Асабліва запомнілася наступальная аперацыя, у час якой узвод, якім я камандаваў, суправаджаючы пяхоту, дзейнічаў сумесна з палком самаходных гармат. Салдаты выяўлялі і знімалі мінныя загароды на дарогах, палях і ў лясах. Тады пяхота пры падтрымцы самаходак прарвала дзве лініі варожай абароны, а на трэцяй атака захлынулася. Камандзір артылерыстаў, падпалкоўнік Сегядзін, прыняў дзёрзкі план — у адным месцы прарвацца палком на самаходках у тыл немцаў. З кожнай батарэяй ішлі на прарыў і мінёры. Сам я знаходзіўся разам з камандзірам палка на яго самаходнай артылерыйскай установцы. Імклівы і адчайны рэйд удаўся. Полк перарэзаў шашу Магілёў — Орша, утрымліваў і кантраляваў яе трое сутак, перакрыўшы рух варожых войскаў. Прарыў гэты быў такім нечаканым для немцаў, што яны палічылі нашы самаходкі сваімі. У час гэтай ашаламляльнай аперацыі былі знішчаны 100 нямецкіх аўтамашын, а мінёры парвалі 120 кіламетраў тэлефоннай сувязі. Пра той подзвіг самаходчыкаў-артылерыстаў і мінёраў падрабязна расказала тады франтавая газета. Усе яны атрымалі баявыя ўзнагароды, у тым ліку і я ўдастоіўся ордэна Чырвонай Зоркі.

Пасля вызвалення Беларусі былі новыя баі ўжо на тэрыторыі Польшчы. У снежні 1944 г. медыкі прызналі мяне нягодным да страявой службы ў сувязі з тым цяжкім раненнем, якое атрымаў на 21-ы дзень вайны. Пасля камісавання мяне перавялі ў запасны полк рэзерву на пасаду старшыны роты.

А ў лістападзе 1945 г. я дэмабілізаваўся

М.С.Тулупаў.

і прыехаў да сям'і ў Шарпілаўку. Вярнуўся да любімай справы.

Пяць гадоў займаў пасаду загадчыка Лоеўскага райана. А потым працаваў паслядоўна дырэктарам сярэдніх школ у вёсках Старыя Дзятлавічы, Пакалюбічы, Церуха Гомельскага раёна. У 1958 г. скончыў завочна Гомельскі педінстытут. А пасля прызначэння пенсіі па ўзросце яшчэ доўга выкладаў рускую мову ў Галавінскай СШ. І толькі калі пераваліла за 70, я, інвалід Айчыннай вайны II групы, развітаўся з педагагічнай справай.

Апрача названых узнагарод маю ордэн Айчыннай вайны I ступені, шэраг медалёў, у тым ліку «За абарону Масквы», «За працоўную доблесць», а таксама нагрудны знак «Выдатнік народнай асветы». У якасці дэлегата ўдзельнічаў у Першым рэспубліканскім з'ездзе настаўнікаў.

У Міхаіла Савельевіча вялікая сям'я — чацвёра дзяцей, 8 унукаў і 3 праўнукі. Абедзве дачкі па прыкладу бацькі працуюць настаўніцамі.

Запісаў І.І.Пічукоў.

Подзвіг сокалаў

Вёска Пясочная Буда, што за 20 км ад Гомеля. У цэнтры яе брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На мемарыяльнай пліце золатам высечаны словы: «Тут пахаваны экіпаж самалёта, які загінуў у 1944 г. у баях за Радзіму, — камандзір палка палкоўнік Крыўцоў М.А., штурман маёр Сомаў І.І., стралок-радыст Паўлаў М.А.». На працягу некалькіх гадоў юныя следапыты Пясочнабудскай школы і сярэдняй школы № 6 г. Калінкавічы, а таксама навуковыя супрацоўнікі Гомельскага краязнаўчага музея збіралі матэрыялы аб членах экіпажа, адшуквалі аднапалчан герояў, вывучалі архіўныя дакументы, знаходзілі адрасы і пісалі іх блізкім. У выніку гэтага пошуку раскрылася яшчэ адна хвалюючая старонка з летапісу бессмяротнага подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У канцы 1943 — пачатку 1944 г. паблізу

вёскі Пясочная Буда на палявым аэрадроме базіраваўся 54-ы бамбардзіровачны авіяполк 16-й паветранай арміі. Адсюль лётчыкі выляталі бамбіць ваенныя аб'екты гітлераўцаў у раёнах Калінкавіч, Мазыра, Жлобіна, Бабруйска і іншых.

12 студзеня 1944 г., калі войскі Беларускага фронту ажыццяўлялі Калінкавіцка-Мазырскую аперацыю, эскадрыллі бамбардзіроўшчыкаў 54-га авіяпалка нанеслі магутны ўдар па чыгуначнаму вузлу Калінкавічы. Там скапілася многа эшалонаў праціўніка з войскамі, тэхнікай, боепрыпасамі. На чале палка ляцеў экіпаж яго камандзіра падпалкоўніка Крыўцова М.А. Нашы самалёты яшчэ не паспелі легчы на баявы курс, як на іх шляху паўстала сцяна агню варожых зенітных батарэй.

Імкнучыся перашкодзіць атацы савецкіх пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў, 8 нямецкіх знішчальнікаў накінуліся на вядучы самалёт Крыўцова. Флагманскі стралок-радыст Паўлаў адбіў атаку. Смела манеўруючы сярод агню, Крыўцоў і Сомаў вялі самалёт на цэль. Пры першым заходзе магутны бомбавы ўдар быў абрушаны на эшалоны ворага. Узарваліся вагоны з боепрыпасамі. У груды металу ператварыліся танкі, гарматы.

Яшчэ адзін заход на станцыю, і тут левы матор Крыўцова загарэўся. Экіпаж мог яшчэ выратавацца пры дапамозе парашутаў.

Але крылатыя сокалы выбралі іншы шлях.

Яны перавялі палаючую машыну ў піке і накіравалі на платформы з гітлераўскай тэхнікай. Раздаўся яшчэ адзін выбух — апошні. Так загінулі героі.

У кнізе генерал-палкоўніка авіяцыі А.Г.Рыкава «Рыцары пятага акіяна» ёсць такія радкі: «Савецкія воіны вызвалілі Калінкавічы 14 студзеня, у той жа дзень мы накіравалі туды каманду на пошукі астанкаў загінуўшых. Сярод разбітых вагонаў і дагараючых дошак знайшлі нарэшце астанкі іх абгарэлых цел і прывезлі на аэрадром Пясочная Буда, дзе стаяў тады 54-ы бамбардзіровачны полк...

На свежай магіле быў устаноўлены наспех збіты з дошак абеліск з надпісам: «Тут пахаваны камандзір палка падпалкоўнік М.А.Крыўцоў, штурман палка маёр І.І.Сомаў, стралок-радыст старшына М.А.Паўлаў і іншыя воіны, якія па-геройску загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне».

Вызначыўся на Гомельшчыне

А.Дз.Валогін нарадзіўся 8 кастрычніка 1924 г. у с. Пячэрскае (цяпер г. Акцябрск Куйбышаўскай вобласці). Герой Савецкага Саюза (15.1.1944). Працаваў токарам механічнай майстэрні асфальтавага завода. У 1942—1943 гг. курсант Тамбоўскага кулямётнага вучылішча. З 8 жніўня 1943 г. на фронце. Гвардыі малодшы сяржант А.Дз.Валогін вызначыўся ў баях за г. Дзмітраўск-Арлоўскі. Загінуў 17.10.1943 г. пры фарсіраванні р. Сож у раёне в. Чырвоная Даліна.

Імем А.Дз.Валогіна названа вуліца на радзіме.

Застаўся назаўсёды маладым

У вёсцы Церуха, што на Гомельшчыне, на самым прыгожым месцы, дзе шапочуць сосны, бачна, як на высокім пастаменце бронзай адлівае фігура смуткуючага салдата. Тут знайшлі свой вечны пакой тыя, хто аддаў жыццё за вызваленне Гомельскага раёна ад фашысцкіх захопнікаў. Тут пахавана шмат вайскоўцаў розных нацыянальнасцей, але лёс у іх быў аднолькавы — смерцю сваёй усталяваць на зямлі жыццё, мір, шчасце.

Тут у пасляваенныя гады былі перапахаваны астанкі Героя Савецкага Саюза гвардыі малодшага лейтэнанта Аляксандра Дзмітрыевіча Валогіна. Яго імя загадам міністра абароны СССР яшчэ ў 1944 г. навечна занесена ў спіс асабовага складу першай роты гвардзейскага палка.

Аляксандру Валогіну ішоў дзевятнаццаты год, калі яго прызвалі ў армію. У 1943 г. трапіў на фронт у 114-ы полк 37-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Вось вытрымка з характарыстыкі камандзіра часці, у якой служыў А.Дз.Валогін: «У баях за

горад Дзмітраўск-Арлоўскі са станкавага кулямёта знішчыў 75 нямецкіх салдат і афіцэраў і першым уварваўся ў траншэі праціўніка, тым самым забяспечыў выкананне задачы, пастаўленай батальёну. З 8 жніўня 1943 г. т. Валогін знішчыў 145 нямецкіх салдат і афіцераў, разлік супрацьтанкавай гарматы, два разлікі кулямётаў праціўніка». Гэта толькі некалькі старонак з баявога жыцця героя.

У баях Аляксандр быў паранены. Пасля шпіталя зноў у родным палку працягваў свой шлях на захад.

37-я дывізія з наступальнымі баямі крочыла ў міжрэчча Дзясны і Сожа. На яе шляху пралягала рака Сноў. Адным з першых, выкарыстаўшы рыбацкую лодку, на заходні бераг пераправіўся Валогін. Ён разам з напарнікам трапным агнём падтрымліваў пераправу батальёна. Калі плацдарм быў пашыраны і ўсталявалася адноснае заціша, камандзір палка К.В.Палякоў падпісаў дакумент аб прадстаўленні кулямётчыка А.Дз.Валогіна да звання Героя Савецкага Саюза, а Валогін з баявымі сябрамі працягваў біць фашыстаў. Званне Героя Савецкага Саюза яму было прысвоена 15 студзеня 1944 г. Але ён ужо не даведаўся аб гэтым.

В.Дз.Вятошкін.

Ад ракі Сноў полк пайшоў да Сожа. Шлях быў цяжкі. Вораг жорстка супраціўляўся. Свой апошні бой Валогін прыняў 17 кастрычніка 1943 г. каля в. Чырвоная Даліна. Ветэран 37-й дывізіі У.Х.Пірашэнка ўспамінаў: «Не ўдалося нам тады адразу ўзяць выгадны рубеж. Рашылі ў атаку пайсці пад вечар. Ворагі адкрылі шалёны агонь. У тым баі вызначыўся і быў смяротна паранены мой аднапалчанін А.Валогін. Імклівы, валявы, адчаянна храбры воін з берагоў Волгі загінуў на беразе Сожа. Было яму тады ўсяго 19 гадоў.

Н.А.Гурэвіч.

Нашы землякі — героі

ВЯТОШКІН Віктар Дзмітрыевіч, нарадзіўся 10 мая 1925 г. у в. Новая Мільча Гомельскага раёна. Поўны кавалер ордэна Славы.

У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1943 г. Удзельнік вызвалення Беларусі, Польшчы, баёў у Германіі. Камандзір мінамётнага разліку, сяржант Вятошкін вызначыўся пры фарсіраванні Віслы, Одэра і ў баі на подступах да Эльбы. 5 мая 1945 г. з мінамётным разлікам знішчыў 5 агнявых кропак ворага, што садзейнічала выхаду палка на Эльбу.

Віктару споўнілася шаснаццаць гадоў, калі скончылася мірнае жыццё і ён з бацькамі апынуўся на часова акупіраванай ворагам зямлі.

Восенню 1943 г., калі Гомельшчына была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Віктар адразу пайшоў на фронт. Свой баявы шлях ён пачынаў мінамётчыкам у 82-й стралковай дывізіі. Удзельнічаў у баях за вызваленне Магілёва, Рагачова, Быхава, Сакела.

У пачатку 1945 г. Віктар Вятошкін атрымаў першы ордэн Славы III ступені за фарсіраванне Віслы і пашырэнне плацдарма да падыходу нашых войскаў.

А між тым савецкія войскі ўжо набліжаліся да Одэра. За фарсіраванне ракі і праяўленую пры гэтым мужнасць нашаму земляку быў уручаны ордэн Славы II ступені.

Давялося яму ўдзельнічаць і ў напружаных баях па акружэнні берлінскай групоўкі гітлераўцаў і выхадзе на Эльбу.

За заключныя аперацыі Вялікай Айчыннай вайны Віктар Дзмітрыевіч быў прадстаўлены да ордэна Славы I ступені. Аднак пра гэтую ўзнагароду ён не ведаў. Толькі праз 25 гадоў яна знайшла героя. Віктар Дзмітрыевіч стаў поўным кавалерам самага славутага салдацкага ордэна.

У 1950 г. Віктар Дзмітрыевіч

І.І.Дзякаў.

І.С.Зайцаў.

дэмабілізаваўся, вярнуўся да дому і адразу ўладкаваўся на фабрыку «Палесдрук». Спачатку працаваў рэзчыкам паперы, механікам. З 1963 г. займаўся цынкаграфіяй, авалодаў прафесіяй фатографа.

Вайсковая загартоўка, дысцыпліна-ванасць дапамаглі яму хутка стаць высокакваліфікаваным майстрам сваёй справы. Да яго баявых узнагарод далучыліся працоўныя, галоўная з іх — ордэн Леніна ў 1977 г.

Зараз В.Дз.Вятошкін на пенсіі.

Н.А.Гурэвіч.

ДЗЯКАЎ Іосіф Іванавіч, нарадзіўся 4 красавіка 1903 г. у г. Гомель. Герой Савецкага Саюза (1945). З рабочых. Член КПСС з 1931 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. З 1942 г. на Заходнім, Цэнтральным, 3-м Беларускім, 1-м Украінскім франтах. У чэрвені 1944 г. у Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці парторг батальёна старшы лейтэнант Дзякаў першым падняўся ў атаку. Салдаты, натхнёныя яго прыкладам, авалодалі варожымі траншэямі, у рукапашнай сутычцы знішчыў 15 гітлераўцаў. 15.7.1944 г. у баях за Гродна замяніў параненага камандзіра роты і на чале падраздзялення адным з першых уварваўся ў горад. Пасля вайны на партыйнай рабоце, працаваў старшынёй Яромінскага сельсавета. Памёр 11.1.1984.

ЗАЙЦАЎ Іван Сцяпанавіч, нарадзіўся 9 кастрычніка 1926 г. у в. Чонкі Гомельскага раёна. Герой Савецкага Саюза (1945). Вызначыўся 16 красавіка 1945 г. у баі за ст. Вербіг (Германія). Цяжка паранены, закрыў сваім целам амбразуру дзота, кулямёты агонь якога стрымліваў наступленне савецкіх воінаў. Пахаваны ў г. Костшын (Польшча).

Калі пачалася вайна, юнаку не было яшчэ і 15 гадоў. Бацька пайшоў на фронт, а юнаку ў ваенкамаце сказалі: «Падрасці яшчэ».

Іван сваімі вачыма ўбачыў усё тое, што прынеслі фашысты на нашу зямлю: слёзы, кроў, смерць савецкіх людзей, разбураныя гарады і вёскі.

На фронт ён трапіў пасля вызвалення вёскі ад гітлераўцаў. Першае баявое хрышчэнне радавы Зайцаў атрымаў у наступальных баях на 3-м Украінскім фронце. Юнак з Чонак бачыў спустошаныя гітлераўцамі гарады і вёскі Украіны, Малдавіі, Польшчы...

Летам 1944 г. ён стаў сяржантам, камандзірам стралковага аддзялення. Неўзабаве быў паранены. Дні лячэння ў шпіталі цягнуліся марудна. Хацелася туды, дзе змагаліся баявыя сябры. І ён дабіўся свайго: са шпіталя выпісваецца датэрмінова. Вясной 1945 г. І.Зайцаў зноў на фронце. Удзельнічае ў баях на тэрыторыі Германіі. Ішлі апошнія дні вайны. Жорсткі бой за нямецкую станцыю Вербіг, каля горада Кюстрын. У ноч на 16 красавіка 1945 г. камандзір стралковага батальёна загадаў роце аўтаматчыкаў штурмам авалодаць двухпавярховым будынкам на ўскраіне горада. Заданне было цяжкае. Фашысты жорстка супраціўляліся, усе падыходы да дома прастрэльваліся. Адну з штурмавых груп узначаліў сяржант І.Зайцаў. Шлях уперад перакрываў дот. Калі Зайцаў і яго падначаленыя кінуліся ў атаку, па іх з паўпадвальнага акна ўдарыў кулямёт, а з другога паверха затрашчалі аўтаматы. Зайцаў загадаў двум байцам знішчыць варожы кулямёт. Але ледзь яны адарваліся ад зямлі, адзін з іх быў забіты, другі — цяжка паранены. «За мной, наперад!» — крыкнуў І.Зайцаў, кінуўся да дота, а за ім — байцы яго аддзялення. Аўтаматныя і кулямётныя чэргі прыціснулі салдат да зямлі. Іван кінуў адну за другой дзве гранаты. Яны разарваліся ля самай амбразуры. Кулямёт змоўк, але толькі на кароткі час. Неўзабаве агнявая кропка ворага зноў ажыла. Фашысцкая куля востра абпаліла левую руку І.Зайцава. «І тады камандзір аддзялення І.Зайцаў са звязкай гранат папоўз да дота, — успамінае генерал

В.С.Антонаў у кнізе «Шлях да Берліна». — Праціўнік, выявіўшы храбраца, які набліжаўся да дота, сканцэнтраваў на ім кулямётны агонь. Забіты таварышы, цяжка паранены сам Ваня, скончыліся гранаты. Заставалася адзінае выйсце. І сабраўшы апошнія сілы, са словамі «За Радзіму» ён кінуўся насустрач вогненнаму смерчу, на амбразуру».

Подзвіг І.Зайцава, здзейснены на вачах шматлікіх воінаў, надаў ім новыя сілы. Байцы штурмавых груп дружна пайшлі ў атаку. І вось на даху будынка з'явілася чырвонае палотнішча сцяга. Баявую задачу савецкія воіны выканалі.

Радзіма высока адзначыла подзвіг І.С.Зайцава. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 31 мая 1945 г. яму пасмяротна было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Мінулі гады. На старой Саксонскай дарозе, у польскім горадзе Касцюшын, каля магілы героя стаіць абеліск.

У Чонках, на сцяне акуратнага дома № 93, дзе нарадзіўся Ваня і жыла яго маці Настасся Клімаўна, установлена мемарыяльная дошка. У Гомелі яго імем названа вуліца. Яго імя прысвоена пасажырскаму цеплаходу Беларускага рачнога параходства. Ён назаўсёды залічаны членам брыгады хімічнага завода. На будынку СПТУ № 56 будаўнікоў у яго гонар установлена мемарыяльная дошка. Яго імя стала вядома ўсёй краіне, а подзвіг героя навечна ўвайшоў у летапіс гісторыі Айчыннай вайны.

Н.А.Гурэвіч.

БАЛАДА АБ САЛДАЦЕ

Вёска ціхая Чонкі,
Вецер восеньскі звонкі
Вербалоззе цалуе,
Ля абрыву — сасонкі.
І расказваюць сосны
Зімы, восені, вёсны,
Гасцінцы і хаты
Пра вясковага хлопца,
Пра вясёлага хлопца,
Пра героя-салдата.
Як у чорны той год
Нашы войскі на ўсход
Адступалі,
Як нямецкія боты,
Фашысцкія боты
Еўропу тапталі.
Як ён лесам блукаў,
Партызанаў шукаў,

І.А.Каўшараў.

Як на захад пайшоў,
Як упаў за мяжой.
Горад Кюстрын стаіць.
Над магілай шуміць
Тапалінае лісце.
Людзі! Сёстры, бацькі!
Хто ляжыць тут такі?
Паглядзіце.
Мой зямляк, гамяльчанін,
Тут пахаваны.
Чулі, людзі?
Хай жа болей ніколі
Такога не будзе.

К. Калінаў.

КАЎШАРАЎ Іван Акімавіч, нарадзіўся 28 кастрычніка 1911 г. у в. Глыбоцкае Гомельскага раёна, Герой Савецкага Саюза (1941). Скончыў Ваенна-паветраную акадэмію (1945). Удзельнік савецка-фінляндскай вайны (1939—1940). У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Ленінградскім, 1-м Беларускім франтах, штурман эскадрыллі лёгкабамбардзіровачнага авіяпалка, начальнік штаба авіяпалка, лейтэнант. Зрабіў 157 баявых вылетаў па знішчэнні самалётаў на варожых аэрадромах, жывой сілы на пярэднім краі, танкаў і чыгуначных эшалонаў. Да 1961 г. служыў у Савецкай Арміі, падпалкоўнік. Ганаровы грамадзянін г. Ціхвін Ленінградскай вобласці.

Адна са старонак у летапіс гісторыі Айчыннай вайны ўпісана нашым земляком І.А.Каўшаравым.

У баях на Волхаўскім фронце толькі з 7 верасня па 7 снежня 1941 г. лётчык І.А.Каўшараў здзейсніў 99 баявых вылетаў, наносіў удары па пазіцыях праціўніка ў раёне г. Ціхвін.

Першая авіяэскадрылля, у якой Іван

М.І.Семянцоў.

Акімавіч быў штурманам, свой першы баявы вылет здзейсніла 22 чэрвеня 1941 г. «Калі эскадрылля падляцела да зададзенага раёна, — успамінаў пазней Іван Акімавіч, — адкрылася відовішча: усе дарогі забіты варожымі танкамі, артылерыяй, мотапяхотай, цыстэрнамі з гаручым. Эскадрыллі авіяпалка скінулі 270 авіябомбаў. У выніку было знішчана 10 танкаў, 29 аўтамашын і да 300 фашыстаў».

Як цяжкі бой запомніўся І.А.Каўшараву і дваццаць сёмы вылет, калі полк страціў 25 працэнтаў самалётаў. На Ленінградскім фронце Іван Акімавіч 127 разоў вадзіў авіяэскадрыллю ў бой. На Сінявінскім участку варожыя знішчальнікі атакавалі савецкія самалёты. Бамбардзіроўшчык Каўшарава загарэўся. Давялося садзіцца прама ў балота. З абпаленым тварам Іван Акімавіч на дзесяць дзён папаў у санчасць. За гэты бой І.А.Каўшараў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Аднойчы разведка данесла, што на аэрадроме Лёзна знаходзіцца каля 100 варожых бамбардзіроўшчыкаў. «Надвор'е было нялётнае. Воблакі прыціскалі нас да зямлі, — успамінае І.А.Каўшараў. — Мне давялося за секунды прыняць аптымальныя рашэнні, каб вывесці групу да цэлі. Пры першым жа заходзе шэраг самалётаў ворага запылалі, аэрадром зацягнула дымам. Пры другім заходзе агнём ахапіла бензазапраўшчыкі. Па звестках партызан былі знішчаны 21 і выведзены са строю 29 самалётаў ворага.

У гэты час гітлераўцы ўзнялі 8 знішчальнікаў МЕ-109 з прыфрантавога аэрадрома і перахапілі нашу эскадрыллю. Завязаўся жорсткі паветраны бой. Фашысцкія знішчальнікі рынуліся ў атаку на вядучага. Наш самалёт быў падбіты. Камандзір пасадзіў машыну на лясной паляне. Экіпаж выбраўся з палаючага самалёта. Па глыбокім снезе мы накіраваліся ў лес. На трэцюю ноч дайшлі да адной вёскі, але нас папярэдзілі, што там знаходзіліся немцы. Мы абышлі гэты населены пункт і пакрочылі далей. Нарэшце, выйшлі да сваіх».

За гэты бой І.А.Каўшараву прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза.

Высокую ўзнагароду Іван Акімавіч атрымаў у Крамлі. Пасля атрымання ўзнагароды да яго падышоў карэспандэнт газеты «Правда» і прапанаваў падпісаць зварот воінаў-беларусаў да сваіх землякоў, партызан і партызанак, усіх працоўных Беларусі, якія апынуліся на часова акупіраванай фашыстамі тэрыторыі.

«Да цябе, наш народ-волат, звяртаюцца сыны твае, воіны-беларусы, — гаварылася ў гэтым дакуменце. — Дзень і ноч мы жывем думкай пра вас, пра родную зямлю. Яна стогне пад пятой акупантаў. Мы клянёмся, што ні крыві, ні жыцця свайго не пашкадуем у барацьбе за сваю справу, за разгром фашысцкіх катаў. Знішчым ненавіснага ворага, назаўсёды ачысцім зямлю ад гітлераўцаў...».

Баявы шлях нашага земляка прайшоў праз Украіну, ваяваў на Ленінградскім фронце, удзельнічаў у Берлінскай аперацыі.

Н.А.Гурэвіч.

СЕМЯНЦОЎ Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся 26 верасня 1917 г. у пас. Ільіч Гомельскага раёна. Герой Савецкага Саюза (1943). У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941 г. Удзельнік баёў у Данбасе, на Каўказе, Курскай дузе, Украіне, Польшчы, Германіі. Намеснік камандзіра эскадрыллі знішчальнага авіяпалка, старшы лейтэнант. З чэрвеня 1941 г. па ліпень 1943 г. зрабіў 270 баявых вылетаў, удзельнічаў у 69 паветраных баях, збіў асабіста 12 самалётаў праціўніка, 9 у групе. Двойчы тараніў варожыя самалёты: у канцы 1942 г. каля г. Эліста, увосень 1943 г. пры наступленні на Кіеў. Загінуў у баі 12 лютага 1945 г. Імя Міхаіла Іванавіча Семянцова напісана на будынку Гомельскага авіяклуба ДТСААФ, у якім вучыўся герой.

Яго імем названа вуліца ў пас. Ільіч.

Ва Улукаўскім сельсавеце, за маленькай рачулкай Іпуць, ёсць пасёлак Ільіч, дзе прайшлі юнацкія гады жыцця Героя Савецкага Саюза Міхаіла Іванавіча Семянцова.

У свой час яго бацька быў зволены з механічных майстэрань Кіеўскага арсенала за рэвалюцыйную дзейнасць і пераехаў на Беларусь. Міхаіл хадзіў у Навабеліцкую школу, а потым працаваў у прыгарадным калгасе «Камсамол Гомельшчыны» (зараз саўгас «Бярозкі»). Адсюль ён у 1938 г. пайшоў у Чырвоную Армію, скончыў Адэскую ваенную школу. Стаў лётчыкам. Вайну сустрэў на Беларусі.

У адным з красавіцкіх нумароў газеты «Правда» (1945) быў змешчаны нарыс «Наша авіяцыя над Одэрам». Там ёсць такія радкі: «Шасцёрка лепшых знішчальнікаў пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза М.І.Семянцова знішчыла сем самалётаў ворага!» Шлях да гэтага подзвігу ў нашага земляка быў доўгі і цяжкі. З першых дзён верасня 1941 г. Міхаіл Семянцоў удзельнічаў у абароне Радзімы. За ўдзел у баях за Маскву ў снежні 1941 г. узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У ліпені 1941 г. адважны лётчык у адным баі збіў два варожыя самалёты, але і яго машына была падбіта. Пасадзіць яе не ўдалося: параненага лётчыка са зломанай рукой падабралі танкісты і адправілі ў шпіталь. Некалькі месяцаў правёў Міхаіл на шпітальным ложку. Пасля выхаду са шпіталя ён вярнуўся ў свой полк, дзе яго чакала яшчэ адна ўзнагарода — ордэн Чырвонага Сцяга.

Ішлі цяжкія баі на Арлоўска-Курскай дузе. Міхаіл Семянцоў амаль штодзённа ўдзельнічаў у іх. У адзін з паветраных баёў са сваім вядомым Качатковым уступілі ў бой з шасцю «месершмітамі». Бой быў жорсткі. Самалёт Качаткова атрымаў пашкоджанне. Сябра не змог падтрымаць свайго вядучага. Міхаілу Семянцову давялося біцца аднаму з групай варожых знішчальнікаў, з якіх два ён збіў.

Восень 1943 г. Нашы войскі выйшлі да р. Дняпро. Цяжкія баі ішлі на задняпроўскіх плацдармах. Экіпажы васьмі самалётаў ЛА-5 атрымалі загад: прыкрыць нашы наземныя часці. У раёне, дзе знішчальнікі павінны былі баражыраваць, прыйшлося ўступіць у бой з 19 варожымі самалётамі. Ні адна бомба не ўпала на пазіцыі савецкіх войскаў. У саставе васьмёркі быў і самалёт М.Семянцова. Ён храбра змагаўся і, калі скончыліся боепрыпасы, пайшоў на таран варожага бамбардзіроўшчыка. Самалёт быў падбіты, але і машына М.Семянцова атрымала моцныя пашкоджанні. У непрытомнасці трапіў Міхаіл зноў у шпіталь. Праз некалькі месяцаў Герой Савецкага Саюза капітан Семянцоў вярнуўся ў свой полк. А наперадзе былі яшчэ два цяжкія гады вайны. Шлях на захад для Міхаіла прайшоў у баку ад родных мясцін. На подступах да Берліна капітан Семянцоў камандаваў эскадрылляй знішчальнікаў.

12 лютага 1945 г. група самалётаў ПЕ-2 з 80-га гвардзейскага палка вылецела на бамбардзіроўку варожага аэрадрома каля горада Нейсе. «Петляковых» суправаджала шасцёрка знішчальнікаў, якіх вёў Герой Савецкага Саюза Міхаіл Семянцоў.

Да варожага аэрадрома эскадрылля бамбардзіроўшчыкаў падышла без перашкод. Лётчыкі, разгарнуўшыся ў баявы строй, пачалі бамбіць узлётную паласу і стаяўшыя на полі самалёты. Менавіта ў гэты час на бамбардзіроўшчыкаў накінуліся фашысцкія знішчальнікі. Шасцёрка «лавачкіных» уступіла з імі ў бой. Першая атака ворага была адбіта. У гэты момант Міхаіл заўважыў, што яго баявы сябра, ураджэнец Беларусі Герой Савецкага Саюза Евель Бялявін, у небяспецы: у хвост яго самалёта заходзіў «месершміт». Міхаіл накіраваў свой знішчальнік наперарэз ворагу і, разумеючы, што можна не паспець, вынік паядынку вырашаюць долі секунды, паласнуў па фашысцкім самалёце чаргой з дальняй дыстанцыі. Гэта чарга прашыла «месершміт». Той успыхнуў і паляцеў на зямлю. Сябра выратаваны. Але на самалёт героя ззаду накінуліся два «месершміты». Семянцоў не паспеў выйсці з атакі, і яго машына была расстраляна фашыстамі. Ніхто і нічым не мог дапамагчы баявому сябру... Ён жыў і загінуў героем.

Н.А.Гурэвіч.

ТРАЦЦЯКОЎ Якаў Адамавіч, нарадзіўся 23.10.1916 г. у в. Зябраўка Гомельскага раёна. Поўны кавалер ордэна Славы. Працаваў трактарыстам у калгасе. З ліпеня 1941 г. на Заходнім, Бранскім,

Я.А.Трацякоў.

Цэнтральным, Беларускім, 2-м і 1-м Беларускіх франтах. Камандзір гарматы старшына Я.А.Трацякоў вызначыўся ў баях на тэрыторыі Беларусі, Польшчы, Германіі. 23.12.1943 г. у баі за в. Казловічы Калінкавіцкага раёна гарматным агнём знішчыў 3 бліндажы, дзот, 5 кулямётных кропак і каля 2 узводаў пяхоты ворага; 14.1.1945 г. у час прарыву абароны праціўніка ў раёне г. Аўгустаў (Польшча) замяніў камандзіра ўзвода і з гармат знішчыў дзот, кулямёт і каля ўзвода варожай пяхоты. 20.4.1945 г. у баях на подступах да Берліна знішчыў гармату праціўніка і падавіў агонь мінамёта.

Жыў у в. Белаярава Мазанаўскага раёна Амурскай вобласці. Памёр у 1995 г.

Ад Масквы да Берліна прайшоў з баямі Якаў Адамавіч...

У снежні 1943 г. нашы войскі вялі ўпартыя баі на тэрыторыі Калінкавіцкага раёна. Мужнасць і адвага старшыны Трацякова ў баях за вызваленне Гомельшчыны былі адзначаны ордэнам Славы III ступені.

Студзень 1945 г. Жорсткія баі разгарнуліся ў раёне польскага горада Аўгустаў. Разлік Трацякова выкаціў гармату на лёд ракі Нараў. Цяжка было рухацца наперад: пад нагамі воінаў і коламі гарматы ламаўся лёд. Страляючы на хаду па кулямётных кропках ворага, разлік гарматы дасягнуў супрацьлеглага берага. Артылерысты хутка ўстанавілі гармату ў адбітым ад немцаў акопе і адкрылі агонь. 14 студзеня ў час прарыву абароны праціўніка Я.Трацякоў замяніў загінуўшага камандзіра ўзвода і прамой наводкай знішчыў дзот, кулямёт і да ўзвода салдат праціўніка. Гэта дазволіла нашым войскам уклініцца ў абарону ворага і захаваць важны плацдарм. За гэты подзвіг Трацякоў быў узнагароджаны ордэнам Славы II ступені.

20 красавіка 1945 г. жорсткія баі ішлі на подступах да Берліна. У гэты дзень наш адважны зямляк-артылерыст правёў апошні пераможны бой з ворагам. Яго разлік падавіў агонь нямецкага мінамёта, знішчыў гармату і больш за 20 салдат і афіцэраў ворага. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў гэтым баі, Якава Адамавіча ўзнагародзілі ордэнам Славы I ступені. Так ён стаў поўным кавалерам ордэнаў салдацкай доблесці і геройства.

Пасля вайны наш зямляк па закліку партыі паехаў на асваенне зямель Далёкага Усходу. Многа гадоў працаваў механізатарам, брыгадзірам.

Першы танкавы таран

Яскравую старонку ў летапіс Вялікай Айчыннай вайны ўпісалі нашы землякі — браты Міна, Елісей, Канстанцін Крычаўцовы, што з вёскі Барок Урыцкага сельсавета.

Калі пачалася вайна, 44-я танкавая брыгада, у склад якой уваходзіў экіпаж братоў Крычаўцовых, дыслацыравалася пад Беластокам. Першы бой танкісты прынялі 22 чэрвеня 1941 г. Яны выканалі загад — падтрымаць агнём пагранічную заставу. Браты добра ведалі мясцовасць, іх танк першым вырваўся наперад і першым адкрыў агонь па варожай пяхоце. Гітлераўцы ў паніцы пачалі адпаўзаць. Пагранічнікі, якіх такая дапамога натхніла, сталі праследаваць праціўніка. Але тут пачуўся гул матораў, з гаю, што быў непадалёку, пачалі выпаўзаць пачвары з чорнымі крыжамі на брані, танкісты налічылі каля 20 варожых танкаў. Свае машыны танкісты паспелі замаскіраваць і чакалі прыбліжэння ворага. Неўзабаве на полі бою гарэлі, як свечкі, 8 нямецкіх танкаў, 2 з іх спынілі браты Крычаўцовы. Але перавага была на баку ворага. Упарта змагаліся танкісты разам з часцямі 10-й арміі за кожны рубеж, аднак вымушаны былі адыходзіць.

26 чэрвеня 1941 г. Ішоў чацвёрты дзень вайны. Каля чыгуначнай станцыі Лапы, што

пад Беластокам, разгарэўся жорсткі танкавы бой. Калі на ўзлессі з'явіліся фашысцкія танкі, экіпаж братоў Крычаўцовых адзін з першых уступіў у бой. Камандзір танка, старэйшы брат Канстанцін, старшына, падаваў дакладныя каманды. Сярэдні брат Міна, механік-вадзіцель, старшы сяржант, умела манеўрыраваў. Малодшы, Елісей, сяржант, метка страляў па ворагу. Браты першым жа снарадам знішчылі галаўны танк. Але тут у іх машыну трапіў варожы снарад, і яна загарэлася. Пылаючы танк не спыніўся, а, наадварот, развіў большую хуткасць і ўрэзаўся ў цяжкі фашысцкі танк. Гэта быў апошні бой братоў-герояў і першы ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны танкавы таран.

Хто яны, дзе і як выхоўваліся браты-патрыёты? Аб гэтым расказала іх сястра, Вольга Георгіеўна Крычаўцова, былая настаўніца, зараз пенсіянерка, якая жыве ў в. Барок Урыцкага сельсавета, у бацькоўскай хаце.

— Мы выраслі ў многадзетнай сям'і, шасцёра сыноў ды тры дачкі. Бацька, Георгій Трафімавіч, быў для свайго часу чалавекам адукаваным, да рэвалюцыі і пасля яе працаваў настаўнікам, захапляўся музыкай, сам вывучыў нотную грамату, быў рэгентам царкоўнага хору, за што быў звольнены з настаўніцкай пасады. Калі ўступіў у калгас, працаваў садоўнікам. Сям'я была дружная, працавітая. Браты добра вучыліся ў школе, мелі музыкальныя здольнасці, атрымалі музычную адукацыю, умелі маляваць, актыўна ўдзельнічалі ў мастацкай самадзейнасці.

Да прызыву ў Чырвоную Армію (1939) Канстанцін скончыў 4 курсы музвучылішча, Міна быў студэнтам другога курса кансерваторыі ў Мінску, Елісей перайшоў на другі курс Гомельскага музычнага вучылішча. Як здарылася, што трох братоў праводзілі на вайсковую службу ў адзін дзень — 17.11.1939 г., і апынуліся яны ў адным экіпажы? Калі старэйшых братоў прызвалі на абавязковую службу, малодшы адмовіўся ад адтэрміноўкі, пажадаў добраахвотна служыць разам з братамі. А бацька звярнуўся да маршала Цімашэнкі з лістом, у якім прасіў міністра абароны, каб яго трох сыноў прызвалі на тэрміновую службу ў Чырвоную Армію ў танкавую часць і далі магчымасць служыць у адным экіпажы. Просьба бацькі была задаволена. І ўжо праз 2 дні браты былі ў Калузе, у 44-й легкатанкавай брыгадзе. Там і склалі адзіны танкавы экіпаж.

Родныя бачылі братоў апошні раз дома, калі іх часць стаяла ў ваенным гарадку Ляшчынец, што пад Гомелем, і яны прыходзілі дадому ў звальненне.

30 сакавіка 1941 г. танкавыя часці з Гомеля былі пераведзены ў Заходнюю Беларусь пад Беласток. Там і сустрэлі вайну.

Былі яны вясёлыя, добрыя, дружныя, вельмі працавітыя, сціплыя. Загінулі маладымі. Вельмі шкада, што так і не ведаем, дзе пахаваны. Доўга шукала, усюды пісала. Знайшла тых, хто ведаў братоў, прыслалі ўспаміны аб іх. А дзе іх магіла, так і не знайшла, — цяжка ўздыхнуўшы, закончыла Вольга Георгіеўна свае ўспаміны.

Браты Крычаўцовы. Злева направа: Елісей, Міна, Канстанцін.

Няма, на жаль, магілы герояў, помніка на ёй, але ёсць нязгасная памяць родных, таварышаў па зброі, удзячных нашчадкаў. У в. Барок ёсць адзіная вуліца, і яна носіць імя братоў Крычаўцовых. Іх гераічны подзвіг адлюстраваны ў экспазіцыі краязнаўчага музея Гомельскай вобласці. У музычным вучылішчы імя Сакалоўскага ёсць куток памяці братоў, дзе захаваліся іх ноты.

Т.А.Карасік.

Старонкі франтавых біяграфій

ДУСЯ АКУЛАВА

Ёсць недалёка ад Гомеля в. Маркавічы. Тут у 1928 г. нарадзілася Дуся Акулава.

Калі ў в. Маркавічы размясціўся шпіталь, Дуся прыйшла туды дапамагаць раненым чырвонаармейцам. Кіраўніцтва шпіталя бачыла імкненне яе дапамагчы медработнікам, бачыла, колькі цеплыні, энергіі прыкладае дзяўчынка, каб аблегчыць пакуты параненых, —таму быў аддадзены загад аб залічэнні Дусі ў штат работнікаў шпіталя.

Неаднойчы, сціснуўшы губы ад болю і горычы, бачыла дзяўчына воінаў, якія паміралі ад ран.

Цяжкія дні адступлення, сотні бяссонных начэй каля ложкаў параненых. Асабліва складанай была пераправа шпіталя цераз Днепр каля в. Радуль. Колькі прыйшлося вытрымаць неакрэплым дзявочым плячам!

Пад Бабруйскам размясціліся ў палатках. У час жорсткага бою аперацыі рабілі тут жа, пад артылерыйскім абстрэлам.

І вось баі ідуць пад Варшавай. Ні дзён ні начэй адпачынку! Медработнікі падалі з ног, а раненых прыбывала ўсё больш і больш. Чуліся словы Дусі: «Пацярпі, родны!»

І гэтак да Берліна. Вайна для яе скончылася ў Патсдаме. Вярнулася Акулава Еўдакія Сцяпанаўна ў родныя Маркавічы з трыма ўрадавымі ўзнагародамі.

ЛАРЫСА ВАСІЛЬЕВА

З фотакарткі глядзіць прыгожая, зусім юная дзяўчына, жыццё якой абарвалася ў семнаццаць гадоў. Адважная беларуская разведчыца нарадзілася ў вёсцы Яроміна Гомельскага раёна. Дзяўчыну вызначалі працавітасць, дапытлівасць. Яна шмат чытала, іграла на музычных інструментах, адначасова з агульнаадукацыйнай скончыла музычную школу. Вясной 1941 г. Ларыса, скончыўшы курсы медсясцёр, прыязджае ў Маскву і пачынае працаваць у дзіцячай паліклініцы № 15. Але хутка пачалася вайна. Восенню 1941 г. становішча Савецкай краіны было асабліва цяжкае. Гітлераўскія полчышчы рваліся да Масквы. ЦК камсамола звярнуўся з заклікам да моладзі Масквы — устаць на абарону сталіцы. І адна з першых адгукнулася на яго Ларыса. Але ў ваенкамаце ёй адмовілі ў просьбе адправіць на фронт: ёй не было 18 гадоў. Яна адказвала, што спартсменка, умее страляць, кідаць гранаты, можа ўвогуле рабіць усё, што патрабуецца ад чырвонаармейца. У адказ чула, што можа трапіць у рукі фашыстаў, і тады — зверствы, пыткі, пакутлівае пакаранне. Адказ быў адзін: «Вытрымаю ўсё». Так пачаўся нядоўгі, але яркі баявы шлях. Ларыса выехала на фронт 5 кастрычніка 1941 г. Трапіла ў разведгрупу. Днём і ўначы ішлі жорскія баі на падыходзе да Масквы. Група разведчыкаў, сярод якіх знаходзілася і Ларыса, перадавала ў штаб фронту каштоўныя разведданыя аб праціўніку. У кароткія перапынкі паміж баявымі заданнямі яна расказвала баявым сябрам аб сваёй вёсцы Яроміна, што на Гомельшчыне, лепш якой няма ва ўсім свеце.

Вось якой запомнілася Ларыса сваім аднапалчанам, якія добра яе ведалі.

Смірнова Н., былы баец атрада, зараз выкладчык МГУ: «У суровыя дні восені 1941 г., калі вораг знаходзіўся ў некалькіх дзесятках кіламетраў ад Масквы, быў створаны наш камсамольска-маладзёжны атрад. У нашым атрадзе, які налічваў больш за 100 байцоў, былі тры семнаццацігадовыя дзяўчыны: Валя Ізмайлава — маленькая, вясёлая; Ларыса Васільева — шэравокая прыгажуня з-пад Гомеля і я. Усе мы прыйшлі ў атрад добраахвотна.

14 студзеня 1942 г. мы выехалі на выкананне чарговага задання. 21 студзеня ўпершыню за шмат дзён спыніліся ў вёсцы Папкова. Але адпачыць прыйшлося

нядоўга. «Фашысты наступаюць», — крыкнуў хтосьці ў акно нашага дома. Аказалася, гітлераўцы акружылі нас, завязаўся няроўны бой. Па глыбокім снезе мы з Ларысай кінуліся да параненага байца, які нерухома ляжаў непадалёку ад шляху. Над нашымі галовамі свісталі кулі. А па дарозе на вялікай хуткасці ішоў на нас фашысцкі танк. Ларыса кінула гранату. Асколкам нямецкай міны я была паранена і страціла прытомнасць. Аб трагічным лёсе Ларысы я даведалася толькі праз шмат гадоў пасля вайны».

В.І.Румянцава — баец атрада, зараз урач, працуе ў Маскве.

Вось што яна расказала: «Ларыса трапіла ў групу, якой камандаваў старшы лейтэнант А.Бойчанка. Дзяўчына падабалася ўсім сваёй жыццярадаснасцю, чуласцю, дабрынёй. Яна стала душой атрада. 21 студзеня 1942 г. група А.Бойчанкі накіроўвалася ў варожы тыл. Каля вёскі Папкова Сухініцкага раёна раптоўна сустрэліся з эсэсаўскай танкавай часцю. Завязаўся няроўны бой. Ларыса была паранена разрыўной куляй у бядро. Перамагаючы боль, яна падпаўзла да варожага танка і кінула гранату, якая ўзарвалася, але не нанесла танку шкоды. Потым яна кінула другую гранату ў фашыстаў, што беглі да яе. І адразу над яе галавой прагучала кулямётная чарга. Яна бегла, кульгаючы на параненую нагу. Варожая куля падкасіла яе. Фашысты схапілі параненую дзяўчыну. Раніцай яны вывелі скалечаную дзяўчыну на снег і на вачах у мясцовых жыхароў кінулі пад старой ракітай. Яна жыла яшчэ некалькі гадзін, сыходзячы крывёю. Труп яе на працягу некалькіх дзён ляжаў на сцяжыцы, немцы не давалі пахаваць».

Вясной, пасля вызвалення вёскі Папкова, Ларысу Васільеву пахавалі байцы Чырвонай Арміі ў брацкай магіле ў в. Брынь, дзе ўзведзены манумент дзяўчыне-воіну, нашай зямлячцы.

Усяго семнаццаць вёснаў сустрэла Ла-

Да 50-годдзя САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ

«Вспомним всех поименно.
Сердцем вспомним своих,
Это нужно — не мертвым,
Это надо — живым».
(Р. Рождественский «Реквием»)

Імя — Ларыса. Прозвішча — Васільева. Партыйнасць — член ВЛКСМ. Дата нараджэння — 27 студзеня 1925 года. Дата смерці — 21 студзеня 1942 года.

Ларыса Васільева... Імя яшчэ адного героя, што толькі нядаўна стала вядомым. Імя, якое варта вымаўляць без хваляванняў, бо яшчэ і яшчэ раз адчуваеш: яна ж сама чымсьці была ў Ларысы ў тых цяжкіх часінах, калі прамо сказаць фашыстам такія словы: «Скроз руских лежа здрадзіў нас. Мы яго адолеем! Але і на адак фашысцкая гадзіна не выйдзе жывой з нашай зямлі».

Як жа ўсё атрымалася?

У тую вясну

Раняй вясной 1941 года на Гомельшчыне вакзале адбываліся праводы. Жыхарка вёскі Яромна, пасля памёрлага ў 1936 годзе Данільчыка грамадзянскай жонкі Міхаіла Васільева маці чацвярых дзяцей Кацярына Данілаўна Васільева праводзіла дачку, вдзячнасці Ларысу да цёткі ў Маскву. Уменнымі павучэннямі, пажаданні дачцы шчасліваго кожнаму, зайздросныя позіркі маленькіх сясцёр... І вось поезд крануўся з месца і, набіраючы разгон, імкнецца на поўнач.

Масква вялікая (вялічэзная). Яркія ўражанні. Ніякай фразы ў Ларысы тут не было. Шматпавярховыя дамы, мноства аўтамабіляў... І самае цікавае — метро. Вязала, сядаеш на адной станцыі і едзе, едзе. Цёмныя тунелі чаргуюцца з чароўна афармленымі станцыямі, поезд набіты пасажырамі, як у казцы.

Крыху пагасцяваўшы ў сталіцы, Ларыса паступіла на працу ў адну з эвакуяваных устаноў. Адначасова стала вучыцца друкаванню на машынцы. І праз чвэрць месяца з сяброўкамі пайшла жыць на кватэру, знядружавацца такое цёплае дамоўе.

«Добры дзень, дарагія і любыя мамачка, Валя, Танюша і Лідачка! Пісьмо ваша атрымала ў кастрычніка. Дарэчы, што даўно не пісала. Я працую з 8 лістапада (красавіка — заўв. аўтараў). Пачуць усё добра. 20-га атрымала першую налучку. 65 рублёў. З іх 30 рублёў аддала за тое, што вучылася друкаванню на машынцы... У чэрвені я, мабыць, буду ў вас. Мы ўжо дамовіліся з Ларысай, што паедзем разам. Ларыса ўжо купіла білеты. Таня закруцілася на кватэры, пакінула сяброўку. Тады месяц. На запамогу яму заспяшаўся друг. Тады з дому выклікала дачушка ў форме чырвонаармейца і абнулася наверсе чалавек. У адно імгненне ён быў падобны і другі «Тыгр». Але фашысты, калі выбраліся з першага танка, схапілі дачушку. Гэта была Ларыса.

Гітлераўцы адвялі сяло. Застрэльшыся ў новых сяброўак Васільевай аддалі вёскі перакрыўшы ў шматлікае адзенне і іншыя перакрывалі да сваіх. А Ларыса...

Немцы прывялі яе ў дом Данільчык. Усю сям'ю выгналі і пачалі дапытваць дзяўчыну.

— Хто ты есць? — зароў маладзец белабрысы афіцэр.

Маўчанне.

— З якой часці?

Маўчанне.

Ліцэі кінжал, і два вароблы навалуліся на Ларысу. У адзін момант убілі яе з ног і пачалі кідаць, таптаць жалезнымі кавалкамі боты, калючы ў твар.

Кінжал — вароблы адступілі. Злоў пытанне. Злоў з'ясаў Ларысы вісоднага гуда. Злоў кінжал, і фашысты з новай сілай кінуліся на дзяўчыну.

Раніца змянілася днём, дзень — вечарам, вечар — ноччу. У Ларысы ўсё сплялося ў адзін суцэльны кашмар. Пытанні, бясконцыя пытанні і ўсе яны — без адказаў. А потым боль ва ўсім целе, а потым перамолаты рукі, а потым выбітыя вішчовай зубы, а потым непрытомнасць. У час якой нічога не бачыць і нічога не адчувае.

Надта халодный вядзе і злоў пытанне. У адказ толькі скрыгат зубамі, якія ледзь трымаюць і жудасны, спаляючы позірк на катаў. Змяніліся тры-двое фашыстаў, бо ім калях ужо не трымаліся на стомленасці. А дзяўт працягваўся.

— Раздзець яе! — раз'юшыўся галасіў зароў афіцэр. Праз мінуту-другую перад вачыма гітлераўцаў прастала дзіцячае цела ў суцэльных крова-падцёках.

— Будзеш адказваць?

— Будзе! — хутчэй выдыхнула, чым сказала Ларыса.

— Ну!

Яна падышла бліжэй да афіцэра і, сабраўшы ўсе сілы, выкрыкнула: «Сярод рускіх імя здрадзіў. Мы не здолеем! Але і на адак фашысцкая гадзіна не выйдзе жывой з нашай зямлі!»

А потым адкінула гітлераўцу ў твар.

Стаць дзікі-шаленымі. Афіцэр выхапіў з кішэні пасадзіў кусцінку, прыжучаны рэжучы ланцэт тварыць бясшумны, падышоў да Ларысы.

— Мы табе будзем рабіць уколы.

Злоў кінжал і нейкай трывогі ўпадзіся ў вачыма, а ў сэрцы — нейкі прыліў сілы, якімі шчыра пачала Ларыса. І потым раздзіўся страх. Перамога чуў, а тым, што быў чалавек, тым, што — дзіцяці, разумеў зразумеў не чаістае дзіцячае цела, быў ўжо на пакінуў не мацуе.

Фашысты выцягнулі дзіцячае цела на двор і два дзюжыя ўпадзіны крайдзі яшчэ нежывой страляў на яе цэлу. А потым, адвярнуўся, пайшоў у хату. Неўзабаве гітлераўцы пакінуліся з двара...

Калі вызвалілі вёску, дзіця Ларысы было пахавана ў брацкай магіле ў трох кіламетрах ад сяла Папкова, у вёскі Брынь. Там яно пачывае і зараз.

* * *

Імя — Ларыса. Прозвішча — Васільева. Дата нараджэння — 27 студзеня 1926 года. Дата смерці — 21 студзеня 1942 года.

Дзень 21 студзеня ўпадае ў жыцці Ларысы, стаў днём нагадвання ёй подзвігу, подзвігу нашай чамячкі, дзіцячыны з Яромля.

Сцёпкіна пачаткі пачуццяў, перад сустрэчай не ўтаіцца

І. СЛЯПЦОЎ.
(Наш пазаштатны карэспандэнт).

К. КАЛІНАЎ,
супрацоўнік газеты «Маяк».

НА ЗДЫМКУ: Ларыса Васільева. Восень 1941 года.

Старонка газеты "Маяк" з нарысам пра Л.Васільеву.

рыса Васільева. Народ не забыў подзвіг бясстрашнай камсамолкі. Настаўнікі і вучні Папкоўскай школы пісалі маці Ларысы, Кацярыне Данілаўне: «Подзвіг Вашай слаўнай дачкі, камсамолкі Ларысы, ніколі не будзе забыты нашым народам. Ён стаіць побач з подзвігам Зоі Касмадзям'янскай. Многіх дзяўчат і жанчын у вёсцы Папкова завуць Ларысамі ў гонар Ларысы, якая геройскі загінула ў баі з нямецкімі захопнікамі». Імем патрыёткі названа вуліца ў яе роднай вёсцы Яроміна. Фотакартка і дакументы Ларысы знаходзяцца ў экспазіцыі абласнога краязнаўчага музея. У 1967 г. маці Ларысы Кацярына Данілаўна зрэзала галіну ракіты, пад якой памерла яе дачка, і прывезла дадому. У Яроміне яна пасадзіла галінку ў агародчыку свайго дома. І прыжылася руская ракіта на беларускай зямлі. Зараз гэта галінка стала прыгожым дрэвам.

Н.А.Гурэвіч.

ФЁДАР МАКСІМАВІЧ ЗАЙЦАЎ

Нарадзіўся ў 1915 г. у в. Сеўрукі ў мнагадзетнай сям'і. Вучыцца як след не давялося. У сярэдзіне 1930-х гадоў Фёдара прызвалі ў армію. Трапіў у асобны сапёрны батальён.

Незадоўга перад канцом службы яго накіравалі на курсы павароў. Атрымаўшы гэтую спецыяльнасць, служыў у вайсковым падраздзяленні непадалёку ад Гомеля. Там і застала яго вайна. Неўзабаве Зайцава адправілі на фронт. Стаў старшы сяржант сапёрам стралковага палка. Абяскоджваў міны, наводзіў масты і пераправы, узводзіў умацаванні, выконваў іншую нялёгкую вайсковую работу. Быў і сувязным-разведчыкам.

У 1943 г. хтосьці з камандзіраў успомніў, што Фёдар Максімавіч яшчэ да вайны скончыў курсы повараў, а такі чалавек якраз спатрэбіўся. Давялося воіну змяніць зброю на прылады кухара. Пачаў ён кашаварыць на палявой кухні.

Але ж на вайне не бывае лёгкіх прафесій. Фёдар Максімавіч успамінае, як пад свіст куль і снарадаў цягнуў на сабе тэрмасы з няхітрым салдацкім харчам на перадавую, як не раз глядзеў смерці у вочы... і не было выпадку, каб па яго віне байцы засталіся галоднымі.

На якой бы пасадзе ні служыў наш зямляк, ён з гонарам выконваў воінскі абавязак. Прымаў удзел у жорсткіх бітвах на Украіне, фарсіраванні Дняпра і ў многіх іншых. Дзень Перамогі сустрэў у Чэхаславакіі.

Фёдар Максімавіч узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі» і «За адвагу», атрымаў ён і нямала падзяк камандавання.

Аднак у 1945 г. вайна для Зайцава не скончылася. Давялося яшчэ змагацца з бандамі, якія арудавалі ў заходніх раёнах краіны пасля выгнання фашыстаў.

Толькі восенню 1946 г. салдат вярнуўся у родныя Сеўрукі.

ІВАН АНДРЭЕВІЧ КОТАЎ

Жыхары вёскі Грабаўка добра ведаюць Івана Андрэевіча Котава. Юнаку яшчэ не споўнілася шаснаццаці гадоў, а ён ужо са зброяй у руках у верасні 1943 г., добраахвотнікам уступіўшы ў дзеючую армію, мужна змагаўся з ворагам у разведаддзяленні. Хутка малады баец стаў камандзірам гарматы 8-й Панфілаўскай дывізіі на 2-м Прыбалтыйскім фронце. За добра распрацаваную і ўмелую разведвальную аперацыю і дастаўку «языка» быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, потым за ўмелыя баявыя дзеянні — ордэнам Чырвонай Зоркі і іншымі ўзнагародамі.

Цяжкае раненне прымусіла яго на час прыпыніць удзел у баявых аперацыях і лячыцца ў шпіталі, дзе ён і сустрэў доўгачаканую вестку аб Перамозе.

У жніўні 1945 г. Іван Андрэевіч вярнуўся ў родныя мясціны, каб аднаўляць разбураную гаспадарку. Свой працоўны шлях ён пачаў з пасады фізрука ў Цярухскай школе. У 1953 г. былога франтавіка, сумленнага, працавітага, калгаснікі калгаса «Сацыялізм» абралі намеснікам старшыні калгаса. Шмат гадоў запар яго выбіралі старшынёй Студзенагуцкага сельсавета (цяпер Цярухскі). Стаўшы пенсіянерам, ветэран вайны і працы не адышоў ад спраў. Ён займаўся пытаннямі кормавытворчасці ў саўгасе. Як і ў маладыя гады, на гэтых пасадах у поўнай меры праявілася яго імкненне прыносіць людзям як мага больш карысці. І зусім невыпадкова яго абралі старшынёй савета ветэранаў вайны і працы Цярухскага сельсавета.

Н.А.Гурэвіч

ВАСІЛЬ ДЗМІТРЫЕВІЧ КРУКАЎ

Тры ўзнагародныя лісты былі адшуканы ў Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Лаканічна іх радкі паведамляюць аб подзвігах і гераічнай гібелі нашага земляка капітана Васіля Дзмітрыевіча Крукава. У першым лісце сказана:

«В.Дз.Крукаў на фронце Айчыннай вайны з першых яе дзён. Мае два раненні. У сакавіку ў наступальных баях яго батарэя дзейнічала выдатна. 31 сакавіка 1943 г. у баі за в. Куземкі тав. Крукаў, будучы параненым, не пакінуў поля бою, а працягваў кіраваць агнём батарэі. Тав. Крукаў дастойны ўзнагароджання ордэнам Чырвонай Зоркі.

В.а. камандзіра палка маёр Секанаў 21 ліпеня 1943 г.».

Вось што гаворыцца ў другім:

«Капітан Крукаў В.Дз. на франтах Вялікай Айчыннай вайны два з палавінай гады няспынна. Мае два раненні. Удзельнічаў у наступальных баях палка на 1-м Украінскім фронце са жніўня 1944 г. Камандаваў батарэяй, паказаў выключнае ўменне, мужнасць і адвагу. Батарэя капітана Крукава за час баёў у 1943—1944 гг. знішчыла да 15 кулямётных кропак, дзве самаходныя гарматы, 5 мінамётных батарэй, 4 аўтамашыны з грузамі і звыш 200 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Батарэя капітана Крукава з'яўляецца перадавой у палку па страявой, баявой, палітычнай падрыхтоўцы.

Капітан Крукаў дастойны ўзнагароджання ордэнам Айчыннай вайны II ступені».

15 ліпеня 1944 г. капітан Крукаў Васіль Дзмітрыевіч гераічна загінуў у баі. Прадстаўляючы яго пясмяротна да высокай узнагароды, камандзір палка маёр Ерамееў пісаў ва ўзнагародным лісце:

«Капітан В.Дз.Крукаў 14 ліпеня 1944 г. у раёне Міркоў праявіў сябе смелым і рашучым. Контратакуючы, немцы падыходзілі ўшчыльную да батарэі капітана Крукава, байцы не зварухнуліся і працягвалі весці прамой наводкай знішчальны агонь па праціўніку.

15 ліпеня 1944 г. у раёне сяла Пегіхвосты Валынскай вобласці батарэя тав. Крукава адыграла рашаючую ролю ў адбіцці контратакі пераўзыходзячых сіл праціўніка. Разлікі дзвюх гармат батарэі былі выведзены са строю, немцы насядалі, спрабуючы акружыць батарэю. Тав. Крукаў сам стаў за гармату і прамой наводкай вёў агонь па праціўніку, пакуль не была адбіта атака. У гэтым баі тав. Крукаў загінуў смерцю храбрых.»

Загадам па 3-й гвардзейскай арміі № 131/н ад 6 кастрычніка 1944 г. узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

Усе тры ўзнагароды, якіх капітан Васіль Дзмітрыевіч Крукаў быў удастоены на працягу аднаго года вайны за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі (ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеней), пры жыцці не былі яму ўручаны.

Толькі ў 1975 г. ордэны Айчыннай вайны I і II ступеней мужнага камандзіра батарэі перададзены ваенкаматам на вечнае захоўванне жонцы Ганне Адамаўне і дачцэ Ніне Васільеўне як памяць аб іх мужу і бацьку.

М.С.Царкоў.

ІВАН АНУФРЫЕВІЧ САБКО

Жыхары Цярухскага сельсавета свята шануюць памяць аб сваім земляку Івану Ануфрыевічу Сабко, які загінуў на палях Айчыннай вайны. Яго імем названа адна з вуліц в. Церуха.

Іван Ануфрыевіч нарадзіўся ў 1914 г. у в. Церуха, у сям'і селяніна. Рос цікавым і дапытлівым хлопчыкам і марыў стаць афіцэрам. Закончыўшы ў 1936 г. Мінскае ваеннае вучылішча, служыў у палку, які дыслацыраваўся ў Полацку. Воінскаму майстэрству вучыў Іван Ануфрыевіч сваіх падначаленых і разам з імі ўдасканальваў свае.

З першых дзён вайны полк, у якім служыў Сабко, уступіў у бой. Вельмі цяжка было на сэрцы ў Івана Ануфрыевіча, калі прыйшлося пакінуць родную Беларусь. Але цвёрдая ўпэўненасць у перамогу надавала сіл маладому лейтэнанту. Камандаван-

Б.С.Шустэр.

не даверыла яму ўзначаліць дывізійную разведку. Адважны камандзір, не ведаючы стомы, не шкадуючы сіл, вадзіў сваіх салдат у тыл ворага, дабываў каштоўныя звесткі, захоплівaў «языкоў». У дывізіі яго называлі «каралём разведкі».

У цяжкія дні абароны Масквы І.А.Сабко стаў камандзірам 360-га гвардзейскага палка, які ваяваў на Калінінскім фронце. Тут ярка раскрыліся яго воінскія здольнасці. Полк з поспехам выконваў загады камандавання. За мужнасць і адвагу яго камандзір І.А. Сабко быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

У адным з наступальных баёў у снежні 1941 г. пад Масквой камандзір палка быў паранены, але да канца бою не пакінуў свайго паста. Пасля шпіталя вучыўся на кароткатэрміновых курсах у Ваеннай акадэміі.

У канцы кастрычніка 1942 г. Сабко быў прызначаны камандзірам 146-га гвардзейскага палка. Студзень 1943 г. — час новых выпрабаванняў. Перад палком і 3-й танкавай арміяй была пастаўлена задача: прарваць эшаланіраваную абарону адборных фашысцкіх войскаў на захад ад Канцяміраўкі і развіць наступленне на Харкаў. Першым пачаць прарыў у раёне в. Міхайлаўка павінен быў полк І.А.Сабко. 8 студзеня 1-ы стралковы батальён пад камандаваннем гвардыі капітана Т.Е.Краўчанкі пачаў разведку боем. Пасля першага поспеху камандзір палка ўвёў у бой астатнія батальёны, забяспечыў тым самым магчымасць перайсці ў наступленне ўсім часцям дывізіі.

Полк пад камандаваннем І.А.Сабко разам з іншымі часцямі за два месяцы зімовага наступлення 1943 г. прынёс вызваленне жыхарам Варонежскай, Белгарадскай і Харкаўскай абласцей. Дзеянні камандзіра былі высока ацэнены, яго ўзнагародзілі ордэнам Суворава III ступені. Але мужнаму камандзіру не давялося дажыць да светлага дня Перамогі: у адным з баёў 6 сакавіка 1943 г. гвардыі маёр І.А.Сабко быў смяротна паранены.

Свята шануюць памяць аб І.А.Сабко яго землякі ў Цярухскім сельсавеце, а таксама жыхары Харкава, дзе ён пахаваны.

ФЁДАР МІТРАФАНАВІЧ ШАРАМЕЦЬЕЎ

У сям'і Шарамецьевых беражліва захоўваецца грамата, якую Фёдар Мітрафанавіч атрымаў ад камандуючага войскамі 1-га Беларускага фронту Г.К.Жукава.

«Красноармейцу Шереметьеву Федору Митрофановичу. Приказом командующего войсками 1-го Белорусского фронта Маршала Советского Союза т. Жукова Г.К. от 30.4.1945 г. № 6, за отличные боевые действия при овладении районом и главным зданием рейхстага всему личному составу вашей части, в том числе и Вам, принимавшему участие в боях, объявляется благодарность».

СЕМЯНЦОЎ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1906, рад., прапаў без вестак 23.12.1943.

СІВАЙ Сяргей Несцеравіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

СІДОРКІН Андрэй Мікалаевіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак.

СІДОРКІН Іван Захаравіч, н. у 1900, рад., прапаў без вестак у 1944.

СІДОРКІН Мікалай Іванавіч, н. у 1926, рад., прапаў без вестак у Літве 18.8.1944.

СІМАКОЎ Аляксей Кузьміч, н. у 1918, рад., прапаў без вестак у 1944.

СІМАКОЎ Апанас Купрыянавіч, н. у 1920, рад., прапаў без вестак у 1944.

СІТНІКАЎ Фёдар Ф., н. у 1905, рад., прапаў без вестак 17.12.1942.

СМЕЛЯКОЎ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1905, рад., прапаў без вестак у 1944.

СНАЙКОЎ Мікалай Аляксеевіч, н. у 1917, рад., прапаў без вестак 6.7.1942.

СТАРАВОЙТАЎ Кірыл Максімавіч, н. у 1894, рад., прапаў без вестак у 1943.

СТРУКАЎ Васілій Патапавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

СТРЫЖАКОЎ Якаў, н. у 1904, загінуў у лагеры Масюкоўшчына ў г. Мінску 6.4.1943.

СУЛІКАЎ Сямён Іванавіч, н. у 1924, ст. сярж., загінуў у Латвіі 3.8.1944.

СЦЕПАНЕНКА Мацвей Васільевіч, н. у 1913, рад., прапаў без вестак у 1944.

СЫРКОЎ Мікалай Майсеевіч, н. у 1920, рад., памёр ад ран 10.1.1945, пахаваны ў г. Капсукас, Літва.

СЯДЗЬКО Яўгеній Пятровіч, ст. сярж., памёр ад ран у Калінінскай вобл. 30.1.1944.

СЯРКОЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1925, рад., загінуў 8.9.1944, пахаваны ў Беластоцкім ваявод., Польшча.

СЯРКОЎ Яўгеній Іванавіч, н. у 1921, рад., прапаў без вестак 10.1.1942.

ТАБАКІН Якаў Абрамавіч, н. у 1919, рад., загінуў 3.3.1942, пахаваны ў Хахольскім р-не Варонежскай вобл ля в. Хахол.

ТАКУНОЎ Фёдар Уладзіміравіч, н. у 1925, рад., загінуў 28.10.1944.

ТАРАСЕВІЧ Іван Апанасавіч, н. у 1922, рад., загінуў ва Усходняй Прусіі 27.3.1945.

ТВАРДОЎСКІ Мікалай Піменавіч, н. у 1904, рад., прапаў без вестак у 1944.

ТРАЦЦЯКОЎ Аляксей Георгіевіч, н. у 1902, рад., прапаў без вестак у 1945.

ТРАЦЦЯКОЎ Іван Фёдаравіч, н. у 1921, рад., прапаў без вестак 2.1.1942.

ТРАЯНАЎ Фёдар Сілавіч, н. у 1911, рад., памёр ад ран 3.9.1944, пахаваны ў Беластоцкім ваяв., Польшча.

ТРУБЧАНКА Сяргей Захаравіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1942.

ТУРКОЎ Якаў Аляксеевіч, н. у 1908, рад., загінуў 14.11.1943, пахаваны ў в. Ветхін Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.

УЛАДЗІМІРАЎ Дзмітрый Емяльянавіч, н. у 1894, рад., прапаў без вестак у верасні 1944.

УЛАДЫНЦАЎ Сцяпан Гаўрылавіч, н. у 1906, рад., прапаў без вестак у студзені 1944.

УКЧЭРАЎ Іван Маркавіч, н. у 1917, рад., прапаў без вестак 11.3.1945.

УСАЎ Васілій Іосіфавіч, н. у 1899, рад., прапаў без вестак у 1944.

УСАЎ Іван Васільевіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1944.

ФЕДАРЦОЎ Іван Максімавіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак 3.10.1942.

ФЕДАРЦОЎ Якаў Іванавіч, н. у 1917, рад., пахаваны ў п. Марс Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.,

ФЕДАСЕЕНКА Аляксей Якаўлевіч, н. у 1918, рад., пахаваны ў п. Зарэчча Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.

ФЕДАСЕЕНКА Фёдар Фёдаравіч, старш. сярж., прапаў без вестак 5.6.1943.

ФІЛІПАЎ Мікалай Сяргеевіч, н. у 1924, рад., загінуў у Літве 16.8.1944.

ФОЛЬБЕРТ Канстанцін Андрэевіч, н. у 1926, рад., памёр ад ран у Гомельскай вобл., пахаваны ў в. Шацілкі Жлобінскага р-на.

ФУРСЕЕЎ Рыгор Карпавіч, н. у 1892, рад., прапаў без вестак у 1941.

ХАДЗЬКО Апанас Іванавіч, н. у 1910, рад., загінуў 12.11.1943, пахаваны ў в. Рудня-Марымонава Гомельскага р-на.

ХАПХАСАЎ Мікалай Сямёнавіч, н. у 1905, рад., загінуў 8.8.1944, пахаваны ў в. Авэлэс, Латвія.

ХАРХУЛЕЎ Васілій Платонавіч, н. у 1926, рад., памёр ад ран у Латвіі 29.12.1944.

ХВАТАЛАЎ Фёдар Андрэевіч, н. у 1919, рад., загінуў у Гомельскай вобл. 12.11.1943.

ХІЛЬКЕВІЧ Рыгор Раманавіч, н. у 1922, сярж., прапаў без вестак 26.1.1943.

ХІМЧАНКА Іван Фёдаравіч, н. у 1904, рад., загінуў 29.7.1943, пахаваны ў пас. Пралетарый Ленінградскай вобл.

ЦВАЛАЎ Уладзімір Васільевіч, н. у 1907, рад., загінуў 18.11.1943, пахаваны ў в. Міхалькі Гомельскага р-на.

ЦВЯТКОЎ Міхаіл Міронавіч, н. у 1912, рад., памёр ад ран у Польшчы.

ЦІТКОЎ Аляксей Карнеевіч, н. у 1924, рад., загінуў у Польшчы.

ЦІТКОЎ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1922, рад., загінуў у Літве 19.7.1944.

ЦІТОЎ Сяргей Піліпавіч, н. у 1901, рад., загінуў 15.11.1945, пахаваны ў п. Храбы Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.

ЦІТОЎ Фёдар Захаравіч, н. у 1922, рад., загінуў у Смаленскай вобл.

ЦІТОЎ Ціт Паўлавіч, н. у 1905, рад., загінуў 27.11.1942, пахаваны на х. Астахаў Бокаўскага р-на Растоўскай вобл.

ЦЫКУНОЎ Аляксей Кірылавіч, н. у 1909, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЦЫКУНОЎ Дзмітрый Кірылавіч, н. у 1920, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЦЫКУНОЎ Іван Мікітавіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЦЫКУНОЎ Фёдар Кірылавіч, н. у 1914, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЦЯРЭШЧАНКА Трафім Іванавіч, н. у 1904, рад., прапаў без вестак 26.6.1941.

ЧУПАРАЎ Іван Аляксеевіч, н. у 1911, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЧУПАРАЎ Карп Спірыдонавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЧУРЫШКА Эдуард Пятровіч, н. у 1906, рад., прапаў без вестак 1.8.1941.

ЧУЧВАГА Барыс Іванавіч, н. у 1908, рад., загінуў 29.4.1945, пахаваны ў г. Берлін, Германія.

ЧЫЖОЎ Міхаіл Гаўрылавіч, н. у 1905, рад., загінуў 30.6.1944, пахаваны ў м. Свіслач Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл.

ЧЫЖОЎ Панцеляймон Сільвестравіч, н. у 1906, рад., прапаў без вестак у 1945.

ЧЫКУНОЎ Аляксей Захаравіч, н. у 1895, рад., пахаваны ў Шабекінскім р-не Белгарадскай вобл.

ЧЫКУНОЎ Васілій Рыгоравіч, н. у 1923, рад., загінуў 21.2.1945 ва Усходняй Прусіі.

ЧЫКУНОЎ Яўстафій, н. у 1895, рад., загінуў 13.11.1943.

ЧЫСТОЎ Ілья Іванавіч, н. у 1908, рад., загінуў у Эстоніі.

ШАБАНАЎ Пётр Ціханавіч, н. у 1909, рад., загінуў 7.4.1942.

ШАЛУПАЕЎ Сяргей Яфрэмавіч, н. у 1915, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШАПАВАЛАЎ Ягор Ягоравіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак.

ШАРАЕЎ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1924, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШАРАЕЎ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1924, прапаў без вестак у 1944.

ШАРАЕЎ Ілья Іванавіч, н. у 1909, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШАРАМЕЦЬЕЎ Захар Касьянавіч, н. у 1914, рад., загінуў 27.7.1944.

ШАРАМЕЦЬЕЎ Міхаіл Васільевіч, н. у 1909, рад., прапаў без вестак каля в. Чыркавічы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

ШАРАМЕЦЬЕЎ Міхаіл Лявонавіч, н. у 1926, рад., загінуў 25.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ШАРЫКАЎ Андрэй Пятровіч, н. у 1921, рад, пахаваны ў в. Адрасерэ Нарвскага р-на, Эстонія.

ШМІДАЎ Давыд Іосіфавіч, н. у 1919, ст. лейт., загінуў.

ШПАНЬКОЎ Аляксей Аляксеевіч, н. у 1921, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШПАНЬКОЎ Павел Андрэевіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШУПЛЯКОЎ Барыс Андрэевіч, н. у 1925, рад., загінуў 19.1.1945, пахаваны ў г. Рацэнж Цэханаўскага пав., Польшча.

ШЧАРБАКОЎ Пётр Пятровіч, н. у 1897, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШЧАРБАКОЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак 25.12.1942.

ШЧАРБІН Захар Піліпавіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШЧЫГОРАЎ Васілій Ягоравіч, н. у 1922, мал. сярж., прапаў без вестак 1.10.1942 у г. Сталінград.

ШЧЫРАЎ Васілій Анісімавіч, н. у 1902, рад., загінуў 28.1.1945 у Польшчы.

ШЫЛАЎ Антон Цярэнцьевіч, н. у 1898, рад., загінуў 25.1.1945, пахаваны ў г. Беласток, Польшча.

ЭЦЭНБУРГ Якаў Якаўлевіч, н. у 1918, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЮРАНКОЎ Кузьма Фёдаравіч, н. у 1913, рад., загінуў 17.11.1943, пахаваны каля в. Дзятлавічы Гомельскага р-на.

ЮРАПАЎ Іван Віктаравіч, н. у 1925, рад., загінуў 18.2.1944, пахаваны ў в. Карпавічы Лёзненского р-на Віцебскай вобл.

ЮРЧАНКА Іван Прохаравіч, н. у 1908, рад., загінуў 7.8.1944, пахаваны ў в. Пяроўса Капсукскага р-на, Літва.

ЯКУБАЎ Васілій Дзянісавіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак 2.8.1941.

ЯКУБОВІЧ Лявон Іванавіч, н. у 1912, прапаў без вестак у 1944.

ЯТЧАНКА Аляксандр Ціханавіч, н. у 1918, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЯТЧАНКА Міхаіл Ціханавіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЯТЧАНКА Фёдар Елісеевіч, н. у 1909, рад., загінуў 12.4.1944, пахаваны ў Беластоцкім ваяв., Польшча.

ЯЦКОЎ Васілій Яфімавіч, н. у 1919, ст. сярж., загінуў 12.1.1944, пахаваны ў в. Аджы-Мушкай Крымскай вобл., Украіна.

ЯЦКОЎ Сцяпан Карпавіч, н. у 1904, рад., загінуў 18.11.1943, пахаваны каля в. Хандогі Дубровенскага р-на Віцебскай вобл.

ЯШЭНКА Павел Мікітавіч, н. у 1914, старш., прапаў без вестак у 1944.

Воіны-землякі, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і месца нараджэння якіх дакладна не вызначана

АЛЯКСЕЕЎ Мікалай Іванавіч, н. у 1924, рад., загінуў 15.12.1943, пахаваны ў в. Мормаль Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.

АРХІПЕНКА Аляксандр Аляксандравіч, мал. сярж., прапаў без вестак.

БОКАЎКАЎ Піліп Захаравіч, н. у 1907, рад., загінуў 2.12.1943, пахаваны ў Жлобінскім р-не Гомельскай вобл.

БАЛЮКОЎ Уладзімір Іванавіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1944.

БУКАЎЦОЎ Кірыла Пятровіч, рад., прапаў без вестак у 1944.

ВІНАКУРАЎ Аляксандр Пятровіч, н. у 1900, рад., прапаў без вестак 27.1.1945.

ВІШНЯКОЎ Мікалай Паўлавіч, н. у 1917, рад., прапаў без вестак у 1944.

ГРЫШАЧКІН Аляксандр Нічыпаравіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак у 1944.

ГРЫШАЧКІН Уладзімір Іванавіч, н. у 1922, рад., памёр ад ран 14.9.1944, пахаваны ў в. Завады Радзіміраўскага пав. Варшаўскага ваяв., Польшча.

ДЗЮБЯНКОЎ Мікалай Максімавіч, н. у 1904, рад., загінуў 20.12.1942, пахаваны ў в. Ледзіна Карманаўскага р-на Смаленскай вобл.

КАНАВАЛАЎ Якаў Міхайлавіч, н. у 1916, рад., загінуў 8.4.1942, пахаваны ў в. Чурылава Смаленскай вобл.

КАВАЛЁЎ Іван Архіпавіч, рад., загінуў у 1944, пахаваны ў в. Язвін Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.

КІР'ЯНАЎ Іван Пятровіч, н. у 1925, рад., загінуў 13.7.1943, пахаваны на ст. Прохараўка Белгарадскай вобл.

КРУПЕНКА Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1923, рад., прапаў без вестак у верасні 1941.

КРУПЕНКА Міхаіл Паўлавіч, н. у 1915, мал. лейт., прапаў без вестак у 1943.

КУРЗАЎ Герасім Фёдаравіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у 1941.

МАЙСЕЕНКА Рыгор Цімафеевіч, н. у 1911, лейт., прапаў без вестак у ліпені 1943.

МАРТЫНЕНКА Мікалай Васільевіч, н. у 1914, старш., прапаў без вестак у 1941.

МАРШАЎ Ілья Аксёнавіч, н. у 1903, рад., прапаў без вестак у 1943.

МАСЛЮКОЎ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1919, рад., загінуў у 1943, пахаваны ў в. Жаробнае Гомельскага р-на.

МІНЧАНКА Ніканор Сямёнавіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1944.

ПАНКОЎ Павел Фёдаравіч, н. у 1909, сярж., прапаў без вестак у 1944.

РАБЧАНКА Уладзімір Фёдаравіч, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

САЛОДКІ Іван Фёдаравіч, н. у 1919, рад., прапаў без вестак у 1944.

САМУСЕЎ Віктар Піліпавіч, н. у 1926, рад., загінуў 3.3.1945 ва Усходняй Прусіі.

СІЛЬЧАНКА Аляксей Міхайлавіч, сярж., прапаў без вестак 2.7.1942.

СКАЧКОЎ Сцяпан Сяргеевіч, н. у 1915, рад., прапаў без вестак у 1944.

УЛАСЕНКА Кірыла Яфрэмавіч, н. у 1902, рад., прапаў без вестак у 1941.

ХРАМЕНКА Трафім Уладзіміравіч, рад., прапаў без вестак у 1942.

* * *

АДАМАЎ Яўхім Васільевіч, н. у 1899, рад., прапаў без вестак у студзені 1944.

ГЕРАСІМЧУК Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1926, рад., загінуў 29.1.1945, пахаваны ў Зеленагурскім ваяв., Польшча.

ГУРЧУНОЎ Аляксей Уладзіміравіч, н. у 1904, загінуў 6.9.1942, пахаваны каля в. Сінявіна Мшынскага р-на Ленінградскай вобл.

ЗАЙЦАЎ Іван Апанасавіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак у ліпені 1941.

ЗУБАРАЎ Васіль Ісаевіч, н. у 1894, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

КАЗЛОЎ Іван Сцяпанавіч, рад., памёр 17.10.1942 у палоне.

МЯЖЭЙНІКАЎ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у маі 1944.

САЙКІН Пётр Васільевіч, н. у 1919, рад., прапаў без вестак 21.8.1942.

САЛАГУБАЎ Іван Паўлавіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

ХАМЯКОЎ Лявон Сцяпанавіч, н. у 1904, прапаў без вестак у студзені 1945.

* * *

ГРАЧАЧНЫ Андрэй Іванавіч, н. у 1905, палітрук, прапаў без вестак у 1942.

ГУЛЕВІЧ Аляксандр Кузьміч, н. у 1915, рад., прапаў без вестак.

ГУЛЕВІЧ Емяльян Сямёнавіч, н. у 1897, лейт., прапаў без вестак 29.1.1943.

ГУМЯНЧУК Яфім Іванавіч, мал. лейт., прапаў без вестак 7.10.1941.

КАСЦЮШЭНКА Аляксандр Мяфодзьевіч, н. у 1922, рад., пахаваны ў в. Мікуліна Старыцкага р-на Калінінскай вобл.

ЧВАРАЎ Іван Аляксандравіч, н. у 1922, рад., прапаў без вестак у лютым 1944.

ШКЛЯВЕР Сямён Пінхусавіч, н. у 1906, прапаў без вестак.

ЯРМОЛЬЧЫК Васіль Ціханавіч, н. у 1905, рад., прапаў без вестак.

* * *

БАРАНАЎ Андрэй Гаўрылавіч, н. у 1910, рад., прапаў без вестак у 1944.

БАРАНАЎ Іван Гаўрылавіч, н. у 1908, рад., прапаў без вестак у 1945.

БЯРОЗАЎ-КІЙ Анан Васільевіч, н. у 1918, ст. сярж., прапаў без вестак у 1941.

БЯРЭШЧАНКА Арсеній Тарасавіч, н. у 1925, рад., загінуў у 1943, пахаваны ў с. Чкалава Гомельскага р-на Гомельскай вобл.

ГЕЎРАСЕЎ Яфім Іванавіч, н. у 1905, мал. сярж., прапаў без вестак у 1944.

ДЗЯЖУРНЫ Васілій Фядотавіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак у 1944.

ДУДЗЯНАЎ Іван Айвенавіч, н. у 1899, рад., прапаў без вестак у 1944.

ЕРЫШАЎ Якаў Яфімавіч, н. у 1925, рад., загінуў у 1945 каля г. Марыенбург, Усходняя Прусія.

ІВАНЧЫК Іван Сяргеевіч, н. у 1920, рад., прапаў без вестак у 1941.

ІВАНЧЫКАЎ Васілій Якаўлевіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1944.

ІГНАЦЬЕЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1902, лейт., загінуў у 1942, пахаваны ў пас. Красны Акцябр Гомельскага р-на.

КАЙДУНОЎ Іван Радзівонавіч, н. у 1909, рад., прапаў без вестак у 1941.

МІХАЛЬЧАНКА Васілій Рыгоравіч, н. у 1909, рад., загінуў 16.10.1943.

ПЯЧЭРНІКАЎ Іван Карлавіч, н. у 1920, рад., прапаў без вестак 22.12.1943.

РУДЗІЙ Сяргей Іванавіч, н. у 1909, рад., прапаў без вестак у 1944.

СІМАКОЎ Рыгор Майсеевіч, н. у 1911, рад., прапаў без вестак у 1944.

ТАТАРАНКА Калінік Рыгоравіч, н. у 1900, рад., прапаў без вестак у 1943.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

У МІРНАЙ ПРАЦЫ

Вызваленне, якога так чакала насельніцтва раёна, прыйшло ў лістападзе 1943 г. Яшчэ грымелі баі на беларускай зямлі, а на вызваленай ад нямецка-фашысцкіх акупантаў тэрыторыі пачаліся аднаўленчыя работы. Адразу ж аднавілі сваю работу мясцовыя органы ўлады. Раённы Савет дэпутатаў працоўных узначаліў Белякоў. Дзейнічалі 20 сельскіх Саветаў, на якія ляглі цяжар і адказнасць па аднаўленні гаспадаркі, ліквідацыі вынікаў вайны. На адказную работу накіроўваліся былыя партызаны, падпольшчыкі і франтавікі.

Галоўнай задачай новых кіраўнікоў было арганізаваць работу па будаўніцтве і аднаўленні жылля, каб як мага хутчэй перасяліць людзей з зямлянак у добраўпарадкаваныя дамы, а таксама разгарнуць работу медыцынскіх і асветных устаноў.

Аднаўленчыя работы вяліся ў цяжкіх сацыяльна-эканамічных умовах. Ваенныя дзеянні прывялі да вялікіх матэрыяльных і людскіх страт. За гады вайны на тэрыторыі раёна была разрабавана і знішчана амаль уся калгасная маёмасць.

З 10 277 сялянскіх двароў за вайну спалена 4256. Напрыклад, у Раманавіцкім сельсавеце з 733 дамоў непашкоджанымі засталося 100, у Прыбыткаўскім з 434 — толькі 41, у Дзятлавіцкім з 394 засталося 59 хат. Многія людзі засталіся без прытулку. За гады вайны колькасць жыхароў раёна значна зменшылася. Калі ў 1941 г. пражывала 50 774 чалавекі, то пасля вызвалення засталося 37 323. На прымусовыя работы ў Германію было вывезена 6425 чалавек. За гады акупацыі загінула 525 мірных жыхароў. Людзі знішчаліся самымі жудаснымі спосабамі. Так, на тэрыторыі Раманавіцкага сельсавета ў меліярацыйным рове былі знойдзены 37 трупаў, у тым ліку 10 дзяцей, закапаных жывымі. Многія сем'і ў раёне так і не дачакаліся пасля вайны сваіх родных і блізкіх, якія загінулі, змагаючыся з ворагам у дзеючай арміі, у партызанскіх і ў антыфашысцкіх падпольных фарміраваннях.

Увесь цяжар па аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі Гомельскага раёна ў першыя гады лёг на плечы жанчын, старых і падлеткаў. Недахоп

працаздольнага насельніцтва, асабліва мужчын, адчуваўся вельмі востра. Гэта патрабавала ад усіх вялікіх намаганняў. Паводле дырэктыў савецкіх і партыйных органаў, на адраджэнне гаспадаркі з дзяржаўнага бюджэту выдзяляліся доўгатэрміновыя крэдыты, пастаўляліся лес і іншы будаўнічы матэрыял. На пачатак 1947 г. у раёне былі пабудаваны 2702 жылыя дамы і пераселены з зямлянак 2802 сям'і калгаснікаў. Але ў зямлянках яшчэ заставалася 807 сямей.

Непазнавальны, жудасны малюнак адкрыўся перад вачыма тых, хто ўбачыў в. Пакалюбічы ў лістападзе 1943 г. Усе вытворчыя і культурна-бытавыя пабудовы былі разбураны, згарэла 428 жылых дамоў. Ад калгаснай гаспадаркі засталося ўсяго 3 кані, 5 колаў і 4 плугі.

У цяжкім становішчы знаходзіліся многія населеныя пункты і гаспадаркі раёна. Усяго па Гомельскаму раёну было разбурана 685 пабудоў, якія належалі калгасам і саўгасам. Захавалася толькі 35 свірнаў, 21 канюшня, 28 жывёльных двароў. Паводле звестак, на 10 снежня 1943 г. у раёне налічвалася 1040 коней, 1819 галоў буйной рагатай жывёлы, 67 галоў свіней, 36 галоў авечак. Фактычна трэба было пачынаць усё спачатку, аднаўляць калектыўныя гаспадаркі. Справа ў тым, што ў гады вайны на акупіраванай ворагам тэрыторыі калгасы і саўгасы распаліся і адрадзілася індывідуальная сялянская гаспадарка. Пасля вайны мясцовымі ўладамі вялася актыўная работа па аднаўленні калгасаў. Ужо да 10 снежня 1943 г. дзейнічала 50 калгасаў з 52, якія былі ў раёне ў даваенны час. Як і ў гады калектывізацыі адбываўся працэс абагульнення жывёлы. У дакладной запісцы на імя сакратара Гомельскага абкома КП(б)Б Жыжанкова старшыня райвыканкома Белякоў адзначаў: «Пры абагульненні конскага пагалоўя ў частцы калгасаў з-за адсутнасці кармоў абагульненыя коні аддаваліся групам калгаснікаў у 5 — 10 двароў, якія на конях павінны праводзіць калгасную работу, аказваць дапамогу ў перавозцы Чырвонай Арміі і абслугоўваць свае ўласныя мерапрыемствы».

Адбудоўваліся жывёлагадоўчыя фермы, кузні і майстэрні па рамонту сельскагаспадарчага інвентару, тэхнікі і іншыя вытворчыя памяшканні. Хутка былі адрамантаваны млыны ў вёсках Яроміна, Прудок, Клімаўка і іншых населеных пунктах. Была адноўлена дзейнасць Гомельскай і Навабеліцкай машынна-трактарных станцый. Для іх забеспячэння былі падабраны 22 трактарысты пажылога ўзросту. Каб выправіць складанае становішча з кадрамі, пры МТС былі адкрыты курсы на 65 чалавек па падрыхтоўцы трактарыстаў з ліку вясковай моладзі. Гэта дало магчымасць у некаторай ступені падрыхтавацца да веснавых палявых работ 1944 г. З разліку пасяўных плошчаў 1941 г. у калгасах была распачата работа па закладцы семянных і страхавых калгасных фондаў. Па стану на 10.12.1943 г. у гэтыя фонды было засыпана: пшаніцы — 16 696 цэнтнераў, аўса — 13 264, жыта — 4303, бульбы — 163 780 цэнтнераў.

Неадкладныя меры прымаліся з боку мясцовых улад па арганізацыі здачы насельніцтвам сельскагаспадарчых прадуктаў у фонд Чырвонай Арміі. Дапамогу Чырвонай Арміі для канчатковага разгрому ворага жыхары раёна лічылі сваім пачэсным абавязкам. Толькі 8 сельскіх Саветаў у канцы 1943 г. у фонд перадалі больш за 1 тысячу цэнтнераў збожжа, 5024 цэнтнеры бульбы, 326 цэнтнераў мяса. Але астатнія 12 сельсаветаў раёна не мелі магчымасці аказаць дапамогу арміі. Таму даведзены раёну план па нарыхтоўцы збожжа быў выкананы на 51 працэнт, бульбы — на 60, мяса — на 67, малака — на 2,4 працэнты. Справа ў тым, што на працягу некалькіх месяцаў многія вёскі Бабовіцкага,

Міхалкаўскага, Пакалюбіцкага, Чкалаўскага і іншых сельсаветаў знаходзіліся ў паласе фронту, у палосе жорсткіх баёў па вызваленні Гомеля і раёнаў Гомельшчыны ад фашысцкіх захопнікаў. Сабраць і захаваць ураджай 1943 г. многім жыхарам гэтых населеных пунктаў не ўдалося. Так, напрыклад, з-за ваенных дзеянняў не была выкапана бульба на плошчы ў 810 га. Таму многія жыхары раёна аказаліся ў вельмі цяжкім і бядотным становішчы.

Пакуль ішла вайна, насельніцтва раёна прымала ўдзел у праводзімай кампаніі па падпісцы на аблігацыі дзяржаўных ваенных займаў, якія былі выпушчаны ў 1944 і 1945 гадах. Праводзілася таксама работа па зборы сярод насельніцтва ўласных сродкаў на будаўніцтва танкаў і баявых самалётаў. Была арганізавана шэфская дапамога калгасаў ваенным шпіталям, якія знаходзіліся на тэрыторыі Гомельшчыны і мелі патрэбу ў прадуктах харчавання і паліве.

Пасля вызвалення раённыя ўлады займаліся не толькі вырашэннем арганізацыйных і эканамічных пытанняў, але і шмат увагі ўдзялялі сацыяльным праблемам. Сярод іх асабліва важнае значэнне надавалася арганізацыі медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, у тым яно мела вельмі вострую патрэбу. Ужо да сярэдзіны снежня 1943 г. у раёне працавалі 10 амбулаторый і некалькі фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Паступова аднаўлялі сваю работу ўстановы культуры і народнай адукацыі. Але вельмі востра адчуваўся недахоп спецыялістаў, асабліва настаўнікаў. У першыя часы адсутнічалі школьныя падручнікі, сшыткі, пісьмовыя прылады, не хапала школьных памяшканняў. За гады вайны былі спалены і разбураны 11 школ. Да канца 1943 г. заняткі былі адноўлены ў 41 школе, дзе навучалася 1400 вучняў. Спачатку многія школы размяшчаліся ў памяшканях, якія не адпавядалі санітарным нормам, у той час у школьных будынках знаходзіліся штабы і інтэрнаты вайсковых часцей Чырвонай Арміі, ваенныя шпіталі. Паводле чаго старшыня Гомельскага райвыканкома дакладваў у абком: «Маюцца факты, калі в/часці не лічацца з патрэбамі мясцовага насельніцтва і мясцовай уладай».

Шмат клопату праяўлялася аб аднаўленні работы школ раёна. Амаль усе дзеці школьнага ўзросту ў гады акупацыі не вучыліся. Таму трэба было правесці ўлік дзяцей, якія пражывалі на тэрыторыі раёна, арганізаваць патранаж над дзецьмі-сіротамі. З 8530 дзяцей школьнага ўзросту ў 1945 г. навучаліся 7903 вучні. Працавалі сярэдняя, 14 няпоўных сярэдніх, 48 пачатковых школ. Было ўсяго 326 настаўнікаў, значная іх частка не мела адпаведнай педагагічнай адукацыі. Гэтая акалічнасць, а таксама недахоп школьных памяшканняў, адсутнасць лабараторый і кабінетаў, неабходных наглядных дапаможнікаў і падручнікаў, цяжкія ўмовы жыцця вучняў адмоўна адбіліся на іх вучобе і ведах. Многія з навучэнцаў не маглі адолець школьную праграму. Напрыклад, у 1948 г. на паўторны год навучання пакінута каля 1000 вучняў, быў адкладзены да восені перавод у наступны клас яшчэ 671 школьніка.

Першапачатковыя меры па ліквідацыі вынікаў акупацыі былі сфармуляваны ў пастанове «Аб бліжэйшых задачах Саўнаркома БССР і КП(б) Беларусі» ад 1 студзеня 1944 г. Для патрэб аднаўлення і развіцця гаспадаркі выдаткоўваліся значныя грашовыя сродкі. З розных рэгіёнаў СССР на Гомельшчыну завозілася прамысловае абсталяванне, трактары, аўтамабілі, будаўнічы матэрыял, буйная рагатая жывёла, коні.

Прымаліся захады па забеспячэнні патрэб гаспадарак і насельніцтва раёна ўласнымі будаўнічымі матэрыяламі. Ужо ў 1944 г. пачалі выпускаць пра-

дукцыю цагельныя заводы, шклозавод у в. Касцюкоўка.

Цяжка далася ў 1944 г. працаўнікам вёскі першая пасяўная. Частку зямель увогуле немагчыма было апрацоўваць, асабліва там, дзе праходзілі жорсткія баі. Многія калгасы не мелі ўсяго неабходнага і магчымасцей для правядзення першага веснавога севу. Працавалі ў асноўным жанчыны, не хапала тэхнікі і коней. Таму апрацоўваць зямлю даводзілася ўручную.

У 1944 г. многія гаспадаркі раёна адгукнуліся на заклік працаўнікоў з калгаса «КІМ» Хойніцкага раёна разгарнуць рэспубліканскае сацыялістычнае спаборніцтва за паспяховае правядзенне сельскагаспадарчых работ і атрыманне шырокіх ураджаяў. Па выніках гэтага спаборніцтва ў ліку пераможцаў быў і калгас «Першае мая». У 1945 г. за поспехі ў жывёлагадоўлі пераможцам рэспубліканскага спаборніцтва быў адзначаны калгас «Чырвоны хлебароб», якому ўручылі пераходны Чырвоны Сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Аднак большасць калгасаў у першыя пасляваенныя гады атрымалі даволі нізкія ўраджаі. У параўнанні з даваеннымі гадамі пасяўныя плошчы значна былі скарочаны. Не хапала сельскагаспадарчай тэхнікі. У 1946 г. у раёне было ўсяго 23 трактары. Як і да вайны, усе пытанні палітычнага і гаспадарчага жыцця былі сканцэнтраваны ў руках партыйных органаў, якія кіравалі як Саветамі, так і гаспадарчымі структурамі. Таму з першых дзён вызвалення пачалося фарміраванне партыйнага і дзяржаўнага апарату раёна. На кіруючыя пасады падбіраліся камуністы, у асноўным з ліку былых партызан і дэмабілізаваных. Падрыхтоўка партыйных, савецкіх і камсамольскіх работнікаў пачала ажыццяўляцца ў школе і на трохмесячных курсах, якія дзейнічалі ў Гомелі. У першыя пасляваенныя гады паскорыўся рост партыйных радоў, што дало магчымасць стварыць пярвічныя партарганізацыі не толькі тэрытарыяльныя, але і ў калгасах, саўгасах, ва ўстановах раёна. У 1948 г. іх было 53, у тым ліку ў калгасах — 23, саўгасах — 3, МТС — 2, ва ўстановах раёна — 17. Яны аб'ядноўвалі 400 членаў і 123 кандыдатаў у члены КП(б). Партарганізацыі ўсклалі на сябе функцыі падбору і расстаноўкі кадраў, кантролю за дзейнасцю Саветаў і грамадскіх арганізацый. Важнае значэнне ў грамадска-палітычным жыцці мелі выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР (1946) і БССР (1947), мясцовыя Саветы (1948, 1950). Аднак вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты, роля і дзейнасць саміх Саветаў у большасці былі фармальнымі, тады існаваў сталінскі рэжым, які дамагаўся ад нас паслухмянасці і ўхвалення сваёй палітыкі.

Аднаўлялі сваю дзейнасць і прафсаюзныя арганізацыі. У выніку праведзенай агітацыйнай работы павялічвалася колькасць членаў прафсаюза. Гэта дало магчымасць стварыць у 1950 г. два новыя райкомы прафсаюзаў — работнікаў аховы і здароўя і палітасветустаноў. Усяго ў гэты час налічвалася 2392 члены прафсаюза, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і саўгасах раёна.

Ва ўмовах пасляваеннага жыцця спецыфічнай была і роля камсамольскіх арганізацый, дзейнасць якіх прыпадала ў асноўным на ўдзел юнакоў і дзяўчат у аднаўленні гаспадаркі раёна. Ужо ў 1943 г. былі створаны 38 камсамольскіх арганізацый у калгасах, 2 у МТС і 2 у саўгасах. З 411 зарэгістраваных камсамольцаў бюро райкома пасля разгляду персанальных спраў аднавіла ў радах камсамола 220 чалавек. Былі прыняты ў члены ВЛКСМ 165 чалавек. Райком КПБ трымаў пад пастаянным кантролем заказы па ўмацаванні камсамольскіх арганізацый, неаднара-

зова на пленумах і бюро ўказваў на арганізацыйную слабасць камсамольскіх арганізацый, якія нярэдка былі на грані развалу і недастаткова ўдзялялі ўвагу ідэйна-палітычнаму выхаванню моладзі. Райком камсамола больш увагі ўдзяляў прыёму новых членаў ВЛКСМ. Толькі за 1950 г. 805 юнакоў і дзяўчат сталі камсамольцамі. Раённая арганізацыя налічвала ў гэты час ужо больш за 2300 членаў ВЛКСМ, з іх толькі 194 працавалі непасрэдна ў калгасах.

Дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі працавалі пад кантролем партапарату і дзейнічалі ў інтарэсах камандна-адміністрацыйнай сістэмы. А працаўнікі раёна часта за сімвалічную плату, самаадцана, не шкадуючы сіл, аднаўлялі разбураную вайной гаспадарку.

У 1950—1995 гг. у выніку добрай працы вяскоўцаў павялічылася развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, вядучай галіной стала жывёлагадоўля. Па ўказанні партыйных органаў у раёне разгарнулася актыўная работа па канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Асноўным у гэтым напрамку стала стварэнне буйных жывёлагадоўчых ферм. Гэта, у сваю чаргу, патрабавала вялікай увагі развіццю трывалай кармавой базы. Таму ўзнікла неабходнасць у пераглядзе структуры пасяўных плошчаў. У выніку за 1953—1958 гг. пасяўныя плошчы пад кармавымі культурамі павялічыліся ў 1,8 раза і складалі трэцюю частку ўсіх пасяўных плошчаў. У той жа час скарацілася пасевы збожжавых культур. У раёне сталі больш увагі звяртаць на пашырэнні пасеваў тэхнічных культур, у тым ліку бульбы. Значна павысіліся ўраджайнасць і валавы збор, што спрыяла развіццю кармавой базы і росту жывёлагадоўлі. Пагалоўе кароў у грамадскім статку павялічылася за 1953—1957 гг. на 41%, свіней — на 81%, птушкі — на 25%. Разам з тым ішло на спад развіццё авечкагадоўлі. Колькасць авечак у калгасах раёна зменшылася з 7 тысяч у 1955 г. да 4,3 тысячы ў 1962 г. Пленум райкома КПБ, разглядаючы стан развіцця авечкагадоўлі, канстатаваў: «Нармальных умоў утрымання і кармлення авец не ствараецца. Працягвае зніжацца пагалоўе. Не ствараюцца авечкагадоўчыя фермы».

У цэлым у 1950-я гады становішча спраў у сельскай гаспадарцы раёна некалькі палепшылася. Павялічыліся грашовыя даходы калгасаў, выраслі іх вытворчыя фонды, умацавалася матэрыяльная база. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічала тое, што дзяржава спісала запазычанасць з калгасаў і нядоімкі з калгаснікаў па сельскагаспадарчаму падатку, павялічыла капіталаўкладанні на патрэбы сяла. Немалую ролю адыграла і працоўная дысцыпліна. Кіраўніцтва райкома КПБ вельмі строга сачыла за выпрацоўкай калгаснікамі вызначанага мінімуму працадзён. У пачатку 1950-х гадоў каля 20% калгаснікаў не выпрацоўвалі ўстаноўленага мінімуму.

Нельга лічыць, што пятая частка працаздольнага насельніцтва раёна была прагульшчыкамі ці гультаямі. Асноўная прычына — цяжкая ручная праца, якая ў той час пераважала ў гаспадарках. Не ўсе гаспадаркі маглі выкарыстоўваць электраэнергію і механізацыю ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Аднак многія калгаснікі працавалі самаадцана, з натхненнем і верай у лепшую будучыню. Для таго, каб дасягнуць даваеннага ўзроўню па ўраджайнасці збожжавых і бульбы, працаўнікам раёна спатрэбілася 14 пасляваенных гадоў. Пагалоўе жывёлы і вытворчасць малака дасягнулі даваеннага ўзроўню за 9, а вытворчасць мяса за 12 гадоў. Па-ранейшаму калгасы адчувалі востры недахоп сельскагаспадарчага інвентару, насення, угнаенняў, а таксама працаздольнага насельніцтва, што перашкаджала хутчэйшаму аднаўленню вытворчасці. Аплата працаднямі

не стымулявала добрай працы. Яны фактычна ператвараліся ў форму кантролю працоўнай павіннасці вяскоўцаў.

У 1950—1952 гг. праведзена ўзбуйненне калгасаў. У Гомельскім раёне замест 57 калгасаў было арганізавана 17 буйных гаспадарак. Аднак сялянства нярэдка не было яшчэ псіхалагічна падрыхтавана да гэтай кампаніі, якую ажыццяўлялі партыйныя органы ўсё ж тымі адміністрацыйнымі метадамі. Узбуйненне дробных калгасаў было праведзена без адпаведнай падрыхтоўкі, паспешна. Гэта, у сваю чаргу, не садзейнічала развіццю калгаснай дэмакратыі. Якраз гэта пацвярджала, што дэмакратычныя прынцыпы кіравання калгасамі толькі дэкларавaліся і на практыцы не ажыццяўляліся. У некаторых гаспадарках раёна было вырашана скараціць памеры прысядзібных участкаў калгаснікаў, што таксама не спрыяла ўмацаванню сельскагаспадарчай вытворчасці. Аб памылковасці прынятых рашэнняў сведчыў і той факт, што ў хуткім часе (у 1954) райком вырашыў з двух узбуйненых калгасаў «Камунар» і імя Леніна стварыць 4 калгасы.

У маі 1957 г. у склад Гомельскага раёна быў перададзены Студзёнагуцкі сельсавет з былога Церахоўскага раёна з двума калгасамі, на базе якіх быў створаны саўгас «Сацыялізм». У маі 1962 г. Гомельскі раён быў узбуйнены за кошт чатырох сельскіх і аднаго пасялковага Савета былога Уваравіцкага раёна. У склад раёна ўвайшлі 6 калгасаў і торфапрадпрыемства «Бальшавік». Акрамя таго, у студзені 1964 г. Гомельскаму раёну былі перададзены Шарпілаўскі і Рудня-Марымонаўскі сельсаветы і быў створаны саўгас «Міжрэчча». У 1965 г. раёну была перададзена тэрыторыя 4 сельскіх саветаў з 4 калгасамі і саўгасам «Расвет» былога Церахоўскага раёна.

Менавіта ў сярэдзіне 1960-х гадоў і завяршылася фарміраванне Гомельскага раёна, які аб'ядноўваў 25 сельскіх і адзін пасялковы Савет, 18 калгасаў, 9 саўгасаў, 3 спецыялізаваныя гаспадаркі, у тым ліку птушкафабрыку і конезавод № 59. Тэрыторыя раёна складала амаль 2000 квадратных кіламетраў.

Непасрэдная блізкасць раёна да г. Гомеля паўплывала на развіццё прамысловай вытворчасці. Яе аснова была закладзена яшчэ ў гады першых савецкіх пяцігодак. Тэрыторыя раёна была багатая на сыравінныя рэсурсы: гліну, лес, торф і інш. Таму вялікая ўвага надавалася развіццю вытворчасці па перапрацоўцы мясцовай сыравіны. У першыя пасляваенныя гады кіраўніцтва раёна садзейнічала адраджэнню торфаздабываючай прамысловасці як асноўнай паліўнай базы. Аднавілі сваю работу торфазавод і торфаарцелі. Аднак прымяненне прымітыўнай тэхнікі здабычы і скарачэнне запасаў торфу прымусілі ў 1951 г. прыпыніць дзейнасць арцелі ў Пакалюбічах. У 1954 г. торфамасіў у



Гомельскі шклозавод імя М.В.Ламаносава. (Здымак 1970-х гадоў). Аднавіў сваю работу ў 1943—1945 гг. у г.п. Касцюкоўка Гомельскага раёна (цяпер у межах г. Гомеля).

Давыдаўцы быў перададзены торфаарцелі «Гразкі», дзе здабыча торфу ажыццяўлялася з прымяненнем механічных рэзчыкаў і торфаўкладчыкаў. Значна павялічылася здабыча торфу ў сувязі з перадачай у 1962 г. Гомельскаму раёну торфапрадпрыемства «Балышавік».

Адразу ж пасля вызвалення раёна ад фашыстаў узнавілі сваю дзейнасць цагельныя заводы. У 1945 г. на базе Асавецкага цагельнага завода быў створаны райпрамкамбінат. Але і ён не мог у поўнай меры забяспечыць патрэбы ў цэгле ў час аднаўленчых работ. Таму было прынята рашэнне аб пачатку будаўніцтва Лапацінскага цагельнага завода, што ў значнай ступені магло забяспечыць патрэбы гаспадарак, а таксама насельніцтва раёна і Гомеля ў будаўнічых матэрыялах. У 1950—1960 гг. становішча з выпускам цэглы ў раёне значна палепшылася, пачалося будаўніцтва школ, бальніц, клубаў, жылля. Толькі ў другой палове 1960-х гадоў на сродкі гаспадарак было ўзведзена 100 дамоў на 275 кватэр, а на сродкі насельніцтва і з дапамогай калгасаў пабудавана 2189 індывідуальных дамоў. Маштабы будаўніцтва на вёсцы з кожным годам пашыраліся. Многія населеныя пункты ў раёне значна змянілі сваё аблічча. Гэтаму спрыяла і сацыяльна-культурнае будаўніцтва. Было ўзведзена 20 школ, 24 клубы і Дамы культуры, 2 бальніцы, 10 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 30 магазінаў, 5 камбінатаў бытавога абслугоўвання, 12 лазняў і шмат іншых пабудоў грамадскага і бытавога прызначэння.

Пашырылася на вёсцы і сфера паслуг. У 1962 г. на тэрыторыі раёна дзейнічала ўсяго 12 дробных швейных майстэрняў. За гады сямігодкі было адкрыта 5 сталовых, чайная, 3 цырульні і 7 майстэрань па пашыву і рамонту адзення і абутку. У 1961 г. пачаў працаваць камбінат бытавога абслугоўвання ў Яроміна. Яго вытворчыя магутнасці пастаянна ўзрасталі, і ў пачатку 1971 г. ён аб'ядноўваў 43 майстэрні, 13 цырульняў, 3 фотаатэлье, майстэрню па рамонту гадзіннікаў. Яны аказвалі насельніцтву звыш 150 відаў бытавых паслуг. Былі пабудаваны тыпавыя дамы быту ў вёсках Пакалюбічы, Прыбыткі, Бабовічы, Урыцкае, Целяшы і ў іншых вёсках раёна. За гады 9-й пяцігодкі (1971—1975) аб'ём паслуг, якія аказваліся насельніцтву, узрос больш як на 75 працэнтаў.

У наступныя гады з боку мясцовых Саветаў удзялялася шмат увагі развіццю сферы паслуг на вёсцы. Асноўны ўпор яны рабілі на вырашэнне такіх сацыяльных пытанняў, як будаўніцтва жылля, дарог, аб'ектаў культурнага і сацыяльнага прызначэння, стварэнне нармальных умоў для працы і вытворчага быту, паляпшэнне грамадскага харчавання, гандлёвага і бытавога абслугоўвання насельніцтва. Гэтаму спрыяла таксама рэалізацыя прынятай у раёне праграмы «Клопат» па далейшаму паляпшэнню абслугоўвання ветэранаў вайны і працы, адзінокіх людзей. У канцы 1980-х гадоў было 35 комплексных прыёмных пунктаў.

У склад камбіната бытавога абслугоўвання ўваходзілі ткацкі, галантарэйны, гарбарны і іншыя цэхі. Гадавы аб'ём бытавых паслуг складаў каля 2,5 мільёна рублёў, а тавараабароту — больш за 53 мільёны рублёў. Да паслуг насельніцтва ў 1992 г. адносіліся 192 прадпрыемствы гандлю, 68 прадпрыемстваў грамадскага харчавання. З кожным годам павялічваўся продаж насельніцтву легкавых аўтамабіляў, матацыклаў, халадзільнікаў і іншай бытавой тэхнікі. Паспяхова ажыццяўлялася газіфікацыя населеных пунктаў, будаўніцтва мастоў і дарог. Цяпер да ўсіх цэнтральных сядзіб гаспадарак і большасці вёсак раёна ёсць дарогі з палепшаным пакрыццём.

Пашырэнне маштабаў капітальнага

будаўніцтва патрабавала стварэння ў раёне будаўнічых арганізацый. У 1959 г. была арганізавана міжкалгасная будаўнічая арганізацыя (Міжкалгасбуд). З кожным годам узровень індустрыялізацыі і механізацыі будаўніцтва павышаўся. За 1959 — 1970 гг. сіламі Міжкалгасбуда было пабудавана і здадзена ў эксплуатацыю 204 тыпавых вытворчых аб'ектаў, выканана будаўніча-мантажных работ на суму больш за 6 мільёнаў рублёў. У 1990 г. у 6 будаўніча-мантажных арганізацыях раёна працавала 1278 чалавек.

Важнае значэнне для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы калгасаў і саўгасаў мела стварэнне на базе РТС раённага і міжраённага аб'яднанняў «Сельгастэхніка». У іх задачу ўваходзіла аказанне гаспадаркам раёна тэхнічнай дапамогі, ажыццяўленне кантролю за станам тэхнікі, яе выкарыстаннем і рамонтам. Эфектыўна працаваў усе гэтыя гады і Гомельскі маторарамонтны завод (створаны ў 1566 г.), які рамантаваў дызельныя трактарныя рухавікі.

Будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў і жылля для гараджан патрабавалі новых пляцовак для іх узвядзення. Так, у гады сямігодкі на землях Гомельскага раёна былі пабудаваны такія буйныя прадпрыемствы, як «Цэнтраліт», Гомельскі суперфасфатны завод (цяпер хімічны завод). Пазней пабудавана Гомельская ТЭЦ-2. Горад «паглынуў» частку вёсак, якія яшчэ нядаўна былі прыгараднымі і знаходзіліся ў складзе і ў межах раёна. Сярод іх вёскі Прудок, Валатава, Мільча, Давыдаўка і іншыя. Іх назвы засталіся толькі ў назвах жылых мікрараёнаў або вуліц Гомеля.

Больш як трэцюю частку тэрыторыі раёна складаюць лясныя масівы. У захаванні лясных угоддзяў важная роля належыць такім прадпрыемствам, як Ленінскі доследны лясгас і Гомельскае вытворчае лесагаспадарчае аб'яднанне. У пасляваенныя гады была праведзена вялікая работа па аднаўленні лясных масіваў, знішчаных у час фашысцкай акупацыі. Страты, нанесеныя лясам Гомельскага раёна, склалі больш за 6,5 тысяч гектараў. Аднак у выніку намаганняў і самаадданай працы лесаводаў толькі за 25 пасляваенных гадоў былі засеяны і засаджаны лесам тэрыторыі плошчай у 12 тысяч гектараў. За гэты ж перыяд было нарыхтавана амаль 1,5 мільёна метраў^3 драўніны як для патрэб народнай гаспадаркі, так і для насельніцтва. Асноўныя працаёмкія працэсы па падрыхтоўцы глебы, пасадцы лесу і яго



У рамонтных майстэрнях саўгаса «Брылёва».

нарыхтоўцы былі механізаваны. Лясгасы арганізавалі цэхі па выпуску тавараў шырокага спажывання. Доследны лясгас з'яўляецца таксама своеасаблівай лабараторыяй Інстытута лесу Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі і адначасова доследна-паказальнай лесагаспадарчай вытворчасцю рэспублікі.

У 1960-я гады пачалося маштабнае асушэнне балот. Для правядзення меліярацыі зямель стваралася магутная вытворчая база, механізаваныя перасоўныя меліярацыйныя калоны (МПМК). Магутная меліярацыйная тэхніка абудзіла наваколлі, распачаліся шырокамаштабныя работы па асваенні забалочаных тэрыторый, хмызнякоў і ператварэнні іх у прыгодныя для земляробства землі. Да канца 1980-х годоў у раёне было асушана больш за 33,5 тысяч гектараў зямель, пабудавана арашальных сістэм на плошчы ў 4,6 тысяч гектараў. Праведзеныя меліярацыйныя работы дабратворна ўплывалі на ўздым сельскагаспадарчай вытворчасці. Калі ў пачатку 1950-х гадоў ураджайнасць збожжавых у раёне складала каля 14 цэнтнераў з гектара, то ў 1988г. яна дасягнула 30,2 цэнтнера, бульбы — 150 і 211 цэнтнераў. У 1992 г. з гектара было атрымана 34,6 цэнтнера збожжавых, а ў калгасах «Бабовіцкі», імя XXII з'езда КПСС, «Лапацінскі» ўраджайнасць дасягнула 40—45 цэнтнераў.

Работа па стварэнні культурных паш і сенажацяў станоўча паўплывала на павышэнне прадукцыйнасці жывёлагадоўлі. У 1989 г. надой на адну карову склаў 3671 кілаграм, у пачатку 1950-х гадоў — 1400 кілаграм. Разам з тым работа, якая праводзілася па меліярацыі зямель, мела сур'ёзныя недахопы. Створаныя меліярацыйныя сістэмы не заўсёды прадугледжвалі двухбаковае воднае рэгуляванне. Дапускаліся таксама адступленні ад праектаў, што прывяло да экалагічных парушэнняў. У засушлівыя гады перасыхалі тарфянікі, падаў узровень вады ў рэках і калодзежах вяскоўцаў, значна абвастрыліся экалагічныя праблемы. Адмоўна сказалася на экалогіі непрадуманасць, нярэдка некампетэнтнасць і ў ажыццяўленні хімізацыі сельскай гаспадаркі. Імкненне мець высокую ўраджайнасць не заўсёды спалучалася з запатрабаваннямі па ахове навакольнага асяроддзя. Вытворчая дзейнасць Гомельскага хімічнага завода таксама стварыла неспрыяльныя ўмовы пражывання людзей, прывяла да росту захворванняў, гібелі акружаючага асяроддзя. 13 млн. тон ядавітых фосфагідаў — адыходаў вытворчасці завода забруджваюць палі, сады і лугі, атручваюць ваду.

Саўгас-камбінат «Сож».

З пераходам да спецыялізацыі і канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці некалькі ажывілася дзейнасць калгасаў і саўгасаў раёна. Непасрэдная іх блізкасць да Гомеля вызначыла задачу па забеспячэнні гараджан садавінай і гароднінай, прадукцыяй жывёлагадоўлі. Важную ролю ў вырашэнні гэтай задачы адыгрывалі спецыялізаваныя гаспадаркі. У снежні 1958 г. на базе двух калгасаў «Камсамол Гомелышчыны» і імя Чапаева быў створаны саўгас «Бярозкі», які спецыялізуецца па вытворчасці гародніны і прадукцыі жывёлагадоўлі. На такой жа вытворчасці спецыялізуецца і саўгас «Брылёва». Гэтыя гаспадаркі не толькі пастаўляюць у гандлёвую сетку свежую садавіну і гародніну, але і перапрацоўваюць яе ва ўласных кансервавых цэхах.

Далёка за межамі раёна і вобласці былі вядомы дасягненні ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга калгаса-камбіната імя Урыцкага. Калгас спецыялізуецца на вытворчасці ялавічыны. Ён стаў базавай гаспадаркай створанага ў 1975 г. аб'яднання, у склад якога ўвайшлі ўсе калгасы раёна. На пабудаваным комплексе па адкорму буйной рагатай жывёлы на 18 тысяч галоў была ўведзена механізацыя і аўтаматызацыя вытворчасці, што спрыяла не толькі павышэнню ўзроўню яе культуры, але і змяншэнню затрат на адзінку прадукцыі. Былі ўзведзены таксама комплексы па вырошчванні і адкорму свіней у саўгасе-камбінаце «Сож», спецсаўгасе «Паўднёвы» і Навабеліцкай птушкафабрыцы. У раёне склалася ўстойлівая структура спецыялізацыі: адна гаспадарка пачала спецыялізавацца па вырошчванні нецеляў, 22 — вытворчасці малака, 2 — насенняводстве траў, 3 — вытворчасці гародніны, 3 — па вытворчасці мяса птушкі і яек.

Укараненне новай тэхнікі, выкарыстанне меліяраваных зямель, хімізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці, дзяржаўная дапамога ў будаўніцтве і рэканструкцыі жывёлагадоўчых комплексаў спрыялі павелічэнню вытворчасці прадукцыі. Раён выканаў планавыя заданні 11-й і 12-й пяцігодак па продажу дзяржаве збожжа, бульбы, мяса, малака, яек, гародніны і іншых відаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Толькі за 1986—1988 гг. гаспадаркамі раёна было прададзена дзяржаве 251 033 т малака, 97 770 т мяса, 46 906 т збожжа, 81 574 т бульбы, што значна пераўзыходзіла планавыя паказчыкі. За паспяховае выкананне планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, дзяржаў-

Адміністрацыйны будынак Гомельскай птушкафабрыкі.

ных заказаў Гомельскі раён неаднаразова выходзіў пераможцам усесаюзных і рэспубліканскіх спаборніцтваў. Многія працаўнікі вёскі былі адзначаны за самаадданую працу савецкімі ўрадавымі ўзнагародамі. Т.В.Васількова, М.І.Кавалёва, Г.Е.Сарокіна, а таксама кіраўнікі гаспадарак П.Н.Кавалёва, М.Ш.Качароўскі, М.П.Хаванскі, А.Т.Кобрусеў, А.А.Паташкін былі ўдастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы. Добра вядомымі ў рэспубліцы сталі дасягненні калгасаў «Перамога», імя Урыцкага, саўгаса «Брылёва», племзавода «Бярозкі» і іншых гаспадарак. Аднак не ўсе гаспадаркі раёна змаглі дасягнуць высокіх паказчыкаў. Спробы ажывіць гаспадарчую дзейнасць калгасаў і саўгасаў нярэдка не ўпісваліся ў старую сістэму кіраўніцтва сельскай гаспадаркай. Па-ранейшаму працягвалася адміністраванне, часта некампетэнтнае ўмяшанне з боку партыйных органаў, якія захапляліся гаспадарча-размеркавальнымі функцыямі. Памылковым быў і перагляд кіравання аграпрамысловым комплексам, стварэнне раённых аграпрамысловых аб'яднанняў (РАПА). У ходзе суцэльнай спецыялізацыі і канцэнтрацыі вытворчасці нярэдка ліквідаваліся невялікія жывёлагадоўчыя фермы. Выявілася і слабасць кармавой базы. Неабдуманасць пры стварэнні жывёлагадоўчых комплексаў прывяла да скаплення на іх вялікай колькасці жывёлы, што адмоўна адбівалася на навакольным асяроддзі.

У пачатку 1990-х гадоў новыя клопаты і турботы ахапілі вяскоўцаў. Стала відавочна, што поўная перавага дзяржаўнай калгасна-саўгаснай сістэмы не стымулюе іх працу ў грамадскім сектары. Працаўнікі сяла не былі зацікаўлены ў выніках сваёй працы. Цяжкасці ў сельскай гаспадаркі пачаліся яшчэ да распаду СССР. Праблемы значна абвастрыліся ў сувязі з рэзкім павышэннем цэн на сродкі вытворчасці — тэхніку, утнаенні, матэрыялы, абсталяванне. Усё гэта прывяло многія калгасы і саўгасы раёна да катастрафічнага фінансавага становішча. Крызіс, у якім апынулася сельская гаспадарка, прывёў да падзення вытворчасці прадукцыі ва ўсіх галінах. Так, вытворчасць малака за 1991 г. скарацілася на 21 працэнт, пагалоўе буйной рагатай жывёлы — на 5,3 тысячы, пагалоўе свіней — на 14 тысяч. Зніжэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі працягвалася і ў наступныя гады. У 1992 г. агульны аб'ём вытворчасці ў раёне склаў каля 80 працэнтаў ад узроўню 1991 г. Надоі малака скараціліся на 22,5 працэнта, на 31,7 працэнта зменшыліся закупкі малака ў насельніцтва.

Зямельная рэформа, распачатая ў

Уборка бульбы на палях калгаса «Перамога» ў Яромінскім сельсавеце. 1987 г.

1990-х гадах, была накіравана на развіццё розных форм уласнасці і гаспадарання. Яна прадугледжвала прадастаўленне насельніцтву ва ўласнасць зямельных надзелаў для вядзення асабістай гаспадаркі. У раёне былі зроблены першыя крокі па стварэнні ўмоў для развіцця новых форм гаспадарання. У канцы 1992 г. дзейнічалі толькі 26 сялянскіх і фермерскіх гаспадарак з агульнай зямельнай плошчай у 608 гектараў.

Рыначны сектар эканомікі раёна быў прадстаўлены 43 малымі прадпрыемствамі і кааператывамі. Але толькі 30 працэнтаў з іх працавалі на спажывецкі рынак тавараў і паслуг. Іх удзельная вага ў агульным аб'ёме вытворчасці тавараў і аказваемых насельніцтву паслуг складала толькі 3,6 працэнта.

Для жыхароў Гомеля мясцовымі Саветамі раёна былі выдзелены зямельныя ўчасткі пад сады і агароды больш за 2 тысячы гектараў. Створана каля 180 садова-агародных таварыстваў (аб'ядноўвалі 20 тысяч гараджан), якія ўласнымі сіламі імкнуцца хоць у некаторай ступені вырашыць харчовыя праблемы.

Разам з тым неспрыяльныя ўмовы для эканамічнай дзейнасці калектыўных, а таксама і сялянскіх гаспадарак ва ўмовах спаду вытворчасці рэзка абвастрылі сацыяльныя праблемы. Не ва ўсіх вёсках раёна былі створаны нармальныя ўмовы працы і жыцця, вырашаны пытанні сацыяльнай абароны сельскага насельніцтва. Таму працэс міграцыі вясковай моладзі не прыпыняецца і цяпер. Многія працоўныя калектывы прамысловых прадпрыемстваў, будаўнічых арганізацый і ўстаноў Гомеля ў большасці сваёй укамплектаваны за кошт жыхароў раёна. У пасляваенныя гады народная адукацыя развівалася пад непасрэдным уплывам тых працэсаў, якія характарызавалі грамадска-палітычнае жыццё. Поспехі ў народнай адукацыі з'явіліся вынікам вялікіх намаганняў настаўнікаў, бацькоў, клопатаў працоўных калектываў. У канцы 50-х гадоў пачала ажыццяўляцца рэформа ў сістэме адукацыі, яна прадугледжвала пераход да політэхнічнага навучання і працоўнага выхавання. Аднак у другой палове 1960-х гадоў, калі пачаўся пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі, прафесійная падрыхтоўка стала неабавязковай і ажыццяўлялася ў тых школах у форме гуртковай работы. З сярэдзіны 1970-х гадоў некалькі ажывілася працоўнае навучанне ў сувязі са стварэннем вучэбна-вытворчых камбінатаў, вучнёўскіх вы-

Пенсіянеры дапамагаюць збіраць ураджай агародніны. Саўгас-камбінат «Усход». Урыцкі сельсавет.

ворчых брыгад, школьных майстэрань. У 1980/81 навучальным годзе ў раёне дзейнічала 17 вучнёўскіх вытворчых брыгад і 6 лясніцтваў. Агульная зямельная плошча, якую апрацоўвалі члены вытворчых брыгад, складала 315 га. Шмат добрых спраў было на рахунку школьнага лясніцтва Каранёўскай васьмігодкі. Юныя лесаводы пад кіраўніцтвам ляснічага і сямікласніка Сяргея Губенкі даглядалі пасадачны матэрыял у гадавальніку, ачышчалі дэндрарый, збіралі лекавыя травы і інш. У летні час на базе вучнёўскіх брыгад дзейнічалі лагеры адпачынку. Умела была наладжана работа лагераў «Юнацтва» ў Маркавіцкай СШ, у зябраўскай СШ № 1, Цярухскай і іншых сярэдніх школах.

З пераходам да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі ўзнікла неабходнасць будаўніцтва новых школ. А патрэба ў іх была вялікая. Так, у 1979 г. толькі 14 (з 22) сярэдніх і 10 (з 17) васьмігадовых школ былі размешчаны ў тыпавых будынках, дзе меліся неабходныя ўмовы для правядзення вучэбна-выхаваўчай работы.

Кіраўніцтвам раёна, грамадскасцю, калектывамі базавых прадпрыемстваў і арганізацый рабіліся пэўныя захады па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы школ. Напрыклад, у зябраўскай СШ № 1 (дырэктар Т.А.Карасік) дзейнічала 17 кабінетаў, быў кабінет тэхнічных сродкаў навучання, вялася падрыхтоўка будучых шафёраў. У канцы 1980-х гадоў у пяці школах раёна было 5 камп'ютэрных класаў.

У пачатку 1990-х гадоў у раёне працавалі 22 сярэднія, 16 няпоўных сярэдніх і 13 пачатковых школ. Акрамя таго, дзейнічалі Улукаўская спецшкола-інтэрнат і Цярухскі дзіцячы дом, 44 дашкольныя ўстановы, 3 прафтэхвучылішчы.

Плённая праца многіх настаўнікаў і выхавацеляў, вопыт педагагічных калектываў не раз вывучаліся калегамі і з іншых рэгіёнаў. Пацвярджэннем гэтаму было правядзенне ў 1990 г. на базе раёна ўсесаюзнага, рэспубліканскага і 6 абласных семінараў.

Аднак недахоп бюджэтных асігнаванняў на патрэбы народнай адукацыі, які востра адчуваецца ў апошнія гады, непазбежна вядзе да адставання матэрыяльна-тэхнічнай базы, што ў сваю чаргу адмоўна адбіваецца на якасным узроўні адукацыі.

Важную ролю ў арганізацыі выхаваўчай работы на вёсцы адыгрываюць установы культуры. За пасляваенныя гады створана шырокая сетка клубаў і дамоў культуры, кінатэатраў і бібліятэк. У дзейнасці культурна-асветных устаноў у 1960—1980 гг. шырока выкарыстоўваліся розныя формы работы — тэматычныя вечары, народныя універсітэты, вечары працоўнай славы,



Тыпавая забудова ў в. Урыцкае.

Будынак Грабаўскай СШ.

сустрэчы з ветэранамі вайны і інш. У канцы 1960-х гадоў у раёне працавалі 137 гурткоў мастацкай самадзейнасці, з іх 39 харавых, 21 танцавальны, 18 драматычных, 10 духавых аркестраў і 3 аркестры народных інструментаў. Шырокую вядомасць атрымала канцэртная дзейнасць харавой капэлы в. Галавінцы, народнага ансамбля песні і танца «Колас» з калгаса імя 22 з'езда КПСС, хора в. Прыбыткі пад кіраўніцтвам настаўніка зябраўскай СШ № 1, заслужанага дзеяча культуры БССР Ф.Ф.Пятрэнкі. Высокім прафесійным майстэрствам вылучаўся сярод іншых духавы аркестр Урыцкага сельскага Дома культуры, якім кіраваў М.Б.Вальфсон. Цёпла сустракалі выступленні харавога калектыву з в. Урыцкае гледачы не толькі Гомельшчыны, але і Украіны, Латвіі, Чэхіі і Славакіі. У 1979 г. калегія Міністэрства культуры прысвоіла гэтаму хору ганаровае званне народнага.

Спрыяла духоўнаму росту падрастаючага пакалення і дзейнасць дзіцячых музычных школ, якія былі адкрыты ў в. Яроміна і в. Пакалюбічы. У Пакалюбіцкай музычнай школе ў 1990 г. было ўжо 70 вучняў, якія займаліся па класе баяна, акардэона, фартэпіяна, трубы і гітары.

Значны ўплыў на культурнае жыццё насельніцтва робіць царква. Засталіся ў мінулым адміністрацыйны ціск на царкву, ганенні на святароў і вернікаў, знішчэнне культавых будынкаў. Прыняты Закон «Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях» павінен забяспечыць прававыя гарантыі ў вырашэнні веруючых сваіх перакананняў, у вяртанні народных традыцый і абрадаў. Уступленне гэтага закона ў дзеянне спрыяе дзейнасці розных рэлігійных канфесій. Адкрываюцца новыя цэрквы і малітоўныя дамы. Пры дапамозе веру-

Вучні зябраўскай СШ № 1 каля сваіх стэндаў на раённых спаборніцтвах школьных клубаў баявой славы.

ючых і мясцовых улад у апошнія гады ўзведзены праваслаўныя цэрквы ў вёсках Урыцкае, Прыбыткі. Напрыклад, у в. Прыбыткі памяшканне царквы ў 1930-я гады было аддадзена ўладамі пад клуб, а ў 1943 у час баявых дзеянняў яно згарэла. І толькі ў 1992 г. жыхары гэтай вёскі і іншых навакольных вёсак атрымалі магчымасць наведваць царкву, якая была пабудавана з дапамогай саўгасаў «Паўднёвы» і «Гомельскі». Новай царкве былі вернуты іконы і культавыя прадметы, якія доўгія гады захоўвалі прыхаджане.

Умацаванню здароўя ў значнай ступені спрыяюць і заняткі фізічнай культурай і спортам. У раёне зроблена шмат па стварэнні і ўмацаванні спартыўнай базы. Актыўная работа ў гэтым напрамку праводзілася асабліва ў 1980-я гады. Менавіта ў гэты час было ўзведзена нямала спартыўных збудаванняў. Гэта спартыўныя залы ў Брылёўскай, Урыцкай і Цярэніцкай сярэдніх школах, дамы культуры са спартыўнымі заламі ў вёсках Цярэшкавічы, Цагельня, у саўгасе «Бярозкі». Добры спартыўны комплекс з двума плавальнымі басейнамі быў пабудаваны ў саўгасе-камбінаце «Сож». Дзякуючы пастаяннай увазе яго кіраўніцтва фізкультурная арганізацыя саўгаса, якую ўзначальвае інструктар-метадыст, майстар спорту СССР Віктар Шундзікаў, з'яўляецца адной з лепшых. На базе спарткомплексу рэгулярна праводзяцца міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы. Былі пабудаваны таксама дзіцячыя сады з міні-басейнамі ў саўгасе «Брылёва» і на торфапрадпрыемстве «Бальшавік». У 1991 г. у распараджэнні фізкультурнікаў і спартсменаў было 35 залаў, 40 футбольных пляцовак, 22 стралковыя ціры і іншыя спартыўныя збудаванні. У раёне стала традыцыяй праводзіць спартакіяды сярод сельскіх Саветаў. Спартыўныя каманды раёна па розных відах спорту ўдзельнічаюць і ў абласных спаборніцтвах. Праведзеная фізкультурнай арганізацыяй спартыўна-аздараўленчая работа давала станоўчыя вынікі.

Чарнобыльскі попел пасыпаў і тэрыторыю Гомельскага раёна. Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС прынесла людзям гора і пакуты, рэальную пагрозу іх здароўю, асабліва дзецям. Яна патраба-

Спартыўны комплекс саўгаса-камбіната «Сож».

вала вялікіх выдаткаў для ліквідацыі гэтай трагедыі. Былі ажыццёўлены меры па сацыяльнай падтрымцы людзей, якія пацярпелі ад катастрофы. Адным з напрамкаў дзейнасці мясцовых улад было будаўніцтва жылля і ўладкаванне перасяленцаў з найбольш пацярпеўшых раёнаў вобласці. Толькі за 1986—1988 гг. у раёне пасялілася каля 1,5 тысячы чалавек, адселеных з чарнобыльскай зоны. Важнае значэнне набылі пытанні медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, асабліва сем'яў з малымі дзецьмі. Іх медыцынскім абслугоўваннем і кантролем за станам здароўя займаюцца работнікі раённай і 7 участковых бальніц, 11 урачэбных амбулаторый, 38 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. На тэрыторыі раёна ў маляўнічых месцах размешчаны санаторыі «Васільеўка» і «Чонкі», 2 дзіцячыя санаторыі, турбаза «Сож», многа санаторыяў-прафілакторыяў і дзіцячых летнікаў.

Аднак пад уздзеяннем радыенуклідаў у апошнія гады значна павялічылася колькасць як дарослых людзей, так і дзяцей з цяжкімі захворваннямі. У рабоце медыцынскіх устаноў раёна ўзнікла нямала складаных праблем і цяжкасцей, звязаных з развіццём матэрыяльна-тэхнічнай базы, набыццём новага абсталявання і медыкаментаў. Эканамічны крызіс, які ахапіў і сацыяльную сферу, прывёў да рэзкага пагаршэння матэрыяльнага становішча насельніцтва, у тым ліку сацыяльна неабароненых яго груп — пенсіянераў, дзяцей, працаўнікоў сяла. Галоўнай задачай на сучасным этапе з'яўляецца пераадоленне крызісных з'яў у сацыяльна-эканамічным жыцці. Трэба памятаць, што дасягнуць гэтага можна толькі самаадданай працай.

Паўстагоддзя прайшло з таго часу, як закончылася апошняе ваеннае ліхалецце. Тэрмін, здаецца, не такі ўжо і вялікі ў параўнанні з папярэднімі стагоддзямі. Аднак пасляваенным пакаленнем зроблена шмат добрага і карыснага, аб чым сведчыць наша гісторыя. Цяперашняе і наступныя пакаленні павінны скарыстаць той станоўчы вопыт, які быў напрацаваны іх папярэднікамі, далёкімі і блізкімі прашчурамі. І гэта магчыма толькі тады, калі будзе захавана гістарычная памяць. На Гомельшчыне раслі і набіралі сілы многія славутыя людзі, якія дасягнулі значных поспехаў у розных галінах: эканоміцы, навуцы, медыцыне,



Спартыўная зала спарткомплексу.

педагогіцы, культуры, ваеннай справе. Імі ганарацца не толькі землякі, але і ўся Бацькаўшчына. Вось чаму важна ведаць сваю мінуўшчыну, гісторыю свайго краю. Непарыўнасць сувязі з мінулым, аднаўленне сваіх каранёў і духоўнай спадчыны нязменна вяртаюць нас да памяці аб тых, хто ўславіў родную зямлю сваімі справамі.

М.М.Мурашка.

Крыніцы

1. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 144 (воп. 1, спр. 71). Ф. 205 (воп. 1, спр. 3, 5, 23, 45; воп. 2, спр. 3, 6, 33; воп. 3, спр. 8; воп. 8, спр. 7, 10, 32, 34, 69; воп. 20, спр. 9; воп. 23, спр. 8; воп. 26, спр. 2; воп. 30, спр. 4; воп. 34, спр. 2).

2. Гомельская область. Мн., 1988. С. 105–106.

3. Гомельская праўда. 1972. 8 ліп.; 1978. 6 чэрв.; 1984. 26 снеж.

4. Историко-экономический очерк Гомельского сельского района Гомельской области Белорусской ССР (рукопись).

5. Маяк. 1972. 9 ліп.; 1975. 31 мая; 1976. 24 студз.; 1979. 20 снеж.; 1980. 4 і 18 ліст.; 1982. 5 ліст. і 11 снеж.; 1991. 10 жн. і 16 кастр.; 1992. 8, 22 лют.; 27 чэрв., 27 кастр.; 1993. 30 студз.

6. Паспорт социально-экономического развития Гомельского района.

Дакументы сведчаць

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРУ АБКОМА КП(б)Б ТАВ. ЖЫЖАНКОВУ

15 снежня 1943 г.

Окончательно Гомельский сельский район вместе с Гомельской обл. был освобожден 26 ноября 1943 г. 27 – 28 ноября с/г были установлены все 20 сельсоветов. Выделены председатели и секретари с/советов, которые утверждены исполкомом райсовета. Сельсоветы сейчас же развернули организационную работу. После установления с/советов была развернута работа по установлению колхозов.

В течение 5-и дней после освобождения р-на были восстановлены все колхозы. Для руководства установления с/советов и колхозов в каждый с/совет был послан уполномоченный р-на сроком на 10–15 дней.

Председатель исп. Ком.
Депутатов труд. Беляков
Секретарь Сорокин

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 144. Воп. 1. Спр. 5. Л. 68, 70.

ЗВЕСТКІ ПРА НАСЕЛЬНІЦТВА ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА

10 снежня 1943 г.

НАИМЕНОВАНИЕ С/СОВЕТОВ	НАСЕЛЕНИЕ				КРЕСТЬЯН. ДВОРОВ			
	Было до войны	Угнано немцами	Убито	Осталось	Было до войны	Сожжено	В т.ч. населен. оставш. на мест.	Осталось домов
Романовичский	4128	65	23	3240	733	633	618	100
Зябровский	1865	47	14	1500	625	191	191	434
Прибытковский	1835	305	32	1298	434	393	370	41
Терешковский	2391	71	35	2078	522	371	365	154
Михальковский	675	123	20	400	153	67	61	86
Карналинский	480	141	36	910	280	20	250	260
Мильчанский	3125	60	2	2554	567	6	6	561
Титенский	2800	291	19	1920	420	15	–	405
Давыдовский	2184	277	15	1519	498	103	97	395
Еременский	4159	198	13	3248	645	91	85	554
Прудковский	2681	169	37	2251	608	66	66	542
Улуковский	3488	102	7	2644	722	511	511	210

Севрюковский	1900	647	25	935	415	89	80	326
Урицкий	3010	236	40	2566	671	32	32	639
Климовский	1669	308	21	1250	396	191	180	205
Дятловичский	1739	125	47	1250	394	335	335	59
Приборский	1661	58	46	1561	367	10	8	357
Бобовичский	3293	2000	45	1257	521	301	88	220
Поколюбичский	5842	1196	21	3830	1009	581	460	428
Чкаловский	1353	26	17	1042	297	250	206	47
Всего по р-ну	50774	6425	525	37323	10277	4256	4001	6021

Пред. Гомельского Райисполкома

ДЗЯРЖАЎНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПА РАЁНЕ

1944 г.

Учтено семей военнослужащих и партизан — 5233
Получает пособие 1903 семьи, которым выплачено 805 274 р.
Получает пенсию 257 семей
Выдана одежда 73 семьям
Построено домов семьям военнослужащих и партизан — 385.
Учтено детей сирот военнослужащих и партизан — 164.
Инвалидов Отечественной войны по району — 205 человек.
Создано первичных организаций ОСО — 17, в них членов — 350 человек.
Обучается в кружках ПЗХО — 900 человек.
Создан кружок по подготовке ворошиловских стрелков, в котором обучается 20 человек.

РАБОТА ЧЫРВОНАГА КРЫЖА

1944 г.

Создано по району 23 первичные организации Красного Креста, в которых 614 человек.
Организовано 4 кружка БГСО
4 кружка ГСО
Охвачено военным обучением в средних школах — 440 человек
в НСШ — 2009 человек
в начальных шк. — 2568 человек
ФЗО — 161 человек

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 5. Л. 13—14.

З ДАВЕДКІ ДЫРЭКЦЫІ НАВАБЕЛІЦКАГА ФАНЕРНА-ЗАПАЛКАВАГА КАМБІНАТА Ў ЦК КП(б)Б АБ ЗАХОЎВАННІ Ў ЧАС НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ РАБОТНІКАМІ ПАЖАРНАЙ АХОВЫ КАМБІНАТА ФОСФАРУ

В 1941 г., в июле месяце, работники пожарно-сторожевой охраны Ново-Белицкого фанерно-спичечного комбината Добровольский Андрей Данилович, Добровольский Захар Данилович, Самусенко Федор, Титков Яков, Самусенко Тит и еще 4 товарища, фамилии которых не установлены, под руководством начальника пожарной охраны комбината Юделевича А.И., по распоряжению директора комбината т. Симановича ночью перевезли через озеро на остров фосфор в 10-килограммовых банках, там же на острове его зарыли. За три ночи было перевезено и зарыто на острове 465 банок красного фосфора.

С приходом Красной Армии А.Д.Добровольский рассказал директору фабрики Михину, что на острове зарыт фосфор.

Было изъято из земли и доставлено на фабрику 465 банок общим весом 4650 кг красного фосфора.

Этого количества фосфора хватит на изготовление 200 тыс. ящиков спичек, или 20 миллионов коробочек. Спичечная фабрика обеспечена фосфором на целый год работы.

Примечание: Добровольский А.Д., 1893 г. рождения, с 13 лет, т.е. с 1905 г. до 1937 г., работал рабочим на фабрике. В 1937 г. был переведен в пожарную охрану комбината, где работал до оккупации, во время которой ушел в д. Севрюки Гомельского района, занимался сельским хозяйством.

Справка составлена на основании опроса Добровольского. Тов. Эйдинов [сакратар ЦК КП(б)Б] беседовал с ним, производит впечатление честного старика.

Подробности везет тов. Эйдинов.
Передал тов. Матузов 12.1.44 г.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 29. Спр. 10. Л. 26.

Падрыхтаваў да друку У.І.Лемяшонак.

СПРАВАЗДАЧА АБ ВЫКАНАННІ ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б І СНК БССР АБ АДНАЎЛЕННІ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ ПА ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ

Гомельский район Красная Армия освободила от немецко-фашистских захватчиков: одну часть, т.е. 7 сельсоветов 10—12 октября 1943 г., вторую часть, т.е. 13 сельсоветов 25—27 ноября 1943 г. Райкомом КП(б)Б до 1 декабря 1943 г. были восстановлены все 20 сельсоветов района и до 15 декабря 1943 г. было выделено из актива колхозов 53 председателя колхозов.

На основе широко развернутой политической работы РК КП(б)Б с 15 декабря 1943 г. начали проводить организационно-хозяйственную работу по восстановлению колхозов, школ, клубов, читален, помощь Красной Армии и пострадавшему населению района, проведены следующие мероприятия:

Восстановление колхозов.

До 25 февраля 1944 г. были закончены выборы председателей, членов правления колхозов, председателей ревизионных комиссий. Председателями колхозов избрано 55 человек. Из них членов ВКП(б)Б — 2, беспартийных — 53 человека. По опыту работы впервые избрано 46 человек, раньше работало 9 человек.

До 15 марта 1944 г. были подобраны и утверждены на заседании правления колхозов 126 человек бригадирами. По 2-м колхозам, Шерстовка Приборского с/с, им. Калинина Кормянского с/с, бригадиры не подбирались по малонаселенности колхозов, имеющих по 15—18 хозяйств. Примерный устав сельхозартели обсужден. Во всех колхозах района до 1 апреля приняты необходимые добавления, вытекающие из местных условий, направленные на организованное хозяйственное укрепление колхозов. Во время обсуждения устава сельхозартели 56 хозяйств единоличных вступили в колхозы.

По учету инвентаря, рабочего и продуктивного скота и другого сельскохозяйственного имущества:

а) колхозных лошадей всего 1220.
б) крупного рогатого скота колхозников.
в) коров продуктивных — 1650 гол.
г) волов — 4 гол.
д) молодняка — 376 гол.
е) — 87 гол.
ж) быков-производителей — 12 гол.
з) овец — 37 гол.
и) свиней — 132 гол.
к) птице-кур — 570 гол.
л) водоплавающей птицы в районе нет.

Инвентарь:
а) сеялок - 13,
б) тракторов — нет,
в) веялок — 51,
г) сортировок — 20,
д) молотилок — 15,
е) жаток — 21,
ж) косилок — 30.

Для ремонта инвентаря организовано 17 кузниц. Из лучших колхозников подобрано во всех колхозах 55 счетоводов, из них проводят заочное обучение 33 человека.

К весеннему севу были собраны лошади по всем колхозам и поставлены в колхозные конюшни.

Корм собирался среди колхозников согласно установки РайЗо и решения правления и общего схода колхозников. Было собрано грубых кормов 346 ц., концентратов — 137 ц.

После восстановления земельными комиссиями межколхозных границ в 55 колхозах и приусадебных участков по району.

Общая площадь земли следующая: Всего 61 329 га, в том числе:

пашни — 21 655 га
сенокоса — 17 014 га
сада — 752 га
леса — 3847 га
неугодий, выпасов, оврагов и т.д. — 7116 га.
Из общего количества озимых посевов — 453 га
пара — 4500 га
весенний сев — 9200 га
подсобных хоз. — 3423 га

По восстановлению животноводческих ферм продолжена следующая работа. В районе восстановлены и работают 2 вет. лечебницы: Гомельская и Новобелицкая. Документов о принятии скота от колхозников оказалось на 100 штук крупного рогатого скота и 50 овец, которые находятся в Ульяновской области. По линии завоза скота получено из восточных областей СССР 62 лошади, которые распределены по колхозам. Контрактация скота проходит явно неудовлетворительно. Крупного рогатого скота-телок план 820, законтрактировано — 288

овцы-ягнята — 10, выполнено 5
свиней — 100, выполнено нет

Изъято незаконно приобретенного во время оккупации крупного рогатого скота 13 голов. Намечено сдать к 15 июня 5 МТС. По восстановлению птицеводческих ферм доведен план по колхозам на 8150 штук и водоплавающей птицы на 2300 штук. Отсутствие корма и помещения не дали возможности провести эту работу. Для развития рыболовства в районе подготавливается 2 пруда в Дятловичском и Титенском сельских советах. Ведется работа по выявлению прудов по другим сельским советам.

Ход весеннего сева по району на 1.4.44 г.
Общий план зерновых 9200, выполнено 6235, или 68%.
картофеля по плану 2400, выполнено 1082.
колосовых по плану 4452, выполнено 4853, или 101%.
Обработка земли из плана сева:
1. Тракторами 1975 га.
2. Лошадьми 3109 га.
3. Коровами 54 га.
4. Лопатами 1086 га.
Всего: 6235 га.

На общих собраниях колхозников до выхода в поле по весеннему севу были разработаны и утверждены нормы выработки и расценки трудодня по каждому колхозу в отдельности как людской, так и тягловой силы в соответствии с уставом сельхозартели.

По плану зимней учебы по колхозам кадров нами проведена следующая работа:

а) подготовлено бригадиров полевых бригад: план	— 50,	подг. — 10
б) звеньевых	— 20,	— 10
в) колхозных счетоводов	— 30,	— 26
г) садоводов	— 50,	— 26
д) старших конюхов	— 30,	— 26
е) заведующих животноводческих ферм	— 30,	— 26
ж) председателей колхозов	— 30,	— 16

Учеба колхозных кадров продолжается и в настоящее время, где учится заочно 33 человека колхозных счетоводов. Приходно-расходные сметы составлены только в 17 колхозах из 55. Это объясняется неопытностью колхозных счетоводов и отсутствием в РайЗо инструктора-бухгалтера, который нами уже подобран.

Колхозное строительство:
1. Конюшен построено новых — 3
2. Отремонтировано старых конюшен — 8
3. Приспособленных — 15
4. Не отремонтировано — 6
5. Надо поставить — 23

Коровников:
1. Отремонтировано старых — 2

2. Приспособленных — 4
3. Требует ремонта — 6
Свинарников:
1. Отремонтировано — 1
2. Требуют ремонта — 2
Овчарников:
1. Отремонтировано — 5
Телятников:
1. Отремонтировано — 2
2. Требуют ремонта — 2
Птичников приспособленных — 3

Строительство колхозных построек продолжается с тем расчетом, чтобы обеспечить весь скот, закупленный у колхозников, законтрактованный и завезенный с восточных областей Союза.

МТС в районе — 2
Всего имеется тракторов — 39 шт.
Из них АТЗ — 3 шт.
ХТЗ — 12 шт.
СТЗ — 14 шт.
У-2 — 10 шт.

План весенних тракторных работ по Гомельскому МТС на 1.6.1944 г. — 1803 га, выполнено 875 га. По Новобелицкому — по плану —833 га, выполнено — 1100 га.

З ДАВЕДКІ НАРКАМАТА ЗЕМЛЯРОБСТВА БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ ПАДАРУНКАХ, ЯКІЯ ПАСТУПІЛІ З УЗБЕКІСТАНА

Лошадей — 150
Сена — 2 платформы
Ячменя — 660 центнеров

Тракторов «Нати» — 7 шт., ЧТЗ — 3 шт., к тракторам выданы лимитные книжки на получение горючего из воинских частей на весь период весеннего сева.

Кроме того, прибыла бригада строителей в количестве 45 человек, которые имеют при себе весь столярный и плотничий инструмент и будут работать в республике на протяжении всего летнего периода.

Эшелон сопровождают: представитель ЦК КП(б) Узбекистана тов. Рамазанов и представитель Средне-Азиатского военного округа — Герой Советского Союза майор тов. Савуленко.

В настоящее время эшелон находится на станции Ипуть — в 3-х километрах от г. Гомеля.

Народный Комиссар земледелия Белорусской ССР И.Крупеня.

8 мая 1944 г.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 29. Спр. 70. Л. 187.
Падрыхтаваў да друку У.І.Лемяшонак.

АБ ПАБУДОВЕ ЖЫЛЫХ ДАМОЎ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА, ЯКОЕ ПРАЖЫВАЛА Ў ЗЯМЛЯНКАХ

После освобождения района от немецко-фашистских захватчиков в колхозах и селах района построено: 4273 жилых домов, в т.ч. в 1948 г. 224 дома, 472 животноводческих и хозяйственных построек, 92 культурно-бытовых зданий. Из землянок в новые дома переселено 12 536 человек.

На 11 октября 1948 г. проживает в землянках 102 семьи, из них 37 семей не имеет средств. Программа строительства в 1948 г. не выполнена.

Поколюбичский с/с почти не построил ни одного дома, а также хозяйственных и животноводческих построек.

Многие парторганизации и сельсоветы, пользуясь бесконтрольностью и отсутствием требовательности со стороны РК КП(б)Б и райисполкома, стали относиться к строительству, как к сезонному делу, рассчитывая наверстать упущенное методом штурмовщины. Последние не учитывают, что в землянках проживают главным образом семьи погибших воинов и партизаны, инвалиды Отечественной войны и сироты, которые без помощи не могут построить себе дома.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 2. Спр. 33. Л. 190.

АБ ССЯЛЕННІ ХУТАРОЎ І ДРОБНЫХ ПАСЁЛКАЎ У КАЛГАСНЫЯ ЦЭНТРЫ

1948 г.

Учитывая, что во время немецкой оккупации самовольно возводились постройки по месту нахождения бывшего хутора Гриневич на территории колхоза «Чырвоны працаўнік», на землях Гослесфонда — Чабров, на территории Ленинского опытного лесхоза — Осадченко, на землях колхоза Калинина Приборского с/с, выселок — 6 дворов на землях колхоза им. Горького Давыдовского с/с, одиночно уцелевшие дома на уничтоженных немецко-фашистскими захватчиками поселках: Подбуглак Бобовичского с/с, «Межи» Карналинского с/с и мелкие поселки в 10 дворов: Черничье, Красная Долина, Гаражанное и Стенька Разин, расположенных от основных производственно-хозяйственных центров колхозов на расстоянии 2—4 км.

Сселить в колхозные центры 51 хозяйство, хутора и отдельно стоящие постройки и поселок Черничье.

Оказывать всемерную помощь при переселении и отводить земли под постройки, а также обеспечивать гвоздями, стеклом, кредитом в размере 1000 руб. на хозяйство, выделить стройлес из расчета 15м² на хозяйство.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобл. Ф. 205. Воп. 2. Спр. 33. Л. 74—75.

СПІС ПАСЯЛКОВЫХ І ХУТАРСКІХ ГАСПАДАРАК, ЯКІЯ ПАДЛЯГАЛІ ССЯЛЕННЮ Ў КАЛГАСНЫЯ ЦЭНТРЫ ПА ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ

НАМЕЧЕНО К ПЕРЕСЕЛЕНИЮ	НАЗВАНИЕ КОЛХОЗА
Гриневич (хутор)(1хоз-во)	Чырвоны працаўнік д. Волотова
Осадченко (сруб) (1 хоз-во)	им. Калинина Приборского с/с
пос. Черничье (6 хозяйств)	Чырвоны герой д. Ст. Дятловичи
пос. Стенька Разин (12 хоз.)	им. Чкалова д. Чкалово
пос. Красная Долина (7 хоз.)	Чырвоны партызан Новые Дятловичы
пос. Горожанное (10 хоз.)	1-е жніўня д. Михальки
Выселок (6 хозяйств)	им. Горького д. Давыдовка
Чабров хутор (1 хоз.)	Ленинский опыт. лесхоз, д. Старые Терешковичи
пос. Подбуглак (хутор) (1 хоз.)	Большевик д. Бобовичи
пос. Межи (6 хоз.)	подс. хоз-во Межи д. Белый Берег

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобл. Ф. 205. Воп. 2. Спр. 33. Л. 89.

СТАН ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ Ў КАЛГАСАХ РАЁНА

1949 г.

Наряду с некоторыми положительными результатами работы по увеличению поголовья скота и повышению его продуктивности, общественное животноводство в колхозах района продолжает оставаться самой отсталой отраслью сельского хозяйства.

При выполнении государственного плана по выходному поголовью крупного рогатого скота, лошадей, овец план развития свиноводства, птицеводства, маточного поголовья всех видов продуктивного скота не выполнен.

Государственный план развития общественного животноводства в колхозах района за 1949 г. выполнен: по лошадям на 111,8%, по крупному рогатому скоту на 101,3%, по рабочим волам — на 92%, по свиньям — на 79,2%, по овцам — на 107,1%.

Рост общественного скота в колхозах за 1948 год составляет лошадей — 48,6%, крупного рогатого скота — 76,8%, свиней —59,1%, овец — 78%. 3 колхоза не имеют свиноводческих ферм, 3 колхоза не имеют птицеводческих ферм, а 13 колхозов имеют птицефермы с очень малым поголовьем птиц — от 30 до 62-х голов. Имеют маточного поголовья по коровам всего 4 колхоза, по свиноматкам 5 колхозов, по овце и козоматкам — 11 колхозов.

Такое неудовлетворительное состояние общественного животноводства в колхозах района наряду с низким выходом молодняка имеет место чрезмерно большой падеж, а также разбазаривание скота на внутрихозяйственные нужды.

Несмотря на большое недоукомплектование животноводческих ферм маточным поголовьем в колхозах имеют место факты продажи, сдачи государству и обмена продуктивного скота в личное пользование колхозников взамен непродуктивного скота.

На внутренние нужды в колхозах района разбазарено и расходовано: крупного рогатого скота 607 голов, свиней — 893 гол., овец —549 гол.

В колхозах района все еще плохо организован уход за скотом, обезличка, неправильное кормление и содержание скота, несоблюдение простейших ветеринарно-зоотехнических правил и отсутствие на многих животноводческих фермах правильной организации труда. Из-за недостатка общественных животноводческих помещений, в особенности свинарников, птичников, что не дает возможности правильного выращивания молодняка, чем тормозит рост общественного животноводства.

Главной причиной неудовлетворительного состояния животноводства является то, что отдел сельского хозяйства, правления колхозов, сельсоветы и первичные парторганизации недостаточно уделяют внимания делу развития общественного животноводства.

Протоколы заседаний бюро РК КП(б)Б №№3—21.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 8. Л. 134—135.

З ПРАТАКОЛА СХОДУ ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА

1949 г.

... В районе имеется 21 электрифицированный колхоз с круглосуточной подачей энергии, но использование ее для животноводства применяется только в 3-х колхозах («Чырвоны хлебароб», «Чырвоны працаўнік», «Чырвонагвардзеец»).

... Колхоз «Чырвоны працаўнік» (председатель Ковалева) уже с осени будет применять доильный аппарат. В 1950 г. будет закончена электрификация всех колхозов района и механизированы трудоемкие работы.

В результате плохой организации труда на фермах и плохого ухода за скотом за 8 месяцев текущего года в колхозах района пало 124 лошади, 129 голов крупного рогатого скота, 230 свиней, 267 овец.

Почти половина колхозного скота не обеспечена помещениями. План строительства животноводческих построек выполнен на 50%.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 10. Л. 41, 46.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ БЮРО ГОМЕЛЬСКАГА РК КП(Б)Б АБ АБ'ЯДНАННІ КАЛГАСАЎ

1950 г.

Колхозы: им. Ленина, «Новинки», «Челюскинец» Поколюбичского с/с, «Шлях да сацыялізму», «Чырвоны працаўнік» Прудковского с/с объединить в колхоз им. Ленина.

Колхозы: им. Молотова, Буденного, Суворова Урицкого с/с, «1 Мая» Титенского с/с и «Авангард» Мельчанского с/с объединить в колхоз им. Молотова.

Колхозы: «Чырвоны хлебароб», «Сталинец», «Интернационал» Еременского с/с и «Правда» Прудковского с/с — в колхоз им. Сталина.

Колхозы: «Чырвоная зорька», «Чырвоная воля» и «Клим Ворошилов» Улуковского с/с объединить в колхоз им. Ворошилова.

Колхозы: им. Хрущева, «Чырвоны будаўнік», им. Калинина и Щербовка Прибытковского с/с — в колхоз им. Хрущева.

Колхозы: «За Родину», «Чырвоная Уза» и «Чырвоны кастрычнік» Давыдовского с/с объединить в колхоз «За Родину».

Колхозы: «Большевик», «Полесская Правда» Бобовичского с/с, им. Чкалова — в колхоз «Большевик».

Колхозы: им. Сталина, «1-га жніўня» Михальковского с/с и «Пионер» Карнилинского с/с — в колхоз им. Маленкова.

Колхозы: «Чырвоны герой» и «Чырвоны партызан» Дятловичского с/с объединить в колхоз им. Жданова.

Колхозы: «Чырвоны пуцілавец», «1 Мая», «6-й съезд Советов» Зябровского с/с — «1 Мая».

Колхозы: «Пролетарий», им. Кирова, Куйбышева Прибытковского с/с, «Перамога»,»Новая жизнь» Климовского с/с — в колхоз им. Кирова.

Колхозы: «Коммунар», «Кооператор», «Искры», им. Чапаева, «Чырвоны боец» Терешковичского с/с — колхоз «Коммунар».

Колхозы: «Комсомол Гомельщины», «Ударник обороны», им. Сталина Романовичского с/с — в колхоз «Комсомол Гомельщины».

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 8. Спр. 7. Л. 28.

З ГІСТОРЫІ РАЗВІЦЦЯ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ

1943 г.

1010 детей школьного возраста не охвачено учебой. Полностью не укомплектованы школы педагогическими кадрами. Не все дети сироты взяты под патронаж. Избы-читальни не работают.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 3. Л. 29.

1944/45 навучальны год

Школьные здания отремонтированы. В р-не работает 63 школы, из них средних 1, неполных средних 14, начальных 48. В школах обучается 7903 человека.

Имеются факты неполного охвата школой детей школьного возраста, в пос. Гроза — 7 чел., в дер. Лопатино — 15 чел. Школы не обеспечены топливом.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 2. Спр. 3. Л. 192.

1945 г.

По району проведен учет детей, подлежащих всеобучу — 8530 чел. Школы укомплектованы учительскими кадрами не полностью. Кол-во учителей 326 чел.

Полностью подготовлены к новому учебному году 6 школ: Приборская, Прибытковская, Улуковская, Урицкая, Брилевская, Залипская и 25 начальных школ.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 23. Л. 64.

При средних и семилетних школах организовать опытные земельные участки размером до 0,25 га для питомника, разрабатывания исследовательской работы по огородничеству, полеводству силами учащихся и учителей.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 45. Л. 210.

1946 г.

Подготовка школ к новому учебному году проходит крайне неудовлетворительно. Из 65 школ ремонт закончен в 50, из которых в 30 не остеклены окна. Во многих школах отсутствует топливо. Не организована проверка детей школьного возраста, что привело к большой запутанности и отсутствию точного учета. Преподавательский состав недоукомплектован на 22 человека.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 46. Л. 23.

1948/49 навучальны год

Школы работали в более благоприятных материальных условиях. Были открыты новые семилетние школы в д. Михальки и Чкалово. Всего взято на учет 10 793 уч-ся. Перед началом учебного года все школы были укомплектованы учащимися и педагогическими кадрами. Всего в р-не работает 38 начальных, 25 семилетних и 2 средние школы. Кроме того работала одна СШ рабочей молодежи и три школы сельской молодежи с количеством учащихся 221 человек. Увеличился и качественно улучшился педагогический состав. Из 475 учителей, работающих в р-не, не имеют соответствующего образования 57 человек, из которых почти все охвачены заочным обучением. Качественно улучшилась учебно-воспитательная работа в школах. Однако имеется и ряд недостатков. 21 школа находится в наемных помещениях, не отвечающих элементарным требованиям школьной работы. Почти все школы района не имеют учебных кабинетов и лабораторных комнат, отсутствует достаточное количество наглядных пособий, недостает географических и исторических карт. Стандарт-

ной мебелью обеспечены только на 75%. Школы р-на неудовлетворительно снабжались топливом. Положение закона о всеобуче не контролируется.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 8. Л. 106–107.

1949 г.

Ереминский детский дом. Работа улучшилась. Подсобное хозяйство детского дома почти полностью обеспечило свои нужды картофелем и овощами. Воспитанники обеспечены верхней и нижней одеждой. Помещение чистое. Дети здоровые. Попечительский совет изыскал дополнительные средства на культурные нужды детей в сумме 3000 руб., за которые куплена библиотека, радиоприемник, фильмоскоп (100 фильмов) и учебники для детей. Силами шефов перевезено 100 т торфа для детского дома. Все воспитанники охвачены кружковой работой. Работают кружки: хоровой, физкультурный, танцевальный, струнный, рукодельный, авиамоделизма, юннатов. Воспитанники детдома на областном худ. смотре самодеятельности заняли одно из лучших мест и были премированы.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 8. Л. 237.

З ДЗЁННІКАВЫХ ЗАПІСАЎ ЗАСЛУЖАНАГА НАСТАЎНІКА БЕЛАРУСІ С.Ц.ПІГУЛЕЎСКАГА

5.8.1946 г.

Сегодня приступаем к ремонту здания школы. С чего начать? Что одеть? Военную гимнастерку и кирзовые сапоги. Нет вам пока отдыха. Да! В них будет лучше. Во-первых, дело буду иметь с военнопленными. Мое военное обмундирование на них будет влиять психологически. Во-вторых, труд у меня сегодня физический, пыльный, — рассуждал я. Пошагал в лагерь военнопленных на Первый поселок торфозавода. В лагере длинные каркасно-засыпные бараки. Возле них построение пленных. Бригады уходят на сушку торфа. Сформирована и наша бригада для ремонта здания школы. В бригаде 14 человек. Учитель Шевцов М.А. пришел мне на помощь. Карабин и патроны я получил. Росписи свои в специальных журналах оставил за количество пленных и оружие.

Колонной по два привели военнопленных в здание школы. Большая часть стойматериалов мною уже была заготовлена. Прораб Макаренко передал мне необходимый инструмент.

Ремонт начали.

Пять человек строгали доски, размеряли. Они ответственны за настил полов.

Вторая группа разбирала кирпич в оконных проемах, переносила его к грубкам, вела перекладку их.

Третья группа ремонтировала каркасные стены: укладывала и прибивала дощечки, засыпала тырсу.

Два человека поставлены ремонтировать крышу: покрывали рубероидом.

Нет пока стекла. Двух человек поставил изготавливать оконные рамы.

Пленные разошлись по классным комнатам. Молотки стучат, как дятлы, жужжат пилы, протяжно шаркают рубанки...

На душе у меня радость, удовлетворение. Ремонт идет! Но и беспокойство! Удрать пленному при желании есть большие возможности. Они работают в пяти комнатах и ремонтируют стены снаружи, ремонтируют крышу.

— Степан Тимофеевич! Убегут фрицы от нас, — с тревогой говорит учитель Шевцов. — Надо ставить караулить больше людей.

— Где их взять? Надо зорче за ними смотреть, караулить. Другого выхода нет. Никто нам на заводе для усиления охраны пленных людей не даст, потому что их нет.

Вечером отвели пленных в лагерь и сдали по списку.

***

Так мы работали по ремонту здания школы до 20.8.1946 г. Каждое утро я ходил в лагерь военнопленных на Первый поселок торфозавода, принимал пленных, приводил, караулил вместе с Шевцовым, вечером отводил в лагерь, сдавал. Руководил ремонтными работами. Директор торфозавода Петриковец М.Я. добился на стекольном заводе бракованного стекла.

За это время напряженного труда сделали:

1. Крышу отремонтировали.
2. Полы настелили.
3. Фундамент здания подкрепили.
4. Стены каркасно-засыпанные починили.
5. Оконные рамы сделали и застеклили.
6. Грубки отопительной системы починили, кое-где переложили.

Ліквідацыя наступстваў Чарнобыльскай катастрофы

Па маштабах, складанасці і доўгачасовых наступствах Чарнобыльская катастрофа з'яўляецца самай буйной за ўсю гісторыю выкарыстання атамнай энергіі. Найбольш цяжкі ўдар яе прыйшоўся на Беларускае Палессе і Падняпроўе — гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны з багатай гісторыка-культурнай спадчынай. Чарнобыльскі попел пасыпаў і тэрыторыю Гомельскага раёна. У асноўным адбылося забруджванне яе цэзіем-137 (94 населеныя пункты са 190 забруджаны радыенуклідамі). Радыяцыйная абстаноўка на тэрыторыі раёна абумоўлена забруджваннем глебы і характарызуецца наступнымі ўзроўнямі:

1—5 Кі/км² (83 вёскі з насельніцтвам больш за 37,5 тыс.жыхароў);

5—15 Кі/км² (11 вёсак з насельніцтвам больш за 37,2 тыс. жыхароў).

Катастрофа на ЧАЭС прынесла людзям гора і пакуты, рэальную пагрозу іх здароўю, асабліва дзецям, якіх цяпер на забруджанай тэрыторыі пражывае больш за 10 тысяч. Пасля аварыі прайшло 10 гадоў, але па-ранейшаму востра стаяць эканамічныя і сацыяльныя праблемы ліквідацыі яе наступстваў, якія патрабуюць вялікіх фінансавых і матэрыяльных выдаткаў.

У першыя гады пасля Чарнобыльскай катастрофы ў раёне прымаліся меры па сацыяльнай абароне людзей. На першым плане было адсяленне людзей з забруджанай тэрыторыі і ўладкаванне іх на новым месцы. Толькі за 8 гадоў пасля аварыі для эвакуіраваных з зоны адсялення было пабудавана 15 пасёлкаў на 1228 кватэр, у якія засяліліся 1033 сям'і (2588 чалавек). У будаўніцтве жылля для перасяленцаў прымалі ўдзел будаўнічыя арганізацыі з Маладзечна, Слуцка, Жодзіна, Мазыра, Мінска і Гомеля. Іх намаганнямі былі пабудаваны жылыя дамы сядзібнага тыпу ў многіх вёсках раёна — Макаўе (50), Маркавічы (96), Цераха (48), Аздзеліна (51), Рагі (44), Міхалькі (50) і інш.

У пасёлках добраўпарадкаваны і заасфальтаваны дарогі, пабудаваны інжынерныя сеткі водазабеспячэння і каналізацыі з ачышчальнымі збудаваннямі. Большасць пасёлкаў газіфікавана. За

Будынак раённай паліклінікі.

1986—1994 гг. у раёне ўведзены ў эксплуатацыю больш за 175 км газаправодаў, якія будаваліся ў асноўным за сродкі, выдзеленыя на ліквідацыю наступстваў аварыі на ЧАЭС. За кошт гэтых сродкаў будаваліся аб'екты сацыяльнага і культурна-бытавога прызначэння. Пабудаваны школы ў вёсках Даўгалессе, Чарацянка, Чкалава і іншых населеных пунктах больш як на 1400 месцаў, дзіцячыя установы на 1130 месцаў, дзіцячы дом у в. Церуха на 280 месцаў, а таксама аб'екты гандлю і аховы здароўя.

Важнае значэнне ў чарнобыльскія гады набылі пытанні медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, найперш дзяцей. Медыцынскім абслугоўваннем і кантролем за станам здароўя пацярпелых займаецца медыцынскі персанал раённай і 7 участковых бальніц, 11 урачэбных амбулаторый, 38 фельчарска-акушэрскіх пунктаў.

Аднак прымаемыя меры па ліквідацыі наступстваў катастрофы асаблівага аптымізму не выклікаюць. Адна з праблем, якая ўзнікла ў апошнія гады, — скарачэнне або адсутнасць фінансавання. Па гэтай прычыне ўзвядзенне часткі аб'ектаў сацыяльнага і культурна-бытавога прызначэння закансервавана. Гэта, у сваю чаргу, адмоўна адбілася на вырашэнні сацыяльных пытанняў. Другая і асноўная праблема — стан здароўя насельніцтва, найперш дзяцей.

Супрацоўнікі Рэспубліканскага цэнтра радыяцыйнага кантролю Галоўгідрамета заявілі, што за дзесяць гадоў пасля катастрофы цэзій паўсюдна распаўся (у вадзе, паветры, глебе) на 20%.[1] За гэтыя гады на Гомельшчыне павялічылася колькасць людзей, у тым ліку і дзяцей, з цяжкімі захворваннямі.

Гомельскі раён у гэтым сэнсе лічыцца адносна добрым. Медыцынскімі ўстановамі была зроблена класіфікацыя насельніцтва раёна па групах першаснага ўліку. Да 1-й групы былі аднесены ліквідатары (1300 чалавек), 2-й — эвакуіраваныя з зоны адчужэння (537 чалавек), 3-й — перасяленцы з зоны першачарговага і наступнага адсялення (1446 чалавек), 4-й — дзеці, якія былі народжаны пасля 1986 г. (382 чалавекі), 5-й — насельніцтва, якое пражывае на тэрыторыі з узроўнем радыяцыйнага забруджвання 1—5 Кі/км² і вышэй (44 733 чалавекі).

На ўліку ў Дзяржрэгістры 3665 чалавек. Усе яны, згодна з загадам Міністэрства аховы здароўя № 102 ад 1992 г., павінны штогод праходзіць медыцынскі агляд. Аналіз, праведзены супрацоўнікамі Гомельскага філіяла НДІ радыяцыйнай медыцыны і абласнога Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, сведчыць, што ў 1989—1994 гг. паказчыкі захворванняў сярод дзяцей і дарослых у Гомельскім раёне практычна не змяніліся. Не змянілася і структура захворванняў. Найбольшую ўдзельную вагу маюць захворванні органаў дыхання (у 1994 г. больш за 60% у дзяцей і 38,5% у дарослых)[2].

Паказчыкі захворванняў насельніцтва (на 100 тыс. чалавек)

	1985	1990	1995
Туберкулёз	46,6	46,5	67,4
Злаякасныя новаўтварэнні	206,0	226,2	371,5
Рак шчытападобнай залозы	0	6,2	10,3
Інфаркт міякарда	12,4	23,7	32,4
Прыроджаныя анамаліі	15,7	20,2	38,9

Значна ўзрос і паказчык агульнай смяротнасці. Калі ў 1984 г. на 1000 чалавек насельніцтва складаў 11,6, у 1990 г. — 13,4, то ў 1995 г. — 16,6. У той жа час нараджальнасць знізілася з 18,5 у 1985 г. да 8,3 у 1995 г. Калі ў 1995 г. натуральны прырост насельніцтва складаў 5,9, то ў 1995 г. ён быў адмоўны і склаў 3,3. Такім чынам, смяротнасць у раёне перавышае нараджальнасць. Такая неспрыяльная тэндэнцыя назіраецца ў большасці раёнаў Гомельскай вобласці. Найбольшую ўдзельную вагу ў структуры смяротнасці складаюць захворванні сістэмы кровазвароту, органаў дыхання, новаўтварэнні і інш. Разам з тым нельга катэгарычна сцвярджаць, што рост захворванняў і смяротнасці звязаны толькі з радыяцыяй, як і нельга адмаўляць яе ўплыў на пагаршэнне стану здароўя насельніцтва і яго смяротнасць.

На працягу чарнобыльскага дзесяцігоддзя шмат зроблена па вырашэнні сацыяльных пытанняў насельніцтва, якое

[1] Звязда. 1996. 10 крас.
[2] Чернобыль: экология и здоровье. Гомель. 1996. № 1. С. 30—34.

пацярпела ад катастрофы, аздараўленні дзяцей. Аднак становішча ў сацыяльнай сферы, якую таксама ахапіў крызіс, застаецца складаным і непрадказальным. У рабоце медыцынскіх устаноў раёна ўзнікла нямала складанасцей і праблем, звязаных з фінансаваннем і развіццём іх матэрыяльнай базы, набыццём новага абсталявання і медыкаментаў.

Трэба памятаць, што без рашучых, мэтанакіраваных дзеянняў па ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы, без стварэння належных умоў для выжывання людзей нельга будзе захаваць генафонд беларускай нацыі.

М.Н.Мурашка.

Каранёўская эксперыментальная база Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Створана ў 1993 г. на базе Ленінскага доследнага лясгаса Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі (з 1993 г. Інстытут лесу НАН Беларусі). Размешчана ў паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі на тэрыторыі Гомельскага (95,3% плошчы) і часткова Добрушскага (4,7%) адміністрацыйных раёнаў у пас. Каранёўка Гомельскага раёна. Займае плошчу 12,5 тысячы га, у яе склад уваходзяць два лясніцтвы: Каранёўскае і Чонкаўскае. Лясы эксперыментальнай базы адносяцца да Палеска-Прыдняпроўскай геабатанічнай акругі падзоны шыракаліста-хваёвых лясоў. Да 1936 г. лясы ўваходзілі ў склад Ленінскага лесаўчастка Гомельскага леспрамгаса, у 1936 г. арганізавана Ленінскае лясніцтва пры Гомельскім лясгасе. З 1945 г. Ленінскі доследны лясгас пры БелНДІ лясной гаспадаркі, з 1953 г. па 1959 г. — Ленінскае лясніцтва Гомельскага лясгаса, з 1967 г. Ленінская эксперыментальная база БелНДІ лясной гаспадаркі.

Тэрыторыя масіву да нацыяналізацыі дзялілася на дачы Каранёўскую, Каранёўска-фальварковую, Зябраўскую, Шчакатоўскую, Горкі і ўяўляла сабой участкі былых прыватнаўласніцкіх лясоў, у якіх вяліся высечкі спелых і перастойных насаджэнняў.

У 1864 г. была ўладкавана Каранёўская дача са штогадовай лесасекай. У 1870 г. — Зябраўская, у 1904—1905 гг. усе дачы ўладкаваны на манер лесагадоўлі ў Германіі. Да 1914 г. ствараліся штучным шляхам насаджэнні ў Каранёўскай і Шчакатоўскай дачах, якія і цяпер знаходзяцца ў добрым стане.

У праекце арганізацыі лясной гаспадаркі Каранёўскай дачы 1922 г., які захаваўся да гэтага часу, адзначана, што з моманту нацыяналізацыі лясоў вядзенне гаспадаркі пагоршылася: пры адвядзенні лесасек не выконвалася форма, іх напрамак; лесасекі былі захламлены, што садзейнічала зніжэнню натуральнага аднаўлення і стварала неспрыяльныя пажарныя ўмовы. З 1924 г. у насаджэннях праводзіліся высечкі догляду, падсочка насаджэнняў, ствараліся лясныя культуры, г. зн. вядзенне лясной гаспадаркі паступова пачало паляпшацца, з'явіўся дзяржаўны клопат за лес, пра што сведчаць запісы ў матэрыялах лесаўладкавання.

Аднак у лесе пераважала ручная праца. Асноўнымі прыладамі на лесасецы былі двухручная піла, сякера. Конь выкарыстоўваўся як транспартны сродак на тралёўцы і вывазцы драўніны. Асноўнай задачай лясной аховы таго часу было забеспячэнне драўнінай мясцовага насельніцтва. Было б неаб'ектыўна не сказаць добрага слова пра тых, хто жыў і працаваў тут. Адзінокая старожка на лясной паляне, газавая лямпа, натуральная гаспадарка, якая, як правіла, не забяспечвала вялікую сям'ю лесніка, — вось тыповы быт даглядчыкаў лесу таго часу. Жыць і працаваць у гэтых умовах згаджаліся сапраўды энтузіясты, адданыя лесу. Гэта Р.Я.Старавойтаў, І.С.Федарцоў, Е.С.Салодкі, Н.Е.Салодкі, І.Р.Каралёў, В.П.Рудаў, І.Я.Тышчук.

У 1898 г. Каранёўскую лясную дачу аглядаў прафесар лясной таксацыі Пецярбургскага ляснога інстытута Пётр Мікалаевіч Вярэха (1838—1917), пасля чаго былі ўстаноўлены памеры штогадовых высечак па лясной гаспадарцы, якой і прытрымліваліся да чарговага лесаўладкавання.

Заснаванне Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі ў

1930 г. з'явілася важным этапам арганізацыі лясной доследнай справы на тэрыторыі Каранёўскай і Шчакатоўскай дач. У 1930-я гады праводзіліся даследаванні па водаахоўнай ролі лесу, распрацоўцы лесаводчых, тэхналагічных асноў арганізацыі і вядзення лясной гаспадаркі, натуральным аднаўленні высечак, распрацоўцы агратэхнікі вырошчвання пасадачнага матэрыялу і лясных культур, тэхналогіі здабычы жывіцы і хімічнай пераапрацоўцы лесу. У гэты перыяд працавалі вучоныя: Ф.Т.Касцюковіч, прафесар І.А.Яхантаў, Ф.П.Маісеенка (яго імем названа вуліца ў Гомелі), І.Д.Юркевіч, А.І.Саўчанка, В.П.Сініцкі, прафесар П.П.Рагавой і іншыя. Вынікі іх даследаванняў увайшлі ў настаўленні, інструкцыі, рэкамендацыі і іншыя дакументы, па якіх вялася і вядзецца лясная гаспадарка ў рэспубліцы.

У 1939 г. афіцыйна адкрыты Ленінскі апорны пункт у пас. Каранёўка, дзе навуковая праца была накіравана на павышэнне прадукцыйнасці насаджэнняў, маладняковў натуральнага і штучнага паходжання, на лесаахоўныя работы. На тэрыторыі апорнага пункта былі адкрыты метэаралагічная станцыя, сетка грунтовых калодзежаў, ствараліся доследныя аб'екты, звязаныя з профілем работы інстытута. Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гг. спыніла навуковыя распрацоўкі. Пасля арганізацыі Ленінскага доследнага лясгаса ў 1945 г. былі працягнуты навукова-даследчыя работы, накіраваныя на аднаўленне пацярпеўшых у вайну лясоў і павелічэнне іх прадукцыйнасці. На тэрыторыі ляснога масіву ў пасляваенныя гады праведзены даследаванні па ацэнцы пашкоджаных лясоў, вывучэнні водаахоўнай ролі лесу, распрацоўцы тыпаў лясных культур для розных умоў. Акрамя таго, тут распрацавана тэхналогія вырошчвання пасадачнага матэрыялу ў гадавальніках і цяпліцах, праведзены даследаванні па вырошчванні хуткаслых гаспадарчых каштоўных пародаў.

У 1948 г. з удзелам І.Д.Юркевіча, А.І.Саўчанкі, А.Ф.Кучынскага ў кв. 166 (былы 149) на плошчы 28 га быў закладзены дэндрарый, у якім створана калекцыя інтрадуцыраваных і мясцовых пародаў дрэў і хмызнякоў; на цяперашні час захавалася каля 100 відаў. У дэндрарыі вывучалася магчымасць росту новых недастаткова праверэных ва ўмовах рэспублікі пародаў, збіралася насенне дрэвавых і хмызняковых пародаў з розных экалагічных умоў для высеву іх у гадавальніку і для далейшага ўкаранення ў лясныя культуры экзотаў. У 1982 г. быў састаўлены праект рэканструкцыі дэндрарыя, у 1984—1987 гг. прыняты меры па рэканструкцыі асобных участкаў дэндрарыя, фарміраванні новых калекцый па сістэматычным прынцыпе, расшырэнні існуючых і стварэнні новых экспазіцый. Аднак, на жаль, праца спынена.

Асаблівае развіццё атрымалі навукова-даследчыя і доследныя работы ў 1960-я гады. Пад кіраўніцтвам акадэміка Ф.М.Харытановіча закладзена мноства доследных аб'ектаў па тэхналогіі стварэння лясных культур ва ўрочышчы Зябраўка: праведзены выпрабаванні і ўкаранёны ў вытворчасць сканструяваныя вядучай лабараторыяй механізацыі ў сістэме Дзяржкамлесу СССР лесапасадачныя машыны ЛМД-1, МЛ-1, тралёвачныя прыстасаванні ТРАЛ-40, ТПР-1, рыхліцель лясны РЛН-50, плуг ПБН-60, плуг-сеялка ПСШ-35, культыватар-рыхліцель ПКРШ-1,5; адпрацавана тэхналогія высечак догляду пад кіраўніцтвам А.М.Кажэўнікава, выкананы комплекс даследаванняў па лясной селекцыі пад кіраўніцтвам кандыдатаў сельскагаспадарчых навук А.І.Саўчанкі, Я.Р.Арленкі, З.С.Паджаравай, створаны селекцыйныя аб'екты доўгатэрміновых назіранняў.

Найбольшую ўдзельную вагу складаюць доследныя аб'екты па лясной селекцыі, недраўнянай прадукцыі, лесазнаўстве і лесаводстве. Гонарам калектыву з'яўляецца лесанасенная база, якая дазволіла з 1975 г. ствараць насаджэнні элітным пасадачным матэрыялам. Упершыню на тэрыторыі базы пад кіраўніцтвам У.Е.Ваўчкова распрацавана тэхналогія плантацыйнага вырошчвання журавіны буйнаплоднай, брусніцы, буякоў, методыка стварэння якіх выкарыстана ў рэспубліцы і за яе межамі ў прамысловых маштабах. На аснове даследаванняў В.І.Фаміной упершыню ў рэспубліцы створана і працуе лабараторыя па вытворчасці інакуляцыі і адпрацавана тэхналогія вырошчвання прыдатных да ежы грыбоў.

Усяго на тэрыторыі Каранёўскай эксперыментальнай базы закладзена 150 дос-

1930 г. з'явілася важным этапам арганізацыі лясной доследнай справы на тэрыторыі Каранёўскай і Шчакатоўскай дач. У 1930-я гады праводзіліся даследаванні па водаахоўнай ролі лесу, распрацоўцы лесаводчых, тэхналагічных асноў арганізацыі і вядзення лясной гаспадаркі, натуральным аднаўленні высечак, распрацоўцы агратэхнікі вырошчвання пасадачнага матэрыялу і лясных культур, тэхналогіі здабычы жывіцы і хімічнай пераапрацоўцы лесу. У гэты перыяд працавалі вучоныя: Ф.Т.Касцюковіч, прафесар І.А.Яхантаў, Ф.П.Маісеенка (яго імем названа вуліца ў Гомелі), І.Д.Юркевіч, А.І.Саўчанка, В.П.Сініцкі, прафесар П.П.Рагавой і іншыя. Вынікі іх даследаванняў увайшлі ў настаўленні, інструкцыі, рэкамендацыі і іншыя дакументы, па якіх вялася і вядзецца лясная гаспадарка ў рэспубліцы.

У 1939 г. афіцыйна адкрыты Ленінскі апорны пункт у пас. Каранёўка, дзе навуковая праца была накіравана на павышэнне прадукцыйнасці насаджэнняў, маладняковў натуральнага і штучнага паходжання, на лесаахоўныя работы. На тэрыторыі апорнага пункта былі адкрыты метэаралагічная станцыя, сетка грунтовых калодзежаў, ствараліся доследныя аб'екты, звязаныя з профілем работы інстытута. Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гг. спыніла навуковыя распрацоўкі. Пасля арганізацыі Ленінскага доследнага лясгаса ў 1945 г. былі працягнуты навукова-даследчыя работы, накіраваныя на аднаўленне пацярпеўшых у вайну лясоў і павелічэнне іх прадукцыйнасці. На тэрыторыі ляснога масіву ў пасляваенныя гады праведзены даследаванні па ацэнцы пашкоджаных лясоў, вывучэнні водаахоўнай ролі лесу, распрацоўцы тыпаў лясных культур для розных умоў. Акрамя таго, тут распрацавана тэхналогія вырошчвання пасадачнага матэрыялу ў гадавальніках і цяпліцах, праведзены даследаванні па вырошчванні хуткаслых гаспадарчых каштоўных пародаў.

У 1948 г. з удзелам І.Д.Юркевіча, А.І.Саўчанкі, А.Ф.Кучынскага ў кв. 166 (былы 149) на плошчы 28 га быў закладзены дэндрарый, у якім створана калекцыя інтрадуцыраваных і мясцовых пародаў дрэў і хмызнякоў; на цяперашні час захавалася каля 100 відаў. У дэндрарыі вывучалася магчымасць росту новых недастаткова праверэных ва ўмовах рэспублікі пародаў, збіралася насенне дрэвавых і хмызняковых пародаў з розных экалагічных умоў для высеву іх у гадавальніку і для далейшага ўкаранення ў лясныя культуры экзотаў. У 1982 г. быў састаўлены праект рэканструкцыі дэндрарыя, у 1984—1987 гг. прыняты меры па рэканструкцыі асобных участкаў дэндрарыя, фарміраванні новых калекцый па сістэматычным прынцыпе, расшырэнні існуючых і стварэнні новых экспазіцый. Аднак, на жаль, праца спынена.

Асаблівае развіццё атрымалі навукова-даследчыя і доследныя работы ў 1960-я гады. Пад кіраўніцтвам акадэміка Ф.М.Харытановіча закладзена мноства доследных аб'ектаў па тэхналогіі стварэння лясных культур ва ўрочышчы Зябраўка: праведзены выпрабаванні і ўкаранёны ў вытворчасць сканструяваныя вядучай лабараторыяй механізацыі ў сістэме Дзяржкамлесу СССР лесапасадачныя машыны ЛМД-1, МЛ-1, тралёвачныя прыстасаванні ТРАЛ-40, ТПР-1, рыхліцель лясны РЛН-50, плуг ПБН-60, плуг-сеялка ПСШ-35, культыватар-рыхліцель ПКРШ-1,5; адпрацавана тэхналогія высечак догляду пад кіраўніцтвам А.М.Кажэўнікава, выкананы комплекс даследаванняў па лясной селекцыі пад кіраўніцтвам кандыдатаў сельскагаспадарчых навук А.І.Саўчанкі, Я.Р.Арленкі, З.С.Паджаравай, створаны селекцыйныя аб'екты доўгатэрміновых назіранняў.

Найбольшую ўдзельную вагу складаюць доследныя аб'екты па лясной селекцыі, недраўнянай прадукцыі, лесазнаўстве і лесаводстве. Гонарам калектыву з'яўляецца лесанасенная база, якая дазволіла з 1975 г. ствараць насаджэнні элітным пасадачным матэрыялам. Упершыню на тэрыторыі базы пад кіраўніцтвам У.Е.Ваўчкова распрацавана тэхналогія плантацыйнага вырошчвання журавіны буйнаплоднай, брусніцы, буякоў, методыка стварэння якіх выкарыстана ў рэспубліцы і за яе межамі ў прамысловых маштабах. На аснове даследаванняў В.І.Фаміной упершыню ў рэспубліцы створана і працуе лабараторыя па вытворчасці інакуляцыі і адпрацавана тэхналогія вырошчвання прыдатных да ежы грыбоў.

Усяго на тэрыторыі Каранёўскай эксперыментальнай базы закладзена 150 дос-

ледных і доследна-вытворчых участкаў, некаторыя з іх з'яўляюцца аб'ектамі назіранняў многія дзесяцігоддзі. Лясгас і яго супрацоўнікі з'яўляліся неаднаразовымі ўдзельнікамі ВДНГ СССР.

У 1983 г. рэканструяваны лясны гадавальнік плошчай 9,7 га, дзе створаны ўмовы для поўнай механізацыі ўсіх працэсаў на аснове вывучаемай агратэхнікі вырошчвання пасадачнага матэрыялу; устаноўлена сістэма паліву. Цяпер у насаджэннях эксперыментальнай базы працягваюцца работы па тэхналогіі вырошчвання пасадачнага матэрыялу на селекцыйнай аснове, стварэнні плантацый 2-га парадку, тэхналогіі правядзення высечак, абнаўленні лесу і іншыя работы, звязаныя з павелічэннем устойлівасці і прадукцыйнасці лясоў, вывучаецца ўплыў антрапагенных фактараў на стан лясных экасістэм. Каранёўская эксперыментальная база аднесена да 1-й групы лясоў, служыць месцам адпачынку насельніцтва абласнога цэнтра і прылягаючых населеных пунктаў.

Сасновыя лесанасаджэнні займаюць 54,6% плошчы, дубовыя — 19,4%, бярозавыя — 11,6%, чорнаальховыя — 10,1%, асінавыя — 3,2%, асянёвыя — 0,6%, яловыя —0,2%, грабавыя — 0,2%, таполевыя —0,1%, маладнякі — 22%, сярэднеўзроставыя — 59%, прыспяваючыя — 12%, спелыя і перастойныя — 7%. Агульны запас дрэвастою 2,78 млн.м^3, сярэдні ўзрост — 63 гады, банітэт — 1,2, паўната —0,73, агульны сярэдні прырост — 48,1 тыс. м^3.

Лесапаркавая зона складае 7,5 тыс. га, або 60,2% агульнай плошчы. Спецыфіка вядзення гаспадаркі заключаецца ў асобных прыёмах фарміравання насаджэнняў, упарадкаванні тэрыторыі, што поўнасцю супадае з яе арыентацыяй з 1963 г. на комплекснае выкарыстанне рэсурсаў: лясная гаспадарка, навукова-даследчыя работы, дрэваапрацоўка і пабочныя карыстанні.

У насаджэннях вядзецца інтэнсіўная гаспадарчая дзейнасць па аднаўленні лясоў, павышэнні іх прадукцыйнасці, узнаўленні ахоўных функцый. Аб'ём лесааднаўленчых высечак, які праводзіцца у лясгасе, адпавядае разліковай лесасецы (сярэднегадавы аб'ём складае 5,5 тыс.м^3).

Найважнейшым лесагаспадарчым мерапрыемствам, накіраваным на вырошчванне гаспадарча-каштоўных насаджэнняў, з'яўляюцца высечкі догляду, якія заключаюцца ў перыядычнай высечцы малапрадукцыйных насаджэнняў.

Штогод высечкі догляду ажыццяўляюцца на плошчы 140 га, догляд за маладнякамі — на плошчы 30 га. Інтэнсіўнасць высечкі, устанаўленне выхаду ліквіднай і дзелавой драўніны робіцца на аснове доследна-вытворчай праверкі, выконваемай супрацоўнікамі інстытута з улікам стану насаджэнняў і фактычнай выбаркі за апошнія гады. Нарыхтаваная ад высечак догляду драўніна выкарыстоўваецца для дрэваапрацоўкі. Высечкі догляду забяспечваюць нармальнае ўзнаўленне лясных рэсурсаў.

У 1981—1988 гг. выканана рэканструкцыя сядзібы эксперыментальнай базы: пабудаваны ніжні склад, цэх пераапрацоўкі, гаражы, уведзена ў дзеянне новае абсталяванне, г.зн. матэрыяльна-тэхнічная база гаспадаркі ўзмацнілася. Тэхнічная ўзброенасць яе адпавядае існуючым патрабаванням і дазваляе павялічыць аб'ём вырабаў на аснове поўнай пераапрацоўкі драўніны. У 1995 г. аб'ём таварнай прадукцыі склаў 4,7 млрд. рублёў, выпускаецца да 20 назваў вырабаў.

На тэрыторыі эксперыментальнай базы ёсць помнік архітэктуры XIX ст. «паляўнічы домік», які нясе сваю гісторыю. Упершыню пра яго ўпамінаецца ў 1864 г. у кантракце на арэнду. Ленінскаму доследнаму лясгасу ён перададзены ў канцы 1960-х гадоў, дзе быў размешчаны цэх па вырабе біялагічных калекцый лясных насякомых (выраблялася 10 відаў), цэх па прасаванні драўніны. Намаганнямі лясгаса ў 1978 г. была пачата рэстаўрацыя помніка адначасова з праектнымі работамі, якія выконваліся навукова-рэстаўрацыйнымі майстэрнямі Міністэрства культуры БССР. У 1983 г. рэстаўрацыя помніка была завершана, у будынку размешчана кантора эксперыментальнай базы. У 1978 г. прыняты меры па разгортванні жыллёвага будаўніцтва, па стане на 1.1.1995 г. эксперыментальная база мае 3,5 тыс. квадратных метраў жылога фонду.

Залаты фонд складаюць людзі, намаганнямі якіх створана комплексная гаспадарка з цудоўнымі традыцыямі пастаяннага правядзення навуковых эксперыментаў і доследна-вытворчай праверкі, укаранення распрацовак інстытута і іх прапаганды. Доўгія гады працавалі і ўнеслі

значны ўклад у развіццё эксперыментальнай базы А.І.Даўгяла, Я.І.Пракапенка, Л.Б.Лейзяровіч, Ф.Я.Камрукоў, А.М.Хахлоў, М.П.Бандарэнка, У.А.Паўленка.

Разам з вучонымі, якія праводзілі навуковыя даследаванні на эксперыментальнай базе раней і цяпер, калектыў доследнай гаспадаркі з годнасцю прадстаўляе прыродную лабараторыю Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

А.В.Цітуленка.

Па рэцэптах аграномаў

Вадкія камбінаваныя ўгнаенні больш эфектыўныя ў параўнанні з грануляванымі. Выкарыстоўваючы вадкія тукасумесі, можна атрымаць ураджай на 10—15 працэнтаў большы, чым ад раздзельнага ўнясення цвёрдых азотна-фосфарна-калійных угнаенняў. Апрача гэтага зніжаюцца эксплуатацыйныя і працоўныя затраты.

На Беларусі няма завода па выпуску вадкіх комплексных угнаенняў, якія з'яўляюцца базавымі для прыгатавання двух- і трохкампанентных растворaў і суспензій. Гэту справу ўзяло на сябе навукова-вытворчае прадпрыемства вадкіх угнаенняў, якое знаходзіцца каля в. Заліп'е Урыцкага сельсавета. Раней яно было вядома як Беларускі філіял СКБ «Сельгасаміяк». У студзені 1996 г. прадпрыемству споўнілася 20 гадоў. На дагаворных асновах яно абслугоўвае калгасы і саўгасы не толькі Гомельскага, але і іншых раёнаў вобласці. І ўсё ж у агульным аб'ёме паслуг большая іх доля прыпадае на гаспадаркі Гомельскага раёна. Напрыклад, у 1993 г. з 14,5 тысячы тон вадкіх тукасумесей 8 тысяч тон было ўнесена на палі раёна.

Спецыялісты прадпрыемства распрацавалі і дасканала асвоілі тэхналогію прыгатавання і ўнясення растворaў. Тут створана для гэтага добрая база, ёсць тэхнічныя сродкі, стабільныя, вопытныя кадры спецыялістаў і рабочых. У прыватнасці, у в. Яроміна дзейнічае аграхімпункт, дзе ёсць спецыяльная туказмешвальная ўстаноўка амерыканскай вытворчасці. На ёй па рэцэптах аграномаў гаспадарак і гатуюцца вадкія сумесі ў выглядзе трохкампанентных суспензій (азот, фосфар, калій). Тут можна атрымаць тукасумесі любых саставаў, неабходных кожнаму полю ў залежнасці ад агранамічных паказчыкаў і ўраджайнасці плануемай культуры. Магутнасць пункта разлічана на 100 тон растворaў за змену. Для транспарціроўкі і ўнясення тукасумесей выкарыстоўваюцца аўтамабільныя і трактарныя цыстэрны ёмістасцю ХТС-80 і МЖТ-10, якія былі пераабсталяваны сваімі сіламі.

Доўгі час базавай гаспадаркай навукова-вытворчага прадпрыемства з'яўляўся калгас імя XXII з'езда КПСС, дзе быў накоплены пэўны вопыт прымянення вадкіх тукасумесей. У 1995 г. вадкія комплексныя ўгнаенні выкарыстоўвалі 15 гаспадарак раёна. Больш за іншых атрымала калектыўна-долевая гаспадарка «Бабовіцкая» (1000 тон). Спецыялісты навукова-вытворчага прадпрыемства і гаспадаркі правялі сумесны дослед на 15 гектарах. Паводле даных галоўнага агранома прадпрыемства Васіля Рыгоравіча Матараса, ячмень на тым участку даў па 34,9 цэнтнера зерня з гектара. Гэта на 5,1 цэнтнера, або на 17 працэнтаў, больш, чым на плошчы, дзе ўносіліся цвёрдыя мінеральныя ўгнаенні. Розніца відавочная. У цэлым жа калектыўна-долевая гаспадарка «Бабовіцкая», нават у неспрыяльным па ўмовах надвор'я годзе, атрымала самы высокі ў раёне ўраджай збожжавых — 31,7 цэнтнера з гектара.

Як сцвярджае дырэктар прадпрыемства Аляксандр Іванавіч Альбах, самыя напружаныя месяцы для аграхімікаў — красавік і верасень. Тэрміны пасяўных работ абмежаваныя, зямля павінна быць запраўлена тукасумесямі без затрымкі. Калектыў заўсёды спраўляецца з адказнымі і неадкладнымі работамі. Гэта вынік таго, што прадпрыемства кожны раз сустракае прыход іх у поўнай і надзейнай гатоўнасці.

Прадпрыемства з улікам трох яго філіялаў на пачатак 1996 г. налічвала 90 чалавек. У тэхналагічным, эксперыментальна-канструктарскім аддзелах, на доследнай вытворчасці і ў іншых падраздзяленнях многія працуюць на працягу доўгіх гадоў. У ліку такіх работнікаў, напрыклад, вадзіцель КамАЗа Аркадзь Нікіцін, трак-

ледных і доследна-вытворчых участкаў, некаторыя з іх з'яўляюцца аб'ектамі назіранняў многія дзесяцігоддзі. Лясгас і яго супрацоўнікі з'яўляліся неаднаразовымі ўдзельнікамі ВДНГ СССР.

У 1983 г. рэканструяваны лясны гадавальнік плошчай 9,7 га, дзе створаны ўмовы для поўнай механізацыі ўсіх працэсаў на аснове вывучаемай агратэхнікі вырошчвання пасадачнага матэрыялу; устаноўлена сістэма паліву. Цяпер у насаджэннях эксперыментальнай базы працягваюцца работы па тэхналогіі вырошчвання пасадачнага матэрыялу на селекцыйнай аснове, стварэнні плантацый 2-га парадку, тэхналогіі правядзення высечак, абнаўленні лесу і іншыя работы, звязаныя з павелічэннем устойлівасці і прадукцыйнасці лясоў, вывучаецца ўплыў антрапагенных фактараў на стан лясных экасістэм. Каранёўская эксперыментальная база аднесена да 1-й групы лясоў, служыць месцам адпачынку насельніцтва абласнога цэнтра і прылягаючых населеных пунктаў.

Сасновыя лесанасаджэнні займаюць 54,6% плошчы, дубовыя — 19,4%, бярозавыя — 11,6%, чорнаальховыя — 10,1%, асінавыя — 3,2%, асянёвыя — 0,6%, яловыя —0,2%, грабавыя — 0,2%, таполевыя —0,1%, маладнякі — 22%, сярэднеўзроставыя — 59%, прыспяваючыя — 12%, спелыя і перастойныя — 7%. Агульны запас дрэвастою 2,78 млн.м^3, сярэдні ўзрост — 63 гады, банітэт — 1,2, паўната —0,73, агульны сярэдні прырост — 48,1 тыс. м^3.

Лесапаркавая зона складае 7,5 тыс. га, або 60,2% агульнай плошчы. Спецыфіка вядзення гаспадаркі заключаецца ў асобных прыёмах фарміравання насаджэнняў, упарадкаванні тэрыторыі, што поўнасцю супадае з яе арыентацыяй з 1963 г. на комплекснае выкарыстанне рэсурсаў: лясная гаспадарка, навукова-даследчыя работы, дрэваапрацоўка і пабочныя карыстанні.

У насаджэннях вядзецца інтэнсіўная гаспадарчая дзейнасць па аднаўленні лясоў, павышэнні іх прадукцыйнасці, узнаўленні ахоўных функцый. Аб'ём лесааднаўленчых высечак, які праводзіцца у лясгасе, адпавядае разліковай лесасецы (сярэднегадавы аб'ём складае 5,5 тыс.м^3).

Найважнейшым лесагаспадарчым мерапрыемствам, накіраваным на вырошчванне гаспадарча-каштоўных насаджэнняў, з'яўляюцца высечкі догляду, якія заключаюцца ў перыядычнай высечцы малапрадукцыйных насаджэнняў.

Штогод высечкі догляду ажыццяўляюцца на плошчы 140 га, догляд за маладнякамі — на плошчы 30 га. Інтэнсіўнасць высечкі, устанаўленне выхаду ліквіднай і дзелавой драўніны робіцца на аснове доследна-вытворчай праверкі, выконваемай супрацоўнікамі інстытута з улікам стану насаджэнняў і фактычнай выбаркі за апошнія гады. Нарыхтаваная ад высечак догляду драўніна выкарыстоўваецца для дрэваапрацоўкі. Высечкі догляду забяспечваюць нармальнае ўзнаўленне лясных рэсурсаў.

У 1981—1988 гг. выканана рэканструкцыя сядзібы эксперыментальнай базы: пабудаваны ніжні склад, цэх пераапрацоўкі, гаражы, уведзена ў дзеянне новае абсталяванне, г.зн. матэрыяльна-тэхнічная база гаспадаркі ўзмацнілася. Тэхнічная ўзброенасць яе адпавядае існуючым патрабаванням і дазваляе павялічыць аб'ём вырабаў на аснове поўнай пераапрацоўкі драўніны. У 1995 г. аб'ём таварнай прадукцыі склаў 4,7 млрд. рублёў, выпускаецца да 20 назваў вырабаў.

На тэрыторыі эксперыментальнай базы ёсць помнік архітэктуры XIX ст. «паляўнічы домік», які нясе сваю гісторыю. Упершыню пра яго ўпамінаецца ў 1864 г. у кантракце на арэнду. Ленінскаму доследнаму лясгасу ён перададзены ў канцы 1960-х гадоў, дзе быў размешчаны цэх па вырабе біялагічных калекцый лясных насякомых (выраблялася 10 відаў), цэх па прасаванні драўніны. Намаганнямі лясгаса ў 1978 г. была пачата рэстаўрацыя помніка адначасова з праектнымі работамі, якія выконваліся навукова-рэстаўрацыйнымі майстэрнямі Міністэрства культуры БССР. У 1983 г. рэстаўрацыя помніка была завершана, у будынку размешчана кантора эксперыментальнай базы. У 1978 г. прыняты меры па разгортванні жыллёвага будаўніцтва, па стане на 1.1.1995 г. эксперыментальная база мае 3,5 тыс. квадратных метраў жылога фонду.

Залаты фонд складаюць людзі, намаганнямі якіх створана комплексная гаспадарка з цудоўнымі традыцыямі пастаяннага правядзення навуковых эксперыментаў і доследна-вытворчай праверкі, укаранення распрацовак інстытута і іх прапаганды. Доўгія гады працавалі і ўнеслі

значны ўклад у развіццё эксперыментальнай базы А.І.Даўгяла, Я.І.Пракапенка, Л.Б.Лейзяровіч, Ф.Я.Камрукоў, А.М.Хахлоў, М.П.Бандарэнка, У.А.Паўленка.

Разам з вучонымі, якія праводзілі навуковыя даследаванні на эксперыментальнай базе раней і цяпер, калектыў доследнай гаспадаркі з годнасцю прадстаўляе прыродную лабараторыю Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

А.В.Цітуленка.

Па рэцэптах аграномаў

Вадкія камбінаваныя ўгнаенні больш эфектыўныя ў параўнанні з грануляванымі. Выкарыстоўваючы вадкія тукасумесі, можна атрымаць ураджай на 10—15 працэнтаў большы, чым ад раздзельнага ўнясення цвёрдых азотна-фосфарна-калійных угнаенняў. Апрача гэтага зніжаюцца эксплуатацыйныя і працоўныя затраты.

На Беларусі няма завода па выпуску вадкіх комплексных угнаенняў, якія з'яўляюцца базавымі для прыгатавання двух- і трохкампанентных растворaў і суспензій. Гэту справу ўзяло на сябе навукова-вытворчае прадпрыемства вадкіх угнаенняў, якое знаходзіцца каля в. Заліп'е Урыцкага сельсавета. Раней яно было вядома як Беларускі філіял СКБ «Сельгасаміяк». У студзені 1996 г. прадпрыемству споўнілася 20 гадоў. На дагаворных асновах яно абслугоўвае калгасы і саўгасы не толькі Гомельскага, але і іншых раёнаў вобласці. І ўсё ж у агульным аб'ёме паслуг большая іх доля прыпадае на гаспадаркі Гомельскага раёна. Напрыклад, у 1993 г. з 14,5 тысячы тон вадкіх тукасумесей 8 тысяч тон было ўнесена на палі раёна.

Спецыялісты прадпрыемства распрацавалі і дасканала асвоілі тэхналогію прыгатавання і ўнясення растворaў. Тут створана для гэтага добрая база, ёсць тэхнічныя сродкі, стабільныя, вопытныя кадры спецыялістаў і рабочых. У прыватнасці, у в. Яроміна дзейнічае аграхімпункт, дзе ёсць спецыяльная туказмешвальная ўстаноўка амерыканскай вытворчасці. На ёй па рэцэптах аграномаў гаспадарак і гатуюцца вадкія сумесі ў выглядзе трохкампанентных суспензій (азот, фосфар, калій). Тут можна атрымаць тукасумесі любых саставаў, неабходных кожнаму полю ў залежнасці ад агранамічных паказчыкаў і ўраджайнасці плануемай культуры. Магутнасць пункта разлічана на 100 тон растворaў за змену. Для транспарціроўкі і ўнясення тукасумесей выкарыстоўваюцца аўтамабільныя і трактарныя цыстэрны ёмістасцю ХТС-80 і МЖТ-10, якія былі пераабсталяваны сваімі сіламі.

Доўгі час базавай гаспадаркай навукова-вытворчага прадпрыемства з'яўляўся калгас імя XXII з'езда КПСС, дзе быў накоплены пэўны вопыт прымянення вадкіх тукасумесей. У 1995 г. вадкія комплексныя ўгнаенні выкарыстоўвалі 15 гаспадарак раёна. Больш за іншых атрымала калектыўна-долевая гаспадарка «Бабовіцкая» (1000 тон). Спецыялісты навукова-вытворчага прадпрыемства і гаспадаркі правялі сумесны дослед на 15 гектарах. Паводле даных галоўнага агранома прадпрыемства Васіля Рыгоравіча Матараса, ячмень на тым участку даў па 34,9 цэнтнера зерня з гектара. Гэта на 5,1 цэнтнера, або на 17 працэнтаў, больш, чым на плошчы, дзе ўносіліся цвёрдыя мінеральныя ўгнаенні. Розніца відавочная. У цэлым жа калектыўна-долевая гаспадарка «Бабовіцкая», нават у неспрыяльным па ўмовах надвор'я годзе, атрымала самы высокі ў раёне ўраджай збожжавых — 31,7 цэнтнера з гектара.

Як сцвярджае дырэктар прадпрыемства Аляксандр Іванавіч Альбах, самыя напружаныя месяцы для аграхімікаў — красавік і верасень. Тэрміны пасяўных работ абмежаваныя, зямля павінна быць запраўлена тукасумесямі без затрымкі. Калектыў заўсёды спраўляецца з адказнымі і неадкладнымі работамі. Гэта вынік таго, што прадпрыемства кожны раз сустракае прыход іх у поўнай і надзейнай гатоўнасці.

Прадпрыемства з улікам трох яго філіялаў на пачатак 1996 г. налічвала 90 чалавек. У тэхналагічным, эксперыментальна-канструктарскім аддзелах, на доследнай вытворчасці і ў іншых падраздзяленнях многія працуюць на працягу доўгіх гадоў. У ліку такіх работнікаў, напрыклад, вадзіцель КамАЗа Аркадзь Нікіцін, трак-

тарысты Дзмітрый Бублін, Станіслаў Вадзюцін, аператар туказмешвальнай устаноўкі Мікалай Дудараў. З першага дня прыйшлі сюды галоўны эканаміст Валянціна Іванаўна Гулевіч, галоўны бухгалтар Таццяна Іванаўна Муравейнікава, вадзіцель аміякавоза Мікалай Якаўлевіч Гаруноў. Да выхаду на пенсію шмат гадоў працаваў спачатку галоўным аграномам, потым намеснікам дырэктара ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны Іосіф Іванавіч Грыб. Першым дырэктарам прадпрыемства быў прызначаны Мікалай Аляксандравіч Кіб, у 1985 г. яго змяніў Аляксандр Іванавіч Альбах, які да гэтага працаваў намеснікам старшыні Гомельскага абласнога аб'яднання «Сельгастэхніка». Тады ж яго намеснікам стаў Аляксей Дзмітрыевіч Кушняроў.

Гэта прадпрыемства, адзінае ў Беларусі, у свой час адносілася да навукова-даследчага, канструктарскага і праектна-тэхналагічнага інстытута вадкіх угнаенняў. Яго ведалі ва ўсім былым СССР. Практычным распрацоўкам спецыялістаў прадпрыемства па выпуску і прымяненні вадкіх тукасумесей прысвячаліся экспазіцыі на ВДНГ СССР. Тэхніка прадпрыемства дэманстравалася на выстаўках у Маскве, Разані, Прыбалтыцы. На цэнтральнай сядзібе каля в. Заліп'е ў чатырохпавярховым будынку размешчаны службы прадпрыемства. Ёсць добра абсталяваныя вучэбныя класы, дзе штогод вядзецца перападрыхтоўка механізатараў і іншых работнікаў, якія працуюць з вадкімі ўгнаеннямі. Побач з гэтым домам на пляцоўцы знаходзілася пастаянная выстаўка тэхнікі, дзе праводзіліся рэспубліканскія і абласныя семінары па вывучэнні навукова-вытворчага вопыту, накопленага аграхімікамі.

Калектыў прадпрыемства выконвае іншыя работы. Напрыклад, па заяўках гаспадарак у майстэрні вырабляюцца штангавыя апырсквальнікі для ўнясення ў глебу вадкіх мінеральных тукаў. Ёсць тут і шырокія магчымасці для запраўкі халадзільных установак, якія працуюць на вадкім аміяку.

20-гадовы юбілей прадпрыемства супаў з эканамічнай нестабільнасцю ў рэспубліцы. Галоўныя цяжкасці звязаны з дарагоўляй мінеральных угнаенняў і нізкай плацежаздольнасцю калгасаў і саўгасаў. І ўсё ж калектыў аграхімікаў працуе прыбыткова. Ад іх паслуг — прамая выгада для гаспадарак у выглядзе прыбаўкі ўраджаю на палях. Навукова-вытворчы патэнцыял, набыты гадамі, не страчаны і карыстаецца попытам у земляробаў.

І.І.Пічукоў.

На службе людзям

З гісторыі раёнкі

Газета «Маяк» — орган Гомельскага раённага Савета народных дэпутатаў. Выдаецца на беларускай мове. Заснавана 10.7.1938 г. пад назвай «Сталінскі сцяг». 14.8.1941 г. выданне газеты спынена, узноўлена 15.10.1943 г. Газета асвятляе працу, жыццё, побыт і адпачынак жыхароў раёна, дзейнасць грамадскіх арганізацый, прапагандуе вопыт лепшых гаспадарак і перадавікоў сельскай гаспадаркі, гісторыю раёна. Мае 4 аддзелы: грамадскага жыцця, пісьмаў, масавай работы, сельскай гаспадаркі і радыёінфармацыі. Вядуцца рубрыкі «Перабудова і кадры», «Палітычная і эканамічная адукацыя», «На палях раёна», «Як Вас абслугоўваюць», «Свет Вашых захапленняў». Выходзяць штомесячныя старонкі: «Нашчадкі», «Чалавек і закон», старонка пісем, тэматычная падборка «Аб кнігах і кнігалюбах» і іншыя. У падборцы «На паэтычнай арбіце» перыядычна друкуюцца літаратурныя творы мясцовых аўтараў.

10 ліпеня 1938 г. выйшаў першы нумар Гомельскай раённай газеты «Сталінскі сцяг», надрукаваны на фабрыцы «Палесдрук» тыражом 1500 экзэмпляраў. Размяшчалася рэдакцыя ў Навабеліцы на вуліцы Леніна, 91. Газета з'яўлялася органам Гомельскага РК КП(б)Б.

У падмаскоўным г. Хімкі ў аддзеле газет Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна захаваўся камплект газеты за 1938 г. Гартаючы яе старонкі, як бы зноў пераносішся ў тую далёкую ад нас эпоху. Гэта былі гады завяршэння індустрыялізацыі, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, культурнай рэвалюцыі, гады складанай міжнароднай абстаноўкі. Пра гэта гавораць загалоўкі ў газеце: «На франтах Іспаніі», «Ваенныя дзеянні ў Кітаі», «Японская ваеншчына працягвае свае правакацыі», «Аб

тарысты Дзмітрый Бублін, Станіслаў Вадзюцін, аператар туказмешвальнай устаноўкі Мікалай Дудараў. З першага дня прыйшлі сюды галоўны эканаміст Валянціна Іванаўна Гулевіч, галоўны бухгалтар Таццяна Іванаўна Муравейнікава, вадзіцель аміякавоза Мікалай Якаўлевіч Гаруноў. Да выхаду на пенсію шмат гадоў працаваў спачатку галоўным аграномам, потым намеснікам дырэктара ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны Іосіф Іванавіч Грыб. Першым дырэктарам прадпрыемства быў прызначаны Мікалай Аляксандравіч Кіб, у 1985 г. яго змяніў Аляксандр Іванавіч Альбах, які да гэтага працаваў намеснікам старшыні Гомельскага абласнога аб'яднання «Сельгастэхніка». Тады ж яго намеснікам стаў Аляксей Дзмітрыевіч Кушняроў.

Гэта прадпрыемства, адзінае ў Беларусі, у свой час адносілася да навукова-даследчага, канструктарскага і праектна-тэхналагічнага інстытута вадкіх угнаенняў. Яго ведалі ва ўсім былым СССР. Практычным распрацоўкам спецыялістаў прадпрыемства па выпуску і прымяненні вадкіх тукасумесей прысвячаліся экспазіцыі на ВДНГ СССР. Тэхніка прадпрыемства дэманстравалася на выстаўках у Маскве, Разані, Прыбалтыцы. На цэнтральнай сядзібе каля в. Заліп'е ў чатырохпавярховым будынку размешчаны службы прадпрыемства. Ёсць добра абсталяваныя вучэбныя класы, дзе штогод вядзецца перападрыхтоўка механізатараў і іншых работнікаў, якія працуюць з вадкімі ўгнаеннямі. Побач з гэтым домам на пляцоўцы знаходзілася пастаянная выстаўка тэхнікі, дзе праводзіліся рэспубліканскія і абласныя семінары па вывучэнні навукова-вытворчага вопыту, накопленага аграхімікамі.

Калектыў прадпрыемства выконвае іншыя работы. Напрыклад, па заяўках гаспадарак у майстэрні вырабляюцца штангавыя апырсквальнікі для ўнясення ў глебу вадкіх мінеральных тукаў. Ёсць тут і шырокія магчымасці для запраўкі халадзільных установак, якія працуюць на вадкім аміяку.

20-гадовы юбілей прадпрыемства супаў з эканамічнай нестабільнасцю ў рэспубліцы. Галоўныя цяжкасці звязаны з дарагоўляй мінеральных угнаенняў і нізкай плацежаздольнасцю калгасаў і саўгасаў. І ўсё ж калектыў аграхімікаў працуе прыбыткова. Ад іх паслуг — прамая выгада для гаспадарак у выглядзе прыбаўкі ўраджаю на палях. Навукова-вытворчы патэнцыял, набыты гадамі, не страчаны і карыстаецца попытам у земляробаў.

І.І.Пічукоў.

На службе людзям

З гісторыі раёнкі

Газета «Маяк» — орган Гомельскага раённага Савета народных дэпутатаў. Выдаецца на беларускай мове. Заснавана 10.7.1938 г. пад назвай «Сталінскі сцяг». 14.8.1941 г. выданне газеты спынена, узноўлена 15.10.1943 г. Газета асвятляе працу, жыццё, побыт і адпачынак жыхароў раёна, дзейнасць грамадскіх арганізацый, прапагандуе вопыт лепшых гаспадарак і перадавікоў сельскай гаспадаркі, гісторыю раёна. Мае 4 аддзелы: грамадскага жыцця, пісьмаў, масавай работы, сельскай гаспадаркі і радыёінфармацыі. Вядуцца рубрыкі «Перабудова і кадры», «Палітычная і эканамічная адукацыя», «На палях раёна», «Як Вас абслугоўваюць», «Свет Вашых захапленняў». Выходзяць штомесячныя старонкі: «Нашчадкі», «Чалавек і закон», старонка пісем, тэматычная падборка «Аб кнігах і кнігалюбах» і іншыя. У падборцы «На паэтычнай арбіце» перыядычна друкуюцца літаратурныя творы мясцовых аўтараў.

10 ліпеня 1938 г. выйшаў першы нумар Гомельскай раённай газеты «Сталінскі сцяг», надрукаваны на фабрыцы «Палесдрук» тыражом 1500 экзэмпляраў. Размяшчалася рэдакцыя ў Навабеліцы на вуліцы Леніна, 91. Газета з'яўлялася органам Гомельскага РК КП(б)Б.

У падмаскоўным г. Хімкі ў аддзеле газет Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна захаваўся камплект газеты за 1938 г. Гартаючы яе старонкі, як бы зноў пераносішся ў тую далёкую ад нас эпоху. Гэта былі гады завяршэння індустрыялізацыі, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, культурнай рэвалюцыі, гады складанай міжнароднай абстаноўкі. Пра гэта гавораць загалоўкі ў газеце: «На франтах Іспаніі», «Ваенныя дзеянні ў Кітаі», «Японская ваеншчына працягвае свае правакацыі», «Аб

падзеях у раёне возера Хасан», «Палёты германскіх самалётаў над чэхаславацкай тэрыторыяй» і інш.

У канцы 1930-х гадоў узмацніўся культ асобы Сталіна, масавыя беззаконні, рэпрэсіі. Таму і газету назвалі «Сталінскі сцяг», а ў пачатковым абзацы першага перадавога артыкула канстатавалася, што «хутка на палях Гомельскага раёна наступіць гарачая пара — уборка новага сталінскага ўраджаю». У справаздачы аб выступленні дэпутата Вярхоўнага Савета БССР па Урыцкай выбарчай акрузе прыводзяцца такія словы: «Асіныя гнёзды трацкісцка-бухарынскай, буржуазна-нацыяналістычнай фашысцкай погані, япона-германскіх, польскіх шпіёнаў і дыверсантаў выкрыты і знішчаны слаўнай савецкай разведкай, якую ўзначальвае сталінскі нарком Н.І.Яжоў. Наша задача — дапамагчы органам НКУС выкрыць прытаіўшыхся, яшчэ не выкрытых ворагаў, усе сілы накіраваць на ліквідацыю шкодніцтва».

На старонках газеты за 1938 г. паведамлялася пра адкрыццё школ, медпунктаў, МТС і іншае. Так у Навабеліцкай МТС было 17 трактароў, 5 камбайнаў, у раёне 140 жняярак, 114 конных грабель, 102 малатарні. У в. Раманавічы арганізавана школа малапісьменных, дзе навучаліся 42 чалавекі, а калгаснік-стаханавец Восіп Перцаў набыў патэфон і веласіпед.

У гады Вялікай Айчыннай вайны газета не выходзіла. Аднавіўся яе выпуск толькі пасля вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З 29.6.1956 г. газета выходзіла пад назвай «Трыбуна хлебароба», з 22.4.1962 г. — «Маяк».

У 1983 г. газета прымала ўдзел ва Усесаюзным конкурсе перыядычнага друку за лепшую прапаганду і актыўнае садзейнічанне ўкараненню ў народную гаспадарку дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу і перадавога вопыту, што дэманстраваліся на ВДНГ СССР, была ўзнагароджана шасцю дыпломамі, чацвёра яе супрацоўнікаў адзначаны медалямі. У гэтым была заслуга тагачаснага загадчыка сельскагаспадарчага аддзела рэдакцыі Івана Іванавіча Пічукова.

На працягу 60 гадоў у рэдакцыі працавала шмат здольных і таленавітых журналістаў, якія сталі вядомымі як у вобласці так і ў рэспубліцы. Першым яе рэдактарам быў Канстанцін Васільевіч Лапіцкі. Адным з першых пасляваенных рэдактараў быў ветэран вайны Р.Л.Марголін. Рэдактарамі былі Царык, Харошка, Майзлес. У 1960—1980 гг. рэдакцыю ўзначальваў ветэран вайны Іван Паўлавіч Дзямідзенка.

Калектыў рэдакцыі па праве ганарыцца сваімі былымі супрацоўнікамі. Сярод іх — вядомы дзіцячы пісьменнік Іван Сяркоў, галоўны рэдактар В.Логвін, яго першы намеснік С.Савасцееў, намеснік У.Стэльмах, загадчык аддзела С.Балоткін — цяперашнія кіраўнікі абласной газеты «Гомельская праўда», уласныя карэспандэнты рэспубліканскай газеты «Беларуская ніва» М.Ермакоў і беларускага радыё В.Сідорчык, памочнік першага намесніка старшыні аблвыканкома А.Міцкевіч і іншыя. Былая супрацоўніца «Маяка» Н.Ц.Царэнка стала дацэнтам кафедры тэлебачання і радыёвяшчання БДУ, кандыдат мастацтвазнаўства.

Няўмольна бяжыць час. Змянілася многае, але, нягледзячы на ўсе перапетыі жыцця, газета «Маяк» застаецца вернай свайму галоўнаму прызначэнню — служыць людзям, расказваць пра іх радасці і засмучэнні, поспехі і няўдачы.

І.К.Брухавецкі.

За газетным радком

БАБОВІЧЫ — ВЁСКА ЗВЫЧАЙНАЯ

Вёска Бабовічы з кожным годам харашэе і добраўпарадкоўваецца. Тут ёсць усё для хлебаробаў: добрыя дамы, 4 магазіны, майстэрня бытавога абслугоўвання, участковая бальніца, аптэка, сярэдняя школа, бібліятэка, Дом культуры. У сферы культурнага жыцця, выхавання ёсць свае паважаныя людзі. Адна з іх — педагог Лізавета Сямёнаўна Рубанава. Яна прайшла слаўны жыццёвы шлях. Ваявала пад Сталінградам і дайшла да Берліна, за што ўзнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За перамогу над Германіяй». Сёння Лізавета Сямёнаўна актыўна ўдзельнічае ў выхаванні падрастаючага пакалення, з'яў-

ляецца дэпутатам сельскага Савета, узначальвае жансавет.

Натхнёна працуюць, культурна, змястоўна адпачываюць працаўнікі вёскі.

Бабовічы — звычайная беларуская вёска, дзе шчасліва жыве чалавек — непасрэдны стваральнік нашай гісторыі.

Гомельская праўда. 1972. 14 чэрвеня.

РАБОТА САВЕТАЎ

У раёне больш за 1000 дэпутатаў Саветаў. З іх непасрэдна на вытворчасці занята звыш 600 чалавек, з іх ліку 50 кіраўнікоў гаспадарак, 78 спецыялістаў сельскай гаспадаркі, 101 механізатар, 118 жывёлаводаў, 137 паляводаў.

Настойлівая арганізатарская работа Саветаў, яго органаў дае станоўчыя вынікі. Гаспадаркі Красненскага сельсавета — калгас «Перамога», саўгас «Брылёва», Гомельская птушкафабрыка — паспяхова выканалі заданні 1974 г. па ўсіх паказчыках.

Маяк. 1975. 29 сакавіка.

ПТУШКАФАБРЫКА «РАССВЕТ»

Птушкафабрыка «Рассвет» утварылася ў студзені 1975 года ў выніку разбуйнення былога саўгаса «Рассвет». Да птушкафабрыкі адышла вёска Пясочная Буда, перададзена 779 га зямлі, у тым ліку 647 га сельскагаспадарчых угоддзяў. Перададзена 7 трактароў, 2 зерневыя камбайны, 3 бартавыя і 3 спецыялізаваныя аўтамашыны, 3 зернесклады, старыя птушнікі, 25 тысяч качак, аўтамабіль МАЗ. На фабрыцы ўступілі ў строй 4 птушнікі для адкорму маладняку, кожны з якіх разлічаны на 10 тысяч галоў, кацельня, ветэрынарны блок, падсобны вытворчы корпус, склад падсцілу, цепла-, электра- і сансеткі. Яшчэ здадзена 12 птушнікаў.

Маяк. 1975. 1 мая.

РАСШЫРАЕЦЦА СФЕРА ПАСЛУГ

Да 1962 г. на тэрыторыі раёна дзейнічалі ўсяго 12 дробных швейных майстэрняў. За гады дзвюх апошніх пяцігодак пабудаваны сельскія дамы быту ў Пакалюбічах, Даўгалессі, Прыбытках, Целяшах, Бабовічах, Старых Цярэшкавічах, Старых Дзятлавічах і іншых вёсках. На сённяшні дзень у раёне налічваецца 30 сельскіх дамоў быту і 22 комплексныя прыёмныя пункты. Расшырыў сферу паслуг і раённы камбінат бытавога абслугоўвання.

За мінулы год на душу насельніцтва аказана паслуг на 6 р. 90 кап.

Маяк. 1975. 31 мая.

ЧЫРВОНЫЯ ЗОРАЧКІ

Прыходзіць вясна і пачынае квітнець зямля. Лёгкімі светла-зялёнымі воблачкамі ахутваюцца бярозы. Паветра ў маі нібы хрустальнае. Прыгажэе вясной вёска Глыбоцкае, прыгажэюць людзі, што жывуць у ёй. Вясной, 31 год назад, да іх, як і да ўсяго народа нашай краіны, прыйшла доўгачаканая перамога ў самай цяжкай вайне. Чырвоныя зорачкі, нібы тыя зорачкі, што на пілотках загінуўшых, успыхвалі на хатах удоў, сірот. Дзве такія зорачкі пламянеюць і на хаце Марыны Аляксееўны Мамрукавай. Адна — гэта за мужа Фёдара Аляксеевіча, другая — за Аляксандра, старэйшага з трох яе сыноў. Ёй аддаў сваё жыццё за гэты светлы майскі дзень у суровым 1943 годзе.

Сям'я Мамруковых адна з першых уступіла ў калгас. З ім Марына Аляксееўна і звязала сваё жыццё. Пасля вайны цяжка было. Усё трэба было адбудоўваць. Марына Аляксееўна выдзялялася стараннасцю. Напэўна, у працы не так чуваць было болю аб загінуўшых. Ёй, старэйшай работніцы, было прысвоена званне заслужанай калгасніцы, а імя яе занесена ў Кнігу працоўнага гонару.

Ёй 72 гады, яна даўно ўжо на пенсіі, але калі асабліва неабходны ў родным калгасе імя Уладзіміра Ільіча рабочыя рукі, яна заўсёды прыходзіць на дапамогу.

На хаце старой жанчыны дзве чырвоныя зоркі — гэта двое, што не вярнуліся з вайны. Але не зламала жанчыну гора, выстаяла. І зараз расказвае ўнукам сваім пра тыя суровыя гады, пра іх дзеда і дзядзьку. А ўнукаў у яе ажно дзевяць. Ёсць ужо і два праўнукі.

Маяк. 1976. 8 мая.

ВЫСОКАЯ АЦЭНКА ПРАЦЫ

Выдатнымі працоўнымі дасягненнямі азнаменавалі другі год дзесятай пяцігодкі працаўнікі Гомельскага раёна.

Хлебаробы сабралі з гектара па 28 цэнтнераў збожжавых культур і зернебабо-

вых, па 162 цэнтнеры бульбы. На 100 гектарах угоддзяў атрымалі 698,4 цэнтнера малака і 146,2 мяса.

Дасягненні раёна атрымалі высокую адзнаку. Раён прызнаны пераможцам Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, паспяховае выкананне народнагаспадарчага плана 1977 г. і ўзнагароджаны пераходным Чырвоным Сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР.

Гомельская праўда. 1978. 4 сакавіка.

ПРА МІНУЛАЕ І СУЧАСНАЕ МАРКАВІЧ

У Маркавіцкім сельскім Доме культуры Гомельскага раёна адкрыты народны музей. Яго стваралі члены мясцовага калгаса «Чырвоны сцяг», работнікі раённага аддзела культуры і абласнога краязнаўчага музея. Тут прадстаўлены шматлікія экспанаты аб мінулым і сучасным вёскі Маркавічы і навакольных населеных пунктаў, барацьбе іх жыхароў за ўсталяванне савецкай улады. Асаблівую ўвагу прыцягваюць дакументы аб дзейнасці партыйнай і камсамольскай ячэек у першыя гады пасля перамогі Кастрычніка, рабоце валаснога выканаўчага камітэта, рэўкома і іншых арганізацый.

Цікавыя таксама матэрыялы аб калектывізацыі вёскі і многія іншыя.

Гомельская праўда. 1979. 27 студзеня.

ФІЗКУЛЬТУРНА-АЗДАРАЎЛЕНЧАЯ І СПАРТЫЎНАЯ РАБОТА

Папулярнай формай далучэння малады людзей да заняткаў спортам праз ГПА сталі штогод праводзімыя зімовыя і летнія спартакіяды. За 3 гады ў фіналах гэтых спаборніцтваў прынялі ўдзел 2000 чалавек, з якіх 1500 выканалі спартыўныя разрады па нарматывах ГПА. У раёне падрыхтавана за час існавання комплексу 28 000 значкістаў. За 1973 год падрыхтавана: 1 майстар, 11 кандыдатаў у майстры спорту СССР, 22 першаразраднікі і 6640 спартсменаў масавых разрадаў. Зборныя каманды раёна, якія ўдзельнічалі ў абласных спаборніцтвах, занялі месцы: па лёгкай атлетыцы — першае, па біятлону — трэцяе, валейболу — чацвёртае, лыжных гонках і кросу — пятае, мнагабор'ю ГПА — шостае.

Увайшлі ў традыцыю тэматычныя вечары, прысвечаныя прапагандзе спорту. На такіх вечарах наладжваюцца сустрэчы з вядомымі спартсменамі, паказальныя выступленні, гутаркі і лекцыі, іншыя мерапрыемствы.

Маяк. 1979. 4 кастрычніка.

ПАМАЛАДЗЕЛІ СТАРЫЯ ЦЯРЭШКАВІЧЫ

Вёска будуе жыллё для механізатараў. Спачатку ўзводзіліся двух-, трох і чатырохпавярховыя дамы. Кватэры ў іх утульныя, з прыродным газам і гарачай вадой. Агульная плошча 70,49 м², а жылая — 41,0. Будаўніцтва жылля працягваецца. Адначасова робіцца добраўпарадкаванне вёскі. Цэнтральная вуліца асфальтавана. Сумесна з калектывам Навабеліцкай птушкафабрыкі пабудаваны стадыён з бегавымі дарожкамі, пляцоўкамі для спартыўных гульняў. Будуецца новы Дом культуры.

Гомельская праўда. 1986. 24 ліпеня.

АДКРЫЎСЯ Ў ВЁСЦЫ ХРАМ

У 1992 г. у вёсцы Прыбыткі пачала дзейнічаць царква. Упершыню за апошнія дзесяцігоддзі жыхары Прыбытак і навакольных вёсак атрымалі магчымасць сустрэць старажытныя нашы святы каляды і хрышчэнне, як было заведзена з даўніх часоў, у царкве, дзе адбыліся ўрачыстыя службы. Царква размешчана ў будынку былой участковай бальніцы (а яшчэ раней там знаходзілася земская школа), знешне яна яшчэ мала падобная на храм. Аднак рамонтныя работы працягваюцца, і яна прыме аблічча ў адпаведнасці з канонамі царкоўнай архітэктуры. Унутры ўжо ўсё амаль як было калісьці ў старой царкве. Яна знаходзілася якраз насупраць. Кашчунскі разрабаваная і аддадзеная пад клуб у трыццатыя гады, яна даўно перастала дзейнічаць, а восенню 1943 г. у час баёў з фашыстамі наогул згарэла.

Аднак многія іконы, культавыя прадметы вернікам удалося выратаваць і захаваць да сённяшніх дзён, і зараз яны знаходзяцца там, дзе і павінны быць. Вяскоўцы вярнулі ўсё, што раней належала царкве — іконы: цар-Бог, Пакрова прасвятой Багародзіцы, Мікалая-цудатворца, Івана Хрысціцеля і іншыя. У дзень каляд прыхаджане з пасёлка Ваявода ўрачыста, з царкоўнымі спевамі, прынеслі ікону Казанскай Божай Мацеры.

Пабудаваць царкву дапамаглі саўгасы «Паўднёвы» і «Гомельскі».

Маяк. 1992. 8 лютага.

ВЯСКОВЫ КІНАМЕХАНІК

Кінамеханік Красненскага стацыянара А.В.Картузаў — цікавы субяседнік. Ён ужо больш сарака гадоў займаецца любімай справай. Анатоль Васільевіч падстройваўся пад сваіх гледачоў, паказваў кіно ў зручны час. І людзі былі задаволены. Ён любіць сваю справу душой і сэрцам.

Позна вечарам пачынае дэманстраваць кіно вясковы кінамеханік А.В.Картузаў. Калі людзей прыходзіць больш, ён радуецца, калі менш — засмучваецца. Верыць, што настане той дзень, калі арганізацыі адпачынку людзей будзе ўдзяляцца належная ўвага.

Маяк. 1992. 22 жніўня.

ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОРНЫ КАЛЕКТЫЎ УРЫЦКАГА ДОМА КУЛЬТУРЫ

Гэты калектыў створаны зусім нядаўна, у лістападзе 1992 г. Кіруе ім рэжысёр масавых прадстаўленняў Урыцкага рэгіянальнага цэнтра культуры і адпачынку Р.А.Лянкова.

У саставе новага ансамбля 15 вучняў сёмых — восьмых класаў.

У СДК дзейнічае таксама дзіцячы калектыў, які выконвае сучасныя танцы. У яго саставе ўдвая больш хлопчыкаў і дзяўчынак. З імі займаецца энтузіяст гэтай справы І.Г.Сінякова.

Адначасова працягваецца дзейнасць народнага фальклорнага калектыву «Скарыначка», якая працуе над увасабленнем на сцэне беларускага вясельнага абраду. Трэба, каб людзі памяталі пра быт і звычаі продкаў.

Вядома, не ўсё з таго, што мела месца ў мінулым, можна перанесці ў сучаснае жыццё. Але ведаць аб гэтым — значыць узбагаціць сябе духоўна, яшчэ больш палюбіць родны край.

Маяк. 1993. 6 лютага.

ФАЛЬКЛОРНА-ЭТНАГРАФІЧНЫ КАЛЕКТЫЎ РУДНЯ- МАРЫМОНАЎСКАГА СЕЛЬСКАГА ДОМА КУЛЬТУРЫ

Калектыў мае фальклорны напрамак, аб чым сведчаць і рэпертуар, і нацыянальныя касцюмы ўдзельнікаў самадзейнасці, і выкарыстанне такіх інструментаў, як бубен, свістулькі і г.д.

У гэтым жа пераконвае афармленне сцэны. Яна ўпрыгожана пасцілкамі, рушнікамі і іншымі рэчамі, якія выткалі і вышылі самі артысты-аматары. Яны ж з'яўляюцца гарачымі прыхільнікамі беларускай народнай песні.

Калектыў невялікі, аб'ядноўвае 14 чалавек. Галоўным чынам гэта жанчыны.

Актыўным удзельнікам канцэртаў з'яўляецца вядучая, старшыня прафкома саўгаса Таісія Пятроўна Мялешка.

Маяк. 1993. 8 мая.

ПРАФТЭХВУЧЫЛІШЧА № 185 СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

У верасні 1973 года ў в. Прыбар былі закладзены падмуркі пад першыя будынкі прафтэхвучылішча № 185. Праз два гады тут ужо займаліся дзве групы рабят. Цяпер такіх груп — дзесяткі, у якіх разам з філіялам ПТВ у Церахоўцы Добрушскага раёна вучацца 450 юнакоў і дзяўчат. Яны набываюць спецыяльнасці майстра сельскагаспадарчай вытворчасці, лабаранта хіміка-бактэрыялагічнага аналізу, майстра-плодаагароднінавода і повара, трактарыста-машыніста шырокага профілю і вадзіцеля. За перыяд існавання вучылішча з яго сцен выйшлі звыш 7000 кваліфікаваных работнікаў, якія працуюць у розных кутках Гомельшчыны, а таксама сумежных абласцей Расіі і Украіны.

Пад кіраўніцтвам заслужанага работніка прафтэхадукацыі рэспублікі І.М.Васючэнкі стаў дзейнічаць гурток мастацкай і тэхнічнай творчасці.

Сабраны экспанаты і аформлена экспазіцыя музея «Памяць». Многія яго матэрыялы прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне. Тут сабраны шматлікія экспанаты пра воінаў Савецкай Арміі, партызан і падпольшчыкаў, мірных грамадзян Прыбарскага с/с, якія загінулі ад рук гітлераўцаў, пра ветэранаў, што цяпер у страі.

Прадстаўлены матэрыялы аб мінулым і сучасным прафтэхвучылішча.

Маяк. 1993. 15 мая.

«Помню свой народ...»

З пісьма ў раённую камісію па напісанні кнігі «Памяць»

Я, Садоводова Мария Яковлевна, белоруска, 1935 г. рождения, д. Межи Гомельского р-на, Карнолинского с/сов.

Наша семья до войны проживала в д. Межи. Родители, колхозники колхоза им. М.Горького. В нашей семье проживал брат моего отца Иван. Был он без родителей, молодой, примерно 20 лет, но был инвалидом. Гомельским военкомом был выдан билет о непригодности к службе. В 1941 году отец был призван в Красную Армию, а дяде поручили колхозных коров. Они были где-то укрыты в липовских лесах. Но в 1942 или 1943 г. лагерь был обнаружен. Их поймали. Было их 11 человек и расстреляли. Дядю расстреляли около д.Михальки глубокой осенью. Место расстрела охранялось. Только весной мать ночью с моим старшим братом похоронили. Я это место не помню, а вскоре и умерла мать. Нас осталось 4 детей, старшей Оле было примерно 11 лет. Она окончила 4 класса в Межах. Брат, я и младшая сестра еще в школу не ходили. В 1945 году мы попали в Улуковский д/дом № 20, где и выросли. После 8 кл. я была направлена в г. Ригу. Окончила училище связи и направлена работать в Карело-Финскую республику. Брат проживал на Кубани в станице Бакинской, умер в 1986 г. Сестра Оля строила Сталинградскую ГЭС и живет в г. Волжском. Самая маленькая Нина живет в Нижнем Тагиле. Очень хочется увидеть свою Родину, но не к кому приехать. Так судьба нас, а вернее война, разбросала по всем частям СССР.

Помню свой народ, свой язык, тоскую, иногда плачу, но нет возможности побывать в родных местах. Спасибо вам и простите, что столько написала.

М.Я.Филиппова.

Вызначыліся працай

ГЕРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

ВАСІЛЬКОВА Таццяна Вяргееўна, нарадзілася 25.10.1933 г. у в. Янова Веткаўскага раёна. Перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці, Герой Сацыялістычнай Працы (1966). З 1954 г. працавала даяркай, з 1971 г. учотчыцай малочнатаварнай фермы калгаса імя Леніна. Узнагароджана ордэнам Леніна (1958).

Званне Героя прысвоена за поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі.

ЖАЛЯЗНЯК Віталій Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1937 г. у в. Уборкі Лоеўскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1986). У 1955 г. скончыў сярэднюю школу. Працаваў матарыстам на радыёвузле, потым механікам на жывёлагадоўчай ферме, загадчыкам гаража, галоўным інжынерам (1962—1964). З лютага 1964 г. інжынер саўгаса імя Горкага Гомельскага р-на. З 1966 г. старшыня калгаса «Бальшавік». У 1974—1995 гг. узначальваў калгас імя Леніна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі «За працоўную адзнаку».

З 30.3.1995 г. старшыня Пакалюбіцкага сельскага Савета. Жыве ў в. Пакалюбічы.

КАВАЛЁВА Марыя Іосіфаўна, нарадзілася 15.6.1905 г. у в. Валатава. Перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці, Герой Сацыялістычнай Працы (1958). З 1930 г. працавала ў калгасе «Чырвоная ніва» (з 1931 г. калгас імя Леніна), потым даяркай, загадчыцай малочнатаварнай фермы, старшынёй калгаса, у 1951—1976 гг. загадчыцай малочнатаварнай фермы. Званне Героя прысвоена за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі.

КАВАЛЁВА Пелагея Нікандраўна, нарадзілася 9.4.1902 г. у в. Заліп'е. Герой Сацыялістычнай Працы (1960). У 1919—1923 гг. працавала настаўніцай пачатковай школы, у 1931—1938 гг. у калгасе імя М.Горкага. У 1938—1941 гг., 1945—1948 гг. намеснік старшыні Гомельскага райвыканкома, у 1950—1952 гг. другі сакратар Гомельскага РК КПБ. У 1952—1964 гг. старшыня калгаса «За Радзіму». Званне Героя прысвоена за поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі і павышэнні вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў.

Т.В.Васількова.

В.І.Жалязняк.

М.І.Кавалёва.

П.Н.Кавалёва.

М.В.Казлова.

А.Г.Каргін.

М.Х.Ш.Качароўскі.

А.Т.Кобрусеў.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1954—1959 гг. Узнагароджана двума ордэнамі Леніна (1958), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памерла ў 1995 г.

КАЗЛОВА Марыя Васільеўна, нарадзілася 14.5.1922 г. у в. Галавінцы. Герой Сацыялістычнай Працы (1971). Працоўную дзейнасць пачала ў калгасе імя Варашылава. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны прымала ўдзел у эвакуацыі калгаснага статка, з якім прайшла пешшу ад Гомеля да Курска. У 1946—1977 гг. працавала даяркай у саўгасе «Бярозкі» (потым племзавод «Бярозкі»). За высокія паказчыкі ў працы неаднаразова ўзнагароджвалася медалямі. Званне Героя прысвоена за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1975—1980 гг.

КАРГІН Аляксей Георгіевіч, нарадзіўся 23.2.1924 г. у в. Пуркаева Дубенскага р-на, Мардовія. Партыйны і дзяржаўны дзеяч. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеняў, Чырвонай Зоркі, медалямі. З 1954 г. другі сакратар Гомельскага РК КПБ, з 1959 г. старшыня Гомельскага райвыканкома, з 1960 г. першы сакратар Гомельскага РК КПБ. У 1966—1969 гг. сакратар Гомельскага абкома КПБ. У 1970—1979 гг. галоўны дзяржаўны інспектар па закупках і якасці сельгаспрадуктаў па Гомельскай вобл. Памёр у 1992 г.

КАЧАРОЎСКІ Моўша Хаім Шлёмавіч, нарадзіўся 5.12.1910 г. у г. Хойнікі. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). У 1948—1953 гг. аграном саўгаса «Брылёва», з 1953 г. старшыня калгаса імя Мікаяна (з 1957 г. калгас «Перамога»). З 1976 г. намеснік старшыні калгаса «Перамога», з 1979 г. намеснік старшыні калгаса імя XXII з'езда КПСС. Званне Героя прысвоена за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна (1958), ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1971), медалямі.

КОБРУСЕЎ Аркадзь Тарасавіч, нарадзіўся 24.7.1937 г. у пас. Івашкава Буда-Кашалёўскага раёна. Герой Сацыялістычнай Працы (1988). У 1963 г.

скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў намеснікам начальніка (з 1965 г.), начальнікам (з 1969 г.) упраўлення сельскай гаспадаркі Гомельскага райвыканкома. З 1979 г. дырэктар саўгаса «Брылёва». Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны».

З клопатам пра людзей

Калядныя і шчадроўныя абрады суправаджаліся песнямі, якія ўражваюць паўнатой захавання сюжэтаў, перапляценнем язычніцкіх элементаў з хрысціянскімі. У цэнтры калядных песень, адрасаваных гаспадару, гаспадыні, дачцэ, сыну, — клопаты земляроба-селяніна аб будучых сяўбе, ураджаі. Асноўны ідэйны сэнс калядных песень — пажаданне гаспадару і гаспадыні шчасця і здароўя, добрага ўраджаю, прыплоду ў гаспадарцы, услаўленне іх дбайнасці і працавітасці, мудрасці і ўвішнасці...

Нельга не адзначыць, што арганічную частку народнай культуры жыхароў Гомельскага раёна складае калядная варажба, вядомая і ў іншых рэгіёнах Беларусі. Гэта надзвычай паэтычная старонка жыцця нашых далёкіх продкаў, для якіх варажба была надзеяй, імкненнем зазірнуць у будучае, адчуць сваё яднанне з прыродай, усцешыць свае рамантычныя летуценні. У якіх бы вёсках Гомельскага раёна мы не закраналі гэтага пытання ў гутарках са старымі людзьмі, усюды атрымлівалі шматлікія звесткі па каляднай варажбе, асабліва любоўнай, што адбывалася на другую куццю. Прывядзём некаторыя прыклады мясцовай навагодняй варажбы:

1. Вечарам трэба было ісці на сметнік і абсыпацца канапелькамі, а ў гэты час трэба было гаварыць такія словы: «Святы Андрэй, канапелькі сею, дай, Божа, знаці, з кім мне іх збіраці». Пасля гэтага ісці ў хату і класціся спаць, ні з кім не размаўляць. Хто прысніцца, за таго і замуж пойдзеш (в. Чкалава).

2. На маладзік дзяўчаты выходзілі на ганак і казалі:

Маладзік малады,
У цябе рог залаты,
Усім друзей выбіраў,
Выбер мне аднаго.

Хто сасніцца ў гэту ноч, гэта і будзе твой суджаны (пас. Мічурынскі).

3. Дзеўкі ў хаце крышылі булку ці хлеб і раскладвалі на парозе, падлозе, затым выпускалі курыцу ці пеўня. Чый кавалак хлеба клюне першым курыца ці певень, тая дзяўчына першай пойдзе замуж.

4. Дзяўчына кладзе пад ложак сваёй маці скавараду і чапялу так, каб яна не ведала, са словамі: «Суджаны, ражаны, прыхадзі да цёшчы бліны есці». Калі матцы прысніцца, што яна корміць блінамі якога-небудзь хлопца, то ён і ёсць суджаны яе дачкі.

5. Калі клалася спаць дзяўчына, то знімала адну панчоху, а над другой прыгаворвала: «Суджаны, ражаны, прыходзь чулок сымаць». Каго ўбачыць у сне, той і будзе суджаным (в. Прыбыткі).

Абавязковай часткай калядных святочных забаў моладзі Гомельскага раёна былі калядныя гульні, сярод якіх можна вылучыць «Жаніцьбу Цярэшкі», варыянт якой давялося запісаць у в. Чкалава ад Х.І.Долбікавай, 1904 г.н.: «Гульня пачыналася па камандзе гаспадара хаты: «Што гэта ўсё песні да скокі. Лепш бы Цярэшку жанілі». Пасля гэтага моладзь пачынае падбіраць хлопца, які б згадзіўся на ролю Цярэшкі.

Калі такі знойдзецца, пачынаюць спяваць:

Цярэшка валочыцца,
Яму жаніцца хочыцца.
Валочыцца, выглядае,
Каго-то ён спаймае.

У гэты момант Цярэшка ловіць выбраную ім дзяўчыну, бярэ яе за руку і падводзіць да абраных «бацькі» і «маткі», просячы дазволу ажаніцца. «Бацькі» яго адгаворваюць і высмейваюць: «Ты ж нічога не ўмееш рабіць, малы і неразумны. Ты ж не знаеш, што і з жонкай рабіць». Але хлопец стаіць на сваім: «Жаніцца хачу». Ды і моладзь патрабуе хутчэй пачынаць «жаніць Цярэшку». «Бацькі» згаджаюцца і «бласлаўляюць» маладых. «Бласлаўленне» насіла жартаўлівы характар. Пасля яго «матка» спявае: «А сёння вяселлейка Бог нам даў, ажаніўся мех, торбу ўзяў». Дзяўчаты спявалі жартаўлівыя песні:

На гарэ дрэнны авёс,
Чаго ты, Цярэшка, не падрос,
Ці цябе дожджык не паліваў,
Ці цябе татулька пракляў?

Потым садзіліся ўсе за сталы, частаваліся, спявалі розныя песні. Нават крычалі «маладым» горка. Хлопцы расказвалі розныя небыліцы, жахі, загадвалі загадкі, жартавалі, смяяліся, танцавалі. Спявалі прыпеўкі. Дзялілі і «каравай». Усё праходзіла смешна і весела. Пасля «дзяльбы каравая» маладых клалі спаць. Дзяўчына вырываецца і ўцякае з хаты. Тады Цярэшку спяваюць:

Цярэшку бяда стала,
З кім яго жонка спала?
Ці ў полі пад ліпкай,
Ці ў садзе пад грушаю
З маладым Андрушкаю,
Ці ў гаю зеляненькім
З казаком маладзенькім?

Пасля гэтага моладзь з песнямі разыходзілася дадому». (Запісала Ю.А.Краўцова ў в. Чкалава ад Х.І.Долбікавай.)

Надзвычай шырока ў фальклоры Гомельскага раёна прадстаўлена каляндарна-абрадавая паэзія веснавога цыкла, якая выяўляе не толькі агульныя заканамернасці, але і яркія спецыфічныя мясцовыя адметнасці. У некаторых вёсках Гомельскага раёна гуканне вясны адбывалася ў розныя дні: на Еўдакію (14 сакавіка), на Саракі (22 сакавіка) і на Благавешчанне (7 красавіка).

Паводле інфармацыі, атрыманай у в. Чкалава, на Саракі выпякалі з цеста 40 фігурак птушак, у адну з якіх абавязкова клалі капейку, з якой і звязвалі надзеі на поспех і шчасце на працягу ўсяго гаспадарчага года. Пэўныя магічныя дзеянні на Саракі выконвалі дзеці, напрыклад, з мэтай аблегчыць прылёт птушак яны перакідвалі цераз стрэхі хат трэскі, прыносілі ў хату сорак трэсак.

Перад тым, як ісці гукаць вясну, пыталі ў бацькоў благаславення і дазволу: «Бацька і маці, дазвольце ісці вясну гукаці», на

што атрымлівалі адказ: «Бласлаўляем, ідзіце, дзеці, вясну сустракаці, зіму праганяці».

Пад час абраду гукання моладзь падзялялася на два гурты, якія знаходзіліся на розных берагах рэчкі і вялі паміж сабою песенную пераклічку. Акрамя гэтага, распальвалі вогнішча, гушкаліся на арэлях і спявалі да самага вечара наступныя песні:

Як на Саракі
Калыхаліся.
Ой, люлі-люлі,
Калыхаліся.

Сорак вожачак
Перарвалася.
Ой, люлі-люлі,
Перарвалася.

Сорак хлопчыкаў
Паўбавілася.
Ой, люлі-люлі,
Паўбавілася.

Сорак дзевачак
Зажурылася.
Ой, люлі-люлі,
Зажурылася.

Адметнасцю веснавога фальклору Гомельскага раёна з'яўляецца бытаванне карагодаў і карагодных песень, асноўнымі матывамі якіх з'яўляліся шлюбныя:

Ой, пусці, маці, да й на рэчку гуляці,
Ой, люлі, на рэчку гуляці.
На рэчцы гуляці да селязнёў ждаць,
Ой, люлі-люлі, селязнёў ждаць.
А то й не селязні да й не насатыя,
Там два малойцы нежанатыя.
(в. Чкалава)

Па сведчанні нашых славутых фальклярыстаў XIX ст. З. Радчанка і Е. Раманава на тэрыторыі Гомельскага раёна быў вядомы звычай «вадзіць сулу». На вялікі жаль, у працах гэтых збіральнікаў няма падрабязных звестак, апісанняў «пахавання стралы». Узнавіць гэты цікавы абрад нам пашчасціла ў в. Краўцоўка, жыхаркі якой В.Л.Анохава і В.А.Кулік засведчылі, што абрад «ваджэння сулы» адбываўся на другі дзень Вялікадня, у адрозненне ад іншых рэгіёнаў Гомельшчыны. Збіраліся жанчыны і, утварыўшы своеасаблівы карагод-ланцуг упоперак вуліцы, ішлі, выконваючы песню:

Ой, ідзе сула да й удоль сяла,
Што ўбіла страла добра моладца.
Па таму моладцу некаму плакаці.
Адкуль узяліся да тры пташачкі,
Тры пташачкі, тры зязюлечкі.
Адна села ў галовачках,
А другая села на шчырым сэрцы,
А трэцяя села ў ножачках.
Дзе мамка плача, там крынічанька.
Мамка плача век да веку,
А сястра плача год да году,
А жана плача да абедзейка.
А паабедаўшы, у зялёны сад пайшла,
Да сабе трох знайшла.

Пасля гэтага адна з удзельніц прапаноўвала павадзіць карагод каля якой-небудзь хаты, каб «радзіла добра капуста, агародніна», пры гэтым абавязкова спявалі песні «Як на нашай вуліцы шырокае возера», «Канапля, канапля» і інш.:

Канапля, канапля,
Канапелька мая.
Чым, канапелька, не зялёна стаіш.
А як жа мне, канапельцы,
Да зяленькай быць,
З ісподу канапельку
Вада падмыла,
А ў полі канапельку
Хваля зламіла.
Зверху канапельку
Вераб'і клююць.

Гаспадар жа, каля хаты якога вадзілі карагод, выносіў стол з пачастункамі. Пасля таго, як усе ўдзельнікі пачастуюцца, з жартамі, песнямі накіроўваліся па вёсцы да наступнай хаты, каля якой дамаўляліся вадзіць карагод. Ідучы, спявалі:

Самая работніца,
На вуліцу ахотніца.
Люлюшкі, люлі,
На вуліцу ахотніца.

Паставіла кросны,
Дзевятыя вёсны.
Люлюшкі, люлі,
Дзевятыя вёсны.

У ніту ні ніціны,
У бердзі ні трасціны.
Люлюшкі, люлі,
У бердзі ні трасціны.

Чоўнік з цэпкаю
Пабеглі за дзеўкамі.
Люлюшкі, люлі,
Пабеглі за дзеўкамі.

Панажы пад лаўкаю
Зараслі мураўкаю.
Люлюшкі, люлі,
Зараслі мураўкаю.

Нам не давялося запісаць іншых тлумачэнняў абраду «ваджэння сулы», акрамя магічнай яго прымеркаванасці да добрага ўраджаю агародніны і капусты, а таксама шлюбнай абумоўленасці выканання адпаведных песень «стралы»: «Святкуюць сулу не толькі, каб радзіла капуста, а і таму, што пасля Пасхі можна было пачынаць спраўляць вяселлі».

Разнастайнымі абрадавымі магічнымі дзеяннямі суправаджалася і свята Юр'я (6 мая). На парозе хлява клалі крапіву з мэтай засцярогі ад злых чар мясцовых ведзьмаў, тройчы абыходзілі карову з хлебам, соллю і свечкай, замаўляючы яе: «Выганяю цябе, кароўка, на крутую гару, на шаўковую траву. Рожкамі каліся, ножкамі тапчыся, хвосцікам махай, сваё малачко нікому не аддавай» (в. Чкалава). Заклінанне з'яўлялася арганічнай часткай юр'евай абраднасці. На Юр'я абавязкова, паводле звестак інфарматараў, «поп з іконаю абыходзіў палі, свяціў іх, прычым у адно месца зганялі і кароў, і коней, поп з малітваю тры разы абыходзіў статак» (в. Чкалава).

Пад час свята Юр'я, паводле этнаграфічных звестак, запісаных З.Радчанка ў Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета, выконваўся звычай «юрыцца», калі «дзяўчаты, і нават дзеці, ідуць за вёску ў поле або ў лясок і пад бярозкаю пражаць яечню; у гэты час дзяўчаты выбіраюць сабе сяброўку на ўвесь год, пры гэтым мяняюцца паясамі і хусткамі, пасля чаго гавораць: «Мы з ёю паюрыліся». Звычай гэты суправаджаўся спяваннем вясняк». [Радченко З. Гомельские народные песни (белорусские и малорусские). СПб., 1888. С. 22.] Апісаны рытуал па сутнасці блізкі да траецкага абраду кумлення.

Матыў адмыкання зямлі спецыяльнымі ключамі — адметная рыса юр'еўскіх песень, запісаных у вёсках Гомельскага раёна:

А Юрь'ева маці,
Божа мілы!
Па небе хадзіла,
З Юр'ем гаварыла:
— А Юр'ю, мой Юр'ю,
Падай Пятру ключы
Зямлю адамкнуці,
Траву выпусціці.
(в. Будзішча)

Тройцу, агульнавядомае на Беларусі свята, называюць у вёсках Гомельскага раёна «аброчным днём». Паводле сведчанняў інфарматараў з в. Краўцоўка, «абракаліся на Тройцу, каб не піць, не гуляць у гэты дзень, ішлі да крыніцы, маліліся, бралі крынічную ваду і загаворвалі яе, упрыгожвалі зелянінай вокны, бярозкамі двары, рвалі любісту». Паводле звестак, запісаных у в. Дуянаўка, «на Тройцу абавязкова рабілі складчыну, неслі з дому прадукты, збіраліся ці ў полі, ці ў якой-небудзь хаце, пяклі яечню і бліны».

У в. Брылёва праз тры дні пасля Тройцы галінкі бярозы ці клёна, якімі ўпрыгожвалі хату і двор, спальвалі і попелам пасыпалі агарод з мэтай палепшыць ураджайнасць. Па ўспамінах інфарматараў, у гэтай жа вёсцы надзвычай распаўсюджанай была традыцыя кумлення, калі дзяўчаты хадзілі ў лес і звязвалі галіны дзвюх бяроз, праходзячы праз утворануюю «бярозавую арку», куміліся, цалаваліся, заключалі саюз на сяброўства, дасягалі вышэйшай прыязнасці. Як паведаміла жыхарка в. Каранёўка А.Ф.Міневіч, 1923 г.н., на Тройцу «ўпрыгожвалі зялёнымі галінкамі хату, а дзяўчаты ішлі ў лес і ўпрыгожвалі дрэвы стужкамі, звязвалі разам гнуткія бярозы, пад якімі праходзілі тры разы, куміліся. Затым была калектыўная трапеза, пяклі яечню. Дзяўчаты, што ўтварылі пару ў час абраду, не мелі права сварыцца між сабой цэлы тыдзень. Праз тыдзень зноў з песнямі ішлі ў лес, развязвалі бярозы».

Па ўспамінах жыхароў в. Зябраўка, у звычаі кумлення «прымалі ўдзел дзеці на першы дзень Тройцы, а на другі дзень — старэйшыя. Спачатку ідуць па вуліцы вёскі, адзенуцца ў работнікаў, касароў, цыганоў. Калі, хто хоча ўдзельнічаць у гэтым, то даюць сала, яйкі, а потым збіраюцца ў хату і кумяцца, і спяваюць усякія песні».

У траецкіх песнях гучалі як земляроб-

чыя матывы, так і шлюбныя. Паводле звестак, запісаных у в. Бабовічы ад Г.М.Палавінка, 1928 г.н., «дзяўчаты хадзілі на луг, вілі вянкі з кветак і кідалі іх у ваду, сачылі, калі вянок патоне, значыць, тую дзяўчыну чакае няшчасце, калі паплыве — выйдзе замуж». Матывы дзявочай варажбы знайшлі адлюстраванне ў наступнай траецкай песні сумнага шлюбнага характару:

Ой, дзевачкі, падружачкі мае,
Як будзеце на луг ісці, гукайце і мяне,
Як будзеце кветачкі рваць,
Нарвіце і мне.

Як будзеце вяночкі віць,
Саўіце і мне.
Як будзеце на рэчку несць,
Нясіце вы і мой.

Як будзеце на ваду пускаць,
Пусціце вы і мой.
Усе вянкі паплылі,
А мой на дно ўпаў.

Усе вянкі паплылі,
А мой на дно ўпаў.
Усе хлопцы з вайны прыйшлі,
А мой там і прапаў.
(в. Бабовічы)

Паводле народных уяўленняў, заключэнне шлюбу павінна было паўплываць на ўрадлівасць зямлі:

Ой, ты, Тройца,
Прасвятая багародзіца.
А хто лён пасеяў,
То няхай зародзіцца.
А хто лён сеяў,
То няхай зародзіцца.
А хто не сеяў,
То няхай не родзіцца.
(в. Брылёва)

Вядомы быў на тэрыторыі Гомельскага раёна і абрад праводзін русалкі. Аб гэтым сведчаць матэрыялы, занатаваныя ў свой час у Новых Дзятлавічах З.Радчанка. Дарэчы, як яна адзначыла, праводзіны русалкі адбываліся на свята Івана Купалы 24 чэрвеня (па старым стылі): «...калі сонца зайдзе, усе дзяўчаты збіраюцца за вёскай і ўюць вялізныя вянкі для ўсіх; асабліва незвычайна вялізны вянок для дзяўчыны, якая ўяўляе русалку. Русалкай выбіраюць тую, якая мае самыя доўгія валасы; яна скідае свой андарак і застаецца ў адной кашулі з расшпіленым каўняром; калі ж русалка смялейшая, то скідае нават і кашулю; доўгія распушчаныя валасы вісяць па плячах, велізарны вянок, як кола, накрывае ўсю галаву. Тут жа выбіраюць і маленькую дзяўчынку на ролю дачкі русалкі; у гэты ж час робяць з саломы чучала, падобнае на чалавека. Калі ўсе вянкі надзеты і саламянае чучала гатова, бягуць у поле з русалкай наперадзе з песняй:

Правяду я русалачку да бору,
А сама вярнуся дадому.

Як дабягуць да поля, усе ідуць па мяжы і, выбраўшы месца далёка ад вёскі і засеянага поля, раскладаюць вялізнае вогнішча і кідаюць у яго чучала, пеючы песні пра Івана Купалу:

Купала на Івана, Купала!

Калі чучала згарыць, тады дзяўчаты і хлопцы скачуць праз гэты агонь і доўга яшчэ працягваюцца іх песні і скокі». [Радченко З. Гомельские народные песни (белорусские и малорусские). СПб., 1888. С. 26.]

Абрад праводзін русалкі, звесткі пра які давялося запісаць сёння, вызначаўся мясцовымі асаблівасцямі, яркімі тэатралізаванымі дзеяннямі. Акрамя таго, што выбіралі і ўпрыгожвалі русалку, удзельнікі абраду пераапраналіся ў цыган, дзядоў, прывідаў, чарцей, салдат.

Паводле сведчання жыхаркі в. Дуянаўка А.Н.Бураковай, 1928 г.н., «выводзілі русалку на двор са словамі: «Ідом, ідом, // Русалачку вядом, // Русалачка прыгожанька, // Наша жыта харошанька». Разыгрывалася своеасаблівае тэатралізаванае прадстаўленне, калі злосныя міфічныя сілы (чорт, ведзьма), «спрабавалі ўкрасці русалку, а астатнія ўдзельнікі відовішча абаранялі яе і не дазвалялі пакрыўдзіць». Пасля гэтага русалку вялі да жыта, прычым «кожны імкнуўся пабачыць, хто ж хаваецца пад выглядам русалкі, і таму пачыналі схоплівать з яе кветкі, вянкі, а русалачка адбівалася палкамі».

Сюжэты запісаных русальных песень нешматлікія, пад час абраду праводзін русалкі выконвалі песню на сюжэт «Правяду русалку ў жыта»:

Выступаюць сёстры Шафранскія.

Правяду русалку ў жыта,
А сама вярнуся да двара.
Правяду русалку ў капусту,
А сама вярнуся ў хату пусту.

Правяду русалку з лесу,
Рана, рана з лесу,
З лесу да ў ядраное жыта,
Вот там ёй і жыці.
(в. Дуянаўка)

Летні цыкл земляробчага календара прадстаўлены на тэрыторыі Гомельскага раёна купальскай і жніўнай паэзіяй. Што датычыць купальскай абраднасці, то найлепш у памяці жыхароў захаваліся міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з такімі персанажамі дэманалогіі, як ведзьмы. Як нам паведаміла жыхарка в. Бабовічы А.Я.Кезікава, 1922 г.н., «у етую ноч ведзьмы бяруць малако ад кароў, ходзяць па палях і завіваюць завязь у жыце (на чыёй паласе завіта завязь, дрэнна будзе для таго хазяіна: можа здохнуць карова, згарэць жыта). Каб вярнуць малако карове, трэба, каб другая ведзьма шаптала над каровай, выгаварвала нячыстае з етай каровы».

На Купалле дзяўчаты варожаць на купальскіх вянках, імкнуцца вызначыць свой лёс. Куды паплыве сплецены вяночак, у які ўстаўлялі запаленую свечку, у той бок дзяўчына выйдзе замуж, а калі вянок патоне, то чакай няшчасця. Верылі, што калі ідзе дождж на Купалле, то будзе неўраджай, галодны год. Па ўспамінах інфарматараў, увечары 23 чэрвеня моладзь збіралася на беразе ракі, раскладвала вогнішча, скакала цераз агонь, вадзіла вакол яго карагоды, спявала купальскія песні:

Кладзіце агні вялікія,
Паліце ведзьму лятучую,
Каб яна на полі не лятала,
Каб загонаў не ламала,
Каб яна па хлявах не хадзіла,
Каб яна кароў не даіла.
(в. Клімаўка)

* * *

Сядзела Купалка на плоце,
Яе галоўка ў злаце.
Ручкі ўніз апусціла,
У бога пагодкі прасіла.
— А дай жа, Божа, пагодку
На гэтую ночку-вясёлку.
Будуць музыкі граць,
Будуць дзевачкі спяваць,
Будуць зелейка збіраці.
Будуць зелейка збіраці,
У старога дзеда пытаці:
«Ой, дзед, дзеду, а што гэта за зелле?
Ці не дзявоцкае насенне?»
(в. Клімаўка)

Пра зажынкі ў памяці жыхароў вёсак Гомельскага раёна захаваліся небагатыя звесткі. Напрыклад, у пас. Мураўчы сёстры Шафранскія (Д.С.Чыжыкава, 1919 г.н., Н.С.Дуброўская, 1924 г.н., С.С.Мірoненка, 1928 г.н.) успаміналі, што калі «прыходзілі зажынкі, то рабілі вянок з каласоў, зажыналі першы сноп і клалі яго асобна, затым аддавалі яго гаспадару. Той ставіў яго на покуць, там сноп і стаяў, пакуль не малацілі. Святілі ж яго на першую прачыстую 28 жніўня, а насенне клалі ў семянное жыта».

Па словах жыхаркі в. Чкалава У.І.Сухоцкай, «зажынкі найчасцей рабілі надвячоркам. Гаспадыня, ідучы зажынаць, клапацілася аб тым, каб ніхто ёй не перайшоў дарогу, бо гэта лічылася дрэнным знакам. Жняя магла парэзаць сабе руку ў час жніва. Падышоўшы да нівы, жняя хрысцілася і казала: «Дай, божа, каб лёгка жалася, сярэдзінка не балела, ручанькі не млелі, галава не гарэла». Пасля гэтага клала ў жыта кавалак хлеба. Першай зжатай жменяй жыта жняя падпярэзвалася, каб на працягу ўсяго жніва не балела сярэдзіна. Потым нажынала невялікі сноп, адносіла яго дадому і хавала за абразамі. Гэты снапок як бы абярагаў ад усякага нядобрага, ад рознай бяды. На ніўцы жняя павінна была пакінуць перавясла і некалькі жменяў сцяблінак жыта на ім».

Зажынкавых песень не давялося запісаць, але ж затое ўласна жніўных песень, песень працы, нам праспявалі шмат. Галоўная тэма жніўных песень — гэта скарга на цяжкую працу, нежаданне вяртацца з поля ў дом свякрухі, сум і туга жанчыны па сваім дзявоцкім жыцці ў бацькоўскім доме, тэма сямейных адносін і інш. Асобную групу жніўных песень утвараюць сіроцкія песні («Сірата жыта жала»), у якіх ярка адлюстроўваўся душэўны стан дзяўчыны-сіраты:

Сіротачка жыта жала,
К сырой зямле прылягала.
— Ой, сырая маць-зямелька,
Узяла татку, узяла й мамку.

Узяла татку, узяла й мамку,
Узяла маю ўсю радзіну,
Узяла ўсю радзіну,
Вазьмі і мяне, сіраціну.

— Нашто цябе, дзеўка, браці,
Лучшы долю табе даці,
Ці коніка варанога,
Ці хлопчыка ўдалога.

— Нашто ваша мне доля,
Вазьмі мяне, сіраціну,
На коніку пракатацца,
А з мілёнкам цалавацца.
(в. Бабовічы)

Уласна жніўныя песні выконваліся па дарозе на поле і дадому, пад час жніва. Жніўныя песні розныя па характары — тужлівыя, баладнага характару, з трагічным матывам, жартоўныя, лірычныя.

У параўнанні з зажынкамі дажынкі як абрадавы комплекс больш поўна захавалі свае асноўныя абрадавыя моманты. Найбольш распаўсюджаным быў абрад «завівання барады», у якім адлюстраваліся ўяўленні аб духах нівы. Паводле ўспамінаў жыхаркі в. Чкалава У.І.Сухоцкай, 1920 г.н., дажынаць жыта збіраліся талакой, клікалі родзічаў, суседзяў, сяброў. У кутку апошняга загона завівалі бараду. Рабілі гэта так: унутры нязжатай лапінкі поля клалі хлеб і соль, а над імі звязвалі жытнія каласы чырвонай стужкай і спявалі:

Ой, чыя ж гэта барада,
Чырвоным шоўкам увіта.
Гэта Іванава барада
Чырвоным шоўкам увіта.

Паводле звестак, запісаных у в. Старая Беліца ад Г.І.Рыкавай, рабілі з галінак крыж, упрыгожвалі яго стужкамі, каласочкамі жыта і спявалі:

У нас сёння вайна была,
Усё поле зваявалі,
Змялі поле мяцёлкамі,
Ідзём дамоў вясёлкамі.

Па словах жыхаркі в. Бабовічы Гомельскага раёна А.Я.Кезікавай, 1922 г.н., «калі дажынаюць жыта, пакідаюць нямнога жыта на паласе. Завязваюць яго і робяць «ляльку», упрыгожваюць яе кветкамі, стужкамі. Яна застаецца на паласе, вакол яе гуляюць гульні, пяюць песні. Увечары ідуць дадому, але «ляльку» ніхто не разбурае».

На дажынках абавязковым з'яўляўся рытуал падрыхтоўкі дажынкавага снапа і пляцення вянка. Дажаўшы жыта, павод-

ле ўспамінаў жыхаркі в. Чкалава У.І.Сухоцкай, завіўшы бараду, некалькі жанчын плятуць вянкі для кожнай жнейкі і вялікі вянок для гаспадара. Калі пачыналі плесці вянок, то гаспадару спявалі:

Канец ніўцы, канец,
Пляцём гаспадару вянец.

Пасля таго, як быў вянок гатовы, жнеі апляталі каласамі сярпы, складалі снапы ў копы, надзявалі вянкі на галовы. Прыгожая, вясёлая жанчына-жняя, узяўшы дажынкавы сноп і вянок гаспадару, разам з іншымі жнеямі ішла з песнямі да хаты гаспадара, спяваючы:

Да гудзіць поле, гудзіць,
Жнейкі з поля ідуць.
Гаспадар, не пужайся,
У хатачцы не хавайся.
Выходзь жнеек сустракаць,
Вялі гарэлку падаваць.

Гаспадар сустракаў жней з хлебам і соллю. Жанчына-жняя, што несла вянок, надзявала яго на шыю гаспадару і прыгаворвала: «Прыняслі табе вянок з шырокага поля, з ядранага жыта. Гаспадару — вянок, а нам гарэлкі — збанок».

Пасля гэтага адбывалася частаванне, абавязковымі стравамі былі бліны, масла, каша. Наяўнасць апошняй стравы (кашы) тлумачылі тым, што ў будучым годзе пасевы павінны быць такімі ж густымі, як каша.

Вясельная абраднасць Гомельскага раёна ўключае такія этапы, як сватанне, змовіны, зборная субота, першы дзень вяселля, пасад, падрыхтоўка каравая, вянчанне ў царкве, дзяльба каравая, ад'езд нявесты ў дом жаніха, другі дзень вяселля ці пярэзвы. Звернемся да апісання асноўных вясельных абрадавых момантаў.

Сватанне адбывалася ў жартаўлівай форме, суправаджалася іншасказальнымі дыялогамі і ставіла на мэце дамовіцца аб шлюбе. У сваты, напрыклад, у в. Чкалава звычайна выпраўлялася чалавек 5—7, сярод якіх былі бацька, хросныя, дзядзькі, цёткі. Увайшоўшы ў двор, сваты падыходзілі да акна нявесцінага дома, стукалі ў шыбы і гаварылі:

«Добры вечар! Ці не пусціце нанач? Мы — з далёкага краю, прытаміліся». Гаспадар звычайна адказвае: «Добрае здароўе! Калі вы з добрымі намерамі, то заходзьце ў хату, а калі не, то ідзіце, адкуль прыйшлі». Сваты ў адказ: «Мы — людзі і з добрымі намерамі». Гаспадары запрашаюць: «Калі добрыя, то заходзьце ў хату». Далей ужо ў хаце дыялог працягваецца.

— Мы чулі, што ў вас цялушка ёсць, ці не прадасьце вы яе нам?

— Няма ў нас цялушкі, на мінулым тыдні прадалі.

— Не, нам не цялушка патрэбна. У вас дачка ёсць. Гавораць, што яна і прыгожая, і добрая гаспадыня, і да работы скорая. У вашым двары — красна дзявіца, у нашым двары — малады купец. Як сойдземся ў цане, дык яе купім».

Пры размове сватоў дзяўчына не павінна была прысутнічаць. Калі ж яны прасілі паказаць ім нявесту, то падводзілі ці бабулю, ці пераапранутага ў дзяўчыну хлопца.

У знак згоды на шлюб пад час сватання дзяўчына дорыць бацьку сарочку, а маці — хустку, ручнік, матэрыю на сукенку. Астатніх сватоў перавязваюць ручнікамі цераз плячо. Паводле этнаграфічных звестак, запісаных у в. Бабовічы, сваты, калі заходзяць у хату, спяваюць:

Наш хлеб, ваша вадзіца,
Наш хлопец, ваша дзевіца,
Наш хлопец не ўмее лапці плесці,
Наша дзевіца не ўмее хату месці,
Трэба іх да кучкі звесці.

Або:

Прыбілася рыбка к гату,
Пусці, сват, у хату,
Мы цябе не згубілі.
Возьмемо, што злюбім,
Вып'емо па кубачку,
Схопімо галубачку.
Вып'емо, подскочымо,
Возьмемо, што скочыло.

Калі ўжо засваталі нявесту, то адбываюцца змовіны. Як паведаміла інфарматар з в. Чкалава У.І.Сухоцкая, змовіны адбываюцца ў гэты ж дзень, што і сватанне. Сваты выстаўляюць на стол гарэлку, кладуць хлеб, а бацькі нявесты рыхтуюць закуску. У гэты ж час нявеста ідзе запрашаць сваіх бліжэйшых сваякоў, сяброўак і суседзяў на змовіны. Калі ўсе збіраюцца, то пачынаюцца частаванне, скокі, песні,

Гучаць жартаўлівыя прыпеўкі пра сватоў жаніха:

Нашы сваты дурні,
Заехалі ў гумны,
У гумне начавалі,
Мышы вушы паад'ядалі.

У адказ жа сваты жаніха спяваюць:

У нашага свата
Дзіравая хата,
Дроў ні палена,
Світка па калена.

За сталом у гэты час вядуцца размовы аб пасагу і дні вяселля:

Ну што ж, сват, я за сваю дачку дам тое,
што і людзі даюць: карову, авечку і парася.

Затым недзе ў тры гадзіны раніцы ўсе госці збіраюцца і з песнямі, жартамі ідуць да хаты жаніха «мазаць печ». Калі прыходзяць у хату, то малююць на печы вугалем, каму што ўздумаецца: кветкі, кружочкі, «хрэшчыкі» і г.д. Маці жаніха запрашае за стол гасцей і частуе іх. Пад час змовін у в. Бабовічы спявалі песні, а бацькі засватанай дзяўчыны звярталіся да гасцей са словамі:

Піце, сваты, гарэлку,
Запівайце дзеўку.
Няхай гэта дзявіца
З касою не ходзіць,
Хлопцаў не зводзіць,
Няхай тыя кавалеры
Платоў не ломяць.

На змовінах вырашалася, што вяселле можна прызначыць праз 3—4 тыдні.

Зборную суботу ў в. Чкалава Гомельскага раёна называюць разборнай кашай, праводзіцца яна ў суботу. У гэты дзень нявеста запрашае да сябе ўсіх сваіх сябровак, якія рыхтуюць вянок:

Прыйшлі дзевачкі ў хатку,
Яны не зналі парадку.
Нясі, Надзечка, што рабіць,
Нясі рутачку вянок шыць,
Нясі рутачку і іголку,
Нясі нітачак і іголку.

Маладая і першая шаферка прыносяць вэлюм, ніткі, іголку, астатнія сяброўкі робяць кветкі для жаніха і шафераў. Пры гэтым спяваюць песню:

Саборная суботачка настала,
Наша Надзечка ўсіх дзевачак сабрала,
А сабраўшы, па-за століку саджала,
Сама села на крэсельца вышэй усіх,
А скланіла галовачку ніжэй усіх.
Стаіць рутачка ля варот,
Ідзі, татачка, з касою,
Нясі рутачку з расою.
Ідзі, мамачка, з сярпочкам,
Сажні рутачку з цвяточкам,
Бо мне ўжо дзеўкай не быці,
З руты вяночкаў не віці,
Бо я ўжо дзеўкай адбыла,
З руты вяночкаў адвіла.

Выконваецца і песня, у якой гучыць матыў будучага сямейнага жыцця нявесты ў хаце свякрухі, выражаны ў форме паралелізму:

Чаго, зязюля, чаго шэрая
Да зямлі прылягаеш?
Ці ты, зязюля, ці ты, шэрая,
Цяжкую зіму чуеш?
А ці цяжкую, ці не цяжкую,
Зімачка — не лецечка.
Летам паляжу, ягадку знайду,
А зімой нічога.
Чаго, Надзечка, маладзенькая,
Так жалосненька плачаш?
Ці ты, Надзечка, маладзенькая,
Ліхую свякруху чуеш?
А ці ліхую, ці не ліхую,
Свякроўка — не мамачка.
У мамачкі жыла, позненька спала,
А ў свякрухі не буду.

Затым, калі ўжо гатовы вянок, то яго прымяраюць на замужнюю жанчыну ці «старую» дзеўку, бо па народных уяўленнях, калі дзяўчына да замужжа прымярае вянок, то хоць і пойдзе замуж, але вясельнага вянка не прыйдзецца ёй надзець. Пасля гэтага нявеста і першая шаферка адносяць вянок у другі пакой, а маці маладой запрашае ўсіх на частаванне, абавязковай стравай якога з'яўляецца каша. Малады выкупляе яе і разбівае гаршчок, дзеліць кашу на ўсіх прысутных. Па народным павер'і трэба ўсё выпіць і з'есці, што стаіць на стале, тады дзяўчаты замуж выйдуць у сваю вёску. Яшчэ адна цікавая прыкмета была звязана са зборнай суботай. Звычайна дзяўчаты ў гэты час п'юць, ядуць, жартуюць, а хлопцы стаяць у парозе і імкнуцца перахапіць у дзяўчат абрус і ўскінуць яго на страху. Дзяўчаты ж стараюцца вынесці абрус і павесіць яго на вароты, што абазначае, што ўсе яны выйдуць замуж.

Абрад падрыхтоўкі і выпечкі каравая не адрозніваўся асаблівым багаццем рытуалаў, але, тым не менш, у в. Каравышань Гомельскага раёна давялося запісаць звесткі пра гэты важны этап вясельнай абраднасці. Па ўспамінах Г.М.Старавойтавай, 1915 г.н., запрашалі «каравайніц», жанчын, якія добра пяклі, спявалі і танцавалі. Калі «каравайніца» пачынала замешваць цеста, то жанчыны гаварылі:

Благаславі, божа,
Блізкія людзі,
Гэтай жанчыне
Каравай замясіці.

Жанчыны-каравайніцы замешваюць цеста, а скончыўшы, спяваюць:

Дзякуй табе, божа,
Што мы справу ўжо зрабілі,
Каравай ужо замясілі,
Нашымі ручкамі беленькімі,
Персцянёчкамі залаценькімі.

Гаспадар запрашае жанчын за стол і частуе. Каравай выпякалі і ў хаце жаніха, і ў хаце нявесты, упрыгожвалі фігуркамі ў выглядзе нябесных свяціл сонца і месяца.

Першы дзень вяселля ці прыезд дружыны жаніха па нявесту захаваў шмат элементаў старажытнага вяселля, адным з якіх з'яўляўся рытуал выкупу маладой. Калі малады прыязджае да нявесты, то яго не пускаюць адразу ў двор, а зачыняюць вароты. Калі атрымаюць выкуп, то адчыняюць іх. Торг працягваецца і ў хаце нявесты, калі да жаніха падводзяць то бабулю, то іншую дзяўчыну замест нявесты, патрабуючы таксама выкуп.

Абрадавы момант вяселля пасад адбываўся перад ад'ездам маладых у царкву. Па словах жыхаркі в. Краўцоўка В.П.Анохавай, 1925 г.н., на пасад садзілі спачатку жаніха, засцілалі для гэтага лаву за сталом кажухом, маладую ж заводзіў на пасад брат, прычым ішлі па лаўках. Як паведамілі ў в. Чкалава, перад тым як сесці на пасад, бацька і маці благаслаўлялі маладых крыжам, жадаючы ім добрага жыцця і шчасця. На пасад маладыя мелі права сесці толькі ў выпадку захавання імі цнатлівасці. Паводле звестак, атрыманых ад інфарматараў в. Маркавічы, перад пасадам дзяўчаты выконвалі песню «Благаславі, Божа», пасля чаго хорам крычалі: «Скідайце ложкі, тарэлкі, што не нясуць гарэлкі», пры гэтым яны ўсе скідаліся са стала. Ім выносілі чарку, пасля гэтага садзілі маладую на пасад: ставілі ўслоны і абводзілі маладую паўз іх, гаворачы: «Карыся, Танечка, матцы і бацьку». Сярод павер'яў, звязаных з пасадам, адзначым наступныя: калі дзяўчына, якая выходзіла замуж, была першая сярод сваіх сябровак, то дзяўчаты крычалі ёй: «Таня, дзе ключы?» Яна адказвала: «Ключы ў аўсе, ідзіце за мной усе», што абазначала хуткае замужжа яе сябровак. Каб хутчэй выйсці замуж, адна з дзяўчат у час вяселля брала зубамі настольнік са стала, несла ў зубах і кідала на парозе.

Як паведаміла жыхарка в. Касцюкоўка С.Р.Малык, 1922 г.н., на пасадзе адбываліся наступныя магічныя дзеянні: бацькі маладой тройчы абводзілі свечкай вакол галавы нявесты, а затым свацця брала ў іх свечку і рабіла застрыжыны. Яна брала ў маладой шлюбны пярсцёнак і праз яго ў трох месцах трохі прыпальвала валасы на галаве ў маладой, а затым бацькі маладой «бралі платок і за сталом злучалі паміж сабой маладых». Песні, якія суправаджалі гэты вясельны этап, адрозніваліся непаўторным псіхалагізмам, эмацыянальнасцю:

Станавіся ўся радзіначка ў рад,
Будуць весці Манечку на пасад,
Усю сваю радзіначку абышла,
Сваёй роднай мамачкі не найшла.
(пас. Мураўчы)

Пасад перад ад'ездам маладых да вянца адлюстраваў рэшткі старажытнай рэлігіі славян, якія адухаўлялі і абагаўлялі з'явы і прадметы навакольнага свету. Шмат міфалагічных павер'яў выяўляецца і ў абрадзе вянчання ў царкве. Напрыклад, нявеста імкнецца «пацягнуць за сабой падножнік, каб яе сяброўкі хутчэй выходзілі замуж» ці назіралі за тым, як гараць свечкі, чыя свечка хутчэй згарыць, той першы памрэ (в. Чкалава); калі ў аднаго з маладых свечка патухне, то ён рана аўдавее, калі ж свечка «смаліць», то доўгага сумеснага жыцця не будзе (в. Прыбар).

Калі прыязджаюць маладыя ад вянца, то іх сустракаюць бацька і маці нявесты з іконай і хлебам-соллю. Як толькі маладыя заходзяць у двор, спяваюць:

Выходзь, мамачка, з свячамі,
Твайго дзіцятку звянчалі
З тым панічом, што ўчора быў,
Твайго дзіцятку спалюбіў.

Калі ж маладыя падыходзяць да бацькоў, выконваюць наступныя песенныя радкі:

Карысь, Надзечка, карыся,
Нізка ў ножкі кланяйся,
Коскамі зямельку ўсцялі,
Слёзкамі ножкі абаллі.

Кульмінацыйным момантам вяселля з'яўляецца дзяльба каравая як сімвалічны момант замацавання шлюбу маладых, жадання ім шчасця, багацця. Адзначым шырокі імправізацыйны характар вясельных пажаданняў, кожнае з якіх вызначалася і канкрэтна-прадметным зместам, і філасофскай скіраванасцю, і жыццёвай народнай мудрасцю і сведчыла аб вялікай веры людзей у магічную сілу слова, ад якога таксама залежалі дабрабыт і добрае сямейнае жыццё маладых.

Колькі ў лесе пянькоў,
Столькі вам сынкоў.
(в. Чкалава)

Дарую загон жыта,
Хочаце жніце, хочаце — не жніце,
А мяне за бабку вазьміце.
(в. Прыбар)

Дарую капейку на шчаслівую сямейку,
Дарую дзве, каб жылі з розумам у галаве,
А руб серабром, каб жылі з дабром,
Дару пятак проста так.
Кладу ўсе астальныя, каб былі нервы стальныя.
(в. Прыбар)

Пад час ад'езду нявесты ў дом жаніха адбываецца рытуал расплятання касы, калі брат маладой (нежанаты) здымае з галавы вянок і расплятае касу. Прычым маладую садзяць, па ўспамінах У.І.Сухоцкай з в. Чкалава, пад «ёлачку» — упрыгожаную галінку хвоі. «Ёлачка» — гэта ўвогуле важны рытуал пярэдадня вяселля на Гомельшчыне. Гэта сімвал цнатлівасці і прыгажосці маладой. Калі брат расплятае касу, то дзяўчаты спяваюць:

Ой, жаль, жаль, будзе Надзечцы касы,
Ой, не так касы, як дзявоцкае красы.

Цікава, што калі маладая ў гэты момант не плача, то гучыць песня:

Камяная да ты печачка,
Гарыш вечар да не выгарыш.
Маладая ж да ты Надзечка,
Вечар сядзіш да не заплачыш.
Сваёй мамачкі не разжаліш,
Ой, дайце ж ёй памочы,
Горкія цыбулі пад вочы.

Іншы раз, калі плача нявеста, то ў песенных радках гучаць смутак, душэўныя перажыванні маладой у сувязі з расстаннем з бацькоўскім домам:

Расплёў брат косачку,
Разліў ёй слёзачку.
Каса мая да русанькая,
Сляза мая гарачанькая.
(в. Чкалава)

— Ой, мая мамка, ці я табе надаела,
Ці я табе хлеба-солі паела,
Ці я табе, мая мамка, вады не насіла,
Аддаеш ты мяне замуж, каб я галасіла.
(в. Бабовічы)

Пасля гэтага адбываецца выкуп нявесты жаніхом, а таксама рытуал выкупу яе пасагу.

Калі вясельны поезд пад'язджае да двара маладога, то спяваюць:

Выйдзі, мамачка, паглядзі,
Што табе ваяры прывезлі,
Скрыню і пярыну,
Дзеўку-балярыну.
(в. Чкалава)

У хаце маладога адбываецца вясельнае застолле, таксама дзяльба каравая, рытуал адорвання нявестай радні маладога, рытуал падрыхтоўкі для маладых «пасцелі», якую раніцай свякруха са «сваш-камі» аглядалі. Калі маладая захавала цнатлівасць, то малады ішоў да цешчы з бутэлькай віна, абвязанай чырвонай лентай (пас. Мураўчы, в. Чкалава), ці ехаў з «красным флагам» (в. Бабовічы), у адваротным выпадку «на галаву маці нявесты надзявалі хамут» (в. Краўцоўка), ці «ставілі перад маці нявесты дзіравыя гліняныя міскі» (пас. Мураўчы), ці жаніх ішоў да цешчы з бутэлькай гарэлкі, але не кланяўся і не частаваўся там (в. Чкалава), давалі маці нявесты выпіць бруднай вады (в. Бабовічы). Апісаныя дзеянні сваімі каранямі ўзыходзяць да старажытных часоў і сведчаць аб высокай народнай маралі.

Здаўна існавала народнае павер'е, што ў выпадку захавання цнатлівасці маладую сям'ю чакае божае благаславенне, нецнатлівасць жа асацыіравалася з разладам у сям'і, спусташэннем.

Паслявясельную частку ў вёсках Гомельскага раёна называлі пярэзвамі, калі радня маладой збіралася ў госці да маладога. Гэты вясельны момант звязаны з рытуалам пераапранання жанчын у мужчынскае адзенне, а мужчын — у жаночае, што выклікала смех. Сярод удзельнікаў вясельнай світы — цыган, цыганка, доктар, «фальшывыя» жаніх і нявеста. Прыйшоўшы ў двор жаніха, госці маладой патрабуюць курыцу (калі нявеста захавала цнатлівасць). А ў в. Каравышань, па словах жыхаркі Г.М.Старавойтавай, 1915 г.н., «госці на другі дзень вяселля лавілі ў суседзяў курыцу, натырквалі яе на палку і праносілі праз усю вёску, ішлі з прыпеўкамі і песнямі, прыйшоўшы, абдзіралі курыцу і варылі булён, а несапраўдныя «жаніх» і «нявеста» паводзілі сябе як маладыя». Злавіўшы курыцу, раскладваюць пасярод вуліцы вогнішча і смаляць яе, скубуць пер'е, а падсмажыўшы, разрываюць яе на кавалкі і ядуць, нават «сырую грызуць», прамаўляючы:

Ці не заляцела наша шчырачка
Сюда к вам,
Хоць заляцела — не заляцела,
Насыпце круп,
Прывучыце тут, няхай вам.
(п. Мураўчы)

Вясельная абраднасць і паэзія Гомельскага раёна — цікавая і арганічная частка вясельнага фальклору Беларусі, але адметная сваімі рытуаламі і песнямі, якія захавалі шмат архаічных элементаў і адрозніваюцца высокамастацкімі якасцямі. Сёння многія вясельныя моманты страцілі сваю рэлігійна-магічную аснову, набылі характар гульні, але выконваюцца надзвычай сур'ёзна, даносячы да нас далёкі подых старажытных традыцый нашых продкаў.

Характарызуючы вусную народную творчасць Гомельскага раёна, варта падкрэсліць, што замовы як жанр і як сродак народнай медыцыны даволі шырока выкарыстоўваюцца жыхарамі. Да сённяшняга часу захавалі яны веру ў магічнае слова, яго здольнасць паўплываць на станоўчае вырашэнне жаданага.

Даволі значны час мы ігнаравалі замовы, з пагардай ставіліся да вопыту народных медыкаў-непрафесіяналаў, але ж пры гэтым траціліі магчымасць выкарыстаць назапашаныя стагоддзямі, праверaныя на практыцы шматлікіх пакаленняў рацыянальныя спосабы і сродкі дапамогі пры хваробах. А яшчэ тым самым мы пазбавілі сябе магчымасці задумацца над глыбокімі асновамі слова, якое здаўна надзелена магічным значэннем.

Найбольшую колькасць замоўных тэкстаў, якія адлюстравалі і язычніцкія элементы, і хрысціянскія, пашчасціла запісаць у такіх населеных пунктах, як Дуянаўка, Краўцоўка, Клімаўка, Раманавічы, Будзішча, Чарацянка, Пыхань, Глыбоцкае, Зялёныя Лукі, Калініна, Брылёва, Шарпілаўка і інш. Змястоўнымі, паэтычнымі, высокамастацкімі помнікамі народнага слова з'яўляюцца, напрыклад, тэксты замоў, запісаныя ў в. Дуянаўка ад В.Н.Суконнай і ў в. Чкалава ад У.І.Сухоцкай:

АД НАРАДКІ

Першым разам, божым часам, ранняя пара, ранішняя зара, стань на помашч. Нарадка, нарадка, прашу я цябе і ўпрашаю, тут табе не быць, касцей на ламаць, сэрца не крышыць, жывата не сушыць і красныя крыві не разжыгаць.

Выйдзі, нарадка, у чыстае поле. На моры ляжаў камень, на тым камені сядзелі тры дзявіцы, тры сястрыцы. Яны адна з адной змагаюцца. Адна кажа: «Я шоўкам вышываю». Другая кажа: «Узоры накладаю», а трэцяя кажа: «Нарадку выганяю». Выйдзі, нарадка, у чыстае поле з рабы божай (імя), там сонца не грэе, раса не ападае, рабы божай (імя) нарадку дажыдае (в. Чкалава).

АД СУДА

На ваўку еду, гадам паганяю,
Зубы, губы замаўляю.
Ёсць у мяне ў хлеве белая авечка,
Каб я не чула худога славечка.
Як гэта сценка нема,
Каб ты анямеў, на мяне худых слоў не меў,
А ўсе добрыя.
(в. Дуянаўка)

Сярод запісаных замоўных формул можна вылучыць замовы ад хвароб, гас-

падарчага характару, ахоўныя ад злых духаў і шкодных істот, любоўныя і замовы сацыяльнага зместу...

У найбольшай колькасці давялося запісаць народныя вераванні, прыкметы і павер'і ад жыхароў вёсак Гомельскага раёна. Напрыклад, у в. Краўцоўка ад В.П.Анохавай мы пачулі пра міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з абрадам закліkання дажджу, сутнасць якога заключалася ў тым, што калі доўга не было дажджу, то лавілі жабу ці рака, клалі ў лапаць, які «неслі два чалавекі, астатнія ж ішлі ўслед і галасілі, як па нябожчыку». Верылі, што здзейсненыя такім чынам магічныя дзеянні паспрыяюць дажджу.

Сярод іншых міфалагічных уяўленняў, запісаных, напрыклад, у в. Прыбыткі, можна адзначыць наступныя:

«Калі пасля вячэры застаўся на стале недаедзены хлеб, значыць, пакідаеш там сваё шчасце»;

«Калі хто-небудзь дае другому іголку, трэба ціхенька ўкалоць, каб не пасварыцца»;

«Калі сядзіш на стуле, нельга класці нагу за нагу і качаць, бо качаеш чорта»;

«На парозе не прывітаюцца, каб не пасварыцца»;

«Калі слюна пападзе на вопратку таму, хто сплёўвае, то пра яго будуць хадзіць чуткі».

Фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, запісаныя ў вёсках Гомельскага раёна, сведчаць, наколькі багатай і разнастайнай, мудрай і жыццёва неабходнай духоўнай крыніцай жыцця нашых далёкіх продкаў і сённяшніх жыхароў з'яўляецца вусная народная творчасць.

В.С.Новак.

Развіццё культуры

Дзень сённяшні

У раёне дзейнічаюць 102 установы культуры: Дом культуры, 33 сельскія Дамы культуры, 9 сельскіх клубаў, Урыцкі рэгіянальны цэнтр культуры (з 1991), Яромінскі маладзёжны цэнтр, 9 дзіцячых музычных школ (92 выкладчыкі, 714 навучэнцаў), 48 устаноў цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы (дырэктар Людміла Іванаўна Шурхавецкая), у тым ліку цэнтральная бібліятэка, 45 філіялаў, 2 дзіцячыя бібліятэкі. Бібліятэчны фонд складае 545,7 тысячы кніг, наведвае 27,6 тысячы чытачоў.

Дзейнічае 69 калектываў мастацкай самадзейнасці: 41 вакальна-харавы (з іх 12 дзіцячых), 13 танцавальных (з іх 9 дзіцячых), 2 тэатральна-драматычныя, 12 інструментальных (з іх 8 дзіцячых), 12 народных калектываў.

Сённяшні дзень характэрны адрад-

У Клімаўскай бібліятэцы.

Дом культуры калгаса «Урыцкае».

жэннем нацыянальных свят, абрадаў, гульняў, рамёстваў. Сталі традыцыяй у вёсках раёна каляндарна-абрадавыя святы «Калядкі», «Шчодрыкі», «Гуканне вясны», «Тройца», «Купалле», «Масленіца» і г.д. Толькі за 1995 г. адбылося 186 тэатралізаваных свят і прадстаўленняў (кіраўнік Ніна Аляксандраўна Сышчанка, дырэктар метадычнага цэнтра). Цікавасць выклікае дзіцячае свята «Цудоўная краіна Несцяроўка».

Бібліятэкары раёна пад кіраўніцтвам Ніны Васільеўны Серыкавай займаюцца зборам матэрыялаў аб гісторыі вёсак, гаспадарак, знакамітых земляках, запісваюць песні, казкі, байкі. На абласным конкурсе «Бібліятэка патрэбна грамадству» званне «Лепшы бібліятэкар-краязнаўца» прысвоена загадчыцы бібліятэкі калгаса «Цяплічны» Людміле Аляксандраўне Арэхавай.

Штогод у маі праводзіцца свята славянскай пісьменнасці. Афармляюцца кніжныя выставы: «Напачатку было слова», «Крыніца духоўнай мудрасці», «Адкуль наш род і наша мова» і інш. Праводзяцца бібліяграфічныя агляды, гутаркі з цыкла «Кагорта тытанаў» (пра Францыска Скарыну, Ефрасінню Полацкую, Сымона Буднага і інш.), «Помнікі беларускай пісьменнасці», «Мова нашых продкаў», літаратурныя вечары, сустрэчы з пісьменнікамі, якія жывуць і працуюць на Гомельшчыне.

Добра вядомы не толькі ў раёне, але і за яго межамі фальклорныя і мастацкія калектывы, якія маюць званне народных. Іх больш дзесятка.

Аматары народнага мастацтва часта выступаюць у працоўных калектывах, у месцах масавага адпачынку і за межамі раёна.

Творча працуюць аматарскія клубы і аб'яднанні па інтарэсах (52, у тым ліку 28 дзіцячых).

Народныя калектывы раёна

Прыбытка́ўскі народны хор сельскага Дома культуры. Створаны ў 1934 г., з 1962 г. мае званне народнага. Кіраўнікі: заслужаны дзеяч культуры БССР Ф.Пятрэнка (з 1934), С.Каплан (з 1981).

У рэпертуары апрацоўкі беларускіх і рускіх народных песень («А я ў печы не паліла», «Ой, сівы конь бяжыць», «Па гарохаўю, па ячанню», «Ці свет, ці світае», «Прыбытачкі», «Песня пра Ярмака»,

Выступае Прыбыткаўскі народны хор.

«Ружа бела-ружовая», «Прымусіў мяне муж»), песні беларускіх і іншых кампазітараў («Песня пра Брэсцкую крэпасць» У.Алоўнікава, «Партызанскі край» І.Кузняцова, «Наш край беларускі» Ю.Талесніка, «А маці ходзіць на курган» А.Пашкевіча і інш.). Калектыў — лаўрэат Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва (1967), дыпламант 1-га Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных (1975—1977). Вядзе канцэртную дзейнасць у рэспубліцы, выступаў на ВДНГ СССР у Маскве (1965), на Украіне.

Т.В.Даніловіч.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1987. Т. 4. С. 393.

Ансамбль песні і танца «Колас» Яромінскага СДК. Створаны ў 1959 г. на базе хора, які існаваў у в. Яроміна з 1927 г. З 1968 г. мае званне народнага. Хормайстар Р.Л.Бяскроўны, балетмайстар І.В.Захарава.

Ужо ў 1959 г. калектыў паспяхова выступіў на рэспубліканскім аглядзе сельскай мастацкай самадзейнасці ў Мінску, у 1965 г. — на ВДНГ. Гонар ансамбля — яго старэйшыя ўдзельнікі: Захарава, Кароўкіна, Клімкова, Круглікаў, Лаўрыненка, сем'і Клімянковых, Сібілевых і інш.

Ансамбль — удзельнік рэспубліканскіх, абласных, раённых конкурсаў мастацкай самадзейнасці, аглядаў, конкурсаў народных ансамблей песні і танца.

Ансамбль народнай песні «Харашухі» Цярэшкавіцкага СДК. Створаны ў 1962 г., з 1997 г. мае званне народнага. Кіраўнік Л.Хвастэнка (з 1991), сапраўдны энтузіяст, вялікі аматар сваёй справы. У складзе ансамбля 20 удзельнікаў, сярод якіх ёсць і сямейныя дынастыі Хвастэнкаў, Осіпавых і інш. Усіх іх аб'ядноўвае любоў да песні, мастацкага слова, жаданне прынесці людзям радасць. У рэпертуары калектыву песні беларускіх кампазітараў, рускія, украінскія народныя песні.

Танцавальны калектыў «Вярцёлкі» Урыцкага рэгіянальнага цэнтра культуры і вольнага часу. Створаны ў 1974 г., з 1996 г. мае званне народнага. Кіраўнік В.У.Пранішнікава (з 1991).

Аснову калектыву складаюць навучэнцы мясцовай школы і працоўная моладзь, якіх аб'ядноўвае любоў да танца. У рэпертуары «Вярцёлак» харэаграфічныя кампазіцыі, жартоўныя замалёўкі, беларускія, рускія, украінскія танцы. Асаблівая ўвага ўдзяляецца даследаванню рэгіянальнага танца, мясцовага фальклору, узнаўленню страчаных узораў, якія бытавалі на Гомельшчыне. Калектыў з канцэртамі быў у Чэхаславакіі, удзельнічаў у свяце «Яніса» ў Латвіі, дыпламант абласнога конкурсу харэаграфічных калектываў (1995), двойчы ўдзельнічаў у свяце «Масленіца» ў Маскве, свяце

«Дажынкі» на Украіне, прымае ўдзел ва ўсіх раённых мерапрыемствах і святах.

Ансамбль песні і танца Урыцкага рэгіянальнага цэнтра культуры і вольнага часу. Створаны ў 1974 г., з 1983 г. мае званне народнага. Кіраўнікі: Л.І.Чудак (з 1974), В.І.Копыл (з 1988), М.Н.Дыдалева (з 1991), хормайстар М.В.Панфіленка, балетмайстар А.Н.Качурка. Хор пяцігалосы. Характар і манера выканання — народныя. У рэпертуары калектыву песні беларускіх, украінскіх, рускіх кампазітараў, народныя песні ў апрацоўцы самадзейных кампазітараў Гомельшчыны і хормайстра М.Н.Дыдалевай «А ў цёмным лесе сава куліча», «Грачанікі», «Як хаце-ла мяне маці» і інш., украінскія «Місяць на нэбе», «На гародзе буркун» і інш. Вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі: «Вясковыя замалёўкі», «Варэнька». Ансамбль — жаданы госць не толькі на Гомельшчыне, але і на канцэртных пляцоўках рэспублікі. У 1996 г. калектыў атрымаў першую прэмію на Міжнародным фестывалі ў г. Паставы.

Ансамбль народных інструментаў Гомельскага РДК. Створаны ў 1976 г. З 1997 г. мае званне народнага. Кіраўнікі: К.М.Пінкевіч (з 1976), А.П.Луцай (з 1992).

У ансамблі 20 удзельнікаў. У складзе аркестра: домры, баян, фартэпіяна, флейта, цымбалы, балалайка, кантрабас. Значны ўклад у работу калектыву ўнёс канцэртмайстар аркестра, выкладчык Гомельскага каледжа мастацтваў імя Н.Ф.Сакалоўскага А.М.Трафімовіч. У рэпертуары ансамбля — апрацоўкі беларускіх народных песень і танцаў, класічныя творы, музыка айчынных і замежных сучасных кампазітараў. Калектыў вядзе актыўную канцэртную дзейнасць, неаднаразова ўзнагароджваўся дыпломамі, ганаровымі граматамі, грашовымі прэміямі.

Народны хор калгаса імя Леніна Пакалюбіцкага сельсавета.

Створаны ў 1976 г., з 1986 г. мае званне народнага. Кіраўнік У.Р.Курдукоў (з 1985 — хормайстар), канцэртмайстар А.Г.Цюрын. У складзе калектыву працаўнікі сельскай гаспадаркі калгаса, мясцовая інтэлігенцыя. Ён выступаў у Латвіі, на Украіне. Па запрашэнні чэхаславацкіх сяброў даў 5 канцэртаў у Чэхаславакіі. Часта выступае ў чарнобыльскай зоне.

Калектыў — удзельнік 2-га Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці (1986), дыпламант Рэспубліканскага конкурсу самадзейнай мастацкай творчасці (1983), пераможца абласнога агляду-конкурсу на лепшую тэматычную, канцэртную праграму (1977).

Мае шматлікія дыпломы, граматы Упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкома, раённага аддзела культуры.

Хор «Вязанка» Брылёўскага СДК. Створаны ў 1979 г., з 1981 г. мае званне народнага. Кіраўнік Р.С.Чудак, лаўрэат Усесаюзнага конкурсу балетмайстраў.

У склад хору ўваходзяць фальклорная група (13 чалавек), танцавальны і інструментальны ансамблі. Канцэртная праграма заўсёды разнастайная і карыстаецца поспехам у гледачоў.

Творчы напрамак хору — беларускія народныя і аўтарскія песні, народныя танцы і сцэнічныя замалёўкі, калядныя, веснавыя і жніўныя песні, вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі. Радуе гледачоў вакальнае трыо жанравага накірунку.

Хор — лаўрэат усесаюзных фестываляў, конкурсаў самадзейнага мастацтва 1984, 1987, 1991 гг. і пераможца абласнога фестывалю вакальна-харавога мастацтва імя Лапацінай (1992), мае дыпломы ВДНГ СССР (1984), ВДНГ Украіны (1989), удзельніка Дзён дружбы (1996, Чарнігаў).

Фальклорны калектыў «Світанак» Гомельскага РДК. Створаны ў 1980 г., з 1994 г. мае званне народнага. Кіраўнікі: А.А.Вярбіцкі (з 1980), В.Д.Падута (з 1994).

У калектыве 29 удзельнікаў, пераважная большасць з якіх людзі пенсійнага ўзросту, а таксама перасяленцы з Брагіна. Сапраўдныя аматары беларускай песеннай і танцавальнай народнай творчасці.

У яго рэпертуары каля 60 твораў, большасць з якіх запісана ў мясцовых старажылаў, напрыклад «Даўгалескія дудары», «Была ў мяне курка» і інш. Ансамбль — удзельнік раённых святаў «Купалле», «Улукаўскія кіржалі», дзён працаўнікоў сельскай гаспадаркі, вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аматары народнай творчасці вядуць вялікую канцэртную

дзейнасць, выступаюць у раёнах вобласці і за яе межамі.

Вакальна-інструментальны ансамбль «Узоры» Гомельскага РДК. Створаны ў 1981 г., з 1987 г. мае званне народнага. Кіраўнік ансамбля А.М.Гулай.

Ансамбль — лаўрэат 1-га Усесаюзнага фестывалю самадзейнай творчасці працоўных, Усесаюзнага конкурсу патрыятычнай песні, Рэспубліканскага конкурсу эстраднай музыкі і ўладальнік галоўнага прыза «Палескі крышталь» у Салігорску ў 1986 г. У 1986 г. калектыў ансамбля шмат выступаў у чарнобыльскай зоне, за што кожны з удзельнікаў быў узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства культуры СССР. Ансамбль «Узоры» сустракаюць з вялікай павагай і радасцю не толькі на эстрадных пляцоўках Гомельшчыны, але і за яе межамі.

Народны хор племзавода «Бярозкі». Створаны ў 1984 г., з 1990 г. мае званне народнага. Кіраўнік Ю.Ф.Мінін (з 1984). У калектыве 35 удзельнікаў. Гэта людзі самых розных прафесій, якіх аб'ядноўвае любоў да беларускай песні. У складзе хора шмат пеўчых дынастый: Садоўскія, Сіраты, Дыдышкі, Бяздзенежных, Вайсман — самадзейны паэт, сёстры Гарчэнка. У яго рэпертуары беларускія, украінскія, рускія песні, прымаўкі, прыказкі. Шмат песень напісана яго кіраўніком Ю.Ф.Мініным. Хор вядзе актыўную канцэртную дзейнасць. Ён лаўрэат абласнога свята вакальна-харавога мастацтва імя Лапацінай, удзельнік Дзён дружбы 1987, 1989 гг. у г. Бярдзянск. Заняў першае месца на фестывалі самадзейнай песні (1990).

Ансамбль народнай песні «Світанак» ДК торфапрадпрыемства «Бальшавік». Створаны ў 1984 г., з 1993 г. мае званне народнага. Яго нязменны кіраўнік — Т.Л.Цукінаў (з 1984—1997), сапраўдны энтузіяст і вялікі аматар сваёй справы. У калектыве 22 удзельнікі. У рэпертуары ансамбля беларускія, рускія, украінскія народныя жарты і анекдоты. «Світанак» вядзе вялікую канцэртную дзейнасць, прымае ўдзел у святах і кірмашах раёна і вобласці.

Узорны ансамбль эстраднага танца «Юнацтва» Гомельскага РДК. Створаны ў 1985 г. З 1993 г. мае званне народнага. Нязменны кіраўнік — А.Д.Захаранка (з 1985). У калектыве 4 танцавальныя групы, 96 чалавек. Рэпертуар ансамбля складаюць харэаграфічныя кампазіцыі, лірычныя мініяцюры, жартоўныя замалёўкі, модныя танцы. Ён своеасаблівая база падрыхтоўкі прафесійных артыстаў балета для Гомельскага дзяржаўнага цырка.

Ансамбль штогод выступае з шэфскімі канцэртамі ў шпіталі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, абласным кардыялагічным цэнтры, у працоўных калектывах.

Удзельнічаў у паказальных выступленнях на Міжнародным конкурсе бальных танцаў краін СНД у Палацы культуры ў Маскве (1993).

Узорны ансамбль эстраднага танца «Юнацтва» — удзельнік міжнароднага свята эстраднага танца «Веснавы букет» (1992), тройчы лаўрэат абласнога конкурсу дзіцячых і юнацкіх калектываў «Танцуючы фламінга» (1994—1996), дыпламант рэспубліканскага конкурсу маладых артыстаў эстрады «Зорная ростань» (1995), дыпламант рэспубліканскага тэлевізійнага конкурсу «Усе мы родам з дзяцінства» (1996).

Фальклорны калектыў «Скарыначка» Урыцкага СДК. Створаны ў 1986 г., з 1990 г. мае званне народнага. Кіраўнік ансамбля — дырэктар СДК В.А.Кавалёў (з 1986). У калектыве 20 удзельнікаў, аматараў народнай песні, танца, фальклорна-абрадавых прадстаўленняў, дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Цікава гучаць у выкананні ансамбля беларускія песні. Народныя танцы «Полька», «Карапэт», гумарыстычныя сцэнкі «Бацька і сын», «Жывот баліць» уносяць своеасаблівасць і народнасць у праграму ансамбля. Калектыў — удзельнік перадач абласнога і рэспубліканскага тэлебачання ў праграмах «Запрашаем на вячоркі», «Звіняць цымбалы і гармонь». Удзельнікі ансамбля трымаюць творчыя сувязі з лепшымі калектывамі аматараў народнай песні Пінскага раёна, з сябрамі з в. Халявін Чарнігаўскага раёна.

Ансамбль — лаўрэат міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонь» у г. Паставы (1996, 1997), удзельнік свята «Славянскае братэрства-97».

Аматарскае аб'яднанне «Руплівы гаспадар» Прыбыткаўскага сельсавета. Створана ў 1986 г. З 1991 г. мае званне

народнага. Кіраўнік аб'яднання — загадчыца сельскага клуба в. Цагельня А.І.Пшаніцына. У калектыве 24 удзельнікі: працаўнікі саўгаса «Паўднёвы», сельская інтэлігенцыя, пенсіянеры. Тут аб'ядналіся людзі, якія любяць родную зямлю, прыроду, аматары-кветкаводы, садаводы, агароднікі. У аб'яднанні абменьваюцца вопытам па вырошчванні кветак, агародніны, садавіны, ідзе адбор асабліва якаснага насення, праводзіцца вучоба. Дэвіз клуба: «Што пасееш, то і пажнеш!». Штогод падводзяцца вынікі працы на выстаўцы «Гаспадарка асабістая — карысць агульная». Сталі традыцыйнымі сустрэчы з удзельнікамі іншых аб'яднанняў раёна, такіх як «Майстрья-искусница» (в. Сеўрукі), «Яраслаўна» (в. Зябраўка) і інш.

Фальклорны калектыў песні і танца «Радзімічы» Гомельскага РДК. Створаны ў 1989 г., з 1992 г. мае званне народнага. Кіраўнікі: Л.М.Навумовіч (з 1989), І.У.Кацэвіч (з 1995). У калектыве 19 удзельнікаў.

У рэпертуары — беларускія народныя песні, танцы, жартоўныя сцэнкі, а таксама відовішчы па матывах беларускіх народных свят і абрадаў. Разнастайныя маршруты канцэртнай дзейнасці «Радзімічаў»: Мінск, Кіеў, Гомельшчына. Яны — удзельнікі традыцыйных свят «Купалле», «Гуканне вясны», «Каляды», фестывалю творчасці моладзі ў Маскве (1993). Тэатральным элементам беларускага фальклору надаецца вялікая ўвага, і ў гэтым значная заслуга рэжысёра В.Окунь. Аркестровая група пад кіраўніцтвам К.Дамасевіча ўносіць асаблівы каларыт у гучанне ансамбля. Калектыў карыстаецца папулярнасцю і павагай у гледачоў.

Па старонках раёнкі

ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОРНЫ КАЛЕКТЫЎ УРЫЦКАГА ДОМА КУЛЬТУРЫ

Гэты калектыў створаны ў лістападзе 1992 г. Кіруе ім рэжысёр масавых прадстаўленняў Урыцкага рэгіянальнага цэнтра культуры і адпачынку Р.Л.Лянкова.

У саставе новага ансамбля 15 вучняў сёмых—восьмых класаў.

У СДК дзейнічае таксама дзіцячы калектыў, які выконвае сучасныя танцы. У яго саставе ўдвая больш хлопчыкаў і дзяўчынак. З ім займаецца энтузіяст гэтай справы І.Г.Сінякова.

Адначасова працягваецца дзейнасць народнага фальклорнага калектыву «Скрыпачка», які працуе над увасабленнем на сцэне беларускага вясельнага абраду. Трэба, каб людзі памяталі пра быт, звычаі продкаў.

Вядома, не ўсё з таго, што мела месца ў мінулым, можна перанесці ў сучаснае жыццё. Але ведаць аб гэтым — значыць узбагаціць сябе духоўна, яшчэ больш палюбіць родны край.

Маяк. 1993. 6 лют.

ФАЛЬКЛОРНА-ЭТНАГРАФІЧНЫ КАЛЕКТЫЎ РУДНЯ-МАРЫМОНАЎСКАГА СЕЛЬСКАГА ДОМА КУЛЬТУРЫ

Калектыў мае фальклорны напрамак, аб чым сведчаць і рэпертуар, і нацыянальныя касцюмы ўдзельнікаў самадзейнасці, выкарыстанне такіх інструментаў, як бубен, свістулькі і інш.

Аб гэтым жа пераконвае афармленне сцэны. Яна ўпрыгожана посцілкамі, рушнікамі і іншымі рэчамі, якія наткалі, вышылі самі артысты-аматары. Яны з'яўляюцца гарачымі прыхільнікамі беларускай народнай песні.

Калектыў невялікі, аб'ядноўвае 14 чалавек. Галоўным чынам гэта жанчыны.

Актыўным удзельнікам канцэртаў з'яўляецца іх вядучая, старшыня прафкома саўгаса Таісія Пятроўна Мялешка.

Маяк. 1993. 8 мая.

Музеі Гомельшчыны

У раёне працуюць 1 народны музей (у вёсцы Пакалюбічы) і 33 школьныя музеі, з якіх 6 гісторыка-краязнаўчых, 6 музеяў баявой і працоўнай славы, 10 этнаграфічных і інш. Пра некаторыя з іх варта расказаць больш падрабязна.

НАРОДНЫ МУЗЕЙ БАЯВОЙ І ПРАЦОЎНАЙ СЛАВЫ Ў ПАКАЛЮБІЧАХ

Сярод легенд аб паходжанні назвы вёскі Пакалюбічы існуе і вось такая, якую мясцовыя жыхары лічаць больш верагоднай. Яна адносіцца да лета 1709 г., калі адбылася Палтаўская бітва са шведамі. Каб выйсці да Палтавы, Пётр I вёў свае войскі ў напрамку паселішча Любеч, што на Чарнігаўшчыне. Адным з прыпынкаў на шляху рускіх воінаў стаў населены пункт, які яны назвалі Пакалюбічы. У тым сэнсе, што пакуль (па-руску пока) будзе Любеч, спынімся тут.

Зараз у Пакалюбічах 1044 двары і 3141 жыхар, тут знаходзіцца цэнтр сельскага Савета.

А вось што сведчаць архіўныя дакументы пазнейшага часу. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. Пакалюбічы ўваходзілі ў склад Багуслаўскай эканоміі разам з вёскамі Лапацін, Прудок, Валатава, Плёсы і Зялёныя Лукі. Належалі яны генерал-фельдмаршалу П.А.Румянцаву-Задунайскаму, а пасля яго сыну — графу Н.П.Румянцаву. Ён садзейнічаў эканамічнаму і культурнаму развіццю свайго маёнтка. Пабудаваў у Пакалюбічах цагляную царкву і вучылішча, Пакалюбічы былі яго любімым летнім месцазнаходжаннем.

У 1833 г. у сяле Пакалюбічы налічвалася 299 рэвізскіх душ. Купіўшы маёнтак у Румянцава, уладальнікам Пакалюбіч становіцца князь І.Ф.Паскевіч. Яго нашчадкі валодалі імі да Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Пакалюбіцкая воласць Магілёўскай губерні ў другой палове XIX ст. ахоплівала шэраг навакольных вёсак, у якіх пражывалі 2417 мужчын, 2397 жанчын, 2300 дзяцей. У воласці былі развіты промыслы: кравецкі, абутковы, калёсны, бандарны, кавальскі, рамізніцкі, лясныя і інш. У саміх Пакалюбічах налічвалася 153 двары і 523 жыхары.

Гэтымі і іншымі звесткамі пра далёкую гісторыю, узятымі з Дзяржархіва Гомельскай вобласці, пачынаецца экспазіцыя першай залы народнага музея баявой і працоўнай славы калгаса імя Леніна. Адкрыццё яго адбылося ў Дзень Перамогі — 9 мая 1977 г. Першапачаткова музей размяшчаўся ў сельскім Доме культуры, а ў 1982 г. справіў наваселле ў асобным доме. У тым жа годзе пастановай калегіі Міністэрства культуры БССР музею было прысвоена званне народнага. У яго фондах налічваецца вялікае мноства адзінак захоўвання, многія з якіх сталі сапраўднымі рэліквіямі. У першай зале ў раздзеле «Там мы жылі...» выстаўлены прадметы сялянскага побыту, якімі карысталіся мясцовыя жыхары ў дарэвалюцыйны перыяд, — хатні ткацкі станок (кросны), ступа з таўкачом, саматканыя вышываныя ручнікі, лапці, сярпы, цапы для малацьбы снапоў і інш.

Ёсць стэнд пад назвай «З хронікі Кастрычніка».

Шмат дакументаў і фотаздымкаў прысвечана гісторыі стварэння калгаса. У 1929 г. на базе грамадскіх земляў сельскімі актывістамі ў в. Пакалюбічы быў арганізаваны калгас, які называўся «Чырвоная ніва», першым старшынёй яго быў выбраны Піліп Прахоравіч Шрэмаў. Тут жа змешчаны фотаздымкі таго часу. На іх апрача П.П.Шрэмава — сакратар камсамольскай ячэйкі Барыс Яўсеевіч Кац, першы брыгадзір Нічыпар Сямёнавіч Каржоў, адзін з першых калгаснікаў Ціхан Фокавіч Рандаўцаў.

П.П.Шрэмаў.

У 1931 г. па жаданні калгаснікаў гаспадарцы было прысвоена імя У.І.Леніна. Пераадольваючы цяжкасці, калгас рос, набіраў сілы, умацоўваўся. Да канца 1930-х гадоў ён стаў адным з перадавых не толькі ў раёне, а і ў вобласці. Ужо ў 1932 г. калгас наведала амерыканская прафсаюзная дэлегацыя. У 1934 г. на яго палях з'явіўся першы трактар. А першым трактарыстам быў Іван Раманавіч Шабанаў, фотаздымак якога таксама ёсць у экспазіцыі. У жніўні 1939 г. калгас быў удастоены высокага гонару экспанаваць сваю прадукцыю ў Маскве на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. У той год гаспадарку ўзначальвала Марыя Іосіфаўна Кавалёва, якая сфатаграфавана на кані. Ёсць тут і фатаграфія Яўмена Кірылавіча Беламутава, які стаў старшынёй калгаса ў 1940 г.

У жніўні 1941 г. на блізкіх подступах да Гомеля, у тым ліку і каля Пакалюбіч, савецкія воіны і апалчэнцы вялі цяжкія баі, адбіваючы ярасныя атакі нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тады ў вёсцы размяшчаўся Гомельскі гарадскі полк народнага апалчэння, якім камандаваў капітан запасу Ф.Е.Уткін. У палку было 2200 байцоў, у тым ліку 500 чалавек, якія прыбылі з Днепрадзяржынска Украінскай ССР. Гэтым камуністычным атрадам кіраваў падпалкоўнік Аляксандр Васільевіч Маневіч. У музеі ёсць матэрыялы, прысвечаныя палку апалчэнцаў і гэтаму атраду. А восенню 1943 г. тут доўга ішлі крывапралітныя наступальныя баі за вёску і абласны цэнтр. Цаной вялікіх ахвяр наша зямля была вызвалена ад ненавіснага ворага. Сотні воінаў загінулі каля Пакалюбіч, а ў вёсцы было знішчана агнём 535 дамоў. І таму зусім не выпадкова, што ў народным музеі шматлікія матэрыялы прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне. Размешчаны яны ў самай вялікай зале. У музеі шмат фотаздымкаў воінаў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Пакалюбіч, а таксама франтавікоў-аднавяскоўцаў, тых, хто склаў галовы на полі бою, і тых, хто дайшоў да светлага пераможнага дня 1945 года.

Значнае месца адведзена тут матэрыялам, прысвечаным 299-й Нежынскай штурмавой авіядывізіі, якая ў складзе 16-й паветранай арміі вызваляла вёску, г. Гомель і была ўзнагароджана за гэта ордэнам Чырвонага Сцяга. Камандаваў дывізіяй палкоўнік Іван Васільевіч Крупскі. Побач з яго здымкам у экспазіцыі змешчаны фатаграфіі многіх іншых авіятараў, сярод якіх 21 Герой Савецкага Саюза.

Б.Я.Кац.

І.Р.Шабанаў.



Першы калгасны трактар на п'едэстале каля музея ў Пакалюбічах.

Як ужо адзначалася, у баях каля вёскі вызваліцелі, у тым ліку і 299-я авіядывізія, панеслі значныя страты. Толькі за адзін дзень — 22 лістапада 1943 г. з задання не вярнуліся 6 самалётаў-штурмавікоў ІЛ-2. Доўгі час не быў знойдзены адзін з загінуўшых экіпажаў. Адшукаць удалося толькі ў 1976 г. разам з падбітым самалётам, які ўрэзаўся глыбока ў балоцісты грунт за ваколіцай Пакалюбіч і не быў відаць. Тады і было ўстаноўлена, што ў самалёце знаходзіліся лётчык лейтэнант Мікалай Закаблук і стралок радавы А.Сцяпанаў. У наступным годзе ў Дзень Перамогі іх астанкі былі перапахаваны ў брацкую магілу з усімі воінскімі

ўшанаваннямі. Тады прыязджалі ў Пакалюбічы ветэраны дывізіі на чале з яе камандзірам, у якога ўжо было званне генерал-маёра. Іх прыезд супаў з адкрыццём калгаснага музея. Да таго моманту акрамя фатаграфій членаў знойдзенага экіпажа і звестак пра іх былі выстаўлены фрагменты абшыўкі корпуса самалёта, дула гарматы, прызначанай для стральбы рэактыўнымі снарадамі, і нават рухавік.

А ўвогуле сярод экспанатаў музея шмат рознага ваеннага рыштунку, знойдзенага на палях баёў. Ёсць тут фатаграфія і пісьмо маршала авіяцыі С.І.Рудэнкі, які камандаваў 16-й паветранай арміяй, а таксама яго мемуарная кніга «Крылы Перамогі», падараваная музею. Пад шклом захоўваюцца фотакопіі спісаў воінаў, загінуўшых пры вызваленні Пакалюбіч. Гэтыя копіі былі зроблены ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Савецкай Арміі. На адным з рэдкіх здымкаў, зробленым 26 лістапада 1943 г., адлюстравана група жыхароў вёскі Прудок (яна ўваходзіла ў Пакалюбіцкі сельсавет), якія сустракаюць савецкіх воінаў-вызваліцеляў.

У цэнтры Пакалюбіч, непадалёку ад музея, знаходзіцца мемарыяльны комплекс з двума помнікамі. Адзін з іх устаноўлены на брацкай магіле, дзе спяць вечным сном байцы і афіцэры, якія загінулі пры вызваленні вёскі. На мармуровых плітах высечаны 518 прозвішчаў, якія ўдалося ўстанавіць, а ёсць жа яшчэ і невядомыя. А побач узвышаецца другі помнік — у гонар землякоў, жыццё якіх абарвалася ў Вялікую Айчынную. Тут высечана больш за 300 прозвішчаў пакалюбіцкіх жыхароў. Амрача франтавікоў у гэтым жалобным спісе значацца 11 калгасных актывістаў, у асноўным маладых хлопцаў-камсамольцаў, якіх гітлераўскія вылюдкі расстралялі 6 лістапада 1941 г.

Шматлікія матэрыялы музея прысвечаны мірнаму жыццю калгаса і вёскі пасля 1945 г.

У розны час калгас узначальвалі Клім Іванавіч Мяжэйнікаў (1948), Яфім Іванавіч Ландарскі (1950—1955), Емяльян Яўстафіевіч Козыраў (1955—1961), Фёдар Давыдавіч Кузубаў (1961—1974), Віталій Ігнатавіч Жалязняк (1974—1995). Кожны з іх пакінуў свой след у жыцці гаспадаркі. А цяпер яе узначальвае кандыдат сельскагаспадарчых навук Юрый Піліпавіч Саўчанка, які ў свой час працаваў тут галоўным заатэхнікам.

У экспазіцыях расказваецца пра многіх перадавікоў гаспадаркі, чыімі рукамі ствараліся яе багацці і працоўная слава. За поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці калгас імя Леніна ў маі 1967 г. быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Немагчыма пералічыць усіх працаўнікоў, якія сталі гордасцю гаспадаркі. Лепшыя з лепшых пералічаны на стэндзе «Іх узнагародзіла Радзіма», які знаходзіцца ў невялікім пярэднім пакоі і нібы сустракае кожнага наведвальніка.

За баявыя подзвігі ў час вайны 418 жыхароў вёскі Пакалюбічы былі адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі. Як сведчыць стэнд са спісам узнагароджаных калгаснікаў, на мірным фронце атрымалі ордэны Леніна 9 чалавек, Працоўнай Славы — 6, Кастрычніцкай Рэвалюцыі — 6, «Знак Пашаны» — 13, медалі «За працоўную доблесць» і «За працоўную адзнаку» — 10. А Фелікс Ісакавіч Шэрман удастоены ордэна Дружбы народаў.

У музеі шырокае асвятленне знайшлі сяброўскія сувязі калгаса з сельскімі працаўнікамі іншых рэспублік былога Саюза, а таксама з грамадзянамі краін далёкага замежжа.

Як сведчаць запісы ў кнізе водгукаў музея, якая налічвае 6 тамоў, калгас апрача чэхаславацкіх наведвалі дэлегацыі многіх краін свету — Балгарыі, Югаславіі, Польшчы, Германіі, Індыі, Шры-Ланкі і іншых. Толькі ў адным 1980 г. у Пакалюбічах пабывала звыш 20 іншаземных дэлегацый. Так што цяпер ужо і сама кніга водгукаў набыла музейную каштоўнасць, стала часткай летапісу вёскі і калгаса.

Вось ужо некалькі гадоў працягваецца сувязь жыхароў Пакалюбіч і германскага горада Альцай. Нямецкія сябры дастаўляюць пакалюбіцкім школьнікам гуманітарную дапамогу, штогод возяць іх да сябе на аздараўленне. А ў лістападзе 1997 г. народны хор калгаса імя Леніна ў поўным складзе (60 чалавек) быў запрошаны нямецкім бокам на гастролі. Самадзейных артыстаў цёпла сустракалі ў Германіі, дзе яны знаходзіліся 12 дзён і выступалі з канцэртамі. Кіраўнік музея

Ф.І.Шэрман, які арганізоўваў гэту паездку, прывёз адтуль зроблены ім відэафільм і шэраг іншых цікавых матэрыялаў, падрыхтаваных нямецкімі сябрамі аб знаходжанні там гасцей з Пакалюбіч. Так што ёсць чым папоўніць параўнальна новую экспазіцыю, якая носіць назву «Пакалюбічы — Альцай». Дарэчы, гэта ўжо не першая паездка Ф.І.Шэрмана ў Германію, куда ён суправаджаў вучняў на адпачынак і адкуль заўсёды прывозіў нямала такога, чаму месца ў музеі. Летапіс краю працягваецца.

Велізарная роля ў арганізацыі дзейнасці музея належыць яго нязменнаму кіраўніку, сапраўднаму энтузіясту краязнаўства Феліксу Ісакавічу Шэрману, педагогу па прафесіі. Ён арганізаваў пошукавую работу па зборы і афармленні каштоўных матэрыялаў. Дапамагалі яму былая настаўніца гісторыі Пакалюбіцкай школы Серафіма Якаўлеўна Канстанціноўская і супрацоўнік абласнога краязнаўчага музея Міхаіл Захаравіч Агееў.

І.І.Пічукоў.

КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ КРАСНЕНСКАЙ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ

Заснаваны 28 мая 1981 г. да 50-годдзя калгаса «Перамога». Пад кіраўніцтвам М.А.Кана група вучняў, члены клуба «Радзімічы», сабрала ў ходзе шматлікіх экскурсій і паходаў успаміны старэйшых жыхароў в. Краснае, удзельнікаў рэвалюцыі, заснавальнікаў калгаса, баёў за свабоду Айчыны, асабістыя рэчы славутых людзей, фотаздымкі, рэшткі зброі, копіі дакументаў дзяржаўных архіваў.

Асабліва значны раздзел музея прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг. Аб цяжкіх гадах акупацыйнага рэжыму, мужнасці аднавяскоўцаў, якія змагаліся супраць фашысцкай навалы на франтах, аб аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі, болі страт сведчаць экспанаты музея.

Тут захоўваюцца, экспануюцца шматлікія ўзнагароды калгаса, зямля з гарадоў-герояў. Значнае месца адведзена гісторыі 4-й Бежыцкай імя Суворава стралковай дывізіі, якая вызваляла в. Краснае Гомельскага раёна.

Экскурсіі для наведвальнікаў музея праводзяць вучні, члены клуба «Радзімічы». За час яго існавання музей наведала 17 000 чалавек.

Пошук матэрыялаў і папаўненне экспазіцыі працягваюцца.

У сакавіку 1997 г. вучні Красненскай сярэдняй школы сталі ўдзельнікамі рэспубліканскага злёту экспедыцыі «Наш край». Музей школы прадстаўляў накірунак «Трагічныя старонкі гісторыі». Асаблівую цікавасць выклікалі матэрыялы «Качагар рэвалюцыі Аляксандр Савіцкі», «Баявы шлях 4-й Бежыцкай імя Суворава стралковай дывізіі». Стваральнік і кіраўнік музея — Міхаіл Аронавіч Кан, настаўнік гісторыі Красненскай сярэдняй школы. У педагагічных перыядычных выданнях друкуюцца яго шматлікія работы па пытаннях выхавання моладзі, адносін у педагагічных калектывах, школы і грамадства і інш.

Узнагароджаны шматлікімі дыпломамі 1-й ступені Міністэрства асветы БССР, Ганаровым знакам Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, шматлікімі граматамі.

Т.А.Карасік.

МУЗЕЙ БАЯВОЙ І ПРАЦОЎНАЙ СЛАВЫ Ў ЦЯРУХСКАЙ ШКОЛЕ

Створаны ў 1963 г. Мэтанакіраваную і плённую працу вучняў-следапытаў па зборы шматлікіх экспанатаў узначаліла дырэктар школы Г.К.Каршакова, настаўнікі гісторыі В.Р.Віцікава, беларускай мовы Н.М.Барсукова, фізікі В.П.Крожаў.

Экспазіцыя музея знаёміць гледача з цікавымі матэрыяламі аб мінулым вёсак Церуха, Студзёная Гута, п. Каралін, тут беражліва захоўваюцца прадметы хатняга ўжытку дарэвалюцыйнага часу, ткацкі станок, адзенне, прадметы народных промыслаў.

Асабліва падрабязна сабраны дакументы, успаміны, фотаздымкі, якія сведчаць аб Вялікай Айчыннай вайне, аб цяжкіх баях, жахах акупацыйнага рэжыму, аб землякох-воінах, якія мужна абаранялі родную зямлю ад фашыстаў.

Асобны стэнд прысвечаны ветэранам 37-й стралковай дывізіі, якія вызвалялі вёску ад захопнікаў. У гэтай дывізіі служыў Аляксандр Валочын, які загінуў смерцю храбрых у час вызвалення вёскі Церуха, дзе ён і пахаваны. За мужнасць і адвагу яму прысвоена пасмяротна званне Героя Савецкага Саюза. Імем героя названа адна з вуліц вёскі.

Пра розныя людскія лёсы расказвае стэнд «Ніхто не забыты, нішто не забыта».

Дваццаць гадоў шукала жонка магілу свайго мужа, нашага земляка, — І.А.Сабко, які геройскі змагаўся з ворагамі і загінуў на вайне. Яна перадала ў музей пісьмы аднапалчан загінуўшага, па якіх магчыма прасачыць баявы шлях і гераічную гібель мужнага воіна.

Ад болю сціскаецца сэрца, калі экскурсавод вядзе расказ аб жудаснай трагедыі, якая разыгралася ў вёсцы Церуха літаральна за некалькі гадзін да яе вызвалення. Фашысты, якія адчулі сваё паражэнне, 26 верасня 1943 г. загналі ў вялікую хату 42 жыхароў і падпалілі яе з усіх бакоў. Тых, хто спрабаваў вырвацца з агню, бязлітасна забівалі. Жудаснае відовішча паўстала перад вачамі воінаў, што неўзабаве ўварваліся ў вёску.

Захаваліся фотаздымкі, зробленыя па свежых слядах.

Экспазіцыя музея працягвае папаўняцца новымі матэрыяламі.

У музеі настаўнікі праводзяць урокі мужнасці, сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Арганізавана сістэматычная работа па патрыятычным выхаванні вучняў на баявых і працоўных традыцыях бацькоў і дзядоў.

З гісторыі населеных пунктаў

АЗДЗЕЛІНА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Кірава.

Вядома з XVIII ст. як вёска. У 1775 г. падаравана Кацярынай II генерал-маёру Сімяону Пішчэвічу. У 1849 г. у Беліцкім павеце, 532 жыхары; хлебазапасны магазін. У 1882 г. у Рудзянецкай воласці Гомельскага павета, 120 двароў, 554 жыхары. Традыцыйныя рамёствы: бандарства, кравецтва, шавецтва. У 1884 г. адкрыта народнае вучылішча. У 1886 г. 115 двароў, 725 жыхароў; 3 ветраныя млыны. У 1909 г. 191 двор, 1366 жыхароў, належала сельскагаспадарчаму таварыству, 2592 дзесяціны зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна; школа 1-й ступені. У 1969 г. 162 двары, 329 жыхароў, цагельня, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі. На 1.1.1996 г. 189 двароў, 519 жыхароў; дзевяцігадовая школа (94 вучні), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, магазін.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Гарадзішча. За 2 км на захад ад вёскі, на правым беразе р. Уза. Пляцоўка круглая, дыяметрам 32 м, абкружана балотам, умацаванняў не мае. Вядома з 1873 г. Абследаваў у 1981 г. У.У.Багамольнікаў. Раскопкі не праводзіліся.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. На ўшанаванне памяці 164 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1984 г. пастаўлены помнік.

АЛЬХОЎКА, вёска ў Цярэшкавіцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. як прыватная ўласнасць. У 1884 г. вёска ў Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета, 25 двароў, 165 жыхароў; школа граматы. Распаўсюджана слясарнае рамяство. У 1909 г. 28 двароў, 190 жыхароў, належала Новацярэшкавіцкаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 248 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. у складзе Новацярэшкавіцкага сельсавета Дзятлавіцкага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 28 двароў, 142 жыхары. На 1.1.1996 г. 18 двароў, 43 жыхары.

АЛЯКСАНДРАЎКА, пасёлак у Старабеліцкім сельсавеце, у складзе калгаса імя Урыцкага. Вядомы як ваколіца з канца XIX ст. у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета. У 1909 г. 25 двароў, 153 жыхары, належала Целяшоўскаму мяшчанскаму праўленню, 240 дзесяцін зямлі. З 8.12.1926 г. вёска ў Старабеліцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна. У час Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 10 двароў, 16 жыхароў.

АСАЎЦЫ, вёска ў Давыдаўскім сельсавеце.

Вядома з XVIII ст. У 1773 г. у Гомельскай воласці Рагачоўскай правінцыі. З 1776 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала П.М.Румянцава-Задунайскага. У 1788 г. вёска ў Гомельскай воласці Беліцкага павета, 30 рэвізскіх душ.

У 1833 г. адносілася да Новікаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1852 г. у Гомельскім павеце 10 двароў, 85 жыхароў. У 1862 г. 58 рэвізскіх душ, 446 дзесяцін зямлі. Царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін, шынок. У 1909 г. вёска ў Гомельскай воласці Гомельскага павета, 50 двароў, 297 жыхароў. Належала Асавецкаму сельскагаспадарчаму таварыству. У 1913 г. знаходзілася земская школа. 8.12.1926 г. у Давыдаўскім сельсавеце Гомельскага раёна, 43 двары, 210 жыхароў. Цагельня. На 1.1.1996 г. 108 двароў, 295 жыхароў. Пачатковая школа, магазін.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Селішча. Недалёка ад вёскі. Плошча каля 1 га. Выявіў і даследаваў у 1925 г. К.М.Палікарповіч. Знойдзены гладкасценная кераміка і рэшткі посуду з арнаментам. Адносіцца да мілаградскай і зарубінецкай культур ранняга жалезнага веку. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

БАБОВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калектыўнай дзяржаўнай гаспадаркі «Бабовіцкая». Вядома з 1640 г. як сяло ў Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага. У 1773 г. вёска ў Гомельскай воласці Рагачоўскай правінцыі, 48 двароў, 271 рэвізская душа. У 1788 г. у Гомельскай воласці Беліцкага павета, 462 рэвізскія душы, прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага. З 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1849 г. пабудавана драўляная праваслаўная Успенская царква. У 1850 г. сяло, 171 двор, 560 жыхароў. У 1864 г. народнае вучылішча, шынок. У 1886 г. 186 двароў, 1187 жыхароў; хлебазапасны магазін, народнае вучылішча, вадзяны млын, вінная лаўка. Асноўныя рамёствы: кравецтва, сталярства, стальмаства, шавецтва. У 1898 г. у прыходзе Успенскай царквы было 2716 прыхаджан, належала 23 дзесяціны зямлі. У 1909 г. 260 двароў, 1880 жыхароў, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 301 дзесяцінай зямлі. У 1913 г. земская школа. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Дзятлавіцкага, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёнаў. У 1926 г. 495 двароў, 2586 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1930-я гады створаны калгас «Бальшавік». У 1933 г. тут размяшчаўся Бабовіцкі ўчастак Гомельскай МТС, які абслугоўваў 5 калгасаў. У час Вялікай Айчыннай вайны ў баях з гітлераўцамі загінулі 222 аднавяскоўцы. У 1970 г. 461 двор, 1432 жыхары. Перапамповачная станцыя нафтаправода «Дружба», шавецкая і швейная майстэрні. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, 3 магазіны. На 1.1.1996 г. 594 двары, 1510 жыхароў. Сярэдняя школа (235 вучняў), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, амбулаторыя, 3 магазіны, сталовая, лазня. Радзіма беларускага скульптара У.Н.Папсуева.

ПОМНІКІ АРХЕАЛОГІІ. Гарадзішча. За 4 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, у пойме левага берага р. Сож ва ўрочышчы Кравянец. Пляцоўка памерам 65х70 м умацавана 2 кальцавымі валамі вышынёй каля 2 м. Вядома з 1910 г. Абследавалі Е.Р.Раманаў (1910), А.М.Ляўданскі і А.Дз.Каваленя (1936), У.У.Багамольнікаў (1976). Раскопкі не праводзіліся.

Селішча. За 0,5—0,7 км на паўднёвы захад ад вёскі, каля могілак. Знойдзены рэшткі ганчарнага посуду і кавалак жалезнага нажа. Адносіцца да эпохі Кіеўскай Русі. Раскопкі не праводзіліся.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 222 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

БАЛЬШАВІК, рабочы пасёлак. Утвораны 24.8.1950 г. у складзе Уваравіцкага раёна на аснове пасёлкаў № 1, 2, 3, 4 торфазавода «Бальшавік». У 1969 г. 2,5 тысячы жыхароў. Торфапрадпрыемства «Бальшавік», камбінат бытавога абслугоўвання, механічная майстэрня. Сярэдняя і васьмігадовая школы, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, бальніца, паліклініка. На 1.1.1995 г. 2,9 тысячы жыхароў. Торфапрадпрыемства. Сярэдняя школа (606 вучняў), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, бальніца, фельчарска-акушэрскі пункт, 4 магазіны.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны 25 воінаў, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. у час вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля будынка выканкома пасялковага Савета. На ўшанаванне памяці 175 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1974 г. пастаўлены абеліск, побач з ім — стэла.

БАРДЗІНА, пасёлак у Яромінскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Брылёва». Вядомы як хутар у пачатку XX ст. У 1909 г. хутар у Пакалюбіцкай воласці Гомельскага павета, 2 двары, 15 жыхароў, належаў селяніну-стараверу Л.І.Лысаму, які меў 319 дзесяцін зямлі. З 8.12.1926 г. у Ціценскім сельсавеце Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 17 двароў, 98 жыхароў. На 1.1.1996 г. 75 двароў, 215 жыхароў.

БАРЭЦ, пасёлак у Цярэшкавіцкім сельсавеце, у складзе саўгаса «Навабеліцкі». Узнік у XX ст. у час калгаснага будаўніцтва і спачатку насіў назву Чырвоны Барэц. З 8.12.1926 г. у Скіцкім сельсавеце Дзятлавіцкага раёна Гомельскай акругі, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёна і акругі, з 30.12.1927 г. у Старацярэшкавіцкім сельсавеце. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 17 двароў, 77 жыхароў. Пасялковыя дзеці наведвалі школу 1-й ступені за 4 км у Старых Цярэшкавічах. У 1930-я гады створаны калгас «Чырвоны Барэц». Працавала кузня. У час Вялікай Айчыннай вайны за 3 км на паўднёвы ўсход ад пасёлка ва ўрочышчы Партызанская крынічка базіраваўся Гомельскі падпольны гарком КП(б)Б і партызанскі атрад «Бальшавік». На 1.1.1996 г. 13 двароў, 35 жыхароў.

БАШТАН, пасёлак у Грабаўскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Зара». Назва пасёлка азначае назву — тэрмін баштан — агарод, бахчоўня (цюркскае). Пасёлак вядомы з пачатку XX ст. як хутар у Насовіцкай воласці Гомельскага павета. У 1909 г. хутар, 1 двор, 5 жыхароў, прыватная ўласнасць памешчыка Фелікса Фашча. Хутар уваходзіў у склад Грабаўскага прыхода. Хутаране наведвалі праваслаўную Свята-Узнясенскую царкву. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., у пасёлку 24 двары, 129 жыхароў. З 8.12.1926 г. у Грабаўскім сельсавеце Насовіцкага раёна Гомельскай акругі, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёна і акругі, з 26.7.1930 г. Гомельскага раёна, з 10.2.1931 г. Церахоўскага раёна, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў 1941 г. 54 двары, 170 жыхароў. У час Вялікай Айчыннай вайны пасёлак са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 51 двор і загубілі 5 жыхароў. За вызваленне пасёлка ў баях з фашыстамі загінула 6 савецкіх воінаў. Пасля вайны пасёлак адбудаваны. З 16.7.1964 г. у Гомельскім раёне. На 1.1.1996 г. 46 двароў, 71 жыхар, 54 з якіх пенсіённага ўзросту. Радзіма беларускага паэта М.З.Башлакова.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахавана 6 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1970 г. пастаўлены абеліск.

ПОМНІК МАЯКОЎСКАМУ. Бюст паэта У.У.Маякоўскага ўстаноўлены ў 1968 г.

БЕЛЫ БЕРАГ, пасёлак у Даўгалескім сельсавеце. Белы Бераг вядомы з канца XIX ст. у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета. У 1898 г. ва ўрочышчы быў заснаваны лесапільны завод, на якім у 1900 г. працавалі 24 рабочыя. У 1909 г. ваколіца, 30 двароў, 517 жыхароў, належала Целяшоўскаму мяшчанскаму сельскагаспадарчаму праўленню, якое валодала 1311 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Дзятлавіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 65 двароў, 305 жыхароў. У пасёлку размяшчалася прыстань, школа 1-й ступені. У 1930-я гады ў складзе саўгаса імя М.Горкага. У 1933 г. тут працаваў ветраны млын. У 1941 г. пасёлак пераселены ў пасёлкі Дубавец і Някрасава.

БУДЗІШЧА, вёска ў Чарацянскім сельсавеце. У вёсцы было народнае вучылішча. У 1886 г. у Маркавіцкай воласці Гомельскага павета, 52 двары, 291 жыхар. Насельніцтва займалася ў асноўным земляробствам, але значнае месца ў гаспадарчым жыцці займалі розныя про-

мыслы і рамёствы. Адыходным промыслам займалася 16 жыхароў. Былі распаўсюджаны рамёствы: кравецтва, шавецтва і бандарства. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Чарацянскага прыхода і наведвалі праваслаўную Успенскую царкву. У 1909 г. вёска, 90 двароў, 598 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 463 дзесяціны зямлі. З 8.12.1926 г. у Пракопаўскім сельсавеце Насовіцкага, з 4.8.1927 г. Церахоўскага раёна. У 1926 г. 122 двары, 598 жыхароў. У вёсцы была школа 1-й ступені, якую наведвалі і дзеці пасёлка Чаплін. У вёсцы быў створаны калгас «Воля». Працавала кузня, ветраны млын. Вёска ў складзе калгаса «За Радзіму». У вёсцы размяшчаецца малочнатаварная ферма. На 1.1.1996 г. 64 двары, 116 жыхароў.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Курган Славы на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

БЯРОЗКІ, вёска ва Улукаўскім сельсавеце. Вядома з канца XIX ст. у Гомельскай воласці Гомельскага павета. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., пасёлак, 45 двароў, 245 жыхароў. З 8.12.1926 г. ва Улукаўскім сельсавеце Гомельскага раёна і акругі, з 26.7.1930 г. Гомельскага раёна. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 95 двароў і загубілі 3 жыхароў. На 1.1.1996 г. 736 двароў, 2196 жыхароў. Дом культуры, дзіцячы сад, крама, лазня.

ВАДАПОЙ, пасёлак у Чарацянскім сельсавеце, у складзе калгаса «Першамайскі». Узнік у час калгаснага будаўніцтва. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 13 двароў, 75 жыхароў. З 8.12.1926 г. у Макаўскім сельсавеце Насовіцкага раёна Гомельскай акругі, з 30.12.1927 г. у Пракопаўскім сельсавеце Церахоўскага раёна Гомельскай акругі. Быў створаны калгас «Вадапой». У пасёлку працавалі кузня, ветраны млын. Пасялковыя дзеці наведвалі школу 1-й ступені, якая знаходзілася за 3 км у вёсцы Макоўе. На 1.1.1996 г. 8 двароў, 9 жыхароў (усе пенсіённага ўзросту).

ВАЛАТАВА, вёска. Вядома з 1640 г. як баярскае сяло «ижь то есть отчизна и дедзізна тых баяр шляхецкая» ў Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага. Пасля Першага падзелу Рэчы Паспалітай сяло ў Расійскай імперыі, з 1773 г. у Гомельскай воласці Рагачоўскай правінцыі, з 1776 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага. У 1778 г. вёска ў Гомельскай воласці Беліцкага павета, 112 рэвізскіх душ. У 1803 г. 29 двароў, 158 рэвізскіх душ. У 1805 г. была пабудавана каменная праваслаўная Мікалаеўская царква (архітэктар Джон Кларк). У 1833 г. сяло, 59 рэвізскіх душ мужчынскага полу, адносілася да Багуслаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. З мэтай стварэння ўзорнай гаспадаркі былі запрошаны немцы-каланісты, якім выдзелена была зямля. Жыхары былі сселены з сяла ў вёску Іванаўка. У 1898 г. у прыходзе праваслаўнай царквы быў 371 прыхаджанін сяла і навакольных вёсак. У 1909 г. сяло, 61 двор, 277 жыхароў, прыватная ўласнасць княгіні Паскевіч, якая валодала 516 дзесяцінамі зямлі. У 1909 г. была земская школа. З 8.12.1926 г. сяло ў Прудкоўскім сельсавеце Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 105 двароў, 507 жыхароў. Быў паштовы пункт, школа 1-й ступені. У 1929 г. заснаваны цагельны завод. Створаны калгас «Чырвоны працаўнік». У калгасе працавала кузня. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1 жніўня 1974 г. вёска ў межах г. Гомеля.

ВЕРХНІ БРЫЛЁЎ, вёска (з 30.4.1948 г. у межах г. Гомеля). У XIX ст. вядома як цэнтр маёнтка Верхні Брылёў. У 1850 г. уладальнікам маёнтка быў калежскі асэсар памешчык А.А.Плескі, які валодаў 115 дзесяцінамі зямлі і меў вялікі сад. У 1886 г. вёска, 24 двары, 303 жыхары, у Гомельскай воласці Гомельскага павета.

У 1884 г. працавала школа граматы. У 1909 г. 41 двор, 352 жыхары, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 61 дзесяціну зямлі. Апошнім уладальнікам маёнтка быў дваранін М.Бенкдзіктовіч. З 8.12.1926 г. вёска ў Ціценскім сельсавеце, з 1939 г. у Красненскім сельсавеце Гомельскага раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 87 двароў, 393 жыхары. У вёсцы меліся школа 1-й ступені, квасільня і грыбны пункт. У вёсцы размяшчаўся саўгас, у які ўваходзіла 9 двароў і 33 жыхары. Радзіма Героя

Сацыялістычнай Працы М.І.Кавалёвай.

ВІШАНСКІ, пасёлак у Яромінскім сельсавеце. Узнік у час калгаснага будаўніцтва. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 17 двароў, 107 жыхароў. З 8.12.1926 г. пасёлак у Касцюковіцкім сельсавеце Гомельскага раёна і акругі. Пасялковыя дзеці наведвалі школу 1-й ступені, якая знаходзілася за 3 км у Касцюкоўцы. Перайменаваны ў пасёлак Сталінец. З 1957 г. атрымаў сваю першапачатковую назву, у складзе калгаса імя XII з'езда КПСС. На 1.1.1996 г. 133 двары, 296 жыхароў. Радзіма беларускага мастака У.А.Еўтухова.

ВЫСОКАЯ ГРЫВА, пасёлак у Цярэшкавіцкім сельсавеце. Вядомы з пачатку XX ст. як хутар. У 1909 г. у Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета, 1 двор, 1 жыхар. З 8.12.1926 г. у Цярэшкавіцкім сельсавеце Дзятлавіцкага, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёна. У 1926 г. 14 двароў, 68 жыхароў. У 1941 г. пасёлак, 18 двароў, 104 жыхары. У кастрычніку 1943 г. гітлераўцы спалілі ўсю вёску — 18 двароў і загубілі 2 мірных жыхароў. Пасёлак у складзе саўгаса «Навабеліцкі». На 1.1.1996 г. 4 двары, 6 жыхароў.

ВЯСЁЛАЕ ПОЛЕ, вёска ва Урыцкім сельсавеце (не існуе). Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 30 двароў, 167 жыхароў. З 8.12.1926 г. вёска ва Урыцкім сельсавеце Гомельскага раёна і акругі.

У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і 14 мірных жыхароў. Пасля вайны вёска не адрадзілася. На месцы спаленай вёскі ў 1977 г. пастаўлена стэла.

ГАДЗІЧАВА, вёска ў Маркавіцкім сельсавеце, у складзе калгаса «Чырвоны сцяг». У 1770 г. 122 двары. Пасля Першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. у Расійскай імперыі. З 1773 г. у Гомельскім павеце Рагачоўскай правінцыі, з 1775 г. прыватная ўласнасць графа П.А.Румянцава-Задунайскага. У 1816 г. вёска, 192 мужчынскія, 170 жаночых сялянскіх душ, у Беліцкім павеце Магілёўскай губерні. У 1850 г. 128 двароў, 385 рэвізскіх душ, у складзе Мікалаеўскай эканоміі Гомельскага маёнтка, прыватная ўласнасць фельдмаршала І.Ф.Паскевіча. У 1850 г. была лютэранская царква. У 1862 г. сяло, 120 двароў, 380 сялян, якія валодалі 1705 дзесяцінамі зямлі. У 1864 г. у вёсцы на бойкім месцы каля дарогі размяшчаўся шынок. У 1882 г. сяло, 178 двароў, 905 жыхароў, у Маркавіцкай воласці Гомельскага павета. Апрача земляробства сяляне займаліся слясарным і сталярным рамёствамі. У сяле размяшчаліся хлебазапасны магазін, царкоўнае народнае вучылішча. У 1886 г. 171 двор, 955 жыхароў, ветраны млын. У 1909 г. сяло, 267 двароў, 1754 жыхары, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 3026 дзесяцінамі зямлі. У 1912 г. у Гадзічаве была пабудавана двухпавярховая школа. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага раёна, з 4.8.1927 г. Церахоўскага раёна, з 30.12.1927 г. у Маркавіцкім сельсавеце. У 1926 г. сяло, 264 двары, 1238 жыхароў. У вёсцы размяшчалася школа 1-й ступені. У 1930 г. створаны калгас. У вёсцы працавалі ветраны млын, калодачная майстэрня. У жніўні 1941 г. у абарончых баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі загінула 19 воінаў. У Айчынную вайну загінула 98 землякоў. На 1.1.1996 г. 116 двароў, 230 жыхароў.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Селішча. За 2,5 км на захад ад вёскі. Займае край надпоймавай тэрасы правага берага р. Нямыльня. Адносіцца да культуры тыпу верхняга пласта Банцараўшчыны і да эпохі Кіеўскай Русі.

ПОМНІК АРХІТЭКТУРЫ. Свята-Кацярынінская царква. У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1-й палавіне XIX ст. з цэглы.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. У цэнтры вёскі. Пахаваны 33 воіны, якія загінулі ў жніўні 1941 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Насупраць клуба ў скверы. На ўшанаванне памяці 104 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1968 г. пастаўлена стэла.

ГАЛАВІНЦЫ, вёска ва Улукаўскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Бярозкі».

У 1640 г. вёска, 8 дымоў, у Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага. У 1773 г. 18 двароў, 23 бабылі, 87 мужчын, 68 жанчын, у Гомельскім павеце Рагачоўскай правінцыі. З 1777 г. у Беліцкім, з 1852 г. у Гомельскім павеце. Прыватная ўласнасць дваран Фашчаў. У 1841 г. пабуда-

вана драўляная праваслаўная Свята-Пакроўская царква. У 1866 г. сяло ў Добрушскай воласці Гомельскага павета, 188 рэвізскіх душ, 846 дзесяцін ворнай зямлі. У 1882 г. 116 двароў, 540 жыхароў, у Гомельскай воласці Гомельскага павета. Вяскоўцы апрача земляробства займаліся адыходным промыслам, слясарным і сталярным рамёствамі. У 1884 г. народнае вучылішча, хлебазапасны магазін. У 1886 г. сяло, 105 двароў, 410 жыхароў, 3 ветраныя млыны. У 1899 г. у прыходзе Пакроўскай царквы было 1865 прыхаджан сяла і навакольных вёсак. Царкве належалі 42 дзесяціны зямлі. У 1909 г. сяло, 184 двары, 1047 жыхароў, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 1218 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр Галавінскага сельсавета, з 30.12.1927 г. ва Улукаўскім сельсавеце. У 1926 г. 123 двары, 533 жыхары, паштовае аддзяленне, школа 1-й ступені. У 1931 г. створаны калгас, у якім у 1935 г. былі свінагадоўчая, конегадоўчая, малочнатаварная фермы. У будынку царквы быў створаны клуб, у якім было ўласнае гукавое кіно. Была пабудавана новая школа. У 1940 г. у вёсцы было 244 двары, 1000 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы знішчылі 50 двароў і загубілі 100 жыхароў. Пасля вайны вёска адбудавалася. На 1.1.1996 г. 361 двор, 908 жыхароў. Сярэдняя школа (680 вучняў), бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, 2 магазіны. Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы М.В.Казловай.

ГАЛЕЕЎКА, вёска ў Старабеліцкім сельсавеце. У XIX ст. вёска, цэнтр маёнтка, які належаў дваранам Солтан-Перасветам. У 1878 г. прыватная ўласнасць двараніна Ю.М.Солтан-Перасвета, які меў тут 445 дзесяцін зямлі. У 1886 г. у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета, 48 двароў, 246 жыхароў, хлебазапасны магазін. Распаўсюджана шавецтва. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Старабеліцкага прыхода і наведвалі праваслаўную Мікалаеўскую царкву. У 1909 г. вёска, 91 двор, 608 жыхароў, належала сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 1257 дзесяцінамі зямлі. Апошнім уладальнікам маёнтка быў дваранін М.Ю.Солтан-Перасвет. З 8.12.1926 г. — цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна, з 30.12.1927 г. тэрыторыя ўключана ў Старабеліцкі сельсавет. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 65 двароў, 377 жыхароў. У вёсцы размяшчалася школа 1-й ступені. У 1941 г. 74 двары, 287 жыхароў. 13 верасня 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі 78 мірных жыхароў вёсак Галееўка і Аляксееўка. Пасля вайны вёска адбудавалася. На 1.1.1996 г. 60 двароў, 109 жыхароў.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. На паўднёвай ускраіне вёскі. Пахаваны 87 мірных жыхароў вёсак Галееўка (73) і Аляксееўка (14), якіх нямецка-фашысцкія карнікі спалілі 13.9.1943 г. У 1976 г. на магіле пастаўлены 2 стэлы, на адной з іх рэльефная выява жанчыны ў жалобе.

ГЛЫБОЦКАЕ, вёска, цэнтр сельсавета і калектыўнай дзяржаўнай гаспадаркі імя Ільіча. У 1788 г. вёска ў Гомельскай воласці Беліцкага павета, 271 рэвізская душа, прыватная ўласнасць фельдмаршала М.П.Румянцава-Задунайскага. У 1833 г. 265 рэвізскіх душ, у Мікалаеўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1834 г. прыватная ўласнасць графа І.Ф.Паскевіча. У 1849 г. пабудавана драўляная праваслаўная царква Раства Багародзіцы, ёй належала 36 дзесяцін зямлі. У 1850 г. сяло, 293 рэвізскія душы. З 1852 г. у Гомельскім павеце. У 1856 г. размяшчалася народнае вучылішча (7 вучняў), у 1868 г. 30 вучняў. У 1878 г. працавала крупадзёрка, даход з якой складаў 100—120 руб. У 1886 г. 207 двароў, 1460 жыхароў; праваслаўная царква, 3 ветраныя млыны, хлебазапасны магазін. Апрача земляробства распаўсюджаны рамёствы: шавецтва, сталярства, бондарства. У 1909 г. сяло, 284 двары, 1956 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 2923 дзесяціны зямлі. У 1909 г. аднакласная царкоўнапрыходская школа. З 8.12.1926 г. — цэнтр сельсавета Насовіцкага, з 4.8.1927 г. Церахоўскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 356 двароў, 1711 жыхароў. У вёсцы размяшчалася школа 1-й ступені. Створаны калгас «Пяскі». У вёсцы працавалі торфазавод, 2 конныя крупадзёркі, 2 ветраныя млыны.

У 1970 г. 400 двароў, 1040 жыхароў. Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, 2 магазіны. На 1.1.1996 г. 384 двары, 847 жыхароў. Дзевяцігадовая школа

(45 вучняў), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексна-прыёмны пункт, сталовая, 2 магазіны, лазня.

Радзіма Героя Савецкага Саюза І.А.Каўшарова, Героя Сацыялістычнай Працы П.П.Цімашэнкі, беларускага вучонага С.С.Абрамава.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Гарадзішча. За 0,5 км на захад ад вёскі, каля балота. Пляцоўка дыяметрам 20 м. Вядома з 1873 г. Абследавалі Е.Р.Раманаў (1910), У.У.Багамольнікаў (1976). Як паведамляў Е.Р.Раманаў, сяляне знайшлі скарб арабскіх дырхемаў дынастыі Саманідаў 895—910 гг. (77 манет зберагаюцца ў Эрмітажы; Санкт-Пецярбург). Раскопкі не праводзіліся.

ПОМНІКІ АРХІТЭКТУРЫ. Царква Раства Багародзіцы. У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1849 г. з дрэва.

ЦАРКОЎНАПРЫХОДСКАЯ ШКОЛА. На заходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў канцы XIX ст. з цэглы.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. У цэнтры вёскі. Пахаваны 25 воінаў, якія памерлі ад ран у шпіталі ў верасні 1943 г. У 1953 г. на магіле пастаўлены абеліск, у 1985 г. рэканструяваны.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 149 воінаў-землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1985 г. устаноўлена мармуровая пліта з імёнамі загінуўшых.

ГРАБАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Зара». Вядома з канца XVIII ст. як сяльцо ў Беліцкім павеце Магілёўскай губерні. У пачатку XIX ст. вёска належала двараніну Феліксу Фашчу. Тут у жніўні 1841 г. наглядаўся ўздым антыфеадальнай барацьбы, якая адлюстроўвалася ў масавых уцёках сялян з вёскі. Пад уплывам чутак, што існуе царскі маніфест, які дазваляе сялянам перасяляцца ў Херсонскую, Екацярынаслаўскую губерні і Бесарабію, дзе перасяленцы будуць вызвалены ад прыгону і атрымаюць ад урада беззваротную грашовую дапамогу, сяляне здымаліся з месца, прадавалі ці грузілі на калёсы маёмасць і разам з сем'ямі накіроўваліся да Чарнігава і далей на поўдзень. Фальшывымі пашпартамі іх забяспечвалі за плату вяскоўцы С.Папкоў і А.Фёдараў. Жорсткімі рэпрэсіямі ўладам удалося спыніць уцёкі і вярнуць адну сям'ю ў колькасці трох чалавек. У 1854 г. працаваў цукровы завод. У 1855 г. было заснавана скураное прадпрыемства, даход з якога складаў 375 руб. У 1856 г. размяшчалася народнае вучылішча, у якім вучылася 20 хлопчыкаў. У 1857 г. сяльцо, 287 рэвізскіх душ. Сяльцо належала памешчыку Карлу Фашчу. У 1859 г. тут дваранін Герард Мікалаеў заснаваў вінакурны завод, даход з якога складаў 4417 руб., у гэтым жа годзе тут была заснавана маслабойня. У 1866 г. 14 дваравых, 277 рэвізскіх душ, з якіх 3 было адпушчана на волю, 19 адмовіліся ад зямлі. Астатнія былі надзелены па 4 дзесяціны зямлі (удобіцы). Звыш гэтага сяляне атрымалі бязвыплатна 141 дзесяціну 300 сажняў зямлі і няўдобіцы 168 дзесяцін зямлі. Сяльцо належала малалетнім нашчадкам памешчыка К.Фашча шаснаццацігадоваму Феліксу і дванаццацігадоваму Антону, апекуном якіх быў памешчык Восіп Ляшкевіч. Сяляне займаліся не толькі земляробствам, таму што сяльцо размяшчалася на вялікай гандлёвай дарозе, гэта давала магчымасць сялянам на дадатковы заробак (нарыхтоўка і вываз лесу, адыходны промысел). У сяльцы размяшчаліся піцейны дом, піваварны завод, сядзібны каменны дом уладальнікаў вёскі. У канцы вёскі на рацэ Цераха размяшчалася плаціна, якую сяляне трымалі ў спраўнасці, вадзяны млын. У 1879 г. у вёсцы была пабудавана драўляная праваслаўная царква Узнясення. У 1886 г. сяло ў Насовіцкай воласці Гомельскага павета, 160 двароў, 811 жыхароў; 1 вадзяны, 2 ветравыя млыны, хлебазапасны магазін, школа граматы. Распаўсюджаны рамёствы: шавецтва, сталярства. У 1897 г. у прыходзе царквы Узнясення было 2900 прыхаджан сяла і навакольных вёсак. Царкве належалі 33 дзесяціны зямлі. У 1909 г. 246 двароў, 1450 жыхароў, належала Грабаўскаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 2149 дзесяцінамі зямлі. Фальварак, 1 двор, 32 жыхары, належаў памешчыку Феліксу Фашчу, які валодаў 2610 дзесяцінамі зямлі. У 1909 г. мелася казённая вінная лаўка. У 1914 г. працавала земская школа. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У студзені 1917 г. быў створаны дзяржгас «Грабаўка», у 1924 г. у саўгасе працавала

14 рабочых. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана школа 1-й ступені. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 219 двароў, 1013 жыхароў. З 4.8.1927 г. вёска, цэнтр сельсавета Гомельскага, з 10.2.1931 г. Церахоўскага раёнаў. У 1929 г. цагельны завод, ветраны і вадзяны млыны. У 1929—1930 гг. 19 жыхароў вёскі ўдзельнічалі ў будаўніцтве Маўзалея У.І.Леніна.

У 1941 г. 340 двароў, 1250 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 303 двары і загубілі 13 мірных жыхароў. У 1970 г. 313 двароў, 953 жыхары; цагельня, лясніцтва, швейная і шавецкая майстэрні, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, бальніца, аддзяленне сувязі, сталовая, 4 магазіны. На 1.1.1996 г. 314 двор, 970 жыхароў. Лясніцтва. Сярэдняя школа (280 вучняў), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, амбулаторыя, сталовая, 5 магазінаў.

Радзіма беларускага вучонага К.Ю.Канановіча.

ПОМНІК АРХІТЭКТУРЫ. Парк. На поўнач ад вёскі. Закладзены ў 2-й палавіне XIX ст. Доўгая ліпавая алея падзяляе парк на 2 часткі: заходнюю і ўсходнюю. Большая частка парку — яблыневы сад.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля будынка старой школы. На ўшанаванне памяці 32 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1970 г. пастаўлены абеліск.

ДАВЫДАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета, у складзе калгаса «Перамога». Заснавана ў 1847 г. як яўрэйская слабада ў Беліцкім павеце Магілёўскай губерні. У 1850 г. вёска, 14 двароў, 101 жыхар, прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1862 г. 19 двароў, 56 рэвізскіх душ, якія былі надзелены 289 дзесяцінамі зямлі; хлебазапасны магазін, млын, школа граматы. У 1909 г. 77 двароў, 456 жыхароў, належала Давыдаўскаму сельскагаспадарчаму таварыству, 457 дзесяцін зямлі. У 1913 г. народнае вучылішча. У 1924 г. тарфяны завод, нафтавы млын. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 37 двароў, 688 жыхароў; паштовае аддзяленне, школа 1-й ступені. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік». У 1971 г. 73 двары, 198 жыхароў. Аддзяленне торфапрадпрыемства «Парыжская камуна», швейная і шавецкая майстэрні. Васьмігадовая школа, сярэдняя школа рабочай моладзі, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, 3 магазіны. На 1.1.1996 г. 379 двароў, 1338 жыхароў; фельчарска-акушэрскі пункт, 3 магазіны.

ДАЎГАЛЕССЕ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса імя М.Горкага. У 1929 г. 53 двары, 282 жыхары. У 1971 г. 220 двароў, 700 жыхароў. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, амбулаторыя, аддзяленне сувязі, сталовая, швейная і шавецкая майстэрні, магазін. На 1.1.1996 г. 347 двароў, 910 жыхароў. Сярэдняя школа (204 вучні), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, комплексна-прыёмны пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, 2 магазіны, лазня.

МАГІЛА ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ І ВОІНА. На могілках. Пахаваны 4 падпольшчыкі, расстраляныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941 г., і афіцэр Чырвонай Арміі, які загінуў у Вялікую Айчынную вайну. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ДЗІКАЛАЎКА, вёска ў Цярухскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Сацыялізм». Узнікла на месцы рудні, дзе ў плавільнях выраблялі жалеза ў асноўным для мясцовых патрэб. У 1773 г. Дзікалаўская Рудня, 14 двароў, 109 жыхароў, у Гомельскай воласці Рагачоўскай правінцыі. У вёсцы размяшчалася карчма, якую трымалі яўрэі (5 чалавек). У 1788 г. Дзікалаўскі жалезны завод, 89 рэвізскіх душ, прыватная ўласнасць фельдмаршала М.П.Румянцава-Задунайскага. У 1833 г. 60 рэвізскіх душ, у Клімавіцкай эканоміі Гомельскага маёнтка, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1850 г. 31 двор, 196 жыхароў. З 1852 г. у Гомельскім павеце. У 1864 г. у вёсцы размяшчаўся шынок, даход з якога складаў 8 рублёў у Гомельскую эканомію. У 1884 г. 48 двароў, 230 жыхароў, у Маркавіцкай воласці Гомельскага павета. Распаўсюджана шавецтва, даход з якога складаў 20 рублёў у год. У 1909 г. 63 двары, 466 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, 666 дзесяцін зямлі. З 20.8.1926 г. у Краўцоўскім сельсавеце Насовіцкага раёна. Паводле перапісу

насельніцтва 1926 г., 76 двароў, 394 жыхары. На 1.1.1996 г. 63 двары, 92 жыхары, з якіх 77 пенсіённага ўзросту.

ДУЯНАЎКА, вёска ў Прыбыткаўскім сельсавеце, у складзе эксперыментальнай базы «Гомельская». Вядома з XVIII ст., уваходзіла ў Вуцеўскі прыход Мікалаеўскай царквы, з 1772 г. у Расійскай імперыі, з 1774 г. у Прыбыткаўскім прыходзе царквы Раства Багародзіцы. У першай палавіне XIX ст. у складзе Прыбыткаўскага маёнтка, прыватная ўласнасць памешчыка, калежскага асэсара М.А.Бардоўскага. У 1872 г. вёска, цэнтр маёнтка Дуянаўка, які належаў двараніну П.Я.Батулінскаму, 1079 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, сад, даход з якога складаў 250 рублёў у год. У 1875 г. селянінам Рыгорам Смусевым была заснавана маслабойня, даход з якой складаў 125 рублёў у год. У 1882 г. 66 двароў, 386 жыхароў, у Насовіцкай воласці Гомельскага павета. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. У 1909 г. 80 двароў, 658 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 481 дзесяцінай зямлі. Фальварак — уласнасць двараніна М.Дабравольскага, 654 дзесяціны зямлі. У вёсцы працаваў вадзяны млын. У 1925 г. створаны саўгас «Дуянаўка», у які ўваходзіла 5 гаспадарак, 33 рабочыя. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёнаў, з 30.12.1927 г. у Прыбыткаўскім сельсавеце. У 1926 г., паводле перапісу насельніцтва, 108 двароў, 564 жыхары, школа 1-й ступені. У 1940 г. 147 двароў, 662 жыхары. З верасня 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску (147 двароў) і загубілі 7 жыхароў. Пасля вайны вёска адбудавана. На 1.1.1996 г. 160 двароў, 292 жыхары. Дзіцячы інтэрнат (279 дзяцей). Магазін.

ЖУРАЎЛЁЎКА, вёска ў Грабаўскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Зара». Заснавана ў XIX ст., у 1864 г. вядома як урочышча Жураўлёва ў складзе маёнтка Грабаўка, прыватная ўласнасць малалетніх нашчадкаў двараніна К.Фашча, апекуном якіх быў памешчык Восіп Ляшкевіч. У 1868 г. сялянам урочышчаў Жураўлёва і Гразкі належала 70 дзесяцін 2001 сажань зямлі і 50 дзесяцін зямлі яны мелі ў часовым карыстанні. У 1903 г. Жураўлёўка ў Насовіцкай воласці Гомельскага павета. Побач была леснічоўка, 1 двор, 4 жыхары, якая належала памешчыку Ф.К.Фашчу. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 8.12.1926 г. у Макаўскім сельсавеце Насовіцкага раёна Гомельскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 37 двароў, 211 жыхароў. Сялянскія дзеці наведвалі школу 1-й ступені за 3 км у в. Макаўе. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 51 двор, 133 жыхары.

ЖЫГАЛЬСКАЯ РУДНЯ, вёска ў Рудня-Марымонаўскім сельсавеце. Узнікла на месцы жалезнай рудні, дзе ў плавільнях выраблялася жалеза для мясцовых патрэб. У XIX ст. у складзе маёнтка Міхалькі, уласнасць памешчыцы П.Валадзьковічавай. Пасля яе смерці ў 1850 г. прыватная ўласнасць памешчыцы Станіславы Хацяноўскай. У 1862 г. 6 рэвізскіх душ мужчынскага полу, 61 дзесяціна зямлі. У 1909 г. 7 двароў, 46 жыхароў, належала Рудня-Марымонаўскаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 37 дзесяцін зямлі. З 8.12.1926 г. у складзе Рудня-Марымонаўскага сельсавета Дзятлавіцкага раёна, з 4.8.1927 г. у Гомельскім раёне. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 16 двароў, 79 жыхароў. На 1.1.1996 г. 20 двароў, 38 жыхароў. У складзе саўгаса імя Някрасава, малочнатаварная ферма.

ЖЫТОЎЛЯ, вёска ў Целяшоўскім сельсавеце.

Вядома з XX ст. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 58 двароў, 321 жыхар. З 8.12.1926 г. у Рудня-Целяшоўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна, з 30.12.1927 г. у Целяшкоўскім сельсавеце. Быў створаны калгас «Чырвоная Дуброва». Працавала кузня. У 1933 г. цагельны завод, ветраны млын. З 17.4.1962 г. у складзе Гомельскага раёна. На 1.1.1996 г. 107 двароў, 271 жыхар.

ЗАДОРАЎКА, вёска ў Целяшоўскім сельсавеце. У пачатку XIX ст. вёска ў складзе маёнтка Задораўка ў Беліцкім павеце Магілёўскай губерні. У 1847 г. 105 рэвізскіх душ, прыватная ўласнасць калежскага асэсара, памешчыка М.С.Міклашэўскага, які меў тут 800 дзесяцін зямлі. У 1863 г. маёнтак, прыватная ўласнасць памешчыцы Крушэўскай. У 1886 г. вёска, 30 двароў, 192 жыхары, у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета, хлебазапас-

ны магазін, ветраны млын. Традыцыйнае рамяство — шавецтва. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Целяшоўскага прыхода і наведвалі праваслаўную Пакроўскую царкву. У 1909 г. 78 двароў, 735 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 1185 дзесяцін зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна, з 30.12.1927 г. у Целяшоўскім сельсавеце.

У вёсцы быў створаны калгас «Чырвоная Задораўка». У вёсцы працавалі ветраны млын, кузня. У 1940 г. 90 двароў, 200 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 80 двароў і загубілі 12 жыхароў. Пасля вайны адбудавалася. З 1986 г. вёска ў складзе калгаса «Чырвоная плошча». На 1.1.1996 г. 38 двароў, 68 жыхароў.

ЗАЙМІШЧА, вёска ў Чарацянскім сельсавеце. У 1886 г. вёска 42 двары, 266 жыхароў, у Маркавіцкай воласці Гомельскага павета. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся кравецкім, шавецкім, сталярным промысламі. У 1909 г. 74 двары, 511 жыхароў, належала Макаўскаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 963 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. у Пракопаўскім сельсавеце Насовіцкага, з 4.8.1927 г. Церахоўскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 71 двор, 395 жыхароў. У вёсцы размяшчалася школа. У Вялікую Айчынную вайну са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1967 г. жыхары пасёлка Данец пераселены ў Займішча. У складзе калгаса «Першамайскі». На 1.1.1996 г. 59 двароў, 93 жыхары, 75 з якіх пенсіённага ўзросту. Магазін.

ЗАЛІП'Е, вёска ва Урыцкім сельсавеце. У 1773 г. 51 двор, 180 мужчын, 144 жанчыны, у Гомельскай воласці Рагачоўскай правінцыі. З 1775 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага. У 1788 г. 270 рэвізскіх душ. У 1833 г. вёска, 169 рэвізскіх душ, у Гомельскай воласці Беліцкага павета. Адносілася да Новікаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1864 г. 75 двароў, 248 жыхароў; шынок. У 1886 г. 63 двары, 621 жыхар; хлебазапасны магазін, царкоўнаприходская школа, ветраны млын. У 1909 г. 150 двароў, 376 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 1469 дзесяцін зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета, з 30.12.1927 г. у складзе Урыцкага сельсавета. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 162 двары, 875 жыхароў; школа 1-й ступені. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1986 г. вёска ў складзе калгаса імя Урыцкага. Паляводчая брыгада. Васьмігадовая школа, медыцынскі пункт, аддзяленне сувязі. На 1.1.1996 г. 245 двароў, 519 жыхароў. Дзевяцігадовая школа (69 вучняў), фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы М.В.Казловай.

ЗАРНІЦА, пасёлак у Зябраўскім сельсавеце. Створана ў XX ст., у час калгаснага будаўніцтва. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 10 двароў, 53 жыхары. З 8.12.1926 г. у Лагуноўскім сельсавеце Насовіцкага раёна Гомельскай акругі, з 4.8.1927 г. у Гомельскім раёне. Пасялковыя дзеці наведвалі школу 1-й ступені, якая знаходзілася за 4 км у в. Лагуны. У 1941 г. 15 двароў, 63 жыхары. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 14 двароў. Пасля вайны пасёлак аднавіўся. У складзе эксперыментальнай базы «Гомельская». На 1.1.1996 г. 11 двароў, 18 жыхароў.

ЗЯБРАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета. Назва вёскі паходзіць ад зыходнай формы Жабраўка (жабра, жабер). Гэта форма захавалася ў назве рэчкі Зябраўкі (прыток р. Вуці). Вёска вядома з 18 ст. у Вялікім княстве Літоўскім. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) — у Расійскай імперыі. У 1773 г. 67 двароў, 385 жыхароў, у Гомельскай воласці Рагачоўскай правінцыі. З 1775 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала М.П.Румянцава-Задунайскага. У 1788 г. 285 рэвізскіх душ; карчма. Вёска адносілася да Каранёўскай эканоміі Гомельскага маёнтка, у Гомельскай воласці Беліцкага павета. З 1834 г. уласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1841 г. сялянскі рух ахапіў Гомельскі маёнтак, у тым ліку і Зябраўку. Сялянскія сем'і пачалі ўцякаць з маёнтка. У 1850 г. 98 двароў, 590 жыхароў. З 1852 г. у Гомельскім павеце. З 1856 г. прыватная ўласнасць Ф.І.Паскевіча. У 1856 г. народнае вучылішча, у якім навучалася 18 хлопчы-

каў. У 1875 г. цэнтр аднайменнага маёнтка, які належаў памешчыку І.Случанкову, 121 дзесяціна зямлі. У 1876 г. у вёсцы селянін Маісеенкаў заснаваў крупадзёрку, даход з якой складаў 270 руб. У 1879 г. другі селянін Лабудзевы Нікіфар заснаваў яшчэ адну крупадзёрку, даход з якой складаў таксама 270 руб. У 1882 г. вёска 146 двароў, 863 жыхары, у Насовіцкай воласці Гомельскага павета. Традыцыйныя рамёствы: кравецтва, шавецтва, сталярства. У 1886 г. 132 двары, 861 жыхар, 2 ветраныя млыны; хлебазапасны магазін, прыстань. У 1900 г. было заснавана на сродкі насельніцтва земскае вучылішча, дзе вучылася 300 вучняў. У 1909 г. вёска, 236 двароў, 1552 жыхары, належала Зябраўскаму сельскагаспадарчаму таварыству, 1505 дзесяцін зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 285 двароў, 1309 жыхароў; школа 1-й ступені. У 1930 г. у вёсцы быў створаны калгас «1 Мая». У калгасе працавалі кузня, ветраны млын.

У 1933 г. размяшчаўся Зябраўскі ўчастак Гомельскай МТС, які абслугоўваў 6 калгасаў. У 1971 г. 400 двароў, 1300 жыхароў. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, 2 магазіны. На 1.1.1996 г. 370 двароў, 851 жыхар. Сярэдняя (128 вучняў) і музычная школы, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, 2 магазіны.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля школы. На ўшанаванне памяці 142 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1962 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ПОМНІК ЦАРЫКАВУ БАРЫСУ АНДРЭЕВІЧУ. Каля школы. На ўшанаванне памяці Героя Савецкага Саюза Б.А.Царыкава, які вызначыўся ў баях пры вызваленні Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1966 г. пастаўлены помнік — паплечны бюст героя.

ЗЯБРАЎКА, чыгуначная станцыя на лініі Гомель — Бахмач (пасёлак Ваявода), у Зябраўскім сельсавеце.

Чыгуначная станцыя Зябраўка ўзнікла ў 1873 г. на чыгуначнай станцыі Лібава-Роменскай дарогі. У 1905 г. тут грузілася да 150 тыс. пудоў лесу і хлеба. У 1909 г. чыгуначная станцыя, 1 двор, 25 жыхароў, у Насовіцкай воласці Гомельскага павета. З 8.12.1926 г. у Зябраўскім сельсавеце Насовіцкага раёна Гомельскай акругі, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёна. У 1971 г. 15 двароў, 45 жыхароў. Магазін. На 1.1.1936 г. 87 жыхароў. Магазін.

ЗЯЛЁНЫЯ ЛУКІ, вёска ў Старабеліцкім сельсавеце. Вядома з XVIII ст. У 1788 г. 48 рэвізскіх душ, прыватная ўласнасць фельдмаршала графа П.А.Румянцава, у Гомельскай воласці Беліцкага павета. Адносілася да Багуслаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1833 г. вёска, 38 рэвізскіх душ. У 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. З 1852 г. у Гомельскім павеце. У 1860 г. 8 двароў, 23 рэвізскія душы. Сялянам належала 129 дзесяцін 1040 сажняў зямлі; хлебазапасны магазін. У 1909 г. ваколіца, 25 двароў, 136 жыхароў, у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета. Ваколіца належала мяшчанскаму праўленню, якое валодала 253 дзесяцінамі зямлі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., ваколіца, 38 двароў, 180 жыхароў; школа 1-й ступені. На 1.1.1996 г. 23 двары, 43 жыхары. Вёска ў складзе калгаса імя Урыцкага.

ІВАНАЎКА, вёска ў Цярэніцкім сельсавеце. Вядома з канца XVIII ст. як прыватная ўласнасць фельдмаршала М.П.Румянцава-Задунайскага. У 1788 г. 182 рэвізскія душы, у Гомельскай воласці Беліцкага павета. Адносілася да Новікаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. З 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1850 г. 48 двароў, 358 жыхароў. З 1852 г. у Гомельскім павеце. У 1868 г. было заснавана цагельнае прадпрыемства, даход з якога складаў 150 руб., у 1877 г. селянінам І. Калатухам — другое цагельнае прадпрыемства, даход складаў 300 руб. У 1886 г. вёска, 110 двароў, 1345 жыхароў, у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета; хлебазапасны магазін, ветраны млын, школа граматы. Асноўным заняткам вяскоўцаў было земляробства, якое сяляне спалучалі з кавальскім, сталярным рамёствамі. У 1909 г. 150 двароў, 985 жыхароў, належала Цярэніцкаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 1293 дзесяціны зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна, з 30.12.1927 г. у Івольскім сельсавеце, з 1938 г. у Гомельскім раёне. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 146 двароў,

776 жыхароў; школа 1-й ступені. У 1930-я гады створаны калгас «1 Мая». Працавалі кузня, ветраны млын. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У складзе калгаса «1 Мая». На 1.1.1996 г. 102 двары, 188 жыхароў, з якіх 107 пенсіённага ўзросту.

ІВАНЬКАЎ, пасёлак у Целяшоўскім сельсавеце. Вядомы з пачатку XX ст. як хутар у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета. Хутаране былі прыхаджанамі Целяшоўскага прыхода і наведвалі праваслаўную Пакроўскую царкву. У 1909 г. хутар, 4 двары, 18 жыхароў, належаў Целяшоўскаму і Задораўскаму сельскагаспадарчым таварыствам, якія валодалі 213 дзесяцінамі зямлі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., пасёлак, 27 двароў, 160 жыхароў. З 8.12.1926 г. у Задораўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. З 30.12.1927 г. у Целяшоўскім сельсавеце. У 1941 г. 32 двары, 144 жыхары. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску (32 двары) і загубілі 8 жыхароў. Пасля вайны пасёлак адбудаваўся. З 17.4.1962 г. у Гомельскім раёне, у складзе калгаса «Чырвоная плошча» (цэнтр в. Целяшы). На 1.1.1996 г. 3 двары, 3 жыхары.

ІЛЬІЧ (былая назва Клёнкі), пасёлак ва Улукаўскім сельсавеце.

У 1926 г. 51 двор, 260 жыхароў. Пасялковыя дзеці наведвалі школу 1-й ступені, якая знаходзілася за 3 км у в. Раманавічы. З 8.12.1926 г. у Раманавіцкім сельсавеце Гомельскага раёна і акругі, з 26.7.1930 г. Гомельскага раёна. У 1941 г. 70 двароў, 315 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўвесь пасёлак (70 двароў) і загубілі 2 жыхароў. Пасля вайны адбудаваны. З 23.5.1959 г. ва Улукаўскім сельсавеце.

У складзе саўгаса «Бярозкі». На 1.1.1996 г. 108 двароў, 278 жыхароў. Радзіма Героя Савецкага Саюза М.І.Семянцова.

ПОМНІКІ АРХЕАЛОГІІ. Могільнік. За 5 км на поўнач ад пасёлка, ва ўрочышчы Баравая (Баравое), на першай надпоймавай тэрасе левага берага р. Сож. 20 насыпаў вышынёй 0,5—1,5 м, дыяметрам 8—10 м. Выявіў у 1980 г. А.А.Макушнікаў. Раскопкі не праводзіліся.

Селішча-1. На заходняй ускраіне пасёлка на краі першай надпоймавай тэрасы левага берага р. Сож. Шырыня селішча (паводле знаходак) 40 м. Выявіў у 1977 г. і абследаваў у 1980 г. А.А.Макушнікаў. Знойдзены абломкі ляпнога посуду, абпаленыя камяні. Селішча адносіцца да позняга этапу зарубінецкай культуры. Датуецца 2—5 ст. н. э.

Селішча-2. За 1 км на поўдзень ад пасёлка, ва ўрочышчы Гарэлы (Глыбокі) Алёс, на мысе правага берага невялікага ручая, які ўпадае ў Сож. Выявіў і абследаваў у 1980 г. А.А.Макушнікаў. Знойдзены рэшткі ганчарнай керамікі эпохі Кіеўскай Русі.

Матэрыялы абследавання селішчаў захоўваюцца ў Гомельскім абласным краязнаўчым музеі.

Стаянка-1. За 0,8 км ад пасёлка, ва ўрочышчы Гарэлы (Глыбокі) Алёс. Памер 50х70 м. Выявіў і абследаваў у 1979 г. Ю.У.Абадэнка. У культурным пласце 0,1 м знойдзены крамянёвыя прылады працы: ножападобныя пласціны, скрабкі, разцы, адшчэпы з рэтушшу, тронкавыя наканечнікі стрэл і інш.

Стаянка-2. На паўднёва-заходняй ускраіне пасёлка, на 10—12-метровай тэрасе р. Сож. Памер 30х50 м. Выявіў і абследаваў у 1979 г. Ю.У.Абадэнка. Культурны пласт 0,15 м. Сабрана 548 крамянёвых вырабаў, аналагічных крамянёваму інвентару стаянкі-1.

Стаянка-3. За 1,2 км на поўдзень ад пасёлка, на правым схіле ўрочышча Гарэлы (Глыбокі) Алёс, на мысе левага берага р. Сож. Памер 40х100 м. Выявіў і абследаваў у 1979 г. Ю.У.Абадэнка. Культурны пласт 0,15 м. Сабраны крамянёвыя прылады працы, блізкія да інвентару стаянак 1 і 2.

Стаянка-4. За 0,4 км на паўднёвы захад ад пасёлка. Памер 20х40 м. Выявіў і абследаваў у 1979 г. Ю.У.Абадэнка. Культурны пласт 0,1 м. Знойдзены крамянёвыя ножападобныя пласціны, скрабкі, разцы, вастрыі, адшчэпы з рэтушшу і інш. Стаянкі датуюцца 8—5-м тысячагоддзямі да н. э., адносяцца да эпохі мезаліту.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Гомельскім абласным краязнаўчым музеі.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. За 3,5 км на паўночны ўсход ад пасёлка, ва ўрочышчы Баравая. Пахава-

ны 49 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1973 г. на магіле пастаўлена стэла.

КАЛІНАЎКА, пасёлак у Целяшоўскім сельсавеце.

Вядомы з пачатку XX ст. як вёска ў Целяшоўскай воласці Гомельскага павета. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 32 двары, 102 жыхары. З 8.12.1926 г. вёска ў Целяшоўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. Быў створаны калгас «Чырвоны ўсход». Працавала кузня.

У 1941 г. 46 двароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 40 двароў і загубілі 2 жыхароў. З 17.4.1962 г. у Гомельскім раёне. У складзе калгаса «Чырвоная плошча». На 1.1.1996 г. 21 двор, 30 жыхароў, 24 з якіх пенсіённага ўзросту.

ПОМНІКІ АРХЕАЛОГІІ. Курганны могільнік. За 0,5 км на ўсход ад пасёлка ва ўрочышчы Сіянск, побач з урочышчам Латышы. Захаваліся 25 курганоў вышынёй 0,5—2,5 м, дыяметрам 4—16 м. Вядомы з 1873 г., абследаваў у пачатку XX ст. Е.Р.Раманаў. У 1977 г. У.У.Багамольнікаў раскапаў 7 насыпаў. Знойдзены бронзавае паясное кольца, 2 бронзавыя пацеркі (цыліндрычная малінападобная і эліпсоідная з імітацыяй зерня). Могільнік датуецца 10—12 ст., належаў радзімічам.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Селішча. За 0,3 км на паўночны ўсход ад пасёлка, на правым беразе р. Уза. Выявіў у 1979 г. А.І.Драбушэўскі, абследаваў у 1981 г. А.А.Макушнікаў. Знойдзены гліняныя прасліцы, рэшткі ляпнога і ганчарнага посуду. Адносіцца да 3-й чвэрці 1-га тысячагоддзя н. э. і да эпохі Кіеўскай Русі. Раскопкі не праводзіліся. Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Гомельскім абласным краязнаўчым музеі.

КАНТАКУЗАЎКА, вёска ў Зябраўскім сельсавеце. У 1863 г. вёска, у складзе аднайменнага фальварка, прыватная ўласнасць памешчыка Веражбіцкага, які меў 64 752 дзесяціны зямлі і карчму. У 1865 г. фальварак Кантакузаўку выкупіў князь Ф.І.Паскевіч. У 1884 г. вёска, 41 двор, 223 жыхары, у Насовіцкай воласці Гомельскага павета. У 1909 г. вёска, 48 двароў, 474 жыхары, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 747 дзесяцін зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага раёна, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёна, з 30.12.1927 г. у Зябраўскім сельсавеце. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 94 двары, 475 жыхароў. У вёсцы размяшчалася школа 1-й ступені. Быў створаны калгас «Чырвоны пуцілавец». Працавалі ветраны млын, кузня. У 1941 г. 100 двароў, 437 жыхароў.

У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі амаль усю вёску (98 двароў) і загубілі 6 жыхароў. У баях за вызваленне вёскі загінулі 4 савецкія воіны. Пасля вайны адбудавалася. У складзе эксперыментальнай базы «Гомельская». На 1.1.1996 г. 65 двароў, 110 жыхароў.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны 4 воіны, якія загінулі ў 1943 г. у час вызвалення вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1968 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. На могілках. Пахаваны 5 мірных жыхароў вёскі, якіх нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі ў жніўні 1941 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

КАРАНЁЎКА, пасёлак у Зябраўскім сельсавеце.

Вядомы з XVIII ст. як слабада ў Гомельскай воласці Беліцкага павета. У 1816 г. слабада, 156 рэвізскіх душ, прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава. У 1833 г. вёска, цэнтр Каранёўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. Да ведамства Каранёўскай эканоміі адносілася 5 вёсак: Зябраўка, Лагуны, Ларышчы, Старыя Івакі, Новыя Івакі, 5062 двары, 38 316 дзесяцін зямлі. З 1834 г. фальварак набыў князь І.Ф.Паскевіч, з 1852 г. фальварак у Гомельскім павеце. У 1886 г. тут працавала сенапрасавальная фабрыка. На 1.1.1996 г. 405 двароў, 1112 жыхароў. Вопытны лясгас. Дзевяцігадовая школа (176 вучняў), дзіцячыя яслі, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

ПОМНІК АРХІТЭКТУРЫ. Сядзібны дом («паляўнічы домік»). На паўднёвай ускраіне пасёлка. Пабудаваны ў 2-й палавіне XIX ст. з цэглы.

КАСЦЮКОЎКА, вёска у Яромінскім сельсавеце. У першай палавіне XIX ст. у

складзе маёнтка. У 1848 г. вёска, 75 двароў, прыватная ўласнасць у Беліцкім павеце Магілёўскай губерні. На вялікай паштовай дарозе Санкт-Пецярбург — Кіеў размяшчаўся пастаялы двор, які ўтрымліваўся за кошт земскага збору (здаваўся ў арэнду купцу Ш.Уцяеўскаму за 35 руб. серабром). Станцыйны драўляны дом складаўся з дзвюх палавін. Пакоі былі з мэбляй: 4 сталы, некалькі стулаў, 2 канапы, 2 ложкі, люстэрка, гадзіннік. У другой палавіне дома — кухня і каморы. У двары размяшчаліся флігель, памяшканні для ямшчыкоў, фуражу, канюшня, пуня, павець, свіран. У вёсцы меўся шынок. У 1863 г. 279 рэвізскіх душ, прыватная ўласнасць памешчыка Восіпа Усцінавіча, які валодаў 1100 дзесяцінамі. Цагельны завод. У 1864 г. прыватная ўласнасць палкоўніка Станіслава Нолькіна. У 1872 г. 275 рэвізскіх душ, належала генерал-маёру барону С.І.Нолькіну, які валодаў 1142 дзесяцінамі зямлі. У 1879 г. крупадзёрка, на якой штогод выраблялася 230 пудоў круп, даход складаў 150 руб. У 1886 г. 123 двары, 688 жыхароў, у Пакалюбіцкай воласці Гомельскага павета; хлебазапасны магазін, школа граматы. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Яромінскага прыхода і наведвалі праваслаўную Пакроўскую царкву. У 1909 г. 178 двароў, 1242 жыхары, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 1239 дзесяцінамі зямлі. Апошнім уладальнікам фальварка быў памешчык С.І.Нолькін, 610 дзесяцін зямлі. У 1909 г. аднакласная царкоўнапрыходская школа. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 158 двароў, 845 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1971 г. 440 двароў, 1556 жыхароў. Вучэбна-доследная гаспадарка прафесійна-тэхнічнага вучылішча. Фабрыка швейных вырабаў. Пачатковая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. На 1.1.1996 г. 379 двароў, 957 жыхароў. Бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. Радзіма беларускага мастака П.Н.Гаўрыленкі, дзяржаўнага і партыйнага дзеяча І.Ф.Кломава.

КЛІМАЎКА, вёска ў Прыбыткаўскім сельсавеце, цэнтр эксперыментальнай базы «Гомельская».

У XVIII ст. вёска ў Гомельскай воласці Вялікага княства Літоўскага, з 1772 г. у Расійскай імперыі. У 1775 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага. У 1778 г. 349 рэвізскіх душ. У вёсцы размяшчаўся шкляны завод, на якім працавалі 22 чалавекі. У 1819 г. на заводзе выраблялі бутэлькі для шампанскага, лямпы, крышталь. У 1833 г. 587 рэвізскіх душ, у Клімавіцкай эканоміі Гомельскага маёнтка Гомельскай воласці Беліцкага павета. У 1862 г. 98 двароў, 287 рэвізскіх душ мужчынскага полу, якія валодалі 1296 дзесяцінамі зямлі. У 1886 г. 118 двароў, 771 жыхар, у Насовіцкай воласці Гомельскага павета; ветраны млын, аднакласная царкоўнапрыходская школа. Традыцыйныя рамёствы: сталярнае, шавецкае. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Прыбыткаўскага прыхода і наведвалі праваслаўную Раства Багародзіцы царкву. У 1909 г. вёска, 48 двароў, 474 жыхары, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 1558 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага раёна, з 4.8.1927 г. у Гомельскім раёне. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 303 двары, 1474 жыхары; школа 1-й ступені. У 1930 г. у вёсцы быў арганізаваны калгас «Перамога». Працавалі кузня, ветраны млын, конная крупадзёрка.

З 16.4.1954 г. у Прыбыткаўскім сельсавеце. У 1972 г. 307 двароў, 924 жыхары. Сепаратарны пункт, швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, 3 магазіны. На 1.1.1996 г. 395 двароў, 936 жыхароў. Сярэдняя школа (630 вучняў), дзіцячы сад, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, 2 магазіны, лазня. Радзіма беларускага вучонага У.Н.Сідарцова.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Гарадзішча. За 0,4 ка на ўсход ад вёскі, на беразе р. Вуць. Пляцоўка авальная, памерам 30х20 м, умацаванняў не мае. Абследавалі Е.Р.Раманаў (1910), У.У.Багамольнікаў (1976). Раскопкі не праводзіліся.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля клуба. На ўшанаванне памяці 224 землякоў з вёсак Клімаўка, Каравышань, Цагельня, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1968 г. пастаўлена стэла.

КЛІМАЎСКІ, пасёлак у Яромінскім сельсавеце. Вядомы як фальварак. У 19 ст. належаў фельдмаршалу П.А.Румянцаву-

Задунайскаму і знаходзіўся ў Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні. У 1833 г. фальварак у Клімавіцкай эканоміі Гомельскага маёнтка, прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага. З 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У Клімавіцкую эканомію ўваходзіла 12 вёсак, 787 двароў, 6687 жыхароў, 4343 дзесяціны зямлі. У фальварку працаваў піваварны завод, на якім выраблялася піва 6777 вёдзер 3 кварты, у 1832 г. прададзена 4025 вёдзер 8 кварт на суму 9402 руб. 79 кап. Піва развозілася па шынках. У фальварку працавала малацільная машына, знаходзіўся хлебазапасны магазін. Праз фальварак праходзіла Кіеўская шаша, на якой размяшчалася дарожная станцыя Клімаўск. У фальварку працаваў цагельны завод двараніна М.А.Івіцкага. У 1909 г. фальварак, 1 двор, 20 жыхароў, у Насовіцкай воласці Гомельскага павета, належаў княгіні І.Паскевіч, якая валодала 654 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. у Касцюковіцкім сельсавеце Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 30 двароў, 137 жыхароў. Дарожная станцыя, 2 двары, 10 жыхароў. У пасёлку быў створаны калгас «Перамога». Працаваў ветраны млын, конная крупадзёрка. На 1.1.1996 г. 35 двароў, 60 жыхароў. У складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС.

КРАСНАЕ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Перамога». У XVIII ст. прыватная ўласнасць у Вялікім княстве Літоўскім. З 1772 г. у Расійскай імперыі. У 1779 г. у вёсцы была пабудавана драўляная праваслаўная Успенская царква, якой належала 36 дзесяцін зямлі. У 1833 г. сяло, 198 рэвізскіх душ мужчынскага полу, у складзе Новікаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка, прыватная ўласнасць графа М.П.Румянцава. З 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1856 г. размяшчалася народнае вучылішча, у якім вучылася 18 хлопчыкаў. У 1886 г. сяло, 101 двор, 682 жыхары; хлебазапасны магазін, аднакласнае народнае вучылішча, у якім у 1888 г. вучылася 69 хлопчыкаў і 9 дзяўчынак. Значнае месца ў гаспадарчым жыцці вяскоўцаў займалі рамёствы: кавальскае, шавецкае. У 1889 г. у прыход праваслаўнай Успенскай царквы ўваходзіла 2378 прыхаджан сяла Краснае і навакольных вёсак. У 1909 г. 184 двары, 1229 жыхароў, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 1418 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета, з 30.12.1927 г. у складзе Ціценскага сельсавета Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцва 1926 г., 170 двароў, 874 жыхары, школа 1-й ступені. У 1930-я гады створаны калгас «1 Мая». У вёсцы працавала кузня. У Айчынную вайну восенню 1943 г. у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі за вызваленне вёскі загінула 258 воінаў і 5 партызан. У 1962 г. пасёлкі Светлы, Камунар, Громкі зліліся з в. Краснае. У 1972 г. 629 двароў, 2320 жыхароў. Камбінат бытавога абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, амбулаторыя, аддзяленне сувязі, 3 магазіны. На 1.1.1996 г. 1066 двароў, 3663 жыхары. Сярэдняя школа (617 вучняў), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, амбулаторыя, сталовая, 4 магазіны, лазня. Свята-Успенская царква.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. У скверы, каля будынка праўлення калгаса «Перамога». Пахаваны 265 воінаў і 5 партызан, якія загінулі восенню 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. У 1992 г. узведзены мемарыял.

КРАЎЦОЎКА, вёска ў Цярухскім сельсавеце. Вёска вядома як прыватная ўласнасць у Вялікім княстве Літоўскім. З 1772 г. у Расійскай імперыі, у 1773 г. 36 двароў, 234 жыхары. З 1776 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава. У 1788 г. 164 рэвізскія сялянскія душы, у Гомельскай воласці Беліцкага павета. Вёска адносілася да Клімавіцкай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1833 г. 150 рэвізскіх душ, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. З 1852 г. у Гомельскім павеце. У 1856 г. народнае вучылішча, у 1868 г. навучалася 15 хлопчыкаў. У 1886 г. вёска, 118 двароў, 648 жыхароў, у Маркавіцкай воласці Гомельскага павета; хлебазапасны магазін, вадзяны млын, школа граматы. У вёсцы былі распаўсюджаны рамёствы і промыслы: адыходны (даход з якога складаў 50 руб.), шавецтва (даход 10 руб.), кавальства (даход 50 руб.), кравецтва (даход 20 руб.). У 1893 г. у вёсцы была пабудавана драўляная праваслаўная Троіцкая царква, у

прыход якой у 1898 г. уваходзіла 1768 прыхаджан Краўцоўкі і навакольных вёсак. У 1909 г. сяло, 185 двароў, 569 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 2084 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага, з 4.8.1927 г. Церахоўскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 247 двароў, 1228 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1930-я гады створаны калгас «4-ы заключны». У вёсцы працавалі вадзяны млын, кузня. У 1941 г. 303 двары, 763 жыхары. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі амаль усю вёску (300 двароў) і загубілі 4 жыхароў. На 1.1.1996 г. 172 двары, 357 жыхароў. Фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, магазін.

ЛАПАЦІНА, вёска ў Пакалюбіцкім сельсавеце. Вядома з канца XVIII ст. як прыватная ўласнасць фельдмаршала М.П.Румянцава-Задунайскага ў Гомельскай воласці Беліцкага павета. У 1803 г. у вёсцы 29 двароў, 158 жыхароў, адносілася да Багуслаўскай эканоміі, у 1833 г. 252 рэвізскія душы. З 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1850 г. 121 двор, 608 жыхароў. У 1864 г. у вёсцы быў шынок, даход з якога ў эканомію Гомельскага маёнтка складаў 25 руб.

У 1886 г. 134 двары, 782 жыхары, у Пакалюбіцкай воласці Гомельскага павета, школа граматы.

У 1909 г. 213 двароў, 1286 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 1683 дзесяціны зямлі. У 1909 г. царкоўнапрыходская школа. З 8.12.1926 г. у Пакалюбіцкім сельсавеце Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 331 двор, 1820 жыхароў, школа 1-й ступені. Быў створаны калгас «Чэлюскінец». У 1936 г. у вёсцы працавала бібліятэка. У Вялікую Айчынную вайну загінула 174 землякі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1972 г. 189 двароў, 695 жыхароў. Цагельня. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. На 1.1.1996 г. 267 двароў, 805 жыхароў. Сярэдняя школа (346 вучняў), музычная школа, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, 2 магазіны, лазня.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля школы. На ўшанаванне памяці 174 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1967 г. пастаўлены помнік.

ЛЕШЧЫНЕЦ, вёска ў Давыдаўскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. у Гомельскай воласці Беліцкага павета як прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1850 г. у вёсцы 7 двароў, 46 жыхароў, у Новікаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1862 г. 9 двароў, 20 рэвізскіх душ мужчынскага полу, 105 дзесяцін зямлі. У 1909 г. 21 двор, 145 жыхароў, у Гомельскай воласці Гомельскага павета, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 125 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1927 г. цэнтр сельсавета, з 30.12.1927 г. у складзе Давыдаўскага сельсавета. У 1926 г. 56 двароў, 259 жыхароў. У вёсцы размяшчалася рамонтная майстэрня Гомельскай МТС, кузня завода імя Ланцуцкага. У баях за вызваленне вёскі і Гомеля ў лістападзе 1943 г. загінула 277 воінаў і 1 партызан. Пасля вайны вёска адбудавалася. У 1949 г. на магіле савецкіх воінаў пастаўлены абеліск. З 1964 г. у межах г. Гомеля.

ЛЮБНЫ, вёска ў Давыдаўскім сельсавеце. У XIX ст. вёска ў складзе аднайменнага маёнтка, які належаў дваранам Шандзікоўскім. У 1878 г. яны мелі 255 дзесяцін зямлі і вялізны сад, даход з якога складаў 100 руб. У 1882 г. вёска, 26 двароў, 175 жыхароў, у Гомельскай воласці Гомельскага павета. У 1909 г. 52 двары, 368 жыхароў, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 154 дзесяцінамі зямлі. У 1914 г. апошнім уладальнікам быў член павятовага суда, адстаўны генерал-маёр І.А.Шандзікоўскі. У 1919 г. створана сельскагаспадарчая арцель. У 1925 г. заснаваны цагельны завод № 3. З 8.12.1926 г. у складзе Давыдаўскага сельсавета Гомельскага раёна. З 1930 г. у прамгасе «Чырвоны Кастрычнік», з 5 лістапада 1934 г. у межах г. Гомеля.

МАКАЎЕ, вёска ў Чарацянскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Першамайскі». Вядома з канца XVIII ст. як прыватная ўласнасць дваран Фашчаў. У 1848 г. вёска, 232 рэвізскія душы, прыватная ўласнасць памешчыка Карла Фашча ў Беліцкім павеце Магілёўскай губерні. У 1862 г. 283 рэвізскія душы, 1420 дзесяцін зямлі. На рацэ Цераха працавалі сукнавальня, вадзяны млын, плаціна, якую сяляне трымалі ў спраўнасці. Піцейны дом. У 1882 г. 133

двары, 740 жыхароў, у Маркавіцкай воласці Гомельскага павета. Традыцыйныя рамёствы: кавальства, кравецтва, шавецтва, сталярства. У вёсцы размяшчаўся хлебазапасны магазін. У 1886 г. 135 двароў, 749 жыхароў, цагельны завод. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Чарацянскага прыхода і наведвалі праваслаўную Успенскую царкву. У 1909 г. 215 двароў, 1257 жыхароў, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 2663 дзесяціны зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага, з 4.8.1927 г. Церахоўскага раёнаў. У 1926 г. 205 двароў, 1014 жыхароў, школа 1-й ступені. З 30.12.1927 г. у складзе Пракопаўскага сельсавета Церахоўскага раёна.

У 1928 г. былі заснаваны цагельны, у 1929 г. ганчарны заводы. У 1930 г. створаны калгас «Асветнік», у якім працавалі 2 ветраныя млыны, кузня. У 1941 г. 238 двароў, 637 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 177 двароў і загубілі 10 жыхароў. Пасля вайны адбудавалася. У 1972 г. 206 двароў, 540 жыхароў. Пачатковая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. На 1.1.1956 г. 226 двароў, 559 жыхароў. Пачатковая школа (60 вучняў), Дом культуры, бібліятэка, комплексна-прыёмны пункт, сталовая, 3 магазіны, лазня.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. На могілках. Пахаваны мірныя жыхары, якіх загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў Вялікую Айчынную вайну. На магіле пастаўлены абеліск.

МАЛІНАЎКА, пасёлак у Цярэніцкім сельсавеце.

З пачатку XX ст. у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 28 двароў, 135 жыхароў. З 8.12.1926 г. у Іванаўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі, з 17.4.1962 г. у Гомельскім раёне. У складзе калгаса «1 Мая». На 1.1.1996 г. 8 двароў, 14 жыхароў, 10 з якіх пенсіённага ўзросту.

МАНЕЕЎ, пасёлак у Аздзелінскім сельсавеце.

З пачатку XX ст. вядомы як хутар у Рудзянецкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., пасёлак, 13 двароў, 66 жыхароў. З 8.12.1926 г. у Рогаўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. З 30.12.1927 г. пасёлак у Аздзелінскім сельсавеце Уваравіцкага раёна. З 17.4.1962 г. у Гомельскім раёне. У складзе калгаса імя Кірава. На 1.1.1996 г. 4 двары, 14 жыхароў.

МАРКАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны сцяг». Упершыню ўпамінаецца ў 1526—1531 гг. у час удакладнення каралём Жыгімонтам I межаў паміж Вялікім княствам Літоўскім і Чарнігаўскім княствам. У 1640 г. сяло, 6 дымоў, у Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага. У 1729 г. была пабудавана драўляная праваслаўная царква Архістратыга Міхаіла. У 1771 г. тут размяшчалася мытня. З 1772 г. у Расійскай імперыі. У 1773 г. сяло, 144 двары, 885 жыхароў. У сяле размяшчалася карчма (17 жыхароў). З 1773 г. сяло ў Гомельскай воласці Рагачоўскай правінцыі. З 1776 г. прыватная ўласнасць графа П.А.Румянцава-Задунайскага. У 1788 г. 761 рэвізская душа. У 1822 г. пабудавана з цэглы праваслаўная Кацярынінская царква (архітэктар Дж. Кларк). У 1824 г. у царкоўнапрыходскай школе навучалася 27 вучняў. У 1833 г. 369 рэвізскіх душ, у 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. З 1852 г. у Гомельскім павеце. У 1856 г. у народным вучылішчы навучаліся 32 хлопчыкі, у 1867 г. — 52 хлопчыкі і 7 дзяўчынак. У 1862 г. размяшчаўся хлебазапасны магазін, шынок. У 1875 г. селянін Цімафей Карэба заснаваў тут крупадзёрку. У 1882 г. цэнтр воласці, 285 двароў, 1775 жыхароў. Традыцыйныя рамёствы: бондарства, кравецтва, сталярства. Асабліва славіліся гарбары і муляры. У 1886 г. 273 двары, 1575 жыхароў, 5 ветраных млыноў, 20 лавак, 2 піцейныя дамы, 2 яўрэйскія малітоўныя дамы, валасное праўленне. У 1898 г. прыход Кацярынінскай царквы ахопліваў 1338 прыхаджан. Ёй належала больш як 56 дзесяцін зямлі. Прыход праваслаўнай царквы Архістратыга Міхаіла — 2197 прыхаджан, яна мела 36 дзесяцін зямлі. У 1909 г. 483 двары, 3995 жыхароў, належала Маркавіцкаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 4411 дзесяцін зямлі. У 1914 г. была пабудавана двухпавярховая школа. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага, з 26.7.1930 г. Церахоўскага раёнаў. Паводле перапісу 1926 г., 307 двароў, 1867 жыхароў. Тут размяшчалася школа

1-й ступені. Быў створаны калгас «Чырвоны сцяг». У сяле працавалі ганчарна-цагельная арцель «Абарона працы», конная крупадзёрка, ветраны млын. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У баях за вызваленне вёскі ўвосень 1943 г. загінула 69 воінаў. У Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінулі 164 землякі. У 1972 г. сепаратарны пункт, швейная майстэрня, сярэдняя школа, бібліятэка, бальніца, аптэка, аддзяленне сувязі, сталовая, 3 магазіны. У 1986 г. малаказавод, комплексна-прыёмны пункт, дзіцячы сад. На 1.1.1996 г. 402 двары, 978 жыхароў. Радзіма беларускай паэтэсы Т.В.Мельчанка.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі, у скверы. Пахаваны 69 воінаў, якія загінулі восенню 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля клуба. На ўшанаванне памяці 164 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1968 г. пастаўлены абеліск.

МАСЦІШЧА, пасёлак у Пакалюбіцкім сельсавеце.

Вядомы з XX ст. Паводле перапісу 1926 г., 45 двароў, 221 жыхар. З 8.12.1926 г. у Лапацінскім сельсавеце Гомельскага раёна і акругі, з 30.12.1927 г. у Пакалюбіцкім сельсавеце. У 1938 г. пасёлак Арол зліўся з пасёлкам Масцішча. У 1941 г. 53 двары, 330 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі амаль усю вёску (51 двор) і загубілі 1 мірнага жыхара. Пасля вайны пасёлак адбудаваўся. У складзе калектыўнай дзяржаўнай гаспадаркі «Лапацінская». На 1.1.1996 г. 60 двароў, 149 жыхароў. Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы Л.В.Шапавалавай.

МІХАЛЬКІ, вёска ў Даўгалескім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Мірны». Упершыню ўпамінаецца як сяло Міхалкава ў 1526—1531 гг. у час удакладнення межаў польскім каралём Жыгімонтам I паміж Вялікім княствам Літоўскім і Чарнігаўскім княствам. З 1773 г. у Расійскай імперыі. У XVIII ст. вёска вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка, прыватная ўласнасць памешчыцы П.Валадзьковічавай, у 1850 г. пасля яе смерці маёнтак перайшоў у спадчыну да пляменніцы памешчыцы Станіславы Хацяноўскай, якая стала валодаць у 1853 г. 14 383 дзесяцінамі зямлі, піцейным домам (даход 200 руб.), ветраным млыном (даход 250 руб.), вінакурным заводам (даход 1560 руб.). У 1862 г. вёска, 38 двароў, 149 рэвізскіх душ, у Дзятлаўскай воласці Гомельскага павета. Адстаўны маёр Карнелій Хацяноўскі распачаў тут прамысловую дзейнасць. У 1873 г. быў заснаваны дзягцярна-смалакурны завод , на якім працавалі 1 майстар і 2 рабочыя (даход 200 руб.). У 1876 г. заснаваны цагельны завод, на якім працавалі 1 майстар, 4 рабочыя (даход 200 руб.). У 1867 г. 208 сялянскіх душ, 1179 дзесяцін зямлі. У 1886 г. 73 двары, 505 жыхароў, праваслаўная капліца, млын, хлебазапасны магазін. Вяскоўцы займаліся ў асноўным земляробствам, якое спалучалася з кавальскім, калёсным і бондарным промысламі. У 1909 г. 124 двары, 842 жыхары, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 943 дзесяціны зямлі. Маёнтак, 1 двор, 16 жыхароў, 11 381 дзесяціна зямлі, належала сялянскаму Пазямельнаму банку. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Дзятлавіцкага раёна, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 191 двор, 1090 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1930-я гады ў вёсцы створаны калгас «1 Жніўня». У вёсцы працавала ваўначоска. У 1941 г. 144 двары, 451 жыхар. У лістападзе 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 58 двароў, загубілі 19 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну са жніўня 1941 г. па чэрвень 1942 г. у вёсцы дзейнічала патрыятычнае падполле пад кіраўніцтвам Ц.Ф.Марозава, М.Я.Мацвеенкі і К.В.Бурага. У 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі арыштавалі і закатавалі 20 падпольшчыкаў. У 1973 г. васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. На 1.1.1996 г. 264 двары, 747 жыхароў. Дзевяцігадовая школа (162 вучні), Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, 2 магазіны, лазня.

ПОМНІК ПАДПОЛЬШЧЫКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 20

падпольшчыкаў, закатаваных у 1943 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Устаноўлены ў 1977 г.

МУРАЎЧЫ, пасёлак у Целяшоўскім сельсавеце.

Вядомы з XX ст. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 18 двароў, 98 жыхароў. З 8.12.1926 г. у Рудня-Целяшоўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна, з 30.12.1927 г. у Целяшоўскім сельсавеце. Пасялковыя дзеці наведвалі школу за 2 км у вёсцы Рудня-Целяшоўская. Пасялкоўцы ўваходзілі ў калгас «Чырвоная плошча», які размяшчаўся ў в. Целяшы.

З 17.4.1962 г. у складзе Гомельскага раёна.

На 1.1.1996 г. 7 двароў, 10 жыхароў.

МЯДЗВЕДЖЫ ЛОГ, пасёлак ва Улукаўскім сельсавеце. Вядомы з пачатку XX ст. у Гомельскай воласці Гомельскага павета. З 8.12.1926 г. у складзе Галавінскага сельсавета Гомельскага раёна і акругі, з 30.12.1930 г. ва Улукаўскім сельсавеце. У 1926 г. 15 двароў, 75 жыхароў. Пасялковыя дзеці наведвалі школу 1-й ступені за 4 км у Галавінцах. У 1941 г. 29 двароў, 110 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўвесь пасёлак (29 двароў). Пасля вайны ён адбудаваўся. У складзе саўгаса «Бярозкі». На 1.1.1996 г. 42 двары, 85 жыхароў.

НІЖНІ БРЫЛЁЎ, вёска ў Краснен-скім сельсавеце (з 30 снежня 1961 г. у межах г. Гомеля). У пачатку XIX ст. вёска ў складзе аднайменнага маёнтка Гомельскай воласці Беліцкага павета, з 1852 г. у Гомельскім павеце. З 1870 г. прыватная ўласнасць купца Пітунова, які валодаў 157 дзесяцінамі зямлі і садам, даход з якога складаў 100 руб. У 1884 г. школа граматы. У пачатку XX ст. маёнтак належаў мяшчанцы Е.Пітуновай, якая мела 46 дзесяцін зямлі і 2 заводы ў вёсцы Ціцянкі — цагельны і тарфяны. У 1909 г. вёска, 50 двароў, 273 жыхары, належала часткова мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 14 дзесяцін зямлі, і часткова Е.Пітуновай. У 1913 г. у вёсцы працавала земская школа. З 8.12.1926 г. у Старамільчанскім сельсавеце Гомельскага раёна і акругі. У 1926 г. 42 двары, 213 жыхароў, кузня, сталярная майстэрня, цагельны завод. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана школа 1-й ступені.

НОВАЯ БУДА, вёска ў Прыбараўскім сельсавеце. Вядома з пачатку XIX ст. як прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава ў Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні. Адносілася да Новікаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1833 г. 34 рэвізскія душы, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1852 г. 14 дамоў, 95 жыхароў, у Макееўскай эканоміі Гомельскага маёнтка Гомельскага павета. У 1860 г. вёска, 48 рэвізскіх душ. У вёсцы размяшчаўся хлебазапасны магазін. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Бабовіцкага прыхода і наведвалі Успенскую царкву. У 1909 г. 32 двары, 237 жыхароў, у Дзятлаўскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 32 1/2 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. у Прыбараўскім сельсавеце Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 67 двароў, 361 жыхар. У 1930 г. створаны калгас «Чырвоны будаўнік», працавала кузня. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Вёска ў складзе вучгаса СПТВ-185. Магазін. На 1.1.1996 г. 137 двароў, 319 жыхароў.

НОВАЯ МІЛЬЧА, вёска ў Краснен-скім сельсавеце, цэнтр Гомельскай птушкафабрыкі. Вядома з канца XVIII ст. як слабада. У 1788 г. 94 рэвізскія душы, прыватная ўласнасць М.П.Румянцава, у Гомельскай воласці Беліцкага павета. У 1816 г. слабада, 134 рэвізскія душы, у складзе Новікаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1843 г. у вёсцы размяшчалася стараверская часоўня. У 1850 г. 84 двары, 356 душ мужчынскага полу, у 1852 г. у Гомельскім павеце, прыватная ўласнасць графа І.Ф.Паскевіча. У 1864 г. у вёсцы размяшчаўся шынок. У 1886 г. слабада, 140 двароў, 588 жыхароў, хлебазапасны магазін, млын, лаўка. Вяскоўцы займаліся ў асноўным земляробствам, якое спалучалася з рознымі промысламі: адыходным, кавальскім, бандарным, сталярным, якія прыносілі значны даход у гаспадарку. У 1909 г. слабада, 205 двароў, 243 жыхары, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 1415 дзесяцінамі зямлі. У 1913 г. земская школа. З 8.12.1926 г. — цэнтр сельсавета ў Гомельскім раёне, а 30.12.1927 г. у Стара-

мільчанскім сельсавеце. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 255 двароў, 1235 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1930-я гады быў створаны калгас «Авангард». Вёска ў час Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1973 г. сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, 2 магазіны. З 28.2.1983 г. частка вёскі ў межах г. Гомеля. На 1.1.1996 г. 275 двароў, 829 жыхароў. Радзіма поўнага кавалера ордэна Славы В.Дз.Вятошкіна, беларускага мастака В.К.Жыхарава.

НОВІКІ, пасёлак, да 23 мая 1962 г. у Пакалюбіцкім сельсавеце. Вядомы з XVIII ст. як фальварак — прыватная ўласнасць графа Румянцава ў Беліцкім павеце Магілёўскай губерні. У 1833 г. у склад фальварка ўваходзіла 6 населеных пунктаў, 623 двары, 3982 жыхары, 1254 дзесяціны зямлі. У фальварку размяшчаўся хлебазапасны магазін. У 1834 г. уладанне князя І.Ф.Паскевіча, з 1852 г. у Пакалюбіцкай воласці Гомельскага павета. У 1884 г. фальварак належаў К.М.Коршунаву, які меў 664 дзесяціны зямлі. У 1909 г. хутар, 1 двор, 1 жыхар, належаў Лапацінскаму сельскагаспадарчаму таварыству. З 30.12.1927 г. у складзе Ціценскага сельсавета. У 1927 г. на базе фальварка была створана сельскагаспадарчая арцель «Вялікія Новікі». У 1926 г. 2 двары, 6 жыхароў. Пасёлак 23 мая 1962 г. зліўся з пас. Востраў.

НОВЫ ДВОР, пасёлак ва Улукаўскім сельсавеце. Вядомы з канца XIX ст. у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета. У 1909 г. 5 двароў, 25 жыхароў, належаў Целяшоўскаму мяшчанскаму праўленню, якое валодала 150 дзесяцінамі зямлі. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 8.12.1926 г. у Галавінскім сельсавеце Гомельскага раёна і акругі. У 1926 г. 107 двароў, 563 жыхары. У 1930 г. створаны калгас імя Варашылава. У пасёлку працавалі ветраны млын, кузня. У час Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1962 г. вёска злілася з вёскай Галавінцы.

НОВЫЯ ДЗЯТЛАВІЧЫ, вёска ў Дзятлавіцкім сельсавеце.

У 1882 г. вёска, цэнтр аднайменнага маёнтка, 61 двор, 219 жыхароў у Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Прыватная ўласнасць памешчыцы К.І.Радчанка, якая валодала 4589 дзесяцінамі зямлі. Яе ўласнасцю было возера, даход з якога складаў 140 рублёў. Традыцыйнае рамяство: кавальства.

Вяскоўцы былі прыхаджанамі Дзятлавіцкага прыхода і наведвалі праваслаўную Троіцкую царкву. У вёсцы была школа граматы.

У 1909 г. маёнтак, 1 двор, 1 жыхар, уласнасць дваранкі З.Радчанка, вёска, 113 двароў, 770 жыхароў, прыватная ўласнасць вясковага сельскагаспадарчага таварыства, якое валодала 1205 дзесяцінамі зямлі.

З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Дзятлавіцкага раёна Гомельскай акругі. З 4.8.1927 г. вёска ў Гомельскім раёне, з 30.12.1927 г. у Старадзятлавіцкім сельсавеце. У вёсцы быў створаны калгас «Чырвоны партызан». У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1955 г. пас. Чарнічны зліўся з вёскай. На 1.1.1996 г. 122 двары, 232 жыхары. Дзевяцігадовая школа (70 вучняў), Дом культуры, бібліятэка, комплексна-прыёмны пункт, фельчарска-акушэрскі пункт, участковая бальніца, лазня.

НОВЫЯ ЦЯРЭШКАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета.

Узнікла пазней в. Старыя Цярэшкавічы ў XVIII ст. У першай палавіне XIX ст. ваколіца, прыватная ўласнасць памешчыкаў В.Клімовіча, А.Серафімовіча, А.Ржэцкай. У 1848 г. размяшчалася пераправа. У 1877 г. мешчанінам Плескім заснаваны цагельны завод, у 1897 г. дваранінам Клімовічам заснаваны яшчэ адзін цагельны завод. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Цярухскага прыхода і наведвалі праваслаўную Грыгор'еўскую царкву. У 1884 г. тут працавала школа граматы. У 1909 г. ваколіца, 125 двароў, 1021 жыхар, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 248 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. вёска, цэнтр сельсавета Дзятлавіцкага раёна, з 4.8.1927 г. у Гомельскім раёне. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 157 двароў, 491 жыхар, школа 1-й ступені. У 1930 г.

створаны калгас «Іскра». У вёсцы была кузня. У 1941 г. 85 двароў, 364 жыхары. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 84 двары і загубілі 12 жыхароў. Пасля вайны вёска адбудавана. У складзе саўгаса «Навабеліцкі». На 1.1.1996 г. 89 двароў, 214 жыхароў. Фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Гарадзішча. За 0,7 км на ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Цераха, у месцы ўпадзення яе ў р. Сож. Пляцоўка авальная, памерам 80х40 м, умацаванняў не мае. Абследавалі Е.Р.Раманаў (1910), У.Ч.Багамольнікаў (1975). Раскопкі не праводзіліся.

НЯКРАСАЎ (да 1938 г. Гразючка), пасёлак у Шарпілаўскім сельсавеце. Заснаваны ў пачатку XX ст. і спачатку быў вядомы як Гразючка. У 1926 г. 4 двары, 21 жыхар. З 8.12.1926 г. у Шарпілаўскім сельсавеце Дзятлавіцкага раёна Гомельскай акругі, з 4.8.1927 г. у Гомельскім раёне, з 10.2.1931 г. у Лоеўскім раёне. З 25.12.1962 г. у Рэчыцкім раёне, з 15.1.1964 г. у Гомельскім раёне. У складзе саўгаса «Міжрэчча». Малочнатаварная ферма. На 1.1.1996 г. 17 двароў, 26 жыхароў.

ПАКАЛЮБІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. Вядома як вёска ў Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага, прыватная ўласнасць Чартарыйскіх. З 1772 г. у Расійскай імперыі, з 1776 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага, уваходзіла ў Багуслаўскую эканомію Гомельскага маёнтка. У 1788 г. 498 рэвізскіх душ, у Гомельскай воласці Беліцкага павета. У 1863 г. 95 двароў, 608 жыхароў. У 1811 г. была пабудавана каменная праваслаўная Мікітаўская царква. У 1824 г. тут размяшчалася царкоўна-прыходская школа, у якой вучылася 10 вучняў. У 1834 г. сяло, 409 мужчын, 454 жанчын, ва ўладанні князя І.Ф.Паскевіча, з 1852 г. у Гомельскім павеце. У 1862 г. 133 двары, 310 рэвізскіх душ мужчынскага полу, 1174 дзесяціны зямлі. У 1886 г. цэнтр воласці, 138 двароў, 848 жыхароў, валасное праўленне, хлебазапасны магазін, народнае вучылішча. У 1898 г. у прыход праваслаўнай Мікітаўскай царквы ўваходзіла 2695 прыхаджан сяла і навакольных вёсак. У 1908 г. фельчарска-акушэрскі пункт, казённая вінная лаўка, млын. У 1909 г. 249 двароў, 1738 жыхароў, належала Пакалюбіцкаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 2039 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Гомельскага раёна. У 1930-я гады быў створаны калгас імя Леніна, конегадоўчая, малочнатаварная, свінагадоўчая фермы. Тут размяшчалася торфараспрацоўчая арцель імя Кагановіча, цагельны завод (у 1932 г. працавала 50 рабочых), кузня, ветраны млын, уласнае гукавое кіно. У будынку царквы размясціўся клуб, была пабудавана новая школа. У 1939 г. пасёлак Будзённы зліўся з Пакалюбічамі. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па кастрычнік 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. За вызваленне вёскі ад гітлераўцаў 26.11.1943 г. загінула 518 воінаў.

У 1975 г. камбінат бытавога абслугоўвання, млын, сярэдняя школа, школа сельскай моладзі, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі, кафэ, 3 магазіны. На 1.1.1996 г. 1029 двароў, 3095 жыхароў. Сярэдняя школа (510 вучняў), музычная школа, дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, комплексна-прыёмны пункт, амбулаторыя, сталовая, 5 магазінаў, лазня. Радзіма беларускага пісьменніка І.К.Сяркова.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Гарадзішча. За 2 км на захад ад вёскі, на высокай тэрасе правага берага р. Сож, у месцы ўпадзення ў яе р. Хоўхля. Пляцоўка памерам 170х75 м умацавана кальцавым валам вышынёй каля 2 м. Вядома з 1873 г. Абследавалі Е.Р.Раманаў (1910), А.М.Ляўданскі і А.Дз.Каваленя (1936), С.Я.Рассадзін (1981). Датуецца II ст. да н. э. — II ст. н. э., адносіцца да зарубінецкай культуры.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. У цэнтры вёскі пахаваны 518 воінаў, якія загінулі 26.11.1943 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. На плітах прозвішчы загінуўшых.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У скверы. На ўшанаванне памяці 300 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1967 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя воіна і жанчыны, а таксама пліты з імёнамі загінуўшых.

ПОМНІК АБАРОНЦАМ ГОМЕЛЯ. Каля будынка школы. З 13 да 19.8.1941 г. войскі 21-й арміі Цэнтральнага фронту сумесна з народным апалчэннем вялі жорсткія баі з 2-й нямецкай арміяй, якая штурмавала горад. У 1961 г. у гонар абаронцаў Гомеля пастаўлена стэла.

ПЛЁСЫ, вёска ў Пакалюбіцкім сельсавеце. Назва вёскі паходзіць ад тэрміна плёс (участак вадаёма з роўным дном і ціхім цячэннем). Упершыню Плёсавічы ўпамінаюцца ў 1640 г. як сяло (4 дымы) у Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага. Сяло было царкоўным ўладаннем і належала Гомельскаму Ануфрыеўскаму манастыру і Троіцкай царкве. З 1772 г. у складзе Расійскай імперыі. У 1776 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала М.П.Румянцава-Задунайскага. У 1811 г. ваколіца Плёсы, 7 рэвізскіх душ мужчынскага полу. Адносілася да ведамства Багуслаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1833 г. вёска, 20 рэвізскіх душ мужчынскага полу, з 1834 г. прыватная ўласнасць графа І.Ф.Паскевіча. У 1862 г. згодна купчай крэпасці вёска належала калежскаму асэсару А.А.Плескаму, які меў 1881 дзесяціну зямлі, вадзяны млын, даход з якога складаў 300 руб. У 1909 г. ваколіца, 17 двароў, 95 жыхароў, у Гомельскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 177 дзесяцін зямлі. Размяшчалася мяшчанскае праўленне. З 8.12.1926 г. у складзе Валатаўскага сельсавета Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 30 двароў, 178 жыхароў. Быў паштовы пункт. Вясковыя дзеці наведвалі школу 1-й ступені за 1,5 км у сяле Валатава. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1986 г. вёска ў складзе калгаса імя У.І.Леніна. На 1.1.1996 г. 27 двароў, 62 жыхары.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Стаянка-1. За 1,5 км на поўнач ад вёскі, на першай надпоймавай тэрасе правага берага р. Сож, каля меліярацыйнага канала. Памер 30х50 м. Выявіў у 1973 г. і абследаваў у 1979 г. Ю.У.Абадэнка. У культурным пласце 0,15 м знойдзены крамянёвыя скрэблы, скрабкі, разцы і інш. Адносіцца да эпохі мезаліту. Датуецца VIII—V ст. да н.э.

Стаянка-2. За 2 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе р. Сож, побач з вадазборным каналам. Памер 15х80 м. Выявіў у 1973 г. і абследаваў у 1979 г. Ю.У.Абадэнка. Знойдзены крамянёвыя наканечнікі стрэл, скрабкі, разцы, скоблі, вастрыі, мікраліты, прылады, якімі секлі фрагменты ляпной керамікі. Адносіцца да эпохі неаліту, датуецца 5—3-м тысячагоддзямі да н.э.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Гомельскім абласным краязнаўчым музеі.

ПРАКОПАЎКА, вёска ў Чарацянскім сельсавеце. У XIX ст. вёска, прыватная ўласнасць дваран Лісоўскіх. У 1845 г. у складзе аднайменнага фальварка, у 1884 г. прыватная ўласнасць памешчыцы Тэрэзы Лісоўскай, якая мела 1421 дзесяціну зямлі і вадзяны млын. У 1884 г. 34 двары, 177 жыхароў, у Маркавіцкай воласці Гомельскага павета, хлебазапасны магазін, млын. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Чарацянскага прыхода і наведвалі праваслаўную Успенскую царкву. У ліпені 1893 г. у вёсцы здарыўся пажар, згарэў хлебазапасны магазін і пабудовы, страты ад якіх склалі каля 2 тысяч рублёў. У 1909 г. 41 двор, 258 жыхароў, належала часткова Займішчанскаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 963 дзесяцінамі зямлі, і памешчыкам Аляксандру і Івану Лісоўскім, якія мелі 1199 дзесяцін зямлі. У 1913 г. размяшчалася земская школа. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага, з 4.8.1927 г. Церахоўскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 71 двор, 395 жыхароў, школа 1-й ступені. 30.12.1927 г. сельсавет узбуйніўся за кошт уключэння Макаўскага і Чарацянскага сельсаветаў. У вёсцы быў створаны калгас «Ударнік». Тут былі кузня, ветраны млын. З 20.2.1938 г. вёска ў Гомельскім раёне Гомельскай вобласці. У 1941 г. 86 двароў, 221 жыхар. У верасні нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі амаль усю вёску (79 двароў). У баях за вызваленне вёскі загінула 97 воінаў. У 1975 г. цэнтр сельсавета. Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. На 1.1.1996 г. 60 двароў, 141 жыхар. Радзіма беларускай паэтэсы Н.Н.Шкляравай.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. У скверы. Пахаваны 97 воінаў,

якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у верасні 1943 г. У 1958 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна з аўтаматам.

ПРАСВЕТ, пасёлак у Цярэніцкім сельсавеце. Вядомы з канца XIX ст. у Гомельскай воласці Магілёўскай губерні. У пасёлку быў ветраны млын. З 8.12.1926 г. у Цярэніцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі, з 30.12.1927 г. у нацыянальным рускім сельсавеце, з 1937 г. зноў у беларускім сельсавеце, з 20.2.1938 г. у Уваравіцкім раёне Гомельскай вобласці. У 1926 г. 46 двароў, 269 жыхароў. У 1930 г. створаны калгас «1 Мая». Тут былі кузня, ветраны млын. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У складзе калгаса «1 Мая», паляводчая брыгада, ферма. На 1.1.1996 г. 56 двароў, 112 жыхароў.

ПРУДОК, вёска ў Пакалюбіцкім сельсавеце. Вядома з XVIII ст. як прыватная ўласнасць фельдмаршала М.П.Румянцава-Задунайскага, у Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні. У 1803 г. в. Прудок (Багуслатаўка), 38 двароў, 206 жыхароў. Адносілася да Багуслаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка, у 1833 г. 166 рэвізскіх душ, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1852 г. 81 двор, 363 жыхары, у Гомельскім павеце. У 1884 г. 117 двароў, 551 жыхар, у Гомельскай воласці Гомельскага павета, хлебазапасны магазін, школа граматы. Традыцыйныя рамёствы: кавальства, шавецтва, бондарства. У 1898 г. вадзяны млын. У 1909 г. аднакласная царкоўнаприходская школа, у 1913 г. земская школа. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета. Паводле перапісу 1926 г., 304 двары, 1513 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1930-я гады створаны калгас «Шлях сацыялізму», ветраны млын, квасільны пункт, кузня. Калгас абслугоўвала Гомельская МТС. З 7.10.1957 г. у межах г. Гомеля.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. ГАРАДЗІШЧА. За 2 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе р. Сож. Вышыня над поймай каля 10 м. Пляцоўка памерам 100х50 м была ўмацавана валам і ровам. Выявіў у 1910 г. Е.Р.Раманаў. Знойдзена ляпная кераміка ранняга жалезнага веку. Матэрыялы захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

ПРЫБАР, вёска, цэнтр сельсавета. Вядома ў XIX ст., у 1811 г. 79 рэвізскіх душ мужчынскага полу, прыватная ўласнасць фельдмаршала М.П.Румянцава-Задунайскага ў Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні. У 1833 г. 64 рэвізскія душы, у складзе Новікаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У вёсцы працаваў млын (1 майстар, 5 рабочых). У 1852 г. 29 двароў, 179 жыхароў, у Гомельскім павеце. У 1858 г. тут было заснавана мукамольнае прадпрыемства, даход з якога складаў 10 тысяч рублёў. У 1862 г. 30 двароў, 94 жыхары, 433 дзесяціны зямлі. У 1864 г. размяшчаўся шынок, які арандаваў гомельскі купец. У 1886 г. 95 двароў, 233 жыхары, у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета, хлебазапасны магазін, школа граматы. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Воўкавіцка-Крупецкага прыхода праваслаўнай царквы Раства Багародзіцы. У 1909 г. 78 двароў, 567 жыхароў, належала Прыбараўскаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 57 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 119 двароў, 621 жыхар, школа 1-й ступені. У вёсцы быў створаны калгас імя Калініна, працавалі кузня, лесапілка, сукнавальня, паравы млын. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1975 г. лясніцтва. Прафесійна-тэхнічнае вучылішча механізацыі, васьмігадовая школа, школа рабочай моладзі, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. У 1996 г. сярэдняя школа (293 вучні), Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, 2 сталовыя, магазін.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Гарадзішча. Насупраць вёскі, на левым беразе р. Уза. Пляцоўка авальная, памерам 40х25 м. З паўднёвага боку захаваліся рэшткі вала вышынёй 0,7—1 м. Знойдзены рэшткі ляпнога і ганчарнага посуду. Адносіцца да мілаградскай і зарубінецкай культур ранняга жалезнага веку і да эпохі Кіеўскай Русі. Раскопкі не праводзіліся.

ПРЫБЫТКАЎСКАЯ РУДНЯ, вёска ў Прыбыткаўскім сельсавеце. Вёска ўзнікла на месцы жалезнай рудні, дзе ў плавільні выраблялася жалеза. У 1773 г.

вёска, 18 двароў, 104 жыхары. Тут размяшчаўся жалезны завод, які адносіўся да Гомельскага маёнтка, здаваўся ў арэнду. У 1788 г. 74 рэвізскія душы. У 1833 г. 57 рэвізскіх душ у Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні, прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага, з 1834 г. уласнасць князя І.Ф.Паскевіча. Адносілася да Клімавіцкай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1850 г. 28 двароў, 258 жыхароў. У 1864 г. у вёсцы быў шынок, які арандаваў гомельскі купец, даход складаў 12 руб. У 1864 г. была заснавана суконнавальня, якую з млынам арандаваў селянін Сцяпан Фёдараў за 300 рублёў. У 1882 г. 67 двароў, 417 жыхароў, у Насовіцкай воласці Гомельскага павета. Традыцыйнае рамяство — кравецтва. У вёсцы знаходзіліся хлебазапасны магазін, народнае вучылішча. У 1909 г. 76 двароў, 546 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 912 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага раёна, з 26.7.1930 г. Церахоўскага раёна. У 1926 г. 101 двор, 470 жыхароў, школа 1-й ступені. У Вялікую Айчынную вайну загінула 56 воінаў-землякоў. На 1.1.1996 г. 61 двор, 108 жыхароў. У складзе эксперыментальнай базы «Гомельская». Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы, дзяржаўнага і партыйнага дзеяча К.Т.Мазурава.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля клуба. На ўшанаванне памяці 56 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1970 г. пастаўлена стэла.

ПРЫБЫТКІ, вёска, цэнтр сельсавета. Упершыню Прыбыткі ўпамінаюцца ў 1640 г. як сяло (9 дымоў) у Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага. Адносілася да Гомельскага замка, якім валодаў староста князь Чартарыйскі.

У 1773 г. была пабудавана драўляная праваслаўная царква Раства Багародзіцы. У пачатку XIX ст. сяло вядома як цэнтр маёнтка, які належаў памешчыку калежскаму асэсару М.А.Бардоўскаму. У 1853 г. 267 рэвізскіх душ, 2098 дзесяцін зямлі. У 1856 г. было народнае вучылішча, у якім навучалася 38 хлопчыкаў і 13 дзяўчынак. У 1864 г. сяло, 64 рэвізскія душы мужчынскага полу, належала памешчыцы Марыі Бетулінскай, суконнавальня, крупадзёрка, якія здаваліся ў арэнду. У 1872 г. маёнтак, 896 дзесяцін зямлі, уласнасць А.Бетулінскага. У 1877 г. сяляне Аляксеевы заснавалі маслабойню, даход з якой складаў 100—125 рублёў. У 1882 г. 113 двароў, 587 жыхароў. Традыцыйныя рамёствы: кравецтва, шавецтва, кавальства, сталярства. У 1886 г. 98 двароў, 581 жыхар, царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін, млын. У 1889 г. у прыходзе праваслаўнай царквы Раства Багародзіцы было 4963 прыхаджаніны з Прыбытак і навакольных вёсак, царкве належала 47 дзесяцін зямлі. У 1909 г. 160 двароў, 986 жыхароў; фальварак, 1 двор, 4 жыхары, у Насовіцкай воласці Гомельскага павета. Прыбыткаўскаму сельскагаспадарчаму таварыству належала 1010 дзесяцін зямлі. У 1925 г. быў створаны саўгас, у які ўвайшло 7 двароў, 70 жыхароў. У 1926 г., паводле перапісу насельніцтва, 179 двароў, 878 жыхароў, школа 1-й ступені. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага раёна Гомельскай акругі, з 26.7.1930 г. Гомельскага раёна. У 1933 г. размяшчаўся Прыбыткаўскі ўчастак Гомельскай МТС, які абслугоўваў 5 калгасаў. У 1941 г. 180 двароў, 730 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 143 двары і загубілі 17 жыхароў. Пасля вайны вёска адбудавалася. У 1975 г. камбінат бытавога абслугоўвання, школа, клуб, бібліятэка, бальніца, аддзяленне сувязі, 3 магазіны. На 1.1.1996 г. 275 двароў, 581 жыхар. Сярэдняя школа (630 вучняў), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, комплексна-прыёмны пункт, швейная майстэрня, бальніца, 3 магазіны. Царква святога Раства Багародзіцы.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ЛЁТЧЫКАЎ. На могілках. Пахаваны лётчыкі 126-га авіяцыйнага палка, якія загінулі ў 1941 г. На магіле пастаўлены помнік.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля будынка выканкома сельсавета. На ўшанаванне памяці 83 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1966 г. пастаўлена стэла.

ПРЫСТАРАНЫ, пасёлак у Цярэшкавіцкім сельсавеце.

Вядомы з XX ст., узнік у час калгаснага будаўніцтва. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 12 двароў, 65 жыхароў. З 8.12.1926 г. у Новацярэшкавіцкім сельсавеце Дзятлавіцкага раёна Гомельскай акругі, з 4.8.1927 г. Гомельскага

раёна, з 30.12.1927 г. у Старацярэшкавіцкім сельсавеце. У 1941 г. 14 двароў, 62 жыхары. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі пасёлак і загубілі 4 мірных жыхароў. Пасля вайны пасёлак адбудаваўся. На 1.1.1996 г. 19 двароў, 38 жыхароў.

У складзе саўгаса «Навабеліцкі».

ПЯСОЧНАЯ БУДА, вёска ў Грабаўскім сельсавеце, цэнтр птушкафабрыкі «Рассвет». Узнікла побач з запасамі кварцавага пяску, на месцы вытворчасці шкла. У 1733 г. 55 двароў, 422 жыхары, адносілася да Гомельскага маёнтка. Тут размяшчалася шкляная мануфактура, якая здавалася ў арэнду. У 1788 г. 422 рэвізскія душы. У 1795 г. на шкляной мануфактуры працавала 100 чалавек. Тут выраблялася аконнае шкло (да 172 130 лістоў), бутэлькі (да 43 922 штук), выраблялуся таксама і хрусталь. У 1833 г. 185 рэвізскіх душ, у Гомельскай воласці Беліцкага павета. Адносілася да Клімавіцкай эканоміі Гомельскага маёнтка, які належаў графу Румянцаву-Задунайскаму, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1846 г. на паштовай дарозе размяшчаўся пастаялы двор, які ўтрымліваўся за кошт земскага збору і здаваўся ў арэнду купцу Шлёму Уцееўскаму. Станцыйны драўляны дом, які складаўся з дзвюх палавін. У адной палавіне знаходзіўся пакой з мэбляй для прыезджых, меўся адзін стол, 7 стулаў, простая лаўка, дзве лаўкі з матрацамі, насценны гадзіннік. У двары было памяшканне для ямшчыкоў, 2 свірны, 2 пуні, канюшня, павець. Каля дарогі меўся шынок. У 1850 г. 80 двароў, 615 жыхароў. У 1882 г. 139 двароў, 743 жыхары, у Насовіцкай воласці Гомельскага павета, хлебазапасны магазін, школа граматы, ветраны млын. Традыцыйныя рамёствы: кравецтва, шавецтва. У 1909 г. 226 двароў, 1398 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 1897 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага, з 4.8.1927 г. Гомельскага, з 10.2.1931 г. Церахоўскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 197 двароў, 910 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1930 г. быў створаны калгас «Авангард», працавала кузня. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1986 г. птушкафабрыка, васьмігадовая школа, аддзяленне сувязі, сталовая, магазін. На 1.1.1996 г. 262 двары, 786 жыхароў. Клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, лазня.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. У цэнтры вёскі. Пахаваны 43 воіны, якія загінулі ў 1941—1943 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — члены экіпажа самалёта 54-га бамбардзіровачнага палка (камандзір падпалкоўнік М.А.Крыўцоў, штурман маёр І.І.Сомаў, стралок-радыст старшына М.А.Паўлаў), якія 12.1.1944 г. паўтарылі подзвіг М.Гастэлы. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 101 чалавек, якія загінулі ў верасні 1943 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск.

РАГІ, вёска ў Аздзелінскім сельсавеце. З 1772 г. у Расійскай імперыі, з 1773 г. у Гомельскім павеце Рагачоўскай правінцыі. Уваходзіла ў склад Прудоўскага маёнтка, які ў 1775 г. быў падараваны Кацярынай II генерал-маёру Сімяону Пішчэвічу. У 1850 г. 170 мужчын і 155 жанчын, у Беліцкім павеце. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Старабеліцкага прыхода і наведвалі праваслаўную Мікалаеўскую царкву. У 1882 г. 102 двары, у Рудзенскай воласці Гомельскага павета. Значнае месца ў гаспадарчым жыцці вяскоўцаў займалі розныя промыслы: шавецкі, калёсны, кавальскі, бандарны. У 1886 г. 94 двары, 504 жыхары; 2 ветраныя млыны, хлебазапасны магазін. У 1909 г. 156 двароў, 1002 жыхары, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 1695 дзесяцінамі зямлі. У 1909 г. аднакласная царкоўнапрыходская школа. З 8.12.1926 г. цэнтр Рагоўскага сельсавета Уваравіцкага раёна, з 30.12.1927 г. у Аздзелінскім сельсавеце гэтага ж раёна. У вёсцы размяшчалася школа 1-й ступені. У 1930 г. створаны калгас «Дружба». У 1931 г. заснавана торфараспрацоўчая арцель імя Сталіна, у 1933 г. маслазавод, ветраны млын. У гады Вялікай Айчыннай вайны загінулі 52 аднавяскоўцы. На 1.1.1996 г. 155 двароў, 439 жыхароў. У

складзе калгаса імя Кірава. Дзевяцігадовая школа (69 вучняў), бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. На ўшанаванне 52 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1981 г. пастаўлены помнік.

РАМАНАВІЧЫ, вёска ва Улукаўскім сельсавеце. Вядома з 1640 г. як сяло ў Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага. У 1773 г. 40 двароў, 307 жыхароў, у Гомельскай воласці Рагачоўскай правінцыі. У 1788 г. вёска, 462 рэвізскія душы, у Гомельскай воласці Беліцкага павета, прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага. У вёсцы размяшчалася карчма. У 1848 г. стараверскі малітоўны дом. У 1850 г. 124 двары, 672 жыхары, адносілася да Багуслаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка, прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1879 г. заснавана цагельнае прадпрыемства, даход з якога складаў 600 рублёў. У 1880 г. пабудавана драўляная праваслаўная Мікалаеўская царква, якой належала 36 дзесяцін зямлі. У 1886 г. 172 двары, 738 жыхароў, у Гомельскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні, хлебазапасны магазін, вінная лаўка, 3 ветраныя млыны. У сяле размяшчалася аднакласная царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. сяло, 314 двароў, 1892 жыхары належалі мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 2458 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 332 двары, 1617 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1930 г. створаны калгас «Камсамол Гомельшчыны», працавалі кузня, ветраны млын. У 1941 г. 236 двароў, 1890 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі ўсю вёску (236 двароў) і загубілі 30 жыхароў. Пасля вайны вёска адбудавалася. З 23.5.1959 г. ва Улукаўскім сельсавеце. У складзе саўгаса «Бярозкі». На 1.1.1996 г. 591 двор, 1569 жыхароў. Сярэдняя школа (355 вучняў), музычная школа, дзіцячы сад, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, кафэ, 2 магазіны.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Паселішча. За 0,5 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Селішча, на дзюнах правага берага р. Іпуць. Выявіў у 1890 г. М.Ф.Беляшэўскі, абследавалі ў 1924 г. К.М.Палікарповіч і А.В.Кротаў, у 1957—1958 гг. І.І.Артцёменка; даследавалі ў 1962—1963 гг. І.В.Гаўрылава, у 1976 г. А.Г.Калечыц. Знойдзены рэшткі агнішчаў, ляпная кераміка з грабеньчатым, лапчастым, ямачным, шнуравым і лінейным арнаментамі. Сярод крамянёвага інвентару — ромбападобныя і трохвугольныя наканечнікі стрэл, ножападобныя пласцінкі, скрабкі, скрэблы, разцы, сякерападобныя прылады. Помнік адносіцца да верхнедняпроўскай (неаліт), сярэднедняпроўскай і сосніцкай культур (бронзавы век), датуецца 3—2-м тысячагоддзямі да н. э. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН РБ і Інстытуце археалогіі АН РФ.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі, у скверы. На ўшанаванне памяці 238 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у 1971 г. пастаўлены абеліск, абапал яго — стэлы з імёнамі загінуўшых.

РАНДОЎКА, вёска ў Прыбарскім сельсавеце. Назва вёскі паходзіць ад дыялектнай асновы рандо — карчма. Вядома як прыватная ўласнасць у Вялікім княстве Літоўскім. У 1772 г. у Расійскай імперыі, з 1775 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала графа П.А.Румянцава-Задунайскага. У 1788 г. 95 рэвізскіх душ, у Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні. У 1833 г. 65 рэвізскіх душ, уваходзіла ў Новікаўскую эканомію Гомельскага маёнтка, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1850 г. 20 двароў, 165 жыхароў, з 1852 г. у Гомельскім павеце. У вёсцы размяшчаўся хлебазапасны магазін. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Воўкавіцка-Крупецкага прыхода і наведвалі царкву Раства Багародзіцы. У 1909 г. 73 двары, 491 жыхар, у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 414 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. у Прыбарскім сельсавеце. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 60 двароў, 312 жыхароў. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 49 двароў, 82 жыхары. У складзе вучэбнай гаспадаркі СПТВ-185, ферма, магазін.

РУБЕЖ, пасёлак у Цярэніцкім сельсавеце. Вядомы ў пачатку XX ст. у Гомельскай воласці Магілёўскай губерні. З

8.12.1926 г. у Цярэніцкім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. У 1926 г. 19 двароў, 105 жыхароў. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 30 двароў, 58 жыхароў. У складзе калгаса «1 Мая».

РУДНЯ-МАРЫМОНАВА, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса імя Някрасава. Узнікла на месцы жалезнай рудні, дзе ў плавільнях выраблялася жалеза. У XVIII ст. у складзе маёнтка Міхалькі, прыватная ўласнасць памешчыцы Паўліны Валадзьковічавай. Пасля яе смерці з 1853 г. прыватная ўласнасць памешчыцы Станіславы Хацяноўскай. У 1861 г. 70 рэвізскіх душ, 337 дзесяцін зямлі. У 1909 г. 90 двароў, 732 жыхары, у Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 1899 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Дзятлавіцкага раёна, з 4.8.1927 г. у Гомельскім раёне. У 1926 г. 144 двары, 853 жыхары, школа 1-й ступені. У час Вялікай Айчыннай вайны акупіравана са жніўня 1941 г. па ліпень 1943 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1943 г. у баях за вызваленне вёскі загінулі 144 воіны. У 1973 г. васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, бальніца, аптэка, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі, швейная майстэрня, сталовая, магазін. На 1.1.1996 г. 313 двароў, 844 жыхары. Сярэдняя школа (160 вучняў), Дом культуры, бібліятэка, комплексна-прыёмны пункт, амбулаторыя, сталовая, 2 магазіны, лазня.

ПОМНІКІ АРХЕАЛОГІІ. Гарадзішча. За 0,5 км на захад ад вёскі, на левым беразе Дняпра. Пляцоўка памерам 100х80 м, з усходняга боку ўмацавана дугападобным валам вышынёй 3—4 м і ровам глыбінёй 2—3 м. Адкрыў у пачатку XX ст. Е.Р.Раманаў, абследаваў у 1957, 1975 і 1977 гг. Л.Д.Побаль. Знойдзена ляпная кераміка мілаградскай (VII—III ст. да н.э.) і ранняга этапу зарубінецкай (III ст. да н. э. — II ст. н. э.) культур ранняга жалезнага веку.

Селішча. Побач з гарадзішчам, цягнецца ўздоўж ракі на адлегласці да 0,5 км. Адкрыў у 1957 г. і абследаваў у 1975 г. і 1977 г. Л.Д.Побаль. Знойдзены ляпная кераміка мілаградскай і фрагмент глінянай пацеркі зарубінецкай культур, шмат керамікі раннефеадальнага часу і жалезны наканечнік стралы. Адносіцца да мілаградскай і ранняга этапу зарубінецкай культур, датуецца VII ст. да н. э. — II ст. н. э. У раннефеадальны час тут жылі ўсходнія славяне, верагодна, радзімічы. Раскопкі не праводзіліся.

Матэрыялы абследаванняў захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН РБ.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На паўднёвай ускраіне вёскі. Пахаваны 144 воіны, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА НАЎМЁТАВА АЛЯКСЕЯ АЛЯКСЕЕВІЧА. На паўночна-заходняй ускраіне вёскі каля брацкай магілы. Партызан А.А.Наўмётаў загінуў у Вялікую Айчынную вайну.

СЕЎРУКІ, вёска ў Чонкаўскім сельсавеце. Назва вёскі паходзіць ад прозвішча Сяўрук. Вядома з XVI ст. як уладанне мясцовых баяр у Вялікім княстве Літоўскім. У 1772 г. у Расійскай імперыі, з 1773 г. у Гомельскім павеце Рагачоўскай правінцыі. У 1777 г. 125 рэвізскіх душ, у Гомельскай воласці Беліцкага павета, прыватная ўласнасць дваран Усціновічаў і Хальчэўскіх. З 1852 г. у Гомельскім павеце Магілёўскай губерні. Побач з вёскай праходзіла вялікая дарога Санкт-Пецярбург — Кіеў (Кіеўская шаша). Каля дарогі размяшчалася цагляная паштовая станцыя. Мелася школа граматы. У 1903 г. мяшчанская ўправа, ветраны млын. У 1909 г. ваколіца, 121 двор, 527 жыхароў, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству. У 1913 г. земская школа. З 8.12.1926 г. у Хутарскім сельсавеце, з 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета Гомельскага раёна. У 1926 г. вёска, 183 двары, 901 жыхар, школа 1-й ступені. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 28.4.1988 г. у Чонкаўскім сельсавеце. На 1.1.1996 г. 196 двароў, 488 жыхароў. Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

ПОМНІК АРХІТЭКТУРЫ. Паштовая станцыя. За 3 км на ўсход ад вёскі, на шашы Санкт-Пецярбург—Адэса. Пабудавана ў 2-й палавіне XIX ст. з цэглы. Уключае станцыйны дом і 2 стайні.

СКІТОК, вёска у Цярэшкавіцкім сельсавеце. Назва вёскі паходзіць ад слова скіт — тып паселішча, якое ўзнікла пасля царкоўнага расколу — жыллё манахаў-раскольнікаў. У XVII ст. у гэту мясцовасць пачалі сцякацца бежанцы-раскольнікі, манахі, стараверы і г.д., якія жылі ў зямлянках. У 1690 г. земянінам Клімовічам з ваколіцы Новыя Цярэшкавічы тут быў заснаваны манастыр. У XVIII у складзе Гомельскай воласці Вялікага княства Літоўскага. З 1772 г. у Расійскай імперыі. У 1848 г. тут была пераправа. У 1876 г. пабудавана каменная праваслаўная царква Раства Багародзіцы. У 1886 г. сяло, 21 двор, 15 жыхароў, у Дзятлаўскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1898 г. у прыходзе праваслаўнай царквы Раства Багародзіцы былі 2424 прыхаджаніны. Царкве належала 36 дзесяцін зямлі. У 1909 г. 47 двароў, 317 жыхароў, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 585 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Дзятлавіцкага, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 64 двары, 329 жыхароў, школа 1-й ступені. З 30.12.1927 г. у Старацярэшкавіцкім сельсавеце Гомельскага раёна. У час Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У час Вялікай Айчыннай вайны ў кастрычніку 1943 г. воіны 102-й Далёкаўсходняй Ноўгарад-Северскай стралковай дывізіі 48-й арміі Беларускага фронту фарсіравалі Сож і разгарнулі бой на правым беразе ракі на подступах да Гомеля. На 1.1.1996 г. 42 двары, 85 жыхароў. У складзе саўгаса «Навабеліцкі».

МЕСЦА ФАРСІРАВАННЯ РАКІ СОЖ. На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. На месцы фарсіравання воінамі Чырвонай Арміі р. Сож. У 1960 г. пастаўлены абеліск.

СОЖ, пасёлак у Цярэшкавіцкім сельсавеце. Узнік на месцы Навабеліцкай МТС, будаўніцтва якой вялося ў 1930—1933 гг. У Вялікую Айчынную вайну была разбурана. На 1.1.1996 г. 70 двароў, 180 жыхароў. У складзе саўгаса «Навабеліцкі».

СТАРАЯ БЕЛІЦА, вёска, цэнтр сельсавета. Уваходзіла ў склад уладанняў польскіх магнатаў Чартарыйскіх у Вялікім княстве Літоўскім. У 1773 г. 47 двароў, 490 жыхароў, тут размяшчалася карчма. У 1775 г. была падаравана імператрыцай Кацярынай II князю М.Кантгаўзену. У яго і купіў Старую Беліцу ў пачатку XIX ст. для свайго сына Міхаіла Станіслаў Солтан-Перасвет, які паходзіў са старажытнага княжацкага роду. У 1777 г. тут была пабудавана драўляная праваслаўная Мікалаеўская царква. У 1777 г. сяло становіцца павятовым горадам, 235 жыхароў. У 1781 г. указам Кацярыны II быў зацверджаны герб з выявай рысі. У 1840 г. Міхаіл Солтан-Перасвет пабудаваў сядзібны дом, які быў разбураны ў першую сусветную вайну. У 1856 г. тут размяшчалася народнае вучылішча, у якім вучылася 12 хлопчыкаў. У 1875 г. 150 двароў, 666 жыхароў, у 1878 г. прыватная ўласнасць Ю.М.Солтан-Перасвета, які валодаў 755 дзесяцінамі зямлі і меў 3 піцейныя дамы. У 1886 г. 110 двароў, 664 жыхары. У сяле размяшчаліся вінакурны завод, 2 ветраныя млыны, 1 валовы млын. У прыход Мікалаеўскай царквы ўваходзіла 2317 прыхаджан Старой Беліцы і навакольных вёсак. Царкве належала 36 дзесяцін зямлі. У 1903 г. тут размяшчалася мяшчанская ўправа. У 1909 г. 48 двароў, 999 жыхароў, у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Сяло належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 1092 дзесяцінамі зямлі. Апошнім уладальнікам маёнтка быў М.Ю.Солтан-Перасвет да 1914 г. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 194 двары, 635 жыхароў, школа 1-й ступені. Быў створаны саўгас «Старая Беліца», у які ўваходзіла 16 гаспадарак, 50 жыхароў; ветраны млын, кузня. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінулі 123 аднавяскоўцы. У 1974 г. цэнтр калгаса. Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі, магазін. На 1.1.1996 г. 159 двароў, 393 жыхары. У складзе калгаса імя Урыцкага. Дзевяцігадовая школа (63 вучні), Дом культуры, фельчарска-акушэрскі пункт,

сталовая, магазін. Радзіма беларускіх вучоных К.Я.Вішнеўскай і Г.В.Штыхава.

ПОМНІК АРХІТЭКТУРЫ. Мікалаеўская царква. У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1-й палавіне XVIII ст. з дрэва.

Сядзіба. На паўднёвай ускраіне вёскі. Сфарміравана ў канцы XVIII — 1-й палавіне XIX ст. Уключае жылы дом, парк, сад і свіран.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі, у скверы. На ўшанаванне памяці 123 аднавяскоўцаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1971 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна і стэла.

СТАРАЯ БУХАЛАЎКА, вёска ў Цярэшкавіцкім сельсавеце. Вядома з XIX ст. як ваколіца Бухалаўка ў складзе аднайменнага маёнтка, які ў 1-й палавіне XIX ст. належаў памешчыку Рыгору Клімовічу. У 1875 г. прыватная ўласнасць дваранкі С.Бялецкай, якая валодала 107 дзесяцінамі зямлі, у Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Сяляне былі прыхаджанамі Скіцкага прыхода і наведвалі царкву Раства Багародзіцы. У 1909 г. ваколіца, 7 двароў, 92 жыхары, належала Цярэшкавіцкаму сельскагаспадарчаму таварыству. З 8.12.1926 г. хутар у Старацярэшкавіцкім сельсавеце Дзятлавіцкага, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 18 двароў, 76 жыхароў. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 13 двароў, 25 жыхароў. У складзе саўгаса «Навабеліцкі».

СТАРАЯ МІЛЬЧА, вёска ў Красненскім сельсавеце. У XVIII ст. вядома як прыватная ўласнасць фельдмаршала графа М.П.Румянцава-Задунайскага ў Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні. Адносілася да Новікаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1833 г. 55 рэвізскіх душ, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1862 г. 41 двор, 146 рэвізскіх душ, 661 дзесяціна 1200 сажняў зямлі. У 1884 г. 75 двароў, 435 жыхароў, хлебазапасны магазін, вадзяны млын. Апрача земляробства, сяляне вёскі займаліся бандарным промыслам. У 1909 г. 136 двароў, 819 жыхароў, у Гомельскай воласці Гомельскага павета, аднакласная царкоўнаприходская школа. Вёска належала сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 479 дзесяцінамі зямлі. У 1913 г. земская школа. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 216 двароў, 971 жыхар, школа 1-й ступені. У 1930-я гады створаны калгас «Авангард», працавала кузня. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 23 лютага 1983 г. у межах г. Гомеля.

СТАРЫЯ ДЗЯТЛАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Прыазёрны». Упершыню Дзятлавічы ўпамінаюцца ў 1640 г. як сяльцо (1 дым, 1 служба — «Олешки Ходарович... В том сельце человек попа Гомельского Ерофея держит здавна землю. При том сельце бояре держат 2 земли») у Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага. Адносілася да Гомельскага замка, якім валодаў гомельскі староста князь Міхаіл Чартарыйскі.

З 1772 г. у Расійскай імперыі. З 1773 г. у Гомельскай воласці Рагачоўскай правінцыі, з 1777 г. у Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні. Прыватная ўласнасць дваран Фашчаў. У 1848 г. вёска, 161 рэвізская душа, прыватная ўласнасць памешчыка Карла Фашча. У вёсцы была прыстань са свірнамі, 3 судны, 2 плыты, якія перавозілі 2273 пуды рознага тавару. У 1856 г. тут было адчынена народнае вучылішча, у якім вучылася 8 хлопчыкаў. У 1863 г. у вёсцы пабудавана драўляная праваслаўная Троіцкая царква, якой належала 36 дзесяцін зямлі.

У 1886 г. сяло, 71 двор, 435 жыхароў, цэнтр воласці Гомельскага павета, хлебазапасны магазін, царкоўнаприходская школа, валасное і мяшчанскае праўленні.

У 1888 г. мелася народнае вучылішча, у якім навучалася 29 хлопчыкаў і 6 дзяўчынак. У 1897 г. Троіцкую царкву наведвалі 2419 прыхаджан сяла і навакольных вёсак.

У 1909 г. 114 двароў, 807 жыхароў, належала часткова мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 1205 дзесяцін зямлі, часткова купцу Івану Істоміну з братамі, якім належала 2538 дзесяцін зямлі. У 1909 г. размяшчаліся ўрачэбны ўчастак, казённая вінная лаўка, фельчарскі пункт, млын. Раз у год

дзейнічаў прызыўны ўчастак па воінскай павіннасці.

У 1913 г. працавала земская школа.

30.8.1919 г. створаны сельскагаспадарчы кааператыў. З 8.12.1926 г. — цэнтр Дзятлавіцкага раёна Гомельскай акругі. У склад раёна было ўключана 25 сельсаветаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 176 двароў, 982 жыхары, школа 1-й ступені. 4.8.1927 г. ён скасаваны і Старыя Дзятлавічы ўвайшлі ў склад Гомельскага раёна. У сяле быў створаны калгас «Чырвоны герой».

У 1941 г. 152 двары, 760 жыхароў. У кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі амаль усю вёску (145 двароў) і загубілі 17 жыхароў.

У 1975 г. цэнтр саўгаса імя Жданава. Хлебапякарня, камбінат бытавога абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, бальніца, аптэка, аддзяленне сувязі, сталовая, 2 магазіны. На 1.1.1996 г. 160 двароў, 371 жыхар. Сярэдняя школа (113 вучняў), клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, 2 магазіны.

Радзіма беларускага этнографа і фальклярыста З.Ф.Радчанка.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. У цэнтры вёскі. Пахаваны 23 воіны Чырвонай Арміі (імёны невядомы), якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. За 0,5 км ад вёскі. Пахаваны 7 мірных жыхароў, якіх загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў Вялікую Айчынную вайну. На магіле пастаўлены крыж.

СТУДЗЁНАЯ ГУТА, вёска ў Цярухскім сельсавеце. Студзёная Гута (Студзёная Вада) узнікла ў XVIII ст. побач са шкляной гутай. У Вялікім княстве Літоўскім вёска, прыватная ўласнасць. У 1773 г. 15 двароў сялянскіх, 2 двары мясцеравыя, 7 двароў бабылёў, 5 хат немаёмных, 147 рэвізскіх душ, у Гомельскім павеце Рагачоўскай правінцыі. З 1776 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага. У 1805 г. шкляны завод знаходзіўся ў аднапавярховым будынку, у якім было 4 печы. Па рацэ Сож дастаўлялі сыравіну і паліва на завод і вывозілі гатовыя шкляныя вырабы, якія збывалі ў межах губерні і на Украіне. Граф П.А.Румянцаў-Задунайскі пабудаваў новы двухпавярховы будынак, кузню, сталярную майстэрню, 2 амбары, 12 жылых двароў для майстроў і рабочых. У 1814 г. на заводзе выраблялася як простае шкло, так і хрусталь, або «багемскае шкло». У 1814 г. было выраблена толькі бутэлек 27 110, штофаў 2265 штук. У 1833 г. 89 рэвізскіх душ мужчынскага полу, адносілася да Клімаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. З 1834 г. ва ўладанні князя І.Ф.Паскевіча. У 1850 г. 59 двароў, 324 жыхары, а 1852 г. у Гомельскім павеце. Былі распаўсюджаны калёсны і кравецкі промыслы. Тут быў паром, які перапраўляў да 200 пудоў грузаў. У 1886 г. 67 двароў, 285 жыхароў у Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У вёсцы размяшчаўся хлебазапасны магазін, пастаялы двор «Студзёная Гута», які размяшчаўся на Кацярынаўскай шашы, належаў мешчаніну Вібраву. У вёсцы была пабудавана княгіняй І.Паскевіч школа. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Цярухскага прыхода, наведвалі праваслаўную Грыгор'еўскую царкву. У 1909 г. 94 двары, 594 жыхары, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 1391 дзесяціну зямлі. З 8.12.1927 г. цэнтр сельсавета ў Дзятлавіцкім раёне, з 4.8.1927 г. у Гомельскім раёне. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 115 двароў, 632 жыхары, школа 1-й ступені. У 1928 г. 7 гаспадарак уступілі ў калгас «Сацыялізм», які знаходзіўся ў в. Цераха. У 1933 г. быў створаны свой калгас. У 1938 г. у вёсцы быў пабудаваны клуб. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 98 двароў, 176 жыхароў. У складзе саўгаса «Сацыялізм». Каля вёскі размяшчаецца санаторый-прафілакторый «Пунсовыя ветразі».

СТУКАЧОЎКА, вёска ў Даўгалескім сельсавеце. У XVIII ст. вядома ў складзе маёнтка Міхалькі, прыватная ўласнасць памешчыцы Паўліны Валадзьковічавай, у 1850 г. пасля яе смерці ўласнасць яе пляменніцы памешчыцы Станіславы Хацяноўскай. У 1862 г. 43 рэвізскія душы, у Дзятлаўскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1886 г. 18 двароў, 125 жыхароў. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся кавальскім і калёсным промысламі. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Дзятлавіцкага прыхода і навед-

валі праваслаўную Троіцкую царкву. У 1909 г. 45 двароў, 275 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 2369 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. у Міхалькаўскім сельсавеце Дзятлавіцкага раёна, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 82 двары, 415 жыхароў, школа 1-й ступені. Тут быў створаны калгас імя Сталіна, працавала кузня. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 26 двароў, 46 жыхароў. У складзе саўгаса «Мірны».

СЦЯГ ПРАЦЫ, пасёлак ва Улукаўскім сельсавеце. Вядомы з пачатку XX ст. у Гомельскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1926 г. 34 двары, 161 жыхар. З 8.12.1926 г. у складзе Галавінскага сельсавета Гомельскага раёна і акругі, з 30.12.1930 г. ва Улукаўскім сельсавеце Гомельскага раёна і акругі, з 27.7.1937 г. Гомельскага раёна. У 1930-я гады быў створаны калгас «Авіятар», працавала кузня. У час Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 50 двароў, 86 жыхароў. У складзе саўгаса «Бярозкі», паляводчая брыгада.

СЯМЁНАЎКА, вёска ў Цярухскім сельсавеце. Узнікла на месцы жалезнай рудні. Упамінаецца ў 1773 г. як Сямёнаўская Рудня, 10 двароў, 42 рэвізскія душы. У 1778 г. 37 рэвізскіх душ мужчынскага полу ў Гомельскай воласці Беліцкага павета, прыватная ўласнасць фельдмаршала М.П.Румянцава-Задунайскага. У 1833 г. 16 рэвізскіх душ мужчынскага полу, адносілася да Мікалаеўскай эканоміі Гомельскага маёнтка, які з 1834 г. прыватная ўласнасць графа І.Ф.Паскевіча. У 1850 г. 8 двароў, 32 жыхары. У 1876 г. мешчанінам Усевічам заснавана крупадзёрная мануфактура (даход складаў 175 рублёў). У 1884 г. 19 двароў, 130 жыхароў, у Маркавіцкай воласці Гомельскага павета, хлебазапасны магазін, школа граматы. Традыцыйныя рамёствы: шавецтва, бондарства. У 1909 г. 35 двароў, 208 жыхароў, належала Сямёнаўскаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 360 дзесяцін зямлі. У 1909 г. аднакласная мужчынская і жаночая царкоўнапрыходская школа, млын. З 8.12.1926 г. у Краўцоўскім сельсавеце Насовіцкага, з 4.8.1927 г. Церахоўскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 49 двароў, 280 жыхароў. У 1941 г. 330 двароў, 1080 жыхароў. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Тут 18.8.1941 г. трымаў абарону полк народнага апалчэння Гомеля. У ноч на 20 жніўня абаронцы пакінулі Гомель. У чэрвені 1943 г. гітлераўцы спалілі 300 двароў і загубілі 7 жыхароў. Пасля вайны вёска адбудавалася. На 1.1.1996 г. 36 двароў, 79 жыхароў. У складзе саўгаса «Сацыялізм».

УЗА, вёска ў Давыдаўскім сельсавеце. Вядома як прыватная ўласнасць у Вялікім княстве Літоўскім. З 1772 г. у Расійскай імперыі, з 1775 г. прыватная ўласнасць графа П.А.Румянцава-Задунайскага. У 1773—1777 гг. у Гомельскім павеце Рагачоўскай правінцыі, з 1777 г. у Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні. У 1778 г. 69 рэвізскіх душ, уваходзіла ў Новікаўскую эканомію Гомельскага маёнтка. У 1833 г. 58 душ. З 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1861 г. яго сын Ф.І.Паскевіч заснаваў на р. Уза крупадзёрку, на якой працавала 7 рабочых і 1 майстар. Штогод на заводзе выраблялася 5625 пудоў мукі на суму 5992 руб. У 1868 г. вёску набыў памешчык Д.А.Філончык, які валодаў 2483 дзесяцінамі зямлі, меў піцейны дом, даход з якога складаў 50 рублёў. У вёсцы размяшчаўся хлебазапасны магазін. У 1898 г. заснаваны лесапільны завод, на якім працавала 50 рабочых. У 1909 г. 33 двары, 212 жыхароў; маёнтак, 1 двор, 4 жыхары, у Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета. Вёска належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 301 дзесяцінай зямлі. Апошнімі ўладальнікамі маёнтка былі памешчыкі Філімончыкавы. Яны валодалі 1069 дзесяцінамі зямлі. У 1913 г. земская школа, тэлеграф. У 1926 г. 63 двары, 319 жыхароў, паштовае аддзяленне. З 8.12.1926 г. у Давыдаўскім сельсавеце.

У вёсцы быў створаны калгас «Чырвоная Уза». У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 83 двары, 185 жыхароў, магазін.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Гарадзішча.

За 1 км на поўдзень ад вёскі, побач са старым рэчышчам р. Уза. Вышыня над поймай 10 м. Гарадзішча складаецца з трох пляцовак: першая памерам 120х100 м, з боку ракі ўмацавана валам вышынёй 1,5 м; другая знаходзіцца на поўдзень ад першай, яе памер 120х50 м; трэцяя памерам 100х40 м, аддзелена ад другой валам вышынёй каля 1,5 м. Па краі гарадзішча з боку поля прасочаны вал вышынёй 0,5 м і роў глыбінёй каля 1 м. Вядома з 1910 г., абследавалі ў пачатку XX ст. Е.Р.Раманаў, у 1936 г. А.М.Ляўданскі і А.Дз.Каваленя, у 1981 г. У.У.Багамольнікаў. У культурным пласце 0,5—1 м знойдзена ляпная гладкасценная кераміка ранняга жалезнага веку.

Матэрыялы абследаванняў захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

УЛУКАЎЕ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгасаў «Бярозкі» і «Цяплічны». У пачатку XIX ст. Улукаўе (Лукаўе) у Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні. Прыватная ўласнасць памешчыкаў Фашчаў. У 1857 г. 61 рэвізская душа, прыватная ўласнасць двараніна А.Фашча. У 1864 г. 55 рэвізскіх душ мужчынскага полу былі надзелены 246 дзесяцінамі зямлі. У 1886 г. 39 двароў, 199 жыхароў, у Гомельскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Традыцыйныя рамёствы: бондарства, кравецтва, шавецтва. У 1890 г. заснаваны крухмальны завод, на якім працавала 20 рабочых, выраблялася 6 тысяч пудоў крухмалу, даход складаў 6 тысяч рублёў. У 1894 г. заснаваны вінакурны завод, на якім працавала 9 рабочых, выраблялася 6 тысяч вёдзер спірту, даход складаў 9 тысяч рублёў, у 1895 г. на заводзе быў уведзены паравы рухавік. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Галавінскага прыхода і наведвалі праваслаўную Пакроўскую царкву. У 1909 г. 58 двароў, 410 жыхароў, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 318 дзесяцін зямлі. Апошняй уладальніцай маёнтка была памешчыца М.П.Крутаева, яна валодала 1370 дзесяцінамі зямлі. У 1920 г. створаны сельскагаспадарчы кааператыў, у 1925 г. — саўгас «Улукаўе». З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 77 двароў, 380 жыхароў, школа. У 1938 г. дзіцячы дом. У 1941 г. 115 двароў, 622 жыхары. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску, загубілі 13 жыхароў. За вызваленне вёскі ўвосень 1943 г. загінула 167 савецкіх воінаў. У час Айчыннай вайны загінула ў баях з гітлераўцамі 229 землякоў. Пасля вайны вёска адбудавалася. У 1974 г. цэнтр саўгаса «Бярозкі». Камбінат бытавога абслугоўвання. Васьмігадовая школа, спецшкола, клуб, бібліятэка, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі, кафэ, 3 магазіны. На 1.1.1996 г. 217 двароў, 548 жыхароў. Дзіцячы сад, бібліятэка, комплексна-прыёмны пункт, бальніца.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. За 200 м ад вёскі. Пахаваны 167 воінаў, якія загінулі пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў восенню 1943 г. У 1956 г. пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У 1977 г. пастаўлена сцяна Памяці з імёнамі 229 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

УРЫЦКАЕ (да 1927 г. Воўкавіцкі Крупец), вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Урыцкага.

Упершыню ўпамінаецца ў 1640 г. як Воўкавічы, 12 дымоў.

У 1816 г. адносілася да Новікаўскай эканоміі, 225 рэвізскіх душ. У 1886 г. вёска Воўкавіцкі Крупец у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета, 164 двары, 879 жыхароў, 3 ветраныя млыны. У 1891 г. пабудавана драўляная царква Раства Багародзіцы, 2437 прыхаджан, 3 дзесяціны зямлі. У 1927 г. сяло, 235 двароў, 1366 жыхароў. У 1929 г. цэнтр сельсавета, 225 двароў, 1187 жыхароў. У 1974 г. торфапрадпрыемства «Парыжская камуна», камбінат бытавога абслугоўвання. Сярэдняя школа, абласная школа кандытараў, кінатэатр, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, аддзяленне сувязі, кафэ, 4 магазіны. На 1.1.1996 г. 870 двароў, 2475 жыхароў. Сярэдняя школа (1213 вучняў), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, бальніца, сталовая, кафэ, 5 магазінаў, лазня. Царква Раства Багародзіцы (узведзена ў 1993 г.).

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі на ўшанаванне памяці 294 воінаў-землякоў і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

Царква Раства Багародзіцы ў в. Урыцкае.

ФЁДАРАЎКА, вёска ў Цярэшкавіцкім сельсавеце. У 1-й палавіне XIX ст. прыватная ўласнасць калежскага асэсара М.А.Бардоўскага. У 1856 г. 64 рэвізскія душы мужчынскага полу, 334 дзесяціны зямлі. У 1872 г. цэнтр аднайменнага маёнтка, які належаў двараніну М.Бетулінскаму. У 1880 г. цагельны завод. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Скіцкага прыхода і наведвалі царкву Раства Багародзіцы. У 1909 г. Фёдараўка (Гарбатаўка), 42 двары, 268 жыхароў, у Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству.

Апошнім уладальнікам маёнтка быў двараніи У.Куняховіч. З 8.12.1926 г. у Старацярэшкавіцкім сельсавеце Дзятлаўскага раёна, з 4.8.1927 г. у Гомельскім раёне. У 1926 г. 81 двор, 411 жыхароў. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Вёска была ў складзе саўгаса «Навабеліцкі». У 1962 г. увайшла ў склад в. Цярэшкавічы.

ХУТАРАНКА, вёска ў Грабаўскім сельсавеце. У XIX ст. вядома як Фугаранка ў складзе аднайменнага фальварка, які належаў памешчыкам Крушэўскім. У 1868 г. заснавана крупадзёрка, даход з якой складаў 125—150 руб. У 1879 г. другі селянін заснаваў тут маслабойню, даход з якой складаў 200—250 руб. У 1880 г. 49 двароў, 272 жыхары, у Насовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Традыцыйныя рамёствы: кавальства, сталярства. У вёсцы размяшчаліся школа граматы, хлебазапасны магазін. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Грабаўскага прыхода і наведвалі праваслаўную царкву Узнясення. Апошнім уладальнікам фальварка быў двараніи В.П.Крушэўскі, які меў 161 дзесяціну зямлі. У 1909 г. 68 двароў, 590 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 1917 дзесяцін зямлі. Народнае вучылішча, мяшчанскае праўленне. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага раёна, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 82 двары, 391 жыхар, школа 1-й ступені. На 1.1.1996 г. 26 двароў, 37 жыхароў. Швейная майстэрня. Радзіма беларускага мастака Т.І.Васюк.

ЦЕЛЯШОЎСКАЯ РУДНЯ, вёска ў Целяшоўскім сельсавеце. У 1852 г. прыватная ўласнасць памешчыкаў Івіцкіх. У 1880 г. мешчанін Атэрман заснаваў крупадзёрку, даход з якой складаў 175 рублёў. У 1886 г. 100 двароў, 660 жыхароў, у Целяшоўскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Традыцыйныя рамёствы: кавальства, шавецтва. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Целяшоўскага прыхода і наведвалі праваслаўную Пак-

роўскую царкву. У 1909 г. 182 двары, 1158 жыхароў, належала вясковаму таварыству, якое валодала 1818 дзесяцінамі зямлі; земскае вучылішча. З 8.12.1938 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 101 двор, 588 жыхароў, школа 1-й ступені. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. У гады Айчыннай вайны загінула 116 землякоў. У 1973 г. цэнтр калгаса імя Суворава. Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. На 1.1.1996 г. 143 двары, 345 жыхароў. Дзевяцігадовая школа (97 вучняў), клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, магазін.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 116 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1976 г. пастаўлены абеліск і 2 стэлы.

ЦЕЛЯШЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоная плошча». Упамінаецца ў 1526—1531 гг. у час удакладнення князем Жыгімонтам I меж паміж Вялікім княствам Літоўскім і Чарнігаўскім княствам. У 1640 г. сяло, 8 дымоў, у Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага, адносілася да Гомельскага замка, які належаў гомельскаму старосце князю Міхаілу Чартарыйскаму. З 1772 г. у Расійскай імперыі. З 1773 г. у Гомельскім павеце Рагачоўскай правінцыі. У 1792 г. тут была пабудавана драўляная праваслаўная Пакроўская царква, якой належала 36 дзесяцін зямлі. У 1-й палавіне XIX ст. прыватная ўласнасць памешчыкаў Аркадзія і Сцяпана Міклашэўскіх. У 1848 г. маёнтак Целяшы (324 мужчынскія і 416 жаночых душ, 4922 дзесяціны зямлі) купіў паручнік Фелікс Івіцкі. У 1850 г. 80 двароў. У 1856 г. адчынена народнае вучылішча, у якім вучылася 10 хлопчыкаў. У 1862 г. 334 рэвізскія душы мужчынскага полу, 1543 дзесяціны зямлі. У 1886 г. 156 двароў, 747 жыхароў, цэнтр воласці ў Гомельскім павеце Магілёўскай губерні. У сяле размяшчаліся валасное праўленне, царкоўнапрыходская школа, ветраны млын, хлебазапасны магазін. Традыцыйныя рамёствы: бондарства, сталярства, шавецтва. У 1903 г. фельчарскі пункт. У 1909 г. 251 двор, 1610 жыхароў, належала Целяшоўскаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 2073 дзесяцінамі зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 206 двароў, 1026 жыхароў, школа 1-й ступені. Быў створаны калгас «Чырвоная плошча», працавала кузня, конная крупадзёрка, ветраны млын. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. У 1943 г. гітлераўцы закатавалі 22 мірных жыхароў. У 1974 г. камбінат бытавога абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін. На 1.1.1996 г. 257 двароў, 707 жыхароў. Сярэдняя школа (1213 вучняў), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, бальніца, сталовая, кафэ, 5 магазінаў, лазня.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны 273 воіны, якія загінулі пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў восенню 1943 г. У 1959 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. За 0,5 км на паўднёвы ўсход. Пахаваны 22 мірныя жыхары, якія былі па-зверску закатаваны гітлераўцамі ў 1943 г. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ЦЕРУХА, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Сацыялізм». Вядома як прыватная ўласнасць у Вялікім княстве Літоўскім. З 1772 г. у Расійскай імперыі. У 1773 г. 20 двароў, 27 рэвізскіх мужчынскіх душ, у Гомельскай воласці Рагачоўскай правінцыі, з 1775 г. прыватная ўласнасць графа П.А.Румянцава-Задунайскага. У 1788 г. 83 рэвізскія душы, у Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні, уваходзіла ў Клімаўскую эканомію Гомельскага маёнтка. У 1833 г. 129 рэвізскіх душ. Працавала піларама (5 рабочых), выраблялася дошак і шалёвак 9617 штук у год. З 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1867 г. пабудавана драўляная праваслаўная Георгіеўская царква. У 1882 г. сяло, 93 двары, 430 жыхароў. Традыцыйныя рамёствы: бондарства, стальмаства, шавецтва. У 1886 г. 112 двароў, 669 жыхароў, у Дзятлаўскай воласці Гомельскага павета. У сяле былі 2 млыны — ветраны і вадзяны, піцейны двор, хлебазапасны магазін, школа граматы.

Побач з сялом праходзіла Кіеўская шаша, на якой размяшчаўся пастаялы двор (1 двор, 6 жыхароў). У 1909 г. 182 двары, 1174 жыхары, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 1352 дзесяцінамі зямлі. У прыходзе Георгіеўскай царквы было 2559 прыхаджан сяла і навакольных вёсак. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Дзятлавіцкага, з 10.2.1931 г. Церахоўскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 239 двароў, 1052 жыхары, школа 1-й ступені, паравы млын, лесапілка, крупадзёрка. У 1930-я гады створаны калгас «Сацыялізм», працавалі кузня, цыркулярка. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па кастрычнік 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. за вызваленне вёскі загінулі 472 савецкія воіны 19-га стралковага корпуса 65-й арміі Цэнтральнага фронту. У 1943 г. гітлераўцы загубілі 42 мірных жыхароў вёскі. Пасля вайны адбудавалася. У 1974 г. сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, амбулаторны пункт, аддзяленне сувязі, швейная майстэрня, кафэ, магазін. На 1.1.1996 г. 300 двароў, 887 жыхароў. Сярэдняя школа (230 вучняў), дзіцячы сад, клуб, бібліятэка, амбулаторыя, 2 магазіны, лазня. Радзіма беларускага вучонага В.П.Ермакова.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І АХВЯР ФАШЫЗМУ. На паўночнай ускраіне вёскі, справа ад дарогі Гомель — Чарнігаў. Пахаваны 472 воіны 19-га стралковага корпуса 65-й арміі Цэнтральнага фронту, якія загінулі ў верасні 1943 г. у час вызвалення вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і 42 мірныя жыхары в. Церуха, загубленыя гітлераўцамі ў 1943 г. Сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза Аляксандр Дзмітрыевіч Валогін.

ЦІЦЯНКІ, вёска ў Красненскім сельсавеце. У 1788 г. 84 рэвізскія душы, прыватная ўласнасць графа М.П.Румянцава-Задунайскага ў Гомельскай воласці Беліцкага павета Магілёўскай губерні. У 1811 г. 111 рэвізскіх душ, уваходзіла ў склад Новікаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1852 г. 26 двароў, 176 жыхароў, у Гомельскім павеце, уласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1882 г. 52 двары, 303 жыхары. Традыцыйнае рамяство — бондарства. У 1884 г. школа граматы. У 1894 г. цагельна-чарапічны завод, на якім працавала 109 рабочых, даход складаў 64 тысячы рублёў. У 1909 г. 108 двароў, 642 жыхары, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 505 дзесяцін зямлі. Два заводы — цагельна-чарапічны і тарфяны — належалі ўладальніцы маёнтка Ніжні Брылёў мяшчанцы Е.Пітуновай. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета. У 1927 г. 222 двары, 1190 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1932 г. створаны саўгас «Ціцянкі», у якім працавала 207 рабочых; квасільны пункт. З 30.4.1948 г. вёска ў межах г. Гомель.

ЦЫКУНЫ, вёска ў Бабовіцкім сельсавеце. Назва ўтварылася ад мянушкі Цыкуны, якая азначае месца жыхарства. У XVIII ст. вядома як слабада ў Вялікім княстве Літоўскім. З 1772 г. у Расійскай імперыі. З 1775 г. прыватная ўласнасць графа П.А.Румянцава-Задунайскага ў складзе Новікаўскай эканоміі Гомельскага маёнтка ў Беліцкім павеце. У 1833 г. 20 рэвізскіх душ, з 1834 г. ва ўладанні князя І.Ф.Паскевіча, з 1852 г. у Гомельскім павеце Магілёўскай губерні. У 1864 г. размяшчаўся шынок, які арандаваў гомельскі купец Дворкін, даход з якога складаў 4 рублі 67 капеек. У 1884 г. 24 двары, 185 жыхароў. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Бабовіцкага прыхода і наведвалі праваслаўную Успенскую царкву. У 1909 г. слабада, 56 двароў, 347 жыхароў, належала вясковаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 418 дзесяцінамі зямлі. У 1913 г. земская школа. З 8.12.1926 г. цэнтр Случмільчанскага сельсавета Дзятлавіцкага, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 22 двары, 429 жыхароў. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 70 двароў, 126 жыхароў. У складзе саўгаса «Мірны».

ЦЯРЭНІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «1 Мая». Упершыню ўпамінаецца ў пісьмовых крыніцах у 1526—1531 гг. У 1960 г. сяло, 2 дымы, у Гомельскай воласці Вялікага княства Літоўскага. У XIX ст. у складзе аднайменнага маёнтка, які належаў у 1861 г. патомным дваранам Уласевым. Яны мелі 1345 дзесяцін зямлі, ветраны млын, даход з якога складаў 150 рублёў. У 1882 г. 60 двароў, 377 жыхароў, у Целяшоўскай воласці Гомельскага па-

вета Магілёўскай губерні. У 1884 г. народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, ветраны млын. У 1909 г. аднакласная царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. вёска, 150 двароў, 1085 жыхароў; маёнтак, 1 двор, 3 жыхары. Вёска належала часткова мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 1259 дзесяцін зямлі, часткова памешчыку А.Уласеву. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі, з 30.12.1927 г. перайменаваны ў нацыянальны рускі сельсавет. У 1926 г. 132 двары, 711 жыхароў, быў створаны саўгас, 1 двор, 6 жыхароў. У вёсцы працавалі ветраны млын, кузня. Дзейнічала школа 1-й ступені. У 1930-я гады створаны калгас «1 Мая». У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1974 г. васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі, магазін. На 1.1.1996 г. 229 двароў, 639 жыхароў. Дзевяцігадовая школа (110 вучняў), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, комплексна-прыёмны пункт, амбулаторыя, магазін, лазня.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. На ўскраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 202 воінаўземлякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, пастаўлены абеліск.

ЦЯРЭШКАВІЧЫ (да 23 мая 1962 г. Старыя Цярэшкавічы), вёска, цэнтр сельсавета, саўгаса «Навабеліцкі» і Навабеліцкай птушкафабрыкі. Упершыню ўпамінаецца ў 1526—1531 гг. У 1640 г. вядома як сяло, 4 дымы, у Гомельскім старостве Вялікага княства Літоўскага. З 1772 г. у Расійскай імперыі. З 1776 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава. У 1785 г. прыватная ўласнасць дваран Мікалая Вінча і Антона Хільчэўскага ў складзе аднайменнага маёнтка ў Беліцкім павеце Магілёўскай губерні. У 2-й палавіне XIX ст. належала памешчыкам Ржэцкім, Зубовічу, Падарэўскаму. У 1848 г. прыстань са свірнамі, 14 суднаў, 1 плыт, 11 229 пудоў тавару. З 1852 г. у Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1856 г. народнае вучылішча, у якім вучылася 27 хлопчыкаў. Традыцыйнае рамяство — кавальства. У 1909 г. 28 двароў, 190 жыхароў, належала сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 248 дзесяцін зямлі. У 1909 г. была аднакласная царкоўнапрыходская школа. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Дзятлавіцкага раёна, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 67 двароў, 276 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1930-я гады створаны калгас «Камунар», працавала кузня. У 1941 г. 85 двароў, 364 жыхары. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 84 двары і загубілі 12 жыхароў. У 1974 г. птушкафабрыка. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, швейная майстэрня, сталовая, магазін. На 1.1.1996 г. 593 двары, 1870 жыхароў. Сярэдняя школа (430 вучняў), музычная школа, Дом культуры, комплексна-прыёмны пункт, амбулаторыя, сталовая, 2 магазіны.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1984 г. пастаўлены помнік.

ЧАРАЦЯНКА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «За Радзіму». У Вялікім княстве Літоўскім прыватная ўласнасць польскіх магнатаў.

У пачатку XIX ст. прыватная ўласнасць Станіслава Солтан-Перасвета. У 1856 г. народнае вучылішча, у якім навучалася 59 хлопчыкаў. У 1865 г. пабудавана каменная праваслаўная Успенская царква, якой належала 39 дзесяцін зямлі. У 1882 г. сяло, 89 двароў, 446 жыхароў, у Маркавіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Традыцыйныя рамёствы: кавальства, сталярства, шавецтва. У 1886 г. 87 двароў, 431 жыхар, ветраны млын. У 1888/89 навучальным годзе ў народным вучылішчы вучылася 57 хлопчыкаў і 8 дзяўчынак. У 1899 г. у прыходзе Успенскай царквы было 2950 прыхаджан сяла і навакольных вёсак. У 1909 г. 113 двароў, 703 жыхары, належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 456 дзесяцін зямлі. Царкве належалі 43 дзесяціны зямлі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Насовіцкага раёна, з 4.8.1927 г. Церахоўскага раёна Гомельскай акругі, з 30.12.1927 г. у Пракопаўскім сельсавеце. У 1926 г., паводле перапісу насельніцтва, 97 двароў, 508 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1930 г. створаны калгас «Кастрычнік», працавала кузня. У Вялікую Айчынную вайну загінулі 122

землякі. У 1974 г. пачатковая школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, швейная майстэрня, магазін. На 1.1.1996 г. 219 двароў, 612 жыхароў. Дзевяцігадовая школа (130 вучняў), Дом культуры, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, кафэ, 2 магазіны, лазня.

ПОМНІКІ АРХЕАЛОГІІ. Гарадзішча-1. За 2 км на поўдзень ад вёскі ва ўрочышчы Мошкі. Пляцоўка круглая, дыяметрам 50 м, умацавана кольцападобным валам вышынёй 2,5 м, шырынёй да 3 м. З паўднёва-ўсходняга боку ёсць роў глыбінёй 0,2—0,5 м, шырынёй каля 1 м. Вядома з 1873 г., абследавалі ў пачатку XX ст. Е.Р.Раманаў, у 1976 г. У.У.Багамольнікаў. Раскопкі не праводзіліся.

Гарадзішча-2. Мясцовая назва Гарадзец. За 0,8—1 км на поўдзень ад вёскі, справа ад дарогі ў в. Глыбоцкае. Пляцоўка прамавугольная, памерам 55х40 м. Умацавана валам вышынёй каля 3 м. Вядома з 1856 г. У 1981 г. С.Я.Расадзін заклаў на пляцоўцы гарадзішча 2 шурфы памерам 1х1 м. Культурны пласт 0,4 м. У ім знойдзены ляпная кераміка, кавалкі шлаку, дробныя косці жывёл.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У скверы каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 22 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1977 г. пастаўлены помнік — пілон і дошкі з імёнамі загінуўшых.

ЧАРНІЧНЫ, пасёлак у Дзятлавіцкім сельсавеце. У канцы XIX ст. вядомы як фальварак, прыватная ўласнасць памешчыка Радчанкі ў Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. фальварак, 1 двор, 2 жыхары, уласнасць двараніна Радчанкі, які валодаў 1210 дзесяцінамі зямлі.

Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 11 двароў, 51 жыхар.

З 8.12.1926 г. у Старадзятлавіцкім сельсавеце Дзятлавіцкага раёна Гомельскай акругі. З 4.8.1927 г. у Гомельскім раёне. У 1955 г. жыхары пасёлка перасялены ў в. Новыя Дзятлавічы.

ЧКАЛАВА (да 1939 г. Жаробнае), вёска ў Дзятлавіцкім сельсавеце. Вядома з XVIII ст. як прыватная ўласнасць у Вялікім княстве Літоўскім. З 1772 г. у Расійскай імперыі. З 1776 г. прыватная ўласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага. У 1788 г. 235 рэвізскіх душ Рагачоўскай правінцыі, адносілася да Хомінскай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1833 г. 181 рэвізская душа, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча ў Гомельскай воласці Беліцкага павета. У 1848 г. 65 двароў, з 1852 г. у Гомельскім павеце. У 1856 г. народнае вучылішча, у якім вучылася 30 хлопчыкаў, у 1868 г. — 20 хлопчыкаў. У 1886 г. 140 двароў, 1001 жыхар, хлебазапасны магазін, школа граматы. Традыцыйныя рамёствы: бондарства, сталярства, шавецтва. У 1909 г. 247 двароў, 1667 жыхароў, належала сельскагаспадарчаму таварыству, якое валодала 3194 дзесяцінамі зямлі. У 1909 г. царкоўнапрыходская школа. У 1913 г. земская школа. У 1924 г. ветраны млын. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 247 двароў, 1167 жыхароў. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Дзятлавіцкага, з 26.7.1930 г. Гомельскага раёна. Паводле перапісу 1926 г., 307 двароў, 1609 жыхароў, школа 1-й ступені. У 1930 г. быў створаны калгас «Батрак», працавалі кузня, ветраны млын. У час Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 282 двары, 637 жыхароў. У складзе саўгаса «Прыазёрны». Аддзяленне сувязі, бібліятэка, магазін, лазня.

ЧОНКІ, вёска, цэнтр сельсавета. У пачатку XVIII ст. гэту мясцовасць пачалі засяляць стараверы. У 1760 г. ва ўрочышчы Чонскі абрыў старац Іаасаф з Гжацка заснаваў для манахаў-пустэльнікаў Пахомаў скіт. У 1775 г. стараверы на беразе Сожа заснавалі стараверскі Чонскі манастыр, які ў 1798 г. далучыўся да праваслаўя і стаў называцца Іаасафскім манастыром. Ён размяшчаўся ва ўладаннях графа Румянцава-Задунайскага. У 1801 г. у ім знаходзілася 100 манахаў. У 1877 г. тут была пабудавана драўляная царква Богаяўлення Гасподня. З 8.12.1926 г. у Хутаранскім сельсавеце, з 30.12.1927 г. у Сеўрукоўскім сельсавеце Насовіцкага, з 4.8.1927 г. Гомельскага раёнаў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 63 двары. У 1927 г. тут была створана сельскагаспадарчая арцель. У кастрычніку 1943 г. у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі загінуў 1761 савецкі воін. У лютым—ліпені 1944 г. тут размяшчаўся Беларускі штаб партызанскага руху. У 1974 г. цэнтр калгаса «Чырвонагвардзеец». Васьмігадовая школа, 2 магазіны.

Побач з вёскай кліматычны курорт Чонкі, які ўключае Дом адпачынку «Чонкі», турысцкую базу «Сож», два абласныя дзіцячыя санаторыі, санаторыі-прафілакторыі заводаў «Гомсельмаш», «Цэнтраліт» і Гомельскага хімічнага, базу адпачынку Гомельскага станкабудаўнічага завода імя Кірава. На 1.1.1996 г. 790 двароў, 2199 жыхароў. Дзевяцігадовая школа (273 вучні), комплексна-прыёмны пункт, 3 магазіны. Радзіма Героя Савецкага Саюза І.С.Зайцава.

ПОМНІК АРХЕАЛОГІІ. Селішча. За 0,4 км на паўднёвы захад ад вёскі, на краі надпоймавай тэрасы правага берага р. Сож. Знойдзены рэшткі ляпнога і ганчарнага посуду, прасліца. Адносіцца да сярэдзіны — 3-й чвэрці 1-га тысячагоддзя н.э. і эпохі Кіеўскай Русі. Раскопкі не праводзіліся.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На беразе р. Сож. Пахаваны 1817 воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі 10—11.10.1943 г. у раёне вёсак Чонкі і Бабовічы пры фарсіраванні р. Сож. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. У 1995 г. рэканструяваны.

МЕСЦА БАЗІРАВАННЯ АПЕРАТЫЎНА-ВУЧЭБНАГА ЦЭНТРА. У ліпені — жніўні 1941 г. у Чонках базіраваўся Аператыўна-вучэбны цэнтр, які вёў падрыхтоўку і засылку дыверсійных груп у тыл нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ПОМНІК У ГОНАР БЕЛАРУСКАГА ШТАБА ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ. У лютым — ліпені 1944 г. тут размяшчаўся Беларускі штаб партызанскага руху. У 1969 г. пастаўлены помнік.

ЧЫРВОНЫ МАЯК, пасёлак у Пакалюбіцкім сельсавеце. Пасёлак узнік у XX ст., у час калгаснага будаўніцтва. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 7 двароў, 36 жыхароў.

З 8.12.1926 г. у Лапацінскім сельсавеце Гомельскага раёна і акругі, з 30.12.1927 г. у Пакалюбіцкім сельсавеце.

У 1941 г. 20 двароў, 50 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі ўсю вёску і загубілі 2 мірных жыхароў. Пасля вайны пасёлак адбудаваўся. На 1.1.1996 г. 122 двары, 382 жыхары.

ШАРПІЛАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Міжрэчча». У XVIII ст. у Гомельскай воласці Гомельскага староства Вялікага княства Літоўскага. З 1773 г. у Гомельскім павеце Рагачоўскай правінцыі, з 1775 г. уласнасць фельдмаршала П.А.Румянцава-Задунайскага. У 1788 г. 62 рэвізскія душы. У 1833 г. у складзе Хомінскай эканоміі Гомельскага маёнтка. У 1833 г. 97 рэвізскіх душ, з 1834 г. прыватная ўласнасць князя І.Ф.Паскевіча. У 1850 г. 65 двароў, 96 жыхароў. З 1852 г. у Гомельскім павеце. У 1864 г. у вёсцы быў шынок, даход з якога складаў 14 рублёў 50 капеек.

У 1882 г. 94 двары, 450 жыхароў, у Дзятлавіцкай воласці Гомельскага павета. Традыцыйныя рамёствы: бондарства, сталярства. У 1886 г. 109 двароў, 692 жыхары, хлебазапасны магазін. У 1909 г. 169 двароў, 1330 жыхароў, належала Шарпілаўскаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 110 дзесяцін зямлі, школа граматы. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета ў Дзятлавіцкім, з 4.8.1927 г. у Гомельскім раёнах. У 1926 г. 246 двароў, 1297 жыхароў, школа 1-й ступені. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У баях з гітлераўцамі за вызваленне вёскі і навакольля загінулі ў верасні — кастрычніку 1943 г. 284 савецкія воіны.

У 1974 г. сярэдняя школа, клуб, 2 бібліятэкі, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, швейная майстэрня, сталовая, 3 магазіны. На 1.1.1996 г. 302 двары, 759 жыхароў. Сярэдняя школа (140 вучняў), дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, комплексна-прыёмны пункт, фельчарска-акушэрскі пункт, 2 магазіны, лазня. Радзіма беларускага паэта А.С.Грачанікава, беларускага вучонага І.Ф.Харламава.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. У цэнтры вёскі. Пахаваны 287 воінаў 19-га стралковага корпуса 65-й арміі Цэнтральнага фронту, якія загінулі ў баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у верасні — кастрычніку 1943 г. У 1974 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ШУТАЎКА, вёска у Цярухскім сельсавеце. Заснавана ў 2-й палавіне XIX ст. У лясным урочышчы Шутаўка некалькі сем'яў з в. Грабаўка расчысцілі лес пад палі і сталі тут жыць. У 1876 г. яны ўжо мелі тут поўную сядзібную аселасць. У 1909 г. вёска,

11 двароў, 64 жыхары, у Насовіцкай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні, належала Грабаўскаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела тут 100 дзесяцін зямлі. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 8.12.1926 г. у Хутаранскім сельсавеце Насовіцкага раёна, з 4.8.1927 г. у Гомельскім раёне. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 13 двароў, 65 жыхароў. Усе яны мелі прозвішча Шутаў. Па нацыянальным складзе насельніцтва было рускае. Вясковыя дзеці наведвалі школу 1-й ступені ў в. Хутаранка. У 1941 г. 14 двароў, 37 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску. Пасля вайны вёска адбудавалася. На 1.1.1996 г. 6 двароў, 11 жыхароў, 9 з якіх пенсіённага ўзросту. У складзе саўгаса «Сацыялізм».

ЯНТАРНЫ, пасёлак у Пакалюбіцкім сельсавеце.

Узнік 31 снежня 1976 г. на месцы размяшчэння нафтабазы Гомельскага раёна. На 1.1.1996 г. 121 двор, 378 жыхароў.

ЯРОМІНА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя XXII з'езда КПСС. У XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка, уладальнікамі якога ў 1840 г. былі дваране Краснінскі-Корвін, А.Багданаў. Яны валодалі 475 дзесяцінамі зямлі, мелі піцейны дом, даход з якога складаў 75 рублёў. У 1863 г. у Красненскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні, прыватная ўласнасць памешчыка Дуніна-Баркоўскага. У 1868 г. сяло, 151 двор, 526 жыхароў. У 1868 г. народнае вучылішча, у якім навучалася 25 хлопчыкаў. У 1886 г. 158 двароў, 840 жыхароў, у Пакалюбіцкай воласці Гомельскага павета, хлебазапасны магазін, казённая вінная лаўка, млын. У 1889 г. у прыходзе праваслаўнай Пакроўскай царквы было 2878 прыхаджан з Яроміна і навакольных вёсак. Царкве належала 36 дзесяцін зямлі. У 1889 г. у народным вучылішчы навучалася 46 хлопчыкаў і 14 дзяўчынак. У 1909 г. 332 двары, 687 жыхароў, належала Яромінскаму сельскагаспадарчаму таварыству, якое мела 1622 дзесяціны зямлі. Частка сяла належала двараніну Патону, які меў 690 дзесяцін зямлі. Створаны саўгас «Яроміна». У 1926 г. у яго ўваходзіла 15 двароў, 58 жыхароў. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета Гомельскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 390 двароў, 2008 жыхароў, школа 1-й ступені, сталярная майстэрня, кузня, шавецкая майстэрня, нафтавы млын. У 1933 г. у сяле размяшчаўся яромінскі ўчастак Гомельскай МТС, які абслугоўваў саўгас «Яроміна» і 6 калгасаў. У Вялікую Айчынную вайну загінула 270 воінаў-землякоў.

У 1974 г. камбінат бытавога абслугоўвання, Касцюкоўскае міжраённае аб'яднанне сельгастэхнікі, абласная станцыя аховы раслін. Сярэдняя школа, Гомельская раённая музычная школа, Дом культуры, 2 бібліятэкі, дзіцячы сад, амбулаторыя, аптэка, аддзяленне сувязі, кафэ, 5 магазінаў. На 1.1.1996 г. 1989 двароў, 5957 жыхароў. Сярэдняя школа (889 вучняў), музычная школа, дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, амбулаторыя, сталовая, 4 магазіны, лазня, камбінат бытавога абслугоўвання.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля будынка выканкома сельсавета. На ўшанаванне памяці 270 землякоў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У 1967 г. пастаўлены помнік — стэла з барэльефнай выявай воінаў, абапал яе пліты з імёнамі загінуўшых. У 1990 г. рэканструяваны.

ЯРОХАВА, пасёлак ва Улукаўскім сельсавеце. Вядомы з пачатку XX ст. у Гомельскай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. З 8.12.1926 г. у складзе Галавінецкага сельсавета Гомельскага раёна і акругі, з 30.12.1930 г. ва Улукаўскім сельсавеце Гомельскага раёна і акругі.

У 1926 г. 18 двароў, 97 жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну пасёлак са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.1996 г. 26 двароў, 47 жыхароў, 32 з якіх пенсіённага ўзросту. У складзе саўгаса «Бярозкі».

ЯЎСТРАТАЎКА, пасёлак у Целяшоўскім сельсавеце. Вядомы з XX ст. у час калгаснага будаўніцтва. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г., 14 двароў, 62 жыхары. З 8.12.1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце Уваравіцкага раёна Гомельскай акругі. З 17.4.1962 г. у Гомельскім раёне. На 1.1.1996 г. 10 двароў, 20 жыхароў. У складзе калгаса «Чырвоная плошча».

В.В.Віталева.